**Генрых Далідовіч**

# Цяпло на першацвет

*Аповесці і апавяданні*

Далідовіч Г.

Цяпло на першацвет. Аповесці і апавяданні. Мн., «Маст, літ.», 1976. - 272 с.

Аповесць «Усе яшчэ наперадзе» — шчыры расказ маладога настаўніка, які прыехаў у вёску пасля інстытута з намерамі чыстымі, высакароднымі і здольны адстаяць свае перакананні.

Пра каханне, пра чалавечае шчасце напісана аповесць «Юля» і апавяданні.

# 1
# аповесці

## УСЕ ЯШЧЭ НАПЕРАДЗЕ

1

Нечакана і незаўважна прайшла пара высокага светлага неба, яркага сонца, празрыстых белых воблакаў: набеглі халодныя сіберныя вятры, нагналі нізкіх і цяжкіх хмар. На дварэ стала кожнага дня імжэць, халаднець, а на бярозах жаўцела і ападала долу лісце.

Раней я не заўважаў гэтай свежай пары, не ўмеў добра прыкмеціць, калі пачынаецца ранняя восень,— калі яшчэ ў жніўні аднаго дня лёгенька пацягне цвярозлівай здаровасцю, паніжэе, стане чуйным, шэрым неба, лес і поле запахнуць верасамі і свежай раллёю. Гэта не адразу ўбачыш, пачуеш; але як прашуміць над табою, праляціць і схаваецца за небакраем плойма шпакоў, толькі тады ясна адчуеш, што гэта не выпадкова: апусцела поле, ужо даўно няма ластавак, адыходзіць дяпло і ідзе штосьці новае,— і ты ўвесь напаўняешся гэтым новым, сур'ёзным і сталым пачуццём.

Сёлета я пасталеў, адчуў нешта новае,— таму, што выпісаўся, выехаў летам з горада і зноў вярнуўся ў вёску, стаў працаваць настаўнікам. Трапіў я не ў свае родныя мясціны, а «за свет», як кажа мая маці,— на той бок Мінска. Стаў на кватэры ў старэнькім ашаляваным доміку, у пажылых гаспадароў-пенсіянераў, з першых дзён спадабаўся гаспадыні: суседзі сталі шаптацца, што яна задумала ажаніць мяне са сваёй дачкой-пястушкай.

Гэтая Ленка, высокая, поўная, скончыла летам дзесядігодку, нікуды не паступіла і цяпер гуляе, вылежваецца дома — у саўгас на работу ісці не хоча («дзесяць класаў канчала»), а ў горад не пускае маці. Я колькі разоў паглядзеў на гэтую Ленку, падумаў сабе «добрая дзеўка», але заляцацца не стаў: далей ад спакусы.

Адразу пасля горада мне тут, у невялікай вёсцы, сумна, неяк няўтульна. Моладзі мала, усе ў горадзе, прыязджаюць дамоў толькі суботаю. Сустрэўся я колькі раз на вечарынках з тутэйшымі хлопцамі-аднагодкамі— і адпала ахвота бавіць з імі час: яны думаюць зусім не так, як я, і гутарка ў іх адна — пра сваю работу. Пра трактары і машыны. І яны мне, і я ім не мог нічога многа сказаць. Перакінуліся мы адным-двума словамі пра тое, што ўсе добра ведалі, і яны болей мяне не зачапілі, хоць і на «вы» называлі, і я больш не загаварыў да іх, думаў пра сваё. Пасядзеў крыху, паслухаў іх, вясёлых і бесклапотных, і пайшоў дамоў. Прападаю дзень у школе (даю ўрокі, пакідаю дзяцей на дадатковыя, вяду літаратурны гурток). Калі прыйду дамоў, адпачываю, чытаю ці правяраю сшыткі, пішу сябрам лісты. Толькі вечарам выйду пасядзець на лаўцы, падыхаць паветрам і дапільнаваць

паштальёнку (можа, будзе пісьмо). Сяджу і наглядаю, як людзі завіхаюцца, грабуць бульбу, абіваюць кашы і носяць у скляпы поўныя мяхі, валакуць з лесу грыбы. Гляджу на адзінокі, рэдзенькі дымок: цяпер у печы мала хто паліць вечарам, а то і зусім не паліць. І не таму, што берагуць людзі дровы, а напрацуюцца, натопчуцца за дзень, сяк-так уходзяцца па гаспадарцы, пап'юць малака і кладуцца спаць.

Выйсці, зайсці няма да каго: настаўнікі нашы жывуць далека, у другой вёсцы, а з тутэйшых суседзяў я яшчэ нікога не ведаю. Адвыкаю пакрысе ад горада, перастаў штодня прасавацца, галіцца, чысціць туфлі (пасля дажджу па нашых вуліцах нельга прайсці, я ўжо задумаў пасля першай аплаты купіць боты), забываю горад, толькі сняцца ноччу высокія шматпавярховыя дамы, вялікія універмагі і кнігарні, кінатэатры, шырокі праспект, па якім штохвіліны ідуць і ідуць кудысьці людзі. А ў вушах звіняць нашы студэнцкія гутаркі, калі мы спрачаліся пра вершы Еўтушэнкі, аповесці Быкава, пра «сярдзітых маладых людзей», пра авангардыстаў, пра песні Высоцкага... Ды пра што мы толькі студэнтамі не спрачаліся, у чым толькі не хацелі разабрацца, каго мы толькі не хвалілі і не лаялі!..

Яшчэ слаба верыцца, што я цяпер не студэнт, ранічкамі нават усхопліваюся, хутчэй апранаюся, бягу мыцца — баюся спазніцца на лекцыю. Гляну на чужую хату, на стосы сшыткаў на стале,— сяду і лаю сябе: «Павел, мілы мой, ты ўжо не Павел, не дыпломнік, а Павел Мікалаевіч, настаўнік, будзь крыху болей салідны і не смяшы людзей. Цяпер ты стаў жыць сталей, вучыць дзятву і зарабляць сабе кавалак хлеба, аддаваць Радзіме доўг, які яна табе пазычала пятнаццаць гадоў...»

Я, калі казаць шчыра, хацеў пасля інстытута застацца ў горадзе, уладкавацца ў мінскую школу ці рэдактарам у якое выдавецтва, але мяне ў сталіцы не пакінулі, сказалі: калі вас пасылаюць у вёску — то і едзьце, парабіце свае тры гады, а там нешта будзе відаць. У аспірантуру таксама не збіраліся мяне запрашаць, не бачылі ўва мне вялікага вучонага, таму я і апынуўся тут, у Міланьскай школе.

Я ехаў сюды і загадзя ведаў, што ў любой вёсцы не сходзіш на «Мелодыі сяброў», на футбол, у тэатр ці ў філармонію, кнігарню, не пачуеш свежых плётак пра артыстак, пісьменнікаў ці футбалістаў... Але ж тых Іванаву, Мар'янавіча, Магамаева, Крысталінскую можна паслухаць і паглядзець па тэлевізары, цяпер не той век, што трэба суткамі дабірацца на конях у горад, што ў вёсках цемната і глухата. Гэта гарадскім веска мо страшная, а я, вясковы, яе не баюся, буду жыць і працаваць старацца так, як вучылі ў інстытуце.

«Папрацуем, Павел Мікалаевіч,— думаў я,— папрацуем і паглядзім, што будзе».

Загадчык райана хацеў паслаць мяне на працу ў васьмігодку (калі мяне забяруць восенню ў войска, для васьмігодкі будзе лягчэй; яшчэ ў Міланьках ніхто з маладых больш года не заставаўся, таму, як пасля я даведаўся, мною «заткнулі» дзюрку). Загадчык, калі сватаў мяне ў гэтую школу, хваліўся, што ў Міланьках — вялікі лес, глыбокая рака, разумныя настаўнікі, і мне там будзе выгода.

Я паслухаў яго і паехаў. У школе мне сказалі, што моваведа ім трэба, гадзін вольных хапае, далі мне весці тры мовы — рускую, беларускую і нямецкую. Набралася ўсіх разам дваццаць пядь гадзін. Каб сказаў студэнтам, то жартавалі б: варта яшчэ ўзяць спевы, маляванне, фізкультуру...

Папрацаваў два месяцы і бачу, што стамляюся. Студэнтам было лягчэй: сядзі і слухай або прыкідвайся, што ловіш кожнае слова выкладчыка. А цяпер цяжкавата — нагаваруся так, што ахрыпае голас, баліць галава; прыйдзеш дамоў і не хочацца есці. Гаспадыня пачала ўжо бедаваць, што худнею.

Я думаў, што дзеці ў васьмігодцы будуць невялікія, ціхмяныя, будуць вельмі паважаць і слухацца настаўніка. Але на першым уроку ўбачыў, што памыляюся: здаліся яны мне вельмі шумлівымі і непаслухмянымі; пасля першага тыдня ўбачыў, што многа дзяцей і вучыцца не хоча, не піша дома і не чытае; пакіну пасля ўрока — уцякаюць, а назаўтра не прыходзяць на мае ўрокі зусім.

Надта цяжкі шосты клас. Не клас, а «дзікая дывізія»: сорак вучняў, трыццаць хлопцаў, з якіх пяць ці шэсць перарosткаў і другагоднікаў. З імі цяжка, нават не ведаю, што рабіць: зусім не хочуць слухацца, адвернешся запісаць што-небудзь на дошцы — б'юцца між сабою ці крыўдзяць дзяўчат. І дома за кніжку не бяруцца.

На другім тыдні я падняў аднаго такога «героя» і рашыў перад класам прысароміць.

— Зразумей, сябра,— кажу яму,— ты ж не слухаеш настаўніка, дома сам не займаешся, уцякаеш з урокаў. Ты ж нічога ведаць не будзеш, толькі адны двойкі будзеш хапаць.

— Ну і што? — смяецца ён.

— Я і за чвэрць пастаўлю табе двойку,— палохаў я далей.

— Стаўляйце, вы настаўнік,— кажа вучань, стаіць і ківаецца.

— Будзеш так вучыцца, я і за другую тое ж выведу. Пасля выйдзе, што і за год двойку схопіш.

— Ну і што? — паціскае ён плячыма, усміхаецца.

— Як — што? — здзіўляюся я,— У сёмы клас не перавяду.

— Пераведзяце,— самаўпэўнена гаворыць вучань.

— Як гэта — «пераведзяце»? Хто цябе з двойкамі пусціць?

— Пусцяць. У нас усіх пераводзяць.

— А я вось не перавяду,— кажу я,— памру, але невука не перавяду.

— Дырэктар скажа — і пераведзяце,— пасміхаецца,— а то я магу ў шосты зноў не пайсці, дома сядзець. Не пайду ў школу — самі прыйдзеце прасіць, каб хадзіў.

— Ну, брат, не дачакаешся,— кажу я.

— Прыйдзеце. Бо калі я не скончу восем класаў, вас пакараць могуць: цяпер усе павінны васьмігодку канчаць.

— Бач, які ты разумны, як усё ведаеш! — сказаў я і здзівіўся, што я так раней не думаў, здаецца, так не думалі і мае аднагодкі, так не разбіраліся цвяроза, стала, як разбіраюцца дзеці цяпер.— Ты вучыся, каб нешта ведаць, вялікім чалавекам быць.

— А! З нашай школы ніхто нікуды не паступае,— махае рукою вучань.

— Вучыцца трэба, старацца,— кажу я,— канечне, як ты вучышся, дык са сваімі ведамі нікуды не паступіш.

— А я і не буду паступаць,— кажа вучань,— мне бацька сказаў, каб скончыў восем класаў і ішоў вучыцца на трактарыста ці шафера. А там усялякіх бяруць. Не ўсім жа настаўнікамі быць.

Я маўчаў, нічога не мог сказаць: усе мае інстытуцкія веды, педагогіка не маглі падказаць, што мне цяпер зрабіць, як пераканаць. Я нават разгубіўся, пасля, каб не прамаўчаць, пакінуць за сабою апошняе слова, сказаў:

— Няправільна ты думаеш, Саша. Сядай. Каб быць добрым шаферам ці трактарыстам, таксама трэба вучыцца.

— Баранку буду круціць і без вашай мовы ці літаратуры,— сказаў вучань,— распісацца я ўжо ўмею...

А аднаго дня я насмяяўся. Заходжу ў сёмы клас, гляджу: няма ля дошкі анучкі.

— Дзяжурны, чым будзем выціраць дошку?

Дзяжурны нагнуўся і пасунуў руку ў парту; дзеці, відаць, на перапынку кідаліся анучкаю ці з другога класа хацелі яе ўкрасці, дык дзяжурны схаваў яе ў сваю парту. Цяпер ён не панёс анучкі, а папусціў яе са свайго месца да дошкі. Глянуў я, глянулі вучні — і абамлелі: на падлозе ляжаў вялікі дамашні блін са скваркамі. Убачыў гэта дзяжурны, зачырванеўся, падбег, схапіў свой блінец і выбег з класа...

## 2

Мала я пажыў у сваіх гаспадароў, але палюбіў пакойчык, які яны адвялі мне. Светлы, чысценькі, падлога жоўтая, бліскучая, свежыя шпалеры, белая столь. Гаспадыня мая любіць парадак, вялікая чысцёха, век ваюе са сваім мужам, прымушае яго ў кухні разувацца і хадзіць па «залі» ў тапачках, а ён, неахайнік, ці забудзецца, ці палянуецца скідаць у сенцах брудныя боты, заскочыць часамі ў іх і наробіць слядоў, а то можа прыцягнуць у хату бярвенца ці дошку і часаць...

На сцяне вісіць стары, у драўлянай аправе гадзіннік, ён прыемна цікае, выстуквае гадзіны, вісіць радыё, але яно мала гаворыць, больш хрыпіць: то правады закруцяцца, то іх абарвуць, калі возяць на машынах сена ці салому, то выключаць, калі баяцца грому, а пасля забываюцца ўключыць.

Ложак мой надта пекна засланы, і я не хачу скідаць падушкі, разбураць красу, адпачываю на канапе, бывае, і засну на ёй, прасплю ўсю ноч. Каб яшчэ быў у хаце тэлевізар, то і зусім добра было б. Я паспеў заўважыць, што ў наш час у вёсцы маладому, ды яшчэ настаўніку, без тэлевізара не абысціся: добра і перадачу якую паглядзець, і кіно; не раз бывае і многа вольнага часу, рабіць няма чаго, то ўключыў тэлевізар і глядзі...

На стале, ля альяса і стосаў сшыткаў, ляжыць разгорнутая кніга, але сёння чытаць не хочацца. Не быў у школе, не стаміўся, але панерваваўся дарогаю, паслухаў дырэктара і настаўніцу Ларысу— і стала чагосьці цяжкая галава. Гэта бывае тады, калі хочаш нешта зрабіць, але не робіш, думаеш, і думкі разбягаюцца,— тады хутка стамляешся. Цяпер хочацца паляжаць спакойна, абдумаць, што робіцца на свеце, як жыву, што ў мяне наперадзе.

Зняў гальштук, пераадзеўся; здаецца, стала лягчэй, неяк вальней дыхаць; можа, нават і таму, што я цяпер быў не ў школе, не чуў, як шумяць дзеці.

Я заплюшчыў вочы, лёг, у галаве штосьці шумела, прыслухаўшыся, я нічога не пачуў, чуваць было толькі, як звонка цікаў гадзіннік. Да галавы прылівала кроў, я нават намацаў жылкі на лбе і чуў, як яны то шырацца, то звужаюцца.

Нечакана падумалася: ці люблю я сваю работу, ці задаволіўся, што стаў настаўнікам? Каб спытаўся хто — сказаў бы: падабаецца працаваць у школе, добра быць настаўнікам. Але цяпер я не ведаў, ці гэта так, хацелася мне нечага большага: неяк жа я вельмі сціпла, ціха жыву, непрыкметна працую, і, здаецца, ніхто не бачыць маёй гэтай работы, не паважае яе — ні пахваліць, ні паганіць...

Ларыса, нядаўняя аднакурсніца мая, здаецца, працуе весялей, смялей глядзіць у будучыню, любіць дзяцей, і яны ахвотней горнуцца да яе, выклікаюць яе з настаўніцкай на калідор, давяраюць свае сакрэты, прыходзяць да яе на кватэру. Мяне ж сароме юцца, пазбягаюць, і мне здаецца, што не варта было мне вучыцца на настаўніка, трэба было выбіраць іншую прафесію. Але якая мне падабаецца прафесія, я і цяпер не ведаю...

Звялі нас з Ларысаю сцежкі наспадзявана і выпадкова, як зводзяць яны, мусіць, усіх незнаемых людзей, якія пасля становяцца сябрамі, калегамі па рабоце, сем'янінамі ці ворагамі на ўсё жыццё або разыходзяцца і забываюцца адзін пра аднаго.

Сустрэліся мы ў інстытуце маладзенькімі першакурснікамі, я ўзяў у Ларысы канспект, а яна ў мяне — кнігу. На гэтым наша дружба і затрымалася: у мяне былі свае клопаты, у яе свае, мне падабаліся другія дзяўчаты, а яна хадзіла з «чужымі», з другіх факультэтаў, хлопцамі. Але ні яна, ні я не ажаніліся ў інстытуце, прыехалі ў Міланькі халасцякамі. За нас сталі думаць вясковыя людзі: мяне сватаюць да гаспадарскай дачкі, а Ларысу — да тутэйшага маладога брыгадзіра. Мы ж абое яшчэ не думаем пра сям'ю: я нават баюся жаніцца, як успомню пра гэта, дык «тры дні баляць зубы», а Ларыса пасварылася са сваім кавалерам Віктарам, а брыгадзір, як прызнаецца яна, зусім ёй не падабаецца...

Уладкоўвацца на работу ў раён мы прыехалі «пакоем» — Вася, Слава і я,— усе пяць гадоў мы разам вучыліся, жылі ў адным пакоі.

Мае аднакашнікі прыехалі раней у райана; мы яшчэ вясною, калі абаранілі дыпломы і раз'ехаліся па сваіх весках, дамовіліся, што аднаго дня прыедзем уладкоўвацца на работу. Калі хто надумаецца прыехаць раней, то няхай пахітрыць крыху, уведае, дзе ёсць добрыя месцы.

Гэта аказалася нялёгка: інспектары былі ў водпуску, а загадчык, хітры чалавек, які «два метры ў зямлю бачыў», расхвальваў усе школы. Як мы пазней ужо дазналіся, ён стараўся, пакуль мы нічога не ведалі ў незнаемым для сябе раёне, паслаць нас у самыя далёкія школы, бо не кожнага «старажыла» падманеш ці падахвоціш ехаць туды, куды рэдка ходзяць аўтобусы...

Калі я зайшоў у райана, там ужо насіліся з рознымі паперамі Вася ды Слава, а цяпер ужо Васіль Іванавіч ды Вячаслаў Вячаслававіч; убачыўшы мяне, яны пацягнулі за рукаў, загаманілі:

— Хадзі, пазнаёмім цябе з тваім будучым калегам па рабоце.

— Вельмі прыемна,— пачуў я знаёмы голас і пазнаў дзяўчыну, што нават не глянула на мяне, сядзела спіною і штосьці пісала.

Пазнаў па шчуплай постаці, доўгіх, па плечы, бела-жоўтых валасах, прыпомніў нават па знаёмай сіненькай сукенцы.

— Ларыса? — здзівіўся я.

— Я, Пашка,— усміхнулася мая аднакурсніца.

— Ніколі не думаў, што са сваім чалавекам траплю ў адну васьмігодку,— сказаў я.

— Як бачыш, трапіў. Ты не рады?

— Заляцацца будзеце пасля, часу хопіць,— зноў пацягнулі мяне за рукаў хлопцы,— ідзі хутчэй, пішы заяву, аўтабіяграфію ды пабяжым у кафэ «Беразіна».

Я паслухаў хлопцаў, пакінуў Ларысу і пайшоў афармляцца. Загадчык падпісаў маю заяву, павіншаваў з пасадаю, прасіў прыязджаць у раён, расказваць, што ў школе на рабоце лёгкае, што цяжкае. Я паабяцаў ездзіць, расказваць, старацца працаваць. Хлопцы не маглі дачакацца мяне, клікалі, і, як толькі я выйшаў, мы паехалі аўтобусам у «Беразіну».

...У той жа дзень мы развіталіся і паехалі ў свае вёскі, падаліся знаёміцца са школамі, стаць дзе на кватэру.

Ларыса чакала мяне на вакзале, нават узяла мне білет. Пасажыраў было многа, жанчыны завалілі клункамі ўвесь аўтобус; як я зразумеў, час цяпер гарачы, сама жнуць, малоцяць, сянуюць, людзі выбралі вольны дзень і вырваліся амаль усёй вёскай у горад.

— Ты была ўжо ў гэтых Міланьках? — спытаўся я ў Ларысы.

— Была,— усміхнулася яна.

— Якія яны там, гэтыя Міланькі ці Мілунькі? Святло, радыё ёсць? — пажартаваў я.

— Есць, не бойся.

— Якая там школа?

— Так сабе, драўляная.

Я стаяў і разглядаў Ларысу, невысокую, шыракатварую, з даўгаватым носам, і яна зусім мне не падабалася, як і ўсе гэтыя пяць гадоў. Падабаліся толькі яе апушчаныя на плечы светлый валасы, яна іх ніколі не адразала, берагла, і яны ў яе былі прыгожыя. Але я парадаваўся, што буду працаваць са сваёю аднакурсніцай.

Як выехалі за горад, аўтобус стала спачатку трэсці, кідаць, тых, хто сядзеў на задніх сядзеннях, шпурляла ўверх, раскідвала іх клункі. Жанчыны спярша смяяліся, а пасля сталі злавацца, крычаць на шафера. Абмінулі першую вёску — аўтобус стаў дымець, ледзь паўзці: дарога была пясчаная, сыпучая, вельмі цяжкая.

— Слаўная дарога! — сказаў я.— У мяне ўжо галава баліць ад дыму і шуму.

— Гэта яшчэ добра,— усміхнулася Ларыса.— Гаворыць, восенню, зімою ды вясною аўтобус туды зусім не ходзіць.

— О божа! — усклікнуў я,— не палохай, а то не паеду.

Сказаў так, а ў сэрцы зашчымела жылка, што маім сябрам, відаць, дасталося нешта лепшае. І зусім не верылася, што я еду на работу. Здавалася, праедзем мы яшчэ трохі, аўтобус прыпыніцца, і я сыду ў сваёй вёсцы. Але слухаў я свежую для сябе гамонку, глядзеў на незнаемых людзей з клункамі — і даходзіла, куды я еду і чаго.

Ларысу каторыя жанчыны пазналі, загаманілі з ёю, сталі дапытвацца: можа, і я — іх новы настаўнік, буду рабіць за Волечку, якая не паладзіла з дырэктарам школы і перавялася ў суседнюю дзесяцігодку.

— Настаўнік,— сказала Ларыса.

— Пастарайцеся спадабацца нашаму Рагачу,— пажадала адна рабацiністая кабета,— калі спадабаецеся і яму, і ягонай жоначцы, то будзе лёгка працаваць.

— Ведаеш ты надта! — зазлавала яе маладзейшая суседка.— Дырэктар і павінен быць строгі, не папускацца вельмі, парадак у школе трымаць.

— Але ж трэба і чалавека паважаць. Ён вось настаўнік маладзенькі, не меней пятнаццаці гадоў вучыўся,— запярэчыла старая, і маладзейшая зноў з ёю заспрачалася.

Пасля яны забыліся пра нас, пра дырэктара, загаварылі пра сваё, бедавалі, што не ўрадзілі сёлета гуркі.

«Вось, Паша, яны не спрачаюцца пра Еўтушэнку ды «сярдзітых маладых людзей», як ты ў Мінску,— думаў я, — яны жывуць, працуюць, ведаюць сваё. Трэба зразумець іх. Тады будзеш для іх сваім чалавекам».

Пасля ўсе стаміліся, наглыталіся пылу і дыму, замоўклі. Як выехалі з лесу, праехалі полем уніз, у лагчыну,— паказалася веска. Сэрца мне падказала: Міланькі!

— Наша? — спытаўся я ў Ларысы.

— Наша,— усміхнулася яна.

Аўтобус стаў прыпыняцца ледзь не ля кожнай хаты: прасілі жанчыны. Выехаўшы з лагчыны на груд, стаў.

Ларыса памагла адной бабулі падняць мяшок, падалася за ёю, услед пайшоў і я. Агледзеўшыся, убачыў, што запыліўся, ажно пластом на мне ляжаў пыл.

Якраз вечарэла: пагледзеўшы вакол, я ўбачыў, як гаспадыні капалі на вячэру бульбу, пачуў, як пішчалі ў задворках галодныя свінні, хтосьці вёз сена. Воз перавальваўся з боку на бок, рыпеў.

«Як і ў нашай вёсцы,— падумаў я,— акурат».

Убачыўшы аўтобус, прыбеглі замурзаныя дзеці. Яны падбягалі да сваіх матак, прасілі гасцінца, дапытваліся, што ім купілі.

— Ох, як стаміўся,— прамовіў я.

— Прывыкай,— сказала Ларыса.— Паглядзіш школу ці адразу да дырэктара пойдзем?

— Давай сходзім да начальства. Спадабаемся, як казала тая кабета.

— Толькі не назаві яго Рагачом,— усміхнулася Ларыса,— гэта так яго дражняць, па-добраму ён Рагатка. Тут усім мянушкі даюць, лепш па іх людзей ведаюць, чым па прозвішчах. Вось і яго домік.

— Нічога сабе «домік»,— здзівіўся я,— цэлы палац, сад які, хлеў. У двары, мусіць, «Масквіч» стаіць?

— Не,— усміхнулася Ларыса,— самазвал.

— Усё роўна буржуа,— сказаў я.

— Не абражай чалавека,— запярэчыла Ларыса.— Раз чалавек жыве ў вёсцы, то павінен, па-твойму, у лапцях хадзіць і гібець у зямлянцы?

— Як ты добра гаворыш,— сказаў я жартам.

— А ты трэплешся,— не адставала і Ларыса.

Мы пастукалі — нам ніхто не адказаў. Тады мы зайшлі самі. У хаце нікога не было; здалося, што ў ёй горача, нават душна, пахла сухімі чарніцамі, недзе ў куце звінела муха.

На двары ляпнулі варотцы, я глянуў у акно: з саду зайшла пажылая невысокая жанчына, босая, у выцвілай сукенцы, скінула з плячэй дзяружку травы, пасекла яе на калодцы, укінула ў саган і прынесла ў хату. Тут і ўбачыла нас, усміхнулася, прывіталася па-вясковаму, папрасіла прабачыць, што такая неахайная, высыпала на стол з кішэняў шчаўе і выйшла ў другую палавіну. Ларыса тут жа мне прашаптала, што гэта і ёсць жонка дырэктара, будзе весці сёлета хімію, яна і ёсць тая «дырэктарыха», Вольга Піліпаўна, пра якую гаварылі жанчыны ў аўтобусе.

«Дырэктарыха», пераадзетая, абутая, хутка вярнулася і прынесла нам вялікіх чырвоных яблыкаў, запрасіла пакаштаваць. Яна распыталася, хто я, адкуль, што хачу весці ў школе.

— Працаваць у нас можна,— сказала Вольга Піліпаўна,— месца ў нас харошае, ціхае, праверак усялякіх мала бывае.

— Чаго іх баяцца,— сказаў я.

— Вы яшчэ не ведаеце,— сказала дырэктарыха,— паробіце — самі ўбачыце, што для нас, настаўнікаў, гэтыя праверкі, колькі яны здароўя забіраюць. Усе вучаць, патрабуюць усяго, а ты здолей усё

зрабіць. Але ў нас яшчэ можна рабіць, ды і вольных гадзін сёлета хапае: і нямецкая, фізкультура, спевы, праца, і маляванне — усё свабоднае гэта, нікім яшчэ не занятае. Так што грошай у нас можаце зарабіць. Вам жа, маладым, адразу пасля інстытута, гэта вельмі трэба.

— А маладыя настаўнікі будуць у школе? — спытаўся я.

— Будуць. Вось ваша сяброўка, вы самі, павінны яшчэ біёлага, піянерважатую прыслаць, фізік вашых гадоў працуе. Ды ў вёсцы нашай дзяўчат маладых і пекных многа.

Вольга Піліпаўна пачынала мне падабацца, яна здавалася спагадліваю, разумнаю.

— Вы сёння пераначуйце ў нас,— сказала гаспадыня,— вечарам павінен прыехаць Іван Сямёнавіч, тады заўтра ўжо знойдзе вам якую кватэру. Вы пачытайце ці пагутарце, а я свінням дам, а то ўжо вушы празванілі.

— Мы пагуляем,— сказала Ларыса.

— Калі ласка, паглядзіце вёску, школу.

Мы ўзялі па яблыку і выйшлі на двор. Нас сустракалі дзеці, віталіся: відаць, бачылі, што мы выходзілі з дома дырэктара і здагадаліся, што мы новыя настаўнікі.

— Тут жыве наш калега-русавед,— сказала Ларыса,— налета яму на пенсію ісці. А дырэктару нашаму праз пяць гадоў, завучу на год-два пазней.

— Можна спадзявацца, што і ў начальства якое хутка выб'емся,— усміхнуўся я.

— Які салдат не хоча...— сказала Ларыса і папярхнулася.

— Во прагная на дырэктарскія яблычкі! — пажартаваў я, Ларыса адкашлялася і замахнулася на мяне кулаком; я адскочыў, але яна паспела стукнуць мяне па спіне.

Мы засмяяліся, і адна гэтая хвіліна больш зблізіла нас, як усе гады нашай вучобы.

## 3

Мы ішлі па вуліцы, я глядзеў вакол і бачыў, што веска наша цесная, нізенькая, хаты стаяць у лагчыне. Як які дождж, адліга ці разводдзе,— вада збягае з усіх грудоў на вуліцу, і нельга па ёй тады, мусіць, ні праехаць ні прайсці, бо і цяпер, у гарачую пару, стаялі на дарозе і не высыхалі лужыны. У іх плёскаліся задаволеныя дзеці і так калацілі па вадзе нагамі, што апырсквалі блізкія платы.

Спадабалася мне, што ў вёсцы многа садоў: бялеліся і чырванеліся яблыкі, з-за якіх амаль не было відаць лісця, паабвісалі на частакол

цяжкія лапы са слівамі. Груш было мала: ці год даўся на іх благі, ці дрэвы састарэлі і болей не пладзілі.

Непадалёку булькала рэчка. Не такая вялікая, шырокая, як хваліў загадчык, але плыткая, звонкая, вераб'ю па калена. Дзве пажылыя кабеты паласкалі бялізну, паблізу купаліся дзеці, і адзін рыжы хлапчук хадзіў з відэльцам, нагінаўся — відаць, выцікоўваў сліжыкі. Падышоў стары дзед, апусціў з плячэй асінавую бочку, скаціў яе з берага на ваду. Плынь падхапіла бочку і панесла; стары падабраў на беразе камень, усунуў яго ў бочку, напусціў вады і, калі ўтапіў, пастаяў, паглядзеў на сваю работу і рады, што добра будзе мокнуць бочка, пайшоў дахаты.

«Веска як веска,— падумаў я,— толькі людзі незнаёмыя мне, а так усё астатняе знаёмае».

Будынак школы, у якім мне выпадала працаваць, не спадабаўся. Стары, нізкі, цемнаваты. Паўднёвая сцяна была яшчэ смалістая, чыстая і звонкая, паўночная — цёмная, сырая, з падгнілымі падрубамі. Страха ўчарнела, абрасла зялёным мохам. Мне ўявілася блізкае жыццё, праца ў гэтай старэнькай школе: стары медзяны званок, які столькі ўжо названіўся, што страціў чысты звон, старыя тэхнічкі, старыя настаўнікі, аблітыя чарнілам парты, сталы. Усё старое. Нават дзеці будуць нейкімі спалоханымі, баязлівымі, і мне, маладому, будзе тут вельмі сумна; буду працаваць, старацца, і нямілай здасца гэтая работа...

«Аднак не плач, Паўлік,— суцешыў я сябе,— ты малады, здаровы, з дыпломам...»

Падумаў я так, супакоіўся і ўявіў, што я — хоць і не Макаранка ці Сухамлінскі, мне далека да іх,— але і я нешта зраблю тут, бо тое-сёе ведаю. Быў студэнтам не зубрыла, аскетам таксама не лічыўся, ездзіў працаваць на канікулы ў Казахстан, займаўся спортам, сядзеў ля кастра на Немане, Бярэзіне, хадзіў з дзяўчатамі ў кіно, але не толькі ведаю песні ды помню прагледжаныя кінафільмы. Я стараўся многа чытаць і не толькі тое, што было па праграме, мог расказаць пра Хэмінгуэя, Камю, Апдайка, Фолкнера, Кавабату...

«Няўжо я нічога не магу зрабіць тут?» — думаў я і ведаў, што буду даваць добрыя ўрокі, зацікаўлю дзяцей, арганізую літаратурны гурток, і мае паэты будуць друкаваць вершы не толькі ў раёнцы... Заўважаць і маю работу, мае ста634ранне, раскажуць па радыё, тэлебачанні. Фотакарэспандэнты, інтрэв'ю...

І мяне, маладога настаўніка, хваляць, раяць вучыцца ў мяне старэйшым, мне прысвойваюць званне заслужанага настаўніка, запрашаюць працаваць у самыя лепшыя школы.

Старыя настаўніцы будуць усхліпваць ад радасці, а маладыя закахана глядзець на мяне, шкадаваць, каб я не паехаў адсюль, спрачацца між сабою: хто з іх можа сябраваць са мною.

Вучаніцы... Што тут ужо гаварыць!..

— Чаго ты смяешся? — таўханула мяне ў бок Ларыса.— Стаіш і смяешся сам сабе...

— Аб чым ты думала, калі мы нядаўна хадзілі і аглядалі школу? — не адказаў, а спытаўся я.— Толькі прызнайся шчыра...

— Пра што я думала?— пацiснула яна плячыма,— глядзела...

— І не думала, як ты будзеш працаваць тут? — здзівіўся я.

— Думала, але раней, калі ўпершыню прыехала сюды. А цяпер думала пра дырэктарыху. Здаецца, добрая яна жанчына. Працавітая, спагадлівая,

— І мне так здаецца,— прызнаўся я.— Але я цяпер стаяў і думаў, як буду працаваць тут.

— Табе не цярпіцца?

— Надакучыла быць студэнтам, надакучыла лайдачыць летам,— сказаў я.— Хочацца быць сталым, самастойным чалавекам. «Малады яшчэ, малады»,— гавораць усе. А мне ўжо дваццаць два гады. Гэта і мала, але ўжо і многа... Вось і хочацца пачаць, праверыць сябе.

— І ты зусім не шкадуеш студэнцтва? — як засумавала Ларыса.— Няўжо забыўся лекцыі, інтэрнат, вечары, сяброў?

— Не забыўся,— прамовіў я,— але ж так век не будзе.

— А я сумую,— сказала Ларыса,— бачу, што наперадзе будзе сумней жыць, таму і баюся пачынаць працу.

— Не бойся,— заспакоіў я, хоць і ў самога вялікай смеласці не было.— Усё будзе добра. Праз колькі дзён мы станем настаўнікамі. Паслухай, якое слова — настаўнікі...

**4**

Назаўтра, калі мы паснедалі з дырэктарам і яго жонкаю, паслухалі радыё, прыйшоў завуч — непаголены, у пацёртых, мусіць, ніколі не прасаваных штанах, у гумовых ботах.

Я не мог утрымацца ад смеху. «Ну і інтэлігент!» — хацеў сказаць шэптам Ларысе, але гэта мне ніяк не ўдавалася.

Завуч пазнаёміўся з намі, сказаў, што бачыў, калі мы праходжваліся ўчора, адразу палічыў нас за настаўнікаў, сёння ў яго суседкі ўжо дапытваліся: мы з Ларысай незнаёмыя між сабой ці сямейныя?

— Вёска заўсёды бачыць усё новае, аглядае, абслухоўвае свежага чалавека,— сказаў Іван Сямёнавіч, дырэктар, пажылы, з маршчын-

камі на твары і шыі, але бадзёры яшчэ мужчына. Ён велічна сеў, паначальніцку глянуў на нас.— Я хачу сказаць другое. Мы, тутэйшыя настаўнікі, людзі немаладыя, сямейныя, абраслі тут сваімі хатамі, хлявамі і садамі. Рамантыка ў нас даўно прайшла, за навуковымі адкрыццямі, славай мы не гонімся, колькі ёсць здароўя, ведаў, вучым дзяцей — словам, выконваем свой грамадзянскі абавязак...

«Умее гаварыць,— падумаў я,— відаць, часта выступае на сходах».

— Вы ж, маладыя, для мяне пакуль што — самалёты без апазнавальных знакаў...

«Які разумны!..»

— Вы маладыя, адукаваныя,— працягваў дырэктар,— толькі што жылі і вучыліся ў горадзе, прывыклі да яго... Хачу вас загадзя папярэдзіць: дзеці ў нас цяжкаватыя, бацькі не вельмі нам памагаюць, але дысцыпліна з боку дырэкцыі да настаўнікаў строгая, працаваць трэба многа і сумленна. Згодны так рабіць — калі ласка, просім да нас. Не падабаюцца нашы парадкі — загадзя шукайце лепшай школы, лепшага дырэктара...

«Відаць, што строгі»,— падумаў я.

— Вечна ты са сваімі перасцярогамі! — накінулася на мужа Вольга Піліпаўна,— палохае толькі маладых.

— Нічога не запалохалі,— умяшалася Ларыса, а далей дадала павучонаму: — Надзённыя праблемы ставяць надзённыя пытанні.

— Вельмі правільна,— сказаў Іван Сямёнавіч,— і маладыя настаўнікі для нашай школы — вялікая праблема, яны мяняюцца ў нас штогод.

— Будзем працаваць,— сказаў я.

— Во гэта слова,— Іван Сямёнавіч устаў, пацісную мне руку.— Калі так надумаліся, парашылі, тады пойдзем «прыжываць» вас, шукаць вам кватэр. На часе я знайду, а пасля самі будзеце мяняць ці свае хаты ставіць.

Ларысе кватэру знайшлі хутка: яе ахвотней бралі хітрыя гаспадыні,— ведалі, што яна будзе прыбіраць за сабою, мыць падлогу, бялізну, памагаць выбіраць бульбу, а то і згатуе сабе есці, падоіць калі карову. Яе ўзяла адзінокая старая кабета, толькі папярэдзіла, каб Ларыса не вадзіла хлопцаў: зімою выскрыгатаюць цяпло ды будуць гудзець да паўночы, не дадуць ёй спаць; а так ёй з «маладой разумнай настаўніцай» весялей будзе, ды на старасць ёй і лішніх трыццаць рублёў не пашкодзіць. Так і сказала ў вочы.

Мяне ж ніхто не хацеў браць на кватэру. Гаварылі, што я малады, гарадскі, чысціню люблю, а ў іх дзеці малыя, будуць шумець, ні

чытаць, ні пісаць не дадуць. Ды і на стол таго мне не паставіш, што самі ядуць. «Не, не»,— адмаўляліся жанчыны і пасылалі да суседзяў.

Так мы прайшлі з паўвёскі.

— Зойдзем сюды,— сказаў дырэктар,— тут нас павінны паслухаць, толькі трэба ўмець падысці да гаспадыні.

Мы зайшлі ў старэнькі, але чысценькі домік, прывіталіся.

— Як жывяце, Іванаўна? — спытаўся дырэктар у гаспадыні.

— Добра,— адказала тая, зірнула на мяне.

— Ленка ваша дома ці ў горад паедзе?

— Які ёй горад, калі мы нядужыя зусім, нам трэба памагаць.

— І праўда. А мы вам зяця во падшукалі, малады, прыгожы, настаўнікам будзе ў нас працаваць.

Жанчына ўсміхнулася:

— Ленка мая маладзенькая яшчэ, куды ёй замуж спяшацца, пабачыць яшчэ гэтага шчасця, ды настаўнік вучоны, ён сабе вучоных і шукаць будзе.

— Вось і вывучыць вашу Ленку,— сказаў дырэктар і пачаў расказваць, як вялікія людзі жаніліся на простых дзяўчатах і добра жылі.

— Жаніхоў няхай яна сама знаходзіць, а чалавек, калі ніхто яго не бярэ, няхай жыве, яды ў нас хапае, абы зубы здаровыя былі,— сказала гаспадыня.

— Дзякуем,— сказаў дырэктар.

— Я спагадлівая,— сказала гаспадыня.— Як падумала, што чалавек чужы, ніхто яго не абагрэе, не прытуліць, дык і пашкадавала...

## 5

Першага верасня мы ішлі ў школу з Ларысай разам. Быў я ў новым зеленаватым з рудаватым адлівам касцюме, купленым яшчэ за бацькавы грошы, у белай кашулі, пры гальштуку, у новых, яшчэ цесных туфлях. Такая ж светлая, юная, здаецца, нават і прыгожая была ў новым светлым касцюме і Ларыса.

Учора вечарам я чытаў «На ростанях», хацеў успомніць, як пачынаў працу Лабановіч. Успомніў, супакоіўся, што і ў мяне ўсё добра будзе.

Стаяла светлая вераснёўская раніца, яшчэ было цёпла, суха, далекавата да нізкага цяжкога неба, халодных вятроў, дажджу з дня ў дзень. Шчодра свяціла сонца, ішло цяпло ад зямлі, і ад гэтага было спакойна, добра на душы.

Жанчыны даставалі з калодзежаў, насілі ваду, выпускалі з двароў каровы, злаваліся, крычалі на сваіх дзяцей; так жа звыкла, як і

кожнага дня, ішоў з комінаў дым, смачна пахла смажанай цыбуляй, прыгарэлай у саганках бульбай...

Я ішоў у школу, са мной віталіся, і я ківаў галавою, усміхаўся; я нарадзіўся ў вёсцы, доўга жыў і крыху ведаў яе хітрасці, добра знаў, што цяпер у вёсцы гаварылі пра новых людзей — пра Ларысу і мяне: тут усё на воку, усе адзін аднаго знаюць. І я адчуваў: калі не паздароўкаюся, хоць і з незнаемым, то набяруся ліха — мяне аб'явяць ганарліўцам ці недавучаным, і я стану для іх чужы. У вёсцы здароўкацца — далёкі разлік, гэта нехта мудра прыдумаў. Я ішоў, ківаў галавою налева і направа.

— Падлізваешся,— пасміхалася з мяне Ларыса.

— Я ведаю, што раблю,— гаварыў я.

У тэты дзень на месцы бацькоў я не таптаўся б пры двары, адлажыў бы ўсю работу, а прыйшоў бы ў школу: які сёння дзень! Першага верасня! Нехта сёння выведзе першую літару, рошыць першую задачу — і пачнецца для яго вялікая і цяжкая, цікавая і радасная дарога ў навуку...

На школьным двары ў белых фартушках, з белымі каўнерыкамі, у чырвоных гальштуках бегалі дзяўчаткі, хлопцы ў школьнай форме, выглядалі на дзіва стройна і міла. Воддаль стаяла групка дзяўчатак, яны тут былі самыя большыя, лепш адзетыя, і я зразумеў, што гэта нашы выпускніцы-васьмікласніцы.

Калі падышоў да школы, абкружанай зелянінай, дзецьмі, я яшчэ больш захваляваўся,— аж заходзілася сэрца.

Васьмікласніцы заўважылі мяне, хіхікнулі і тут жа пырхнулі кудысьці за школу: відаць, засаромеліся такога маладога, адзетага пад густ цяперашняй моды.

На лаўцы маўкліва, заклаўшы нагу на нагу, сядзеў дырэктар Іван Сямёнавіч, ля яго сядзела і ўсміхалася, загаворвала з дзецьмі Вольга Піліпаўна. Жонка дырэктара, як жартавалі настаўнікі,— гэта тайны і моцны намеснік мужа: што яна скажа,— тое і будзе ў школе. У Вялікабрытаніі ёсць каралева, але яна не кіруе. У школах-васьмігодках дырэктаравы жонкі не маюць пасад, але кіруюць.

Сёння наша «каралева» была вясёлая, усміхалася, прыемна сустрэла мяне і Ларысу, пасадзіла ля сябе, павіншавала нас з першым днём работы.

Насупраць сядзеў завуч, сёння шчокі яго былі паголеныя, белыя, аж нават сінія. Касцюм на ім таксама быў акуратны, адпрасаваны. Ля яго сядзеў стары настаўнік, якому праз паўгода ісці на пенсію; ён быў поўны, сівы, маршчыністы і выглядаў ласкавым дзядулем. Ля яго

нясмела трымалася маладая настаўніца біялогіі, якую, як мы дачуліся, прыслалі ўчора.

Гэта былі пакуль што ўсе нашы настаўнікі, новых усіх яшчэ не было.

Дырэктар махнуў рукою — з калідора выйшла на ганак пажылая тэхнічка і пазваніла сапраўды старым медзяным званком. Хоць звон быў глухі, але пачулі яго хутка. Збегліся вучні, выстраіліся, Іван Сямёнавіч устаў, прайшоўся ля дзяцей і павіншаваў іх з новым навучальным годам, уручыў леташнім выдатнікам граматы. Васьмікласнікі паднеслі кветкі, сшыткі і алоўкі першакласнікам, тыя нясмела бралі гэтыя падарункі, каторыя малыя расхваляваліся ці спалохаліся: павыпускалі кветкі на зямлю.

Стары настаўнік адвярнуўся і закрыў вочы хустачкаю, пасля павярнуўся і сказаў Ларысе, якая стаяла паблізу:

— Штогод не магу, калі ўбачу першакласнікаў. Падумаю: мае вы дзеткі, гулялі вы дасюль, былі вясёленькія, добрыя, мілыя, а гэта пачаліся для вас клопаты, і цяпер іх будзе у вас з кожным годам больш... І на ўсё жыццё...

Роўна ў дзевяць гадзін пажылая тэхнічка зноў пазваніла,— і дзеці, штурхаючыся, смеючыся, пабеглі ў свае класы; усхваляваны ад гэтых першых хвілін работы, ад слоў старога настаўніка, падаўся за імі і я. Калі зайшоў у настаўніцкую, нечакана забаяўся ісці ў клас, спалохаўся дзяцей, іх позіркаў, адчуў, што я не ведаю, што ім цяпер сказаць, як пачаць свой першы ўрок.

— Зараз пойдзеце па сваіх класах, запішаце, хто прыйшоў, хто не мае якіх кніжак,— сказаў Іван Сямёнавіч.— Сёння раз у год дазваляю рабіць тое, што хочаце.

Я заплюшчыў вочы, узяў класны журнал свайго сёмага класа і пайшоў, адчуваючы, як цяпер трэба мне сказаць дзецям нешта важнае, разумнае, не збіцца, не збянтэжыцца.

— Ні пуху ні пяра, Ларыса! — усміхнуўся я, калі ўбачыў яе.

— Да д'ябла, Павел Мікалаевіч! — махнула яна на мяне журналам — відаць, таксама хвалявалася: усё ж трэба ісці да людзей, хоць і не сталых, але чуйных і разумных.

У класе мяне чакалі — белагаловы хлапчук выцікоўваў з дзвярэй, убачыў, крыкнуў штосьці і пабег да сваёй парты. У класе зашумела, загуло, а пасля стала ціха.

Я зайшоў у клас; дзеці стаялі, усміхаліся, а то і сур'ёзна пагдядалі,— відаць, таксама хваляваліся.

Я прывітаўся з вучнямі і дазволіў ім сесці. Пазнаёміўся, сказаў, дзе вучыўся, што буду весці ў школе. Напомніў, як весці сябе на маіх уроках, прыстрашыў, што буду караць непаслушных.

— Ого! — сказаў адзін вучань і замоўк, я нават не пазнаў, хто такі смелы.

Я спытаўся у іх, дзе хто быў летам, што бачыў, што рабіў. Аказалася, многія не выязджалі нават з сваіх вёсак, былі самае вялікае ў райцэнтры, амаль усе працавалі ў саўгасе, збіралі ягады, грыбы, сенавалі, без работы не сядзелі. Чыталі мала, калі-нікалі глядзелі тэлевізар.

Я стаў гаварыць, што трэба кожнага дня чытаць, якая ад гэтага вялікая карысць; пасля я спытаўся, якіх яны пісьменнікаў ведаюць. Дружна назвалі Купалу і Коласа, той-сёй успомніў яшчэ пажылых пісьменнікаў, што пішуць цяпер, але маладых празаікаў і паэтаў ніхто не назваў. Калі я спытаўся, што такое стыль у літаратуры, то амаль усе паціскалі плячыма. Я адчуў, што прыйдзецца мне з імі працаваць ды працаваць. Відаць, нічога добрага не дало тое, што летась літаратуру ў іх вёў настаўнік фізкультуры — «дагружалі» да стаўкі.

Тады я папрасіў усіх дастаць лісткі і запісаць колькі сказаў. Паглядзеўшы іх, убачыў, што некаторыя напісалі вельмі непісьменна.

«Ёсць што рабіць табе тут, Павел Мікалаевіч»,— думаў я. Пачуў званок і адпусціў вучняў; калі ішоў з класа, успамінаў, чаго не сказаў, падумаў, што тое, нясказанае, было самае важнае, што я заўсёды такі: раблю нешта і не дараблю, як закончу, тады ўжо ўспамінаю, што забыўся, шкадую, але позна.

## 6

У школе пакуль што не знаходзілася каму весці матэматыку. Завучу, Міхасю Рыгоравічу, дазвалялі весці ўсяго дванаццаць гадзін, астатнія гадзіны матэматыкі і фізікі не вяліся, прападалі: леташні настаўнік яшчэ не прыязджаў у школу, гаварылі, бегаў па Мінску і шукаў там работу. Ды ён і не быў настаўнікам: вучыўся яшчэ толькі на другім ці трэцім курсе інстытута, працаваў паблізу лесніком, паступіў у інстытут — дык і запрасілі ў школу.

Не было настаўніка фізкультуры і працы — той, што рабіў летась, перавёўся ў другую школу, і дзеці сумавалі, хадзілі вялыя, вельмі хацелі бегаць, гуляць у футбол і валейбол. Толькі на днях прыслалі піянерважатай сёлетнюю дзесяцікласніцу, паступала ў інстытут — не паступіла, папрасілася ў школу — зарабіць педагагічны стаж.

Затое хапала моваведаў; старому настаўніку, Алесю Трахімавічу, далі трыццаць шэсць гадзін, дзве стаўкі. Налета яму ісці на пенсію,

дык зрабілі, каб яна, гэтая пенсія, была самая вялікая. Мяне «дагрузілі», нямецкай мовай, Ларысу — спевамі і маляваннем. Мы не хацелі браць, але дырэктар сказаў:

— Дзівакі, у школе няма пабочных прадметаў, усе важныя і за ўсе аднолькава плоцяць...

Ларысе пасля яшчэ даручылі і бібліятэку — выдаваць дзецям кніжкі, мне — выпускаць газету.

Зайшлі мы ў бібліятэку — і жахнуліся: тут ляжалі старыя карты, паламаныя крэслы, кнігі былі запыленыя. Аказваецца, летась не было бібліятэкара, усе настаўнікі адмаўляліся прымаць і выдаваць кнігі, дык бібліятэка была цэлы год на замку.

— Мне тут адной ніколі не справіцца,— пабедавала Ларыса,— выручай, Пашка, усё роўна табе няма чаго рабіць дома.

— А што мне за гэта будзе?— усміхнуўся я.— У інстытуце дала б канспект перапісаць, а тут мне канспекта не трэба.

— Дзякуй скажу.

— Гэтага мала.

— Тады кавай пачастую.

— І гэтага мала,— усміхнуўся я.

— А ты чаго хочаш? — спыталася Ларыса.

— Не ведаю.

— Ну дык і не мянці языком, і я табе памагу калі выпусціць газету.

— Ладна, падружым,— сказаў я.— Але паслухай, усё гэта на некім жа лічыцца, узяла ключ ты — пераходзіць усё на цябе. А ты ж па кнізе не прымала.

— І праўда,— сказала Ларыса,— так можна і ў турму сесці ці цэлы год дарэмна рабіць.

Пагаварылі мы так, параіліся — і Ларыса аддала ключ дырэктару.

Той заспакоіў, каб праверыла, прымала, што ёсць, астатняе, чаго няма, але што лічыцца, спіша. Ларыса зноў узяла ключ, мы папрасілі памагчы васьмікласнікаў і пачалі заставацца пасля ўрокаў— выносіць паламаныя крэслы, старыя партрэты, карты, табліцы, ачышчаць ад пылу і павуціння кнігі, падклейваць іх, падпісваць.

Перамацваючы кожную кнігу рукамі, я ўбачыў, што тут ёсць многа добрага, чаго я яшчэ не чытаў. На сваю радасць, знайшоў колькі тамоў Буніна і Дастаеўскага, творы якіх я вельмі тады любіў. Мы раскладалі кнігі не толькі па алфавіце, але і па аддзелах.

— Баюся, што сумна будзе,— пасміхалася Ларыса.— Трэба знайсці работу, тады ніколі не будзе сумна.

— Работа заўсёды будзе,— сказаў я,— толькі падстаўляй шыю. Гэту работу маглі зрабіць і да нас.

— Нічога, зробім і мы, а праз колькі дзён станем і кніжкі даваць, літаратурны вечар зробім.

— Ого!

— А што ж ты думаў, трэба працаваць,— сказала Ларыса,— сам чуў, як дырэктар гаварыў, што задача наша не толькі ўрокі даваць.

— Ты толькі слухай яго.

— А ведаеш, ён талковы мужчына, работу сваю знае, і толькі яму ў нашай школе быць дырэктарам.

— Я бачыў, што ён і да цябе сімпатыю мае,— усміхнуўся я,— гавораць, сын яго цяпер у войску, хутка прыйдзе, дык, можа, за нявестку ўзяць цябе думаюць.

— Не выдумляй,— замахнулася на мяне кнігаю Ларыса,— гэта цябе гаспадыня хоча за зяця ўзяць.

— Плёткі,— сказаў я, і ў мяне адпала ахвота жартаваць, я зірнуў на Ларысу: яна глядзела на мяне і ўсміхалася, відаць, была рада, што добра адпомсціла, таксама падкалола. Я паглядзеў на яе і нечакана ўбачыў, што яна добрая дзяўчына, хараством вельмі не вызначаецца, але працавітая, дбайная. Калі папросяць, то абавязкова ўсё зробіць, ніколі не спіхне на другога. Такім, як яна, падумаў я, трэба верыць, можна з імі сябраваць, і яны будуць надзейныя сябры.

— Чаго ты так на мяне глядзіш? — спыталася Ларыса.

— Так,— сказаў я і адвярнуўся, каб яна не ўведала маіх думак.

Я не вельмі любіў дасюль вялікую кампанію, бянтэжыўся, быў не вельмі смелы з дзяўчатамі, а цяпер з Ларысаю было ўсё проста, цікава, свабодна. І я зразумеў, што буду сябраваць з Ларысаю, памагаць ёй, так, як у Мінску сябраваў з хлопцамі, калі мы таксама стараліся адзін дзеля аднаго.

І тут я ўспомніў, што сёння хадзіў на пошту ў суседнюю вёску, выпадкова ўбачыў там маладую дзяўчыну і яна мне спадабалася. Асцярожна распытаўся ў сваіх вучняў, уведаў, што яна працуе на медпункце.

«Трэба парэзаць заўтра палец і схадзіць на медпункт, пазнаёміцца,— падумаў я,— нельга ж ксяндзом жыць».

— Ну, на сёння хопіць,— сказала Ларыса,— пагаруем яшчэ колькі дзён і зробім усё.

Ларыса замкнула на замок бібліятэку, і мы пайшлі ў настаўніцкую, паслухалі пласцінку Магамаева, Татляна, Мар'янавіча, «Песняроў», я хацеў паслухаць яшчэ маскоўскі «Спартыўны дзённік», але Ларыса пацягнула мяне дамоў, напомніла, што нашы гаспадыні могуць

злавацца, што мы позна бадзяемся, не даём ім спаць. Мы памаракавалі на сваё кватаранцкае жыццё, выключылі радыёлу, святло, замкнулі школу і пабеглі дамоў.

Нам было па дарозе, я падвёў Ларысу да яе сянец, развітаўся і падаўся агародамі дадому, адчуваючы, што мы пасябравалі, будзем памагаць адно аднаму. І гэта добра! Тады бачыш, што ты не адзін жывеш на свеце, можна з некім параіцца, пабыць разам. І табе хтосьці, калі трэба будзе, паможа ў любую часіну.

## 7

Калі я папрацаваў два месяцы, то першымі асяклі мяне, спусцілі з неба на зямлю дзеці: няўважліва слухалі, уцякалі з урокаў, а шасцікласнік Саша смела заявіў, што за трактарыста вывучыцца і без маёй мовы і літаратуры.

І зусім адчуў я сябе простым настаўнікам, звычайным працаўніком, такім, як і ўсе, калі вярнуўся ў школу з першых сваіх асенніх канікулаў.

Я правінаваціўся, дапусціў для школы вялікі грэх. На асенніх канікулах я паехаў у сваю родную вёску, да бацькоў, пагуляў з сябрамі, з якімі дружыў многа гадоў.

У раённы горад вярнуўся раніцою, спадзеючыся трапіць у свае Міланькі першым аўтобусам. Але вечарам і ноччу ішоў вялікі дождж, наліў вады, дарогі размоклі, і аўтобус не выйшаў нават з горада.

Я пабег на шашу і стаў прасіцца на машыны. Пакуль я дачакаўся міланьскай грузавой, даехаў, то ў школу было ўжоісці позна. Я і не пайшоў, пакінуў у гаспадароў сумку і рашыў даведацца, як даехала Ларыса. Яе бацькі жылі таксама далёка адсюль.

Ларыса не спазнілася, аказваецца, яна была хітрэйшая, прыехала за дзень да работы і паспела даехаць аўтобусам. Яна і сказала, што ўзлаваўся на мяне дырэктар, узлавалася яго жонка. Ларыса абараняла мяне і паспрачалася з ёю.

— Навошта? — спытаўся я.— Я і сам сябе абараню.

Ларыса прамаўчала, адвярнулася.

— Чаго ты? — здзівіўся я.

— Нічога,— сказала яна,— памажы мне праверыць сшыткі.

Я здзівіўся, заўважаючы, што апошнім часам неяк дзіўна стала адносіцца да мяне Ларыса — былая мая аднакурсніца: старалася паменей сустракацца і гаварыць са мною, быццам чаго злавалася.

— І моцна лаялі мяне? — спытаўся я.

— Ды добра заўтра ўляціць.

— Можа, уляжацца за ноч злосць...

— Расклад новы павесілі,— сказала Ларыса.
— Трэба схадзіць паглядзець свае ўрокі,— сказаў я,— а то прыйду заўтра без планаў — зусім прапаў. Не хочаш прайсціся са мною?
— Пайшлі,— згадзілася Ларыса.— Адзін баішся?
— Пры табе не так лаяць будуць,— усміхнуўся я,— хоць дырэктара не павінна ўжо ў настаўніцкай быць.
Ларыса апранулася, і мы пайшлі.
— Ну, што ты рабіў дома? — спыталася яна.
— Весяліўся, адпачываў,— сказаў я.
— А я сумавала, мне хацелася ў школу.
— А я і яшчэ тыдзень не супраць быў пагуляць,— прызнаўся я,— кароткія асеннія канікулы...
— І цябе зусім не цягнула сюды? — здзівілася яна.
— Не вельмі,— прызнаўся я.
— Халодны ты чалавек.
— Да каго? Да цябе? — пажартаваў я.
— Чаму — да мяне? Да школы.
— Школу я люблю,— сказаў я,— ну, можа, яшчэ не люблю, толькі паважаю, але хутка буду і любіць. А ты палюбіла?
— Палюбіла,— сказала Ларыса і так уважліва паглядзела на мяне,— і яшчэ тое-сёе палюбіла.
— Калі не сакрэт, то што?
— Не што, а каго,— паправіла мяне Ларыса,— ты мовавед і гавары правільна.
— Дык каго вы палюбілі, Ларыса Іванаўна?
— Вас, Павел Мікалаевіч.
— Што-о-о? Пяць гадоў вучыліся разам, нават не глядзела на мяне,— сказаў я, ведаючы, што Ларыса сябравала з многімі хлопцамі, але непадоўгу.
— Можа, ты гэтага не бачыў.
— Можа,— сказаў я,— але я другое бачыў...
— Ну, ладна, хопіць блазнаваць,— перапыніла мяне Ларыса,— прыдумвай, як апраўдацца. Чуеш, у настаўніцкай радыё гаворыць? Дырэктар, калі адыходзіць, то выключае. Гавораць, ён нават гадзіннік на ноч спыняе, каб не зношваўся механізм.
Я ведаў, што любіць слухаць музыку і прыбіраць настаўніцкую тэхнічка, цётка Каця.
«Яна, відаць»,— вырашыў я і не падумаў нават, што можна сказаць, калі ў настаўніцкай будзе Іван Сямёнавіч. Калі затрымаўся завуч Міхась Рыгоравіч, то не бяда: чалавек ён памяркоўны, нават

чулы, як я зразумеў, прыдзірацца не любіць, ён нават на ўрокі не так часта ходзіць, як дырэктар.

Я штурхнуў дзверы,прапусціў Ларысу, зайшоў сам,— і разгубіўся, як школьнік: на канапе, паклаўшы нагу на нагу, сядзеў і чытаў газету Іван Сямёнавіч, побач дыміў цыгарэтаю, правяраў сшыткі Міхась Рыгоравіч. Відаць, школьнае начальства затрымалася, каб удвух пагаварыць пра нешта важнае.

Я прывітаўся. Міхась Рыгоравіч кіўнуў галавою, не глянуў на мяне і пачаў спехам укладваць у сваю сумку сшыткі. Ён не правяраў іх, як і не чытаў газеты дырэктар, бо трымаў яе дагары.

Я ведаў, што мяне зараз будуць лаяць, і мне было непрыемна, нядобра. Я ўзяў са стала чысты лісток і стаў перапісваць свае заўтрашнія ўрокі. Калі будуць маўчаць, падумаў я, перапішу і вышмыгну з пакоя. Да заўтрашняга злосць уляжацца, ды і нейкую адгаворку выдумаю.

— Чаму не былі сёння ў школе, сарвалі наш распарадак, Павел Мікалаевіч? — дырэктар зняў акуляры, адлажыў газету, сур'ёзна глянуў на мяне.

За гэтыя два месяцы я крыху ўведаў яго: пажылы, разумны, вельмі любіць, каб усе яго слухалі і нават пабойваліся. Любіць пасмяяцца і вельмі задаволены, калі і ты смяешся, хоць і з сябе. Цяпер ён нават не прывітаўся са мною, і гэта мне не спадабалася.

— Не пайшоў сёння раніцаю аўтобус, я і застаўся ў горадзе. Цяпер на грузавой даехаў,— сказаў я праўду.

— Яна ж паспела,— прамовіў Іван Сямёнавіч і кіўнуў на Ларысу.

— Я спадзяваўся на гэты аўтобус.

— А яна не спадзявалася, раней прыехала,— сказаў Іван Сямёнавіч, устаў, нібы хацеў яшчэ здзівіць мяне сваім вялікім ростам,— Як мы цяпер будзем дакараць вучняў, калі настаўнікі самі не прыходзяць на ўрокі.

— Не мог жа я пяшком прыйсці, паспець на ўрок,— апраўдваўся я.

— Чулі вы, Міхась Рыгоравіч? — глянуў дырэктар на завуча.— Я трыццаць тры гады раблю ў школе і ніколі не спазніўся на ўрок. Ці мяцеліца круціла, ці дождж ліў, ці добрыя, ці благія дарогі былі. А гэта— цэлы дзень прапусціць!

Міхась Рыгоравіч таксама глядзіць на дырэктара, згаджаецца з ім. Сёння мне завуч не падабаецца: нyголены, белы гузік на ягонай белай кашулі прышыты чорнаю ніткаю. Цяпер я прыгадваю, што ён часта прыходзіць у школу з зарослымі шчокамі і барадою.

— Раней, адразу пасля вайны, калі аўтобусы зусім не хадзілі, я на ўсе сходы, канферэнцыі пяшком праз дзень у раён шмыгаваў. А моладзь наша праскочыцца для здароўя адзін раз лянуецца! — абураўся Іван Сямёнавіч.

— А я,— цмокае, пачынае ўспамінаць Міхась Рыгоравіч,— я кожнага дня за сем вёрст на работу хадзіў. Іду, снег па пояс, холадна. Змерзну, прыйду ў школу — журнала не магу ў рукі ўзяць. Правяду пяць-шэсць урокаў — дадому, да сям'і бягу, бо яшчэ трэба нешта і дома зрабіць. А што я тады атрымліваў? Ды якія тады грошы былі? Воз дроў каштаваў чатырыста рублёў... І жылі, не бедавалі, не плакалі, яшчэ і весела было...

— Бестурботнасць,— сказаў Іван Сямёнавіч.— Няма той сур'ёзнасці, якую разумелі мы, якой ад нас патрабавалі. Ніякай сталасці, ніякай боязі. Адны гулі ды танцы ў галаве. А дзе Карчагіны, Матросавы?..

— Затое фамусавы ды малчаліны ёсць,— сказала Ларыса.

— Не тая цяпер моладзь, што да вайны была,— як не пачуў яе дырэктар і стаў апранацца, зняў з вешалкі сваё доўгае, да самых костачак паліто, зусім старое, з абцёртым, аблінялым каўняром. І вушанцы яго было гадоў болей, як мне.

— Не тая,— згадзіўся Міхась Рыгоравіч,— Мы...

— На першы раз сам прыдумай сабе кару,— паказаў на мяне дырэктар пальцам.— На другі — падумаю я. А ты, Рыгоравіч, вылічы яму за гэты дзень.

— Вылічу,— сказаў завуч,— заўтра буду табель складаць.

Дырэктар апрануўся і павольна, як гаспадар, выйшаў з настаўніцкай, з намі не развітаўся.

— Мядзведзь, а не чалавек!— абурыўся Міхась Рыгоравіч.— Цярпець не магу такіх людзей, як ён. Ён «ні на адзін урок не спазніўся!» Каб ты жыў толькі! Бывала, нібы на сход едзе, а на самай справе нешта сваё робіць. Я ж чалавек, сам ведаю, што значыць у такое мокрае і халоднае надвор'е трыццаць кіламетраў адмахаць.

— Хай бы закінулі сваё слова,— сказала Ларыса.

— Хіба ён мяне паслухае? — усклікнуў Міхась Рыгоравіч.— Ён толькі сваю жонку слухае. О, яна пілка харошая! І грошы яна загадала вылічыць. Што тут вылічаць, калі вы, маладыя, і так мала палучаеце...

— І тут вы маглі заступіцца,— сказала Ларыса.

— Што я памагу? — хадзіў па пакоі і апраўдваўся Міхась Рыгоравіч.— Не тыя гэта людзі, што некага паслухаюць. Да вас тут многа маладых настаўнікаў прыязджала, і ніхто не затрымліваўся: не мог дагадзіць,— то не так глянуў на іх, не так сказаў...

— А вы працуеце,— сказала Ларыса.

— Што я? Па мне яны няхай што хочуць робяць...

— Вось яны і робяць, што хочуць, бо мы ўсе маўчым ці баімся іх,— сказала Ларыса, і я здзівіўся, якая яна смелая.

Міхась Рыгоравіч асекся, замітусіўся, стаў збірацца дамоў, перамяніў гутарку, спытаўся, як я гасцяваў дома.

— Перажываеш? — спыталася Ларыса, калі мы развіталіся з завучам і засталіся адны.

— Чаго перажываць, усё правільна,— сказаў я.

— Гэта калі мы былі студэнтамі,— вучыліся, адкрывалі для сябе ўсё больш і больш новага,— для нас адкрывалася неабсяжнае, і мы сябе лічылі вялікімі, незалежным!, а цяпер усё проста: мы — радавыя работнікі, павінны працаваць і падначальвацца дырэктару, дырэктар — раёну, раён — вобласці. І нічога ў нашай рабоце няма геройскага, кожны дзень адно і тое ж.

— Так,— сказаў я,— мы — маленькія людзі, настаўнікі.

— Ну, не маленькія,— не згадзілася Ларыса,— прафесія наша пачэсная, і мы ўсіх вялікіх, міністраў і лаўрэатаў, вучылі і цяпер вучым будучых. Дык я пасля гэтага — маленькі чалавек?

— Ну, ладна, Ларыса Іванаўна,— сказаў я,— хопіць дыскусій, надакучылі яны мне ў інстытуце. Здаецца, дарэмна ты сёння прыдзіралася да Міхася Рыгоравіча.

— Не падабаецца ён мне,— сказала Ларыса,— ён падобны на айсберг — большая палавіна яго пад вадою, а не на паверхні. Ты прыгледзься толькі добра.

## 8

Есці не хацелася, не было што сёння рабіць, чытаць таксама ахвота не брала, таму я не пайшоў дамоў, а завярнуў да Ларысы.

Вечарэла. Выяснівалася неба — значыць, ноччу падхопіцца марозік, сцягне ваду, убеліць аселіцу. І добра будзе: можа, стане сушэй, можна будзе спакойна хадзіць па вуліцы, а не па гародах.

— Во трапілі мы з табой, Ларыса, у вёсачку! — кажу я.— Бадай, інстытута не варта было канчаць, каб ехаць сюды. Што мы тут бачым? Куды выйсці, што рабіць пасля школы?

— Неяк жа жывуць людзі,— усміхнулася Ларыса.

— Вось так і жывуць. Працуюць, пад'ядуць і спаць кладуцца.

— Сказаць табе сакрэт?

— Ну, скажы.

— А я прыехала ў раён наш, у школу гэтую толькі таму, што прыехаў сюды ты. Загадчык мяне ў дзесяцігодку пасылаў, а я кажу: «Не, пасылайце ў Міланькі, больш нікуды не паеду».

— Што гэта значыць? — насцярожыўся я.

— А вось тое і значыць,— усміхнулася Ларыса.— Якія вы, мужчыны, нездагадлівыя, сляпыя!..

— Ты, Ларыса, здзіўляеш мяне,— сказаў я і падумаў, што недарэмна яна гэта ўсё кажа, штосьці недагаворвае, і яна не жартуе, даўно ўжо нешта збіраецца сказаць. Здаецца, калі добра прыпомніць, нават у інстытуце падыходзіла да мяне, жартавала, падбівала на нейкую адкрытасць.

— Сказаць табе яшчэ што-небудзь?

— Ну, скажы,— згадзіўся я і захваляваўся.

— Еду я на канікулы дамоў — і не хочацца мне ехаць, так сумна стала, што ледзь не плачу.— (Я з палёгкаю ўздыхнуў: Ларыса расказвала пра сябе.) — Прыехала, сыходжу з аўтобуса — Віктар сустракае, кланяецца, капялюш здымае перада мною, чамаданчык з рук забірае. Ты ж Віктара помніш, ён летась філфак канчаў.

— Помню. Гавораць, у вас вялікая любоў была. Нават збіраліся жаніцца.

— Не выдумляй,— злуецца Ларыса.— Я адразу ўбачыла, што ён за чалавек, яшчэ летась. Я ж ведала, колькі ён дзяўчат падмануў. Райка з біяфака нават дзіця ад яго чакала...

— А цябе вось не забывае...

— Ды я ж табе гавару: сустракае, такі рады, нават буську ў шчаку даў, пытаецца: «Дык дзе ж твой фраер?» — «У аўтобусе»,— кажу. Адскочыўся, пазыркаў. Бачыць — няма. Зноў да мяне.

— Што за фраер? — пытаюся я.

— Хвілінку пацярпі, зараз скажу,— усміхаецца Ларыса.— Гавару яму: дзякую, да свайго дома дарогу ведаю, так што праводзіць мяне не трэба.

— Я цябе столькі чакаў,— ліслівіць ён,— я так каяўся за наша мінскае... Ты даруй, я цябе толькі адну люблю, а за тое прабач... Які чалавек не памыляецца...

— Памірыліся? — цікаўлюся я.

— Ды ты слухай,— нервуецца Ларыса,— а то не буду расказваць.

«Бяда вялікая,— падумаў я,— такіх раманаў я тысячу чуў. Банальна і пошла».

— Я яшчэ сказала, каб не ішоў,— ідзе, усё выбачаецца, ліпне,— працягвала Ларыса.— Заходзім дамоў. Гляджу: маці, бацька, дзядзькі мае, цёткі сядзяць, прыбраныя, вычасаныя. Я ўсміхнулася, павітала-

ся. На Віктара глядзяць, таксама ўсміхаюцца — ён жа з суседняй вёскі, тутэйшы, дык яго ведаюць. Маці нават не дала мне распрануцца, адразу пацягнула за руку ў другую палавіну. «Шэльма,— ледзь не трасе мяне за валасы,— напалохала ты нас са сваім Пашкам! Думаем з бацькам, што яшчэ за Павел Мікалаевіч, адкуль ён узяўся?..»

— Не разумею,— здзівіўся я.

— Пачакай,— усміхаецца Ларыса,— усё раскажу. Абураецца маці мая, крычыць на мяне: так напалохаць. Думалі, што здурнела я: не парабіла і двух месяцаў — і замуж ужо задумала выскачыць за незнаёмага чалавска. А які ён? Стары, малады, п'яніца, гультай? Крычыць маці, што дала б веніка і мне, і Паўлу Мікалаевічу...

— Дзівосы, Ларыса! Мне ажно не верыцца.

— Я ўсміхаюся,— працягвала Ларыса,— і гавару: праўда, ёсць такі Пашка, Павел Мікалаевіч, мы з ім разам вучыліся пяць гадоў, цяпер разам працуем у адной школе, збіраемся пажаніцца... Ехалі разам да Мінска, пасля ён пасаромеўся ехаць са мною, да сваіх бацькоў павярнуў.

— Цэлы дэтэктыў,— адмахваюся я,— не хапае яшчэ, каб твая маці прыехала паглядзець на зяця... Чаго ты ўсё гэта выдумала, Ларыса?

— Мне і маці гаворыць: не дуры, дзеўка. Ходзіць да цябе Віктар, бярэ — дык і ідзі. Чалавек тутэйшы, знаёмы, будзеце рабіць у яго вёсцы, вучыць дзяцей. І нам блізка будзе наведвацца.

— Твая маці і праўду кажа,— згаджаюся я,— тут ты не выйдзеш замуж за настаўніка.

— Дык вось я маме сваёй і кажу: не люблю, мамачка, я яго, ненавіджу. Калі падыдзе да мяне Віктар, дык мяне калоціць. Бывае ж, што іншага чалавека цярпець не можаш, такі ён табе працаўны. «Не дуры, дзеўка, галавы,— кажа маці,— а чаго цябе Віктар сустрэў, чаму разам у хату прыйшлі?» — «Ненавіджу я яго, мама».— «А чорт вас разбярэ,— узлавалася маці,— рабіце самі, што хочаце, хто цяпер бацькоў слухае...» — Сказала, махнула рукою і пайшла, прамовіла ў другой хаце: «Падманула нас...»

— І чаго ты бацькоў злуеш? — спытаўся я.

— А ты не здагадваешся? — перапытала Ларыса.— Не? Тады скажу я. Думаю, напішу дамоў, што прыеду з табою — бацькі скажуць сваякам, тыя — сваім родзічам... Так і да Віктара дойдзе — і адчэпіцца ён ад мяне.

— А чаму ты іменна выбрала мяне ў «жаніхі»?

— А каго я больш ведаю? Ды і Віктар цябе знае, можа, паверыць лепш.

— Ну і паверыў ён табе?

— Відаць, паверыў,— сказала Ларыса.— Загаворваў, прасіўся, але я сказала: «Ідзі і больш мне на вочы не трапляйся, не пераходзь дарогі».

— Дык ты цяпер свабодная?..

— Паўлік!

— Усё, Ларыса Іванаўна, больш не буду,— схамянуўся я, не стаў больш жартаваць,— але ўсё ж ён цябе, відаць, любіць.

— Ты думаеш? Не. Яго мучыць, што я не паддалася яму, што знайшлася адна, якой не засляпіла вочы яго краса, не спакусілі яго абяцанні...

Мы памаўчалі.

— Зайсці вечарам да цябе? — спытаўся я.

— Заходзь,— сказала Ларыса.— Ты ж ведаеш, што адной вельмі сумна.

«Дзівосы! Сапраўднае кіно!— думаў я.— Ларыса магла і не пісаць дамоў пра мяне, яна, можа, сказала гэта толькі мне, што я падумаю, што скажу... І Віктар... Недарэмна яна расказала мне пра яго. Няўжо яна?.. Не ведаю, не ведаю. Толькі я жаніцца яшчэ не думаю, так што, дзевачкі, не пераходзьце мне дарогі!..»

Прызнацца, усё ж Ларысіны расказы мяне збянтэжылі. Я адчуў, што спакой мой прапаў, кожны новы дзень будзе прыносіць мне нешта новае. І Ларыса стане мне не толькі калегам па рабоце, але яшчэ і блізкім чалавекам. І невядома, ці трэба ўсё гэта: нешта гляджу я на яе холадна і абыякава — мо і таму, што Ларыса — не красуня вялікая, не такая ўжо прываблівая ў яе постаць, звычайная, як кажуць, дзяўчына. А можа, нічога Ларыса пра мяне не думае, можа, я сам усё прыдумаў ці хачу прыдумаць?

Так я разважаў, пакуль не зайшоў у сваю хату і не павітаўся з гаспадыняй, якой я не бачыў цэлы тыдзень. Апошнімі часамі я стаў яе чагосьці саромецца, губляцца, мітусіцца перад ёю, калі дачуўся ад людзей, што мяне хочуць ажаніць. Людзі сказалі па сакрэце Ларысінай гаспадыні, гаспадыня — Ларысе, а Ларыса сказала мне, нават падкалола: «Жаніся, твае гаспадары — людзі грашовыя. Гавораць, на кніжцы многа грошай маюць. Хатка, хлявок, кароўка, свінні, лазня ёсць. Сам заробіш добра ў школе, жонку ў сталовую ўладкуеш — чаму не жыць? А там, глядзі, дырэктарам станеш, і капейка большая будзе, і павага...»

— Ну, як вы тут жывяце? — спытаўся я ў гаспадыні.

— Якое наша жыццё? Гаспадарскае, топчамся дзень пры хаце,— сказала гаспадыня, села на ўслончыку.— А вы дзе на канікулах былі? Што новага бачылі?

— У бацькоў быў.

— Што там чуваць? — гаспадыня, маршчыністая, акуратная, глядзіць на мяне, і я не магу вытрымаць яе позірку, апускаю вочы.

— Таксама ходзяць дзень пры хаце.

— Маці, можа, папраўілася крыху?

— Папраўілася,— прамовіў я.

— А людзі кажуць, што вы дома не былі.— І гаспадыня зноў пільна глядзіць на мяне.

— А дзе ж я мог быць?

— Гавораць, што вы з Сямёнішынай настаўніцай да яе бацькоў ездзілі.

— Чаго гэта? — усміхаюся я.

— Гавораць, што вы жаніцца думаеце, ходзіце разам у школу, са школы, вечарам падоўгу праседжваеце. Да другіх настаўніц і не заглядаеце.

— Я ж іх мала ведаю яшчэ, а з Ларысай Іванаўнай я разам вучыўся.

— Канечне, вы— маладыя, адукаваныя, вясковай якой дзяўчыны браць не будзеце, вам толькі настаўніца можа быць параю...

— Ды не думаю я яшчэ жаніцца! — усміхаюся я.— Нешта выдумляюць людзі, а вы верыце ім.

— Дыму без агню не бывае,— кажа гаспадыня, паднімаецца і ідзе на кухню, гаворыць сама сабе.— Пашчасліваіла во дзеўцы...

## 9

— Добра вы даяце ўрокі,— гаварыў Міхась Рыгоравіч (ён толькі што хадзіў са мною ў сёмы клас),— у вас свежыя веды, добрая мова; я ўжо не ўмею так чыста гаварыць, слова на адной мове, слова на другой. Вось яшчэ вопыту ў вас мала, і гэта відаць: што трэба зрабіць за хвіліну, вы робіце за пяць, пра што трэба болей гаварыць, вы абмінаеце.

— Вопыт прыйдзе,— сказаў стары настаўнік Алесь Трахімавіч, які чуў, як завуч разбіраў мой урок,— Вось калі ведаў няма ці чалавек не папаўняе іх, тады і вопыт не выратоўвае. На нашай рабоце трэба самому вучыцца, вучыцца і вучыцца, тады і дзеці слухаць будуць і паважаць. Як перастаў чытаць, дык і пакаціўся назад, як воз з гары...

— Добра дае ўрокі, добра,— пахваліў Міхась Рыгоравіч,— па-цяперашняму, па-праблемнаму. Ужо як будзе якая праверка, то мы

будзем на вашы ўрокі інспектараў пасылаць. Гэтыя новыя праграмы — гора для нас. Сучасны ўрок, праблемнасць, пошукавы метад... Прымяні ты яго, калі наш вучань простай задачы не рошыць; вось рашаем колькі дзён задачы на яблыкі, раблю кантрольную, тое ж самае дзеянне, толькі ўжо гутарка пра слівы. Усё роўна ёсць двойкі. Рашалі ж, кажу, на падобнае дзеянне. А яны мне сваё кажуць: «А мы на слівы не рашалі, толькі на яблыкі...»

— Бо вучым іх па-старому,— сказаў Алесь Трахімавіч,— як мы дасюль вучылі,— яны мала думалі, спісвалі, паўтаралі за намі. А новыя праграмы, праблемнасць вучыць іх думаць, мысліць. І дарэмна мы, старыя, баімся гэтага...

— Анекдот адзін,— усміхнуўся Міхась Рыгоравіч.— У настаўніка адной васьмігодкі нашага раёна пытаецца інспектар: «Ну, як у вас з новымі праграмамі, праблемай?» А ён: «У мяне ніякай праблемы няма, дзеці ціха сядзяць...»

— Такі настаўнік навучыць! — сказаў Алесь Трахімавіч.— Ён мучыць недзе, а не вучыць. Каб жа адзін ён такі...

— Так, трэба цяпер рабіць па-новаму,— сказаў Міхась Рыгоравіч, і я здзівіўся, як ён мяняецца; адно гаворыць, а хтосьці запярэчыць — ён тут жа адмаўляецца ад сваіх слоў, падтрымлівае іншага, і так ніколі ён не абароніць сваёй думкі, заўсёды згаджаецца з другімі. За гэта яго не любіць Ларыса, гаворыць, што трэба асцерагацца такіх людзей; вось Алесь Трахімавіч скажа, што думае, будзе адстойваць сваё, сваё скажа і Іван Сямёнавіч, хоць не раз думае, што сказаў лепш за ўсіх, а вось Міхась Рыгоравіч падумае яшчэ, што сказаць, а то і не скажа свайго, пачакае, пакуль выгаварацца іншыя.

— Ну, добра,— кажа Міхась Рыгоравіч,— Паўлу Мікалаевічу мы дадзім зрабіць даклад пра сучасны ўрок, але вось нядобра, што ён у вялікім даўгу перад намі...

— У якім? — насцярожыўся я.

— Не здагадваецеся? Нядобра, нядобра, Павел Мікалаевіч,— паківаў галавою завуч.— Атрымалі першыя дзве палучкі, першы год робіце ў школе, уладкаваліся на кватэры...

Я зразумеў яго, усміхнуўся.

— Сухія вашы грошы будуць, пагрызуць іх мышы,— сказаў Міхась Рыгоравіч.

— Мы ж настаўнікі, і нам нельга...— пачаў я.

— Хто сказаў? — перабіў Міхась Рыгоравіч.— Мы ж таксама людзі, і нішто чалавечае нам не чужое... Калі я адрабіў, хто не дазволіць мне рабіць тое, што я захачу? Абы ўсё добра было,— ён хацеў яшчэ нешта

сказаць, але ўбачыў, што ў школу ідзе маладая дзяўчына, прамаўчаў, дачакаўся новага чалавека.

Мы таксама ўсе замоўклі, сталі чакаць у настаўніцкай гэтай дзяўчыны. Яна штосьці спыталася на калідоры ў тэхнічкі, пасля пастукала і зайшла.

— Добры дзень,— сказала яна,— я да вас. Мяне накіравалі весці фізкультуру.

— Добра,— сказаў завуч.— Як вас зваць?

— Наташа.

— Мы так не называем,— усміхнуўся завуч.

— Наталля Васільеўна.

— Во, гэта па-нашаму. Мы вас чакалі, але цяпер дырэктар дома, падыдзіце да яго, ён вам паможа на кватэру стаць, бо я толькі завуч, такіх спраў не рашаю.

Тая падзякавала і пайшла.

— Во нашаму Паўлу Мікалаевічу жніво!— усміхнуўся Міхась Рыгоравіч,— Халасцяк адзін, а дзяўчат ажно чатыры: і Ларыса Іванаўна, і біялагіня, і піянерка, і фізкультурніца...

Я засаромеўся і нічога не адказаў.

— Не драмі, Мікалаевіч, ніколі не забывай, што ты мужчына, певень, так сказаць,— Міхась Рыгоравіч зарагатаў, ажно ўзяўся за бакі.

— Не трэба, Міхась Рыгоравіч,— сказаў Алесь Трахімавіч,— Павел Мікалаевіч — сціплы чалавек, малады. У яго яшчэ ўсё наперадзе...

— А я і не кажу яму жаніцца,— сказаў Міхась Рыгоравіч,— певень ля ўсіх курак паходжвае, адной не выбірае, бо другія задзяўбуць, а нашы дзяўчаткі харошыя, павесяліцца можна. Я ў яго гады...

Я засмяяўся, але нічога не сказаў.

— Але мы не кончылі гутаркі пра сучасны ўрок,— сказаў Міхась Рыгоравіч,— праз пятнаццаць хвілін закрываецца магазін...

Праз паўгадзіны Міхась Рыгоравіч, Алесь Трахімавіч і я сядзелі ў маёй кватэры, гаспадыня падала нам на стол, што мела, астатняе я дастаў са сваёй сумкі, з якой хадзіў нядаўна ў магазін.

— Люблю пасля работы пасядзець з калегамі, пагаварыць,— хрумстаў агуркі і гаварыў Міхась Рыгоравіч.— Ужо суседзі мае не тое, у іх свае гутаркі, клопаты... А вы, Павел Мікалаевіч, не бойцеся, за гэта не прагоняць з работы, мы ж пасля працы сядзім, не сварымся, не б'ёмся...

— Але ўсё роўна гэтага не ўбачаць за аграномам, інжынерам, а заўсёды убачаць за настаўнікам,— сказаў Алесь Трахімавіч,— Тое, што даруюць людзі ім, нам не даруюць.

— Бо вы настаўнікі,— сказала мая гаспадыня.

— Настаўнікі!— міргнуў вокам завуч.— Не абы-хто, а — настаўнікі!

— А я зайздрошчу маладым,— сказаў Алесь Трахімавіч.— Цяпер добра жыць. А як пачынаў я... Сорак год таму прыехаў я ў гэту вёску, вучылі дзяцей па хатах, адзін клас тут, другі — там... Але працавалі, весяліліся, раскулачвалі тутэйшых багацеяў, а калі і не спалі ноччу дома, хаваліся ад кулакоў...

Міхась Рыгоравіч успомніў каторых з кулакоў, і яны з Алесем Трахімавічам сталі гаварыць пра іх, пра той час, пасля ўспомнілі вайну, як партызанілі, і заспрачаліся: адзін даказваў, што ў гібелі атрада вінаваты нейкі Івашынаў, а другі даказваў, што прадаў людзей ворагу нехта другі...

Я сядзеў і слухаў іх, а яны не бачылі мяне, успаміналі, спрачаліся, і ўсё гэта было крыху тлумна, надакучліва, бо мая гаспадыня даўно ўжо махнула рукою і пайшла ў другую палавіну.

— Памыляешся, Міхась Рыгоравіч!

— Не, гэта вы забыліся, Алесь Трахімавіч!

— Пагаварыце вы што пра цяперашняе,— увайшла і сказала мая гаспадыня,— вы ўжо колькі гадоў пра гэта спрачаецеся, ніхто добра не ведае, хто выдаў тых людзей. А хлопец во сядзіць адзін і не ведае, каго слухаць.

— А і праўда,— сказаў Алесь Трахімавіч,— давайце пагаворым з Паўлам Мікалаевічам, а то яму сумна.

— Гаварыце пра сваё,— сказаў я,— на мяне не глядзіце, я ж тут гаспадар.

— Во і добра,— усміхнуўся Міхась Рыгоравіч,— а вы, Іванаўна, не ўпусціце яго, хлопец добры, разумны, ды і палучае някепска, і ваша Лена — дзяўчына харошая, будуць жыць, як за пазухай у Езуса. Пакуль яшчэ жывяце, дык і ўнукаў падгадуеце.

— Ды ён адукаваную хоча знайсці,— прабубніла гаспадыня.

— Вашай Ленцы і адукаваныя ні красою, ні розумам не дакажуць,— сказаў Міхась Рыгоравіч. Алесь Трахімавіч маўчаў.

— Разумная, але дыплома не мае. Ён да Сямёнішынай настаўніцы ходзіць, тая мае паперы.

— На што табе Ларыса тая? — перайшоў да мяне на «ты» Міхась Рыгоравіч.— Падумай добра: тут у цябе і хата будзе, і ў хаце, і хлеў, і у хляве — што сыр у масле будзеш плаваць. А як з тою станеш на ногі? На зарплату цяжка жыць будзе, бо ні двара, ні кала няма...

— Ды я не думаю яшчэ жаніцца,— сказаў я.

— Во гэта ён і мне гаворыць,— сказала гаспадыня,— а сам штовечара да яе бегае.

— Угамонім,— сказаў Міхась Рыгоравіч і падміргнуў гаспадыні, тая паднялася і падалася ў бакоўку.

— Не трэба так, Рыгоравіч,— папрасіў я.

— Маўчы,— сказаў ён.— Жэнішся ці не жэнішся, а пажыві, паплавай ды і Ленку калі-нікалі па галоўцы пагладзь, спраўная дзеўка. Смялей толькі, адзін раз на свеце жывём; што ўхопім — тое і наша...

Вярнулася гаспадыня, прынесла дамашняга піва.

— Хопіць на сёння,— сказаў Алесь Трахімавіч, але завуч не паслухаў яго, разліў піва ў шклянкі. Мы выпілі, і я пабаяўся, каб сёння для мяне ўжо не было замнога.

## 10

Міхась Рыгоравіч і Алесь Трахімавіч зноў успомнілі вайну, заспрачаліся за партызанства, цяпер закранулі і Івана Сямёнавіча.

Мне хацелася запярэчыць, абараніць дырэктара, але яны лепей ведалі адзін аднаго, таму я толькі аднойчы ўмяшаўся.

— А мне здаецца, што Іван Сямёнавіч перажывае за работу, добры дырэктар і чулы чалавек.

— Ты яшчэ ўбачыш яго чуласць,— гаварыў Міхась Рыгоравіч,— ох, яшчэ адчуеш яго чуласць!..-

«Вось і разбярыся ў людзях,— падумаў я,— Сябе ўсе хваляць, а другіх ганяць».

Пасля яны зноў успомнілі пра мяне, што я выкладаю літаратуру. Міхась Рыгоравіч палажыў мне руку на плячо і сказаў:

— Я люблю літаратуру. І нашу, і рускую. Я сам некалі пісаў, добра яшчэ помню дзейнік і выказнік... дапаўненні розныя... Папрасі яшчэ ў гаспадыні, падыдзі, яна табе дасць.

— Не, не, Міхась Рыгоравіч, хопіць,— устаў Алесь Трахімавіч,— я больш не буду.

— Па адной яшчэ толькі.

— Не, не!— адмаўляўся Алесь Трахімавіч, і я быў з ім згодзен.— Пасядзелі, пагутарылі, пара і дадому. Ці ж мы хаткі не маем, што людзём надакучаем, як пяецца?

Міхась Рыгоравіч хацеў яшчэ застацца, міргаў мне, але Алесь Трахімавіч пацягнуў яго дамоў. Я выйшаў іх праводзіць.

— Зойдзем да Ларысы Іванаўны,— сказаў Міхась Рыгоравіч,— яна павінна нас пачаставаць.

— Ні ў якім разе! — адмовіўся Алесь Трахімавіч.— Такім нам больш нікуды не трэба хадзіць, трэба ісці толькі дамоў. Трэба ж,

Рыгоравіч, ведаць сваю меру, вы колькі разоў ужо ад гэтага цярпелі, што не ўмелі сябе ў рукі ўзяць. Пасля і ў школе брыдка будзе, і дзецям у вочы сорамна будзе глянуць, і людзі абы-што гаварыць будуць...

Міхасю Рыгоравічу гэта не падабалася, і ён употайкі перадражніваў свайго старога калегу.

Я правёў іх яшчэ крыху, паслухаў, як спрачаліся Міхась Рыгоравіч і Алесь Трахімавіч, развітаўся з імі і павярнуў дамоў. Нечакана мне захацелася зайсці да Ларысы, і я не стаў разважаць, мне было весела і радасна, я пайшоў да яе.

Падняўся на горку, убачыў знаёмую зялёную лаўку, на якой мы часта сядзелі, і мне стала добра, што ёсць такая Ларыса, ёсць да каго выйсці. Прайшоў далей, убачыў ля частакола матацыкл, на якім ездзіў малады сусед-брыгадзір. Ён, як гаварылі, падходжваў да Ларысы, відаць, і дяпер быў з ёю; можа, і не варта мне было цяпер заходзіць. Іншым часам я вярнуўся б дамоў, але цяпер не павярнуў, цвёрда рашыў зайсці, хоць пажартаваць, пазлаваць іх.

Брыгадзір гэты абыходзіў мяне, стараўся не сустракацца— відаць, думаў, што я хаджу да Ларысы і мы з ім становімся сапернікамі. Я нават стаў асцерагацца, каб ён не падвучыў вясковых падшыванцаў прыпільнаваць мяне вечарам ды патрэсці добра: я чужы ім чалавек, не паглядзяць, што і настаўнік, заступяцца за свайго сябра, які хоча знайсці сабе «інтэлігенцкую» жонку.

Я зайшоў у хату, прывітаўся з гаспадыняй і спытаўся, ці дома Ларыса. Сямёніха кіўнула галавою на другую, лепшую палавіну хаты.

Я знарочыста моцна пастукаў і, не чакаючы запрашэння, увайшоў і нават разгубіўся — ніякага брыгадзіра тут не было. Ларыса, нейкая сумная, нават кіслая, у дамашнім халаце, укрыўшы коўдраю ногі, сядзела на ложку. Ці яна кагосьці чакала, ці слухала радыё, толькі цяпер яна не выглядала настаўніцай, была звычайная вясковая дзяўчына.

— Ты адна? — спытаўся я, сам сеў на ложак і заклаў нагу за нагу.

— А з кім я павінна быць? — злосна спыталася Ларыса.

— З некім жа павінна быць.

— Вось ты прыйшоў, дык і пабуду з табою.

— Правільна.— Я ўстаў і сеў бліжэй да Ларысы, хацеў прыхіліць яе да сябе, але яна перасела далей ад мяне.

— Пайшлі ў школу,— усміхнуўся я,— закончым сёння наводзіць парадак.

— Ты ўжо добра навадзіўся недзе,— сказала Ларыса,— прыцямнее крыху, дык ідзі дамоў, каб не бачылі людзі. Ды спаць лажыся. А да мяне зараз дзяўчаты нашы прыйдуць, пойдзем з імі на танцы.

— О, і я з вамі.

— Куды ты пойдзеш! Не саромся! — асекла мяне Ларыса.

— Ясна,— сказаў я.— Ты не хочаш, каб я ішоў з табою, замінаў табе. Матацыкл жа стаіць ля частакола...

— І паеду,— сказала Ларыса,— і ў цябе прасіцца не буду, ён не горшы за другіх хлопцаў...

— Завочна ў інстытуце вучыцца, матацыкл мае, на машыну збірае,— жартаваў, злаваў я Ларысу.

— Ён ужо на «Масквіч» мае.

— Пахваліўся.

— Прызнаўся, таму і я не хачу выпускаць такога хлопца,— жартавала ці злавала і Ларыса, а можа, і праўду гаварыла.— Вось што ты маеш, што можаш паабяцаць дзяўчыне? Зарплату толькі... А ў яго і хата свая, і садок.

— Давай, давай, не выпускай такога жаніха, не ганіся за жураўлём у небе, калі сініца ў руцэ!

— Дык я і не ганюся, паеду зараз з ім на танцы.

Я быў колькі вечароў у тым клубе, вялікім, пустым, дзе збіраюцца школьнікі, васемнаццацігадовыя здаравякі, якія закончылі сёлета школу, не папаступалі, дык цяпер вылежваюцца дома да войска. Яны кураць у клубе, шумяць, танцуюць мала, таўкуцца толькі па кутках. Прайсці дзяўчатам, як і настаўніцам, ля іх нялёгка, лепш весці ўрок у шумным класе.

«О! Каралевы прыйшлі!»— гэтае вітанне іх яшчэ самае бяскрыўднае, пасля яны будуць гаварыць такое, ад чаго будуць вянуць вушы. Каб сам не быў настаўнікам, то здзіўляўся б: хто іх і чаму вучыў у дзесяцігодцы?

За сталом у куце будуць сядзець маладыя мужчыны і ляскаць у даміно, пакуль не пачнецца кіно; старэйшыя ў клуб ходзяць рэдка, пазамыкаюцца і глядзяць дома тэлевізары, цяпер ужо і ў вёсцы не збіраюцца на вячоркі, цяпер не ўгаворыш збірацца штовечара да суседа ці сваяка, драць пер'е ці іграць у карты і слухаць вясёлага гаваруна. Штодня па тэлевізары ідзе дзве-тры карціны, знаходзь толькі час, глядзі — і не трэба ісці ў клуб, плаціць грошы.

— І што ты будзеш танцаваць? — спытаўся я ў Ларысы.

— Вальсы, полькі, падыспаны...

— А ты гарадское пакажы,— я злаваў яе,— твіст адстукай, хоць гэта ўжо і не модна. Але для вясковых здаравіл-дзецюкоў будзе добра. Ці уош станцуй, які падобен на мыццё бялізны, урэж хіч хайкер — спробу сесці ў аўтамабіль, нягледзячы на тое, што цябе выпіхае шафёр... Ці што іншае станцуй...

Ларыса глядзела на мяне і здзіўлялася: яна, відаць, не бачыла мяне такім, не верыла, што так можа мяняцца чалавек — звычайна я чалавек спакойны, нават ціхі, а цяпер вось зусім другі.

— А мо пакажы ім джэрк, «Амерыкану» ці «007», здзіві іх крыху,— блазнаваў я.— Ці леткай-енкай, сіртакі, рэдлавам...

— Ніколі не ведала, што ты такі балабон,— сказала Ларыса.— Праўду гавораць людзі, што ў ціхім балоце чэрці водзяцца.

— Я пакрыўдзіў вас, Ларыса Іванаўна?

— Ладна, не мянці языком, бо заўтра сорамна будзе, што ты такі, а сёння мне сорамна за цябе... Шчаслівай ночы,— сказала і адвярнулася.

— Шчаслівa,— сказаў я, пакрыўдзіўся, што Ларыса амаль выгнала мяне, але здолеў стрымацца, выйшаў з пакоя.

Назаўтра была нядзеля, і я спаў да полудня; папалуднаваўшы, зноў заваліўся храпці: балела галава, ды і не хацелася нікуды выходзіць.

Вечарам я таксама застаўся дома, не пайшоў да Ларысы, а ляжаў на канапе і чытаў кнігу.

## 11

Панядзелкам я не зайшоў раніцою да Ларысы, наўмысна позна выходзіў з дому, каб яна паспела пайсці ў школу. Але, калі падышоў да школы і азірнуўся, убачыў, што Ларыса была яшчэ дома, а цяпер спяшаецца подбегам за мной.

Гэты дзень я стараўся з ёю не сустракацца, то затрымліваўся ў класе з дзецьмі і не заходзіў у настаўніцкую, то загаворваў з другімі настаўніцамі: мне было сорамна за сваё суботняе буянства.

Пад полудзень у школу прыйшоў Уладзімір Пятровіч, якога столькі чакалі, праз якога ў школе не вялася фізіка і многа гадзін матэматыкі. Ён быў маіх гадоў, такога ж росту, але значна паўнейшы, шырэйшы ў плячах.

Дырэктар узлаваўся на яго, крычаў, што так нельга рабіць: не звальняцца з работы, трымаць за сабою месца і не паказвацца ў школе. Уладзімір Пятровіч маўчаў, апусціўшы галаву, не апраўдваўся, не прасіўся.

— Што цяпер пайшлі за настаўнікі, не ведаю! — абураўся дырэктар.— Калі не любіш работы, дык не ідзі ў школу. Раз прыйшоў — будзь добры працаваць, вучыць дзяцей. Такой вольнасці настаўнікі ніколі не дапускалі, былі самыя дысцыплінаваныя людзі, а гэта прыйшлі пасляваенныя — што хочуць, тое і робяць, нікога не слухаюць, нічога не сароме юцца. Ну і моладзь!..

Уладзімір Пятровіч маўчаў. Відаць, яго не вельмі краналі словы дырэктара, бо сядзеў ён спакойна, не чырванеў, не бялеў, ведаў, што ўсё роўна трэба выслухаць.

— Я перадаю вас на мясцком,— здаўся дырэктар,— хоць пакараю яшчэ і сам.— Пасля як апраўдаўся: — Так жа нельга рабіць, гэта школа...

— Ох, чалавек! — стаў абурацца Міхась Рыгоравіч, калі дырэктар выйшаў з настаўніцкай.— Ну і лютуе.

Толькі і хоча, каб жылі работаю, сядзелі дзень у школе, а ёсць у цябе сям'я ці не, здаровая яна ці хворая,— гэта яго не турбуе...

— Чаму ж вы гэта не сказалі, калі быў тут Іван Сямёнавіч? — спыталася Ларыса.— Цяпер спачуваеце, а чаму тады не заступіліся?

Міхася Рыгоравіча гэта раззлавала, збіла з толку: ён і сам нагаворваў на Уладзіміра Пятровіча дырэктару, абураўся, а цяпер хацеў перад ім палаяць дырэктара. Узлаваўся і на Ларысу: заўсёды яна асякае яго, не прамоўчыць.

— Ну і пілка! — калі Ларыса выйшла, пайшла на ўрок, апомніўся, сказаў Міхась Рыгоравіч.— Ну і сякеру ты сабе падабраў, Павел Мікалаевіч.

— Жаніцца думаюць? — спытаўся Уладзімір Пятровіч.

— Ходзяць,— сказаў Міхась Рыгоравіч і таксама пайшоў на ўрок.

Мы засталіся з Уладзімірам Пятровічам адны ў настаўніцкай.

— Я, канечне, не ведаю ні вас, ні гэтую дзяўчыну,— сказаў ён,— але не раю жаніцца, хадзіце яшчэ да трыццаці халасцяком. Я сам цяпер не перакаюся, што жаніўся, узяў такое гора на галаву... Хутка во родзіць, хацелі ў Мінску застацца, прыпісаліся, работу знайшоў, дык ніхто на кватэру не хоча з дзіцём браць. Гойсаў, гойсаў, ды і прыйшлося вярнуцца ў гэту глухмень... А тое, што шэф крычыць, гэта мала важна, яму трэба крычаць, яму за гэта грошы плацяць. А мне жыць трэба, і ніхто за мяне не пастараецца, калі я сам не зраблю...

Я маўчаў: не ведаў Уладзіміра Пятровіча, не знаў, што прамовіць, толькі адчуваў, што і праўда нядобра — цэлы месяц гуляць, не прыязджаць у школу, і дырэктар, калі казаў пра гэта, не прыдзіраўся, як нядаўна гаварыў Міхась Рыгоравіч, а заступаўся за дзяцей, для якіх столькі часу не вялася матэматыка і фізіка. Тут ужо дырэктара нельга ў чым-небудзь благім вінаваціць, на яго месцы любы не пахваліў бы Уладзіміра Пятровіча.

— А вы дарэмна прыехалі ў гэту школу, у гэту глухмень,— сказаў Уладзімір Пятровіч,— трэ было распытаць ды дабівацца лепшага... Ды я ніколі не вучыўся б за настаўніка, чатыры гады я прарабіў, а што я бачыў? Урокі, урокі, урокі... Прапробіш і яшчэ пяць, дзесяць гадоў —

урокі, урокі... Можаш яшчэ на якога завуча ўзбіцца, але ж у школе-васьмігодцы толькі адзін завуч ды дырэктар патрэбны, усе не займуць іх месц. Значыць, будзь век настаўнікам... Я раблю, бо мне вучыцца трэба і капейку мець. Закончу інстытут— і нагі маёй у школе не будзе...

— Але ж некаму трэба рабіць і настаўнікам,— сказаў я,— дзеці ж самі вучыцца не могуць.

— Хай робіць той, хто ніякіх талентаў не мае,— сказаў Уладзімір Пятровіч,— ды не ўсе думаюць: «трэба ж вучыць і дзяцей», многія глядзяць, дзе лепш. Ды ты сам паглядзі: закончыў ты інстытут, пятнаццаць год вучыўся, а што ты маеш? Сто рублёў. Ні кватэры, ні павагі. Я парабіў ужо на вёсцы, ведаю, што цяпер не так настаўніка паважаюць, а брыгадзіра, бо ён каня, лепшую работу дасць, паважаюць і магазіншчыка, бо ён прадасць табе самае ходкае, лесніка на чарку зазываюць, бо ён лесу можа адпусціць, пра шафера не забудуцца, бо ён прывязе штосьці, адвязе...

— Можа, гэта таму, што раней на вёсцы настаўнік быў самы адукаваны,— сказаў я,— а цяпер ёсць яшчэ і аграномы, і інжынеры, і ўрачы.

— Філасофстваваць я не люблю,— сказаў Уладзімір Пятровіч,— але настаўнікам не буду. Не хачу. Бо бачу: прарабу, які закончыў тэхнікум, дзіцё яшчэ, а яму матацыкл далі, ветурачу «дук» далі, раскатваецца, як на таксі, пра дырэктара няма чаго ўжо і гаварыць — ён дзяржаўны «Масквіч» за свой лічыць. І ў цябе, і ў іх вышэйшая адукацыя, усе жывяце ў вёсцы, але зраўняйся ты з імі...

— А я і не думаў пра гэта,— усміхнуўся я.

— Бо па кніжках яшчэ жывеш, жыцця не бачыў,— сказаў Уладзімір Пятровіч.— А мяне, брат, не абхітрыш. Мне меней за ўсё баліць, што дзеці не вучыліся матэматыцы, мне трэба было пра сябе думаць, каб жыць палюдску. І перад шэфам я не маўчаў бы, каб не рабіць яшчэ тут, і перад жонкай яго не пасміхаўся б...

Я прамаўчаў, толькі здзіўляўся гэтым яго словам, яго такой ранняй «мудрасці».

— Я табе скажу, што і схітраваць трэба калі. Бо цяжка пражыць без хітрасці,— Уладзімір Пятровіч, мусіць, заўважыў маю іранічную ўсмешку.— Усе могуць быць Чацкімі ды Рахметавымі, ці як там па-вашаму... Прыязджае аднойчы да мяне дырэктар саўгаса, ён тады яшчэ вучыўся завочна. «Ратуй, Пятровіч,— просіць,— трэба хутка экзамен здаваць, а ў мяне нават кнігі гэтай няма. Я чуў, што ў цябе ёсць, выратуй, дай пачытаць, бо ў ніякай бібліятэцы няма». У мяне была тая кніга, можна сказаць: «Бяры, Аляксандравіч, стаіць вунь на

этажэрцы»,— ці самому падаць, але я нахмурыўся і кажу: «Няма, Аляксандравіч. З вялікай радасцю вам даў бы, але няма».— «Што ж рабіць? — бядуе дырэктар.— На адных вас была надзея».— «Ой-ёй-ёй,— бядую і я,— як вам памагчы? Паеду да сваіх знаёмых, нос разаб'ю, але дастану вам». Праз колькі дзён сам прыношу яму гэту кнігу і падаю яе як вялікую знаходку, нібы з-пад зямлі дастаў яе. Як ён радаваўся, дзякаваў мне, абяцаў таксама памагчы. Я не прасіў тады абы-чаго, а прыкусіў язык, падумаў пра дом, што будуецца ў суседняй вёсцы для рабочых; папрашу кватэрку і сабе — павінен не адмовіць. Вось як, Павел Мікалаевіч... А абавязкі... Заўсёды яны яшчэ будуць, гэтыя абавязкі...

— Але так жа прыніжаеш сябе, ганьбіш,— сказаў я,— смяяцца будуць, папіхаць.

— А ты папіхайся, сціскай зубы ды пра сябе думай, гадай, што табе будзе за гэта,— сказаў Уладзімір Пятровіч.— Будзе час, ты даб'ешся свайго, трэба ўмець і крыху пацярпець, і памаўчаць.

«Калі я вучыўся, я не думаў пра гэта,— падумаў я,— цяпер я стаў рабіць — стаў і жыць. І як усё цікава, проста і незразумела. Сапраўды, я дасюль жыў па кніжках, толькі цяпер я пачынаю глядзець на ўсё сваімі вачамі».

— Я, можа, табе такога не сказаў бы, каб не паглядзеў гэтых колькі хвілін на цябе,— сказаў Уладзімір Пятровіч,— Не тую ты ўзяў ноту. Абломіць Іван Сямёнавіч цябе, казлом адпушчэння будзеш.

— Чаму? — здзівіўся я.— Што ж я раблю такога благога?

— Мне яшчэ гэта Міхась Рыгоравіч учора гаварыў, а гэта вёрткі і хітры чалавек, усё ён разумее, бачыць,— сказаў Уладзімір Пятровіч,— Прыглядаецца да цябе Іван Сямёнавіч.

— Хай прыглядаецца,— сказаў я.— Што ведаю, так і вучу дзяцей.

— Мы, як людзі малыя, па-свойму робім,— усміхнуўся Уладзімір Пятровіч. Хацеў яшчэ штосьці сказаць, але празвінеў званок з урока і зайшоў у настаўніцкую дырэктар, за ім увайшла яго жонка, паглядзела на мяне, нібы стараючыся ўведаць, аб чым мы маглі тут гаварыць. Уладзімір Пятровіч змоўк, узяў ручку, перапісаў заўтрашні расклад і стаў збірацца дамоў, на сваю кватэру.

— Паслухайце, што ўчора было,— сказаў Іван Сямёнавіч,— Мілецкая абазвала Каўняровіч аграноміхай, Каўняровіч тую — шляхцянкай, і завяліся бабы біцца, ледзь мужыкі расцягнулі,— дырэктар расказваў і смяяўся. Зарагатаў і Міхась Рыгоравіч.

Не ўтрымаўся, усміхнуўся і я, глянуў на Ларысу і сцяў губы: была яна невясёлая, так зняважліва глядзела на мяне, што мне стала

нядобра. Я адвярнуўся і стаў корпацца ў сваёй сумцы, перакладаў сшыткі, заглядаў у свае планы.

— Літаратары,— сказаў Іван Сямёнавіч,— пастаўлю таму пяць, хто адкажа, як зваць па імю і па бацьку Плюшкіна. Дачка мая, дзевяцікласніца, калі летась спыталася настаўніка аднаго ў дзесяцігодцы, дык ён не адказаў.

— Сцяпан Дзмітрыевіч,— сказаў я, бачачы, што ўсе маўчаць.

— Адкуль вы гэта ведаеце?— здзівіўся дырэктар,— Я ў інстытуце аднаго выкладчыка на гэтым пасадзіў.

— Там у адным месцы гаворыцца пра дачку Плюшкіна...

— Добра, стаўлю вам пяць,— падышоў да мяне дырэктар і падаў кнігу.— Раю пачытаць.

Я глянуў на пацёртую кнігу і па вокладках пазнаў: «Братья Карамазовы».

— Дзякую,— сказаў я,— чытаў у інстытуце. Нават адказваў на экзамене па гэтым рамане, трапіўся мне вобраз Паўла Смердзякова.

— Ну і хто загубіў, па-вашаму, старога Карамазава?

— Іван Карамазаў і Павел Смердзякоў,— адказаў я.

— Гм,— хмыкнуў дырэктар і працягнуў другую кніжку.— А гэта чыталі?

— Нават нядаўна,— сказаў я.

— І вы зразумелі, чаму Раскольнікаў зрабіў злачынства, для чаго ён ступіў на такую сцежку?

— Цяжка сказаць,— прызнаўся я,— але ўся логіка аўтара...

— Гм,— зноў хмыкнуў дырэктар і выйшаў на калідор: нечага вельмі шумелі вучні ў пятым класе.

— Іван Сямёнавіч бярэ на зуб нашага Паўла Мікалаевіча,— сказаў Міхась Рыгоравіч.— Ён кожнага года задае гэтыя пытанні маладому настаўніку, і ніхто не мог на іх адказаць,— вось гэтым і пацяшаўся Іван Сямёнавіч. Вы...

— Што за праверкі? — здзівіўся я.— На дыплом я ў інстытуце экзамены здаваў.

— Гэта ўсё фокусы яго,— сказаў Міхась Рыгоравіч.— Чытаў малады настаўнік сур'ёзнае, учытваўся — значыць, свой характар, настойлівасць мае. Вы цяпер, Павел Мікалаевіч, будзьце асцярожныя з ім, ён вельмі не любіць, калі хто больш за яго ведае. Тады і праверачкі будуць, і падкавырачкі; хоць вы ўрокі даяце і выдатна, але ўсё роўна...

— Дзіўна,— сказаў я,— усё гэта далека ад нашай задачы — вучыць дзяцей. Я раблю, колькі ўмею, колькі выходзіць.

— Ты небяспечны для яго чалавек,— сказаў Міхась Рыгоравіч.

— Чым я небяспечны?

— Ты разумны, адукаваны, зараз у партыю ўступіш, работу школьную добра зразумееш...

— Дык гэта ж і добра! — здзівіўся я,— Дай бог, каб такое было.

— А для Івана Сямёнавіча гэта небяспечна,— сказаў Міхась Рыгоравіч.— У вуллі павінна быць адна матка. Калі з'яўляецца другая, то між імі завязваецца адразуж барацьба.

— Не разумею,— сказаў я.

— Дырэктарам цябе тады могуць паставіць. Ясна? — сказаў Уладзімір Пятровіч, развітаўся і выйшаў.

Я разгубіўся і маўчаў.

— У цябе яшчэ многа рамантыкі ў галаве, на вачах — ружовыя акуляры, а тут штодзённае жыццё. Помніш, як ён гаварыў табе ў першы дзень: «Мы — людзі немаладыя, абраслі сваімі хатамі, хлявамі і садамі. Рамантыка ў нас даўно прайшла...» Калі ён дырэктарам, у школьным садзе два разы траву сабе выкасіць, яблыкаў, гуркоў, капусты возьме,— сваю капейку зберажэ. Ёсць людзі, якія любяць быць хоць маленькім начальнікам... Пажыві сам.

Міхась Рыгоравіч замоўк, хапіўся гартаць нейкі часопіс: у настаўніцкую зноў зайшлі дырэктар і яго жонка; мне аж стала няёмка, што гаварылі дасюль пра яго.

— Міхась Рыгоравіч,— сказаў дырэктар завучу, — мне здаецца, што нашы маладыя настаўнікі даволі холадна адносяцца да работы, доўга ўцягваюцца. На ўрокі ходзяць акадэмікамі, толькі з указкаю ці крэйдаю ў руках, пазакласнай работы амаль ніякай, бібліятэка ўсё яшчэ закрыта, а вучні якія! — пазарасталі, неакуратныя... Падленьваецца рабіць наша моладзь.

— Падленьваецца,— падтрымаў Міхась Рыгоравіч,— мы больш ахвотна некалі пачыналі рабіць.

— Трэба нам больш з табою патрабаваць,— сказаў дырэктар,— правяраць і патрабаваць, на ўрокі часцей хадзіць.

— Трэба, Іван Сямёнавіч,— зноў згадзіўся Міхась Рыгоравіч.

Я глянуў на завуча: толькі што ён хваліў мае ўрокі, а цяпер згаджаецца з дырэктарам, што мы, маладыя — Ларыса, настаўніцы біялогіі і фізкультуры і я,— лянуемся, не стараемся. Міхась Рыгоравіч адвярнуўся, махнуў на дырэктара рукою, зморшчыўся і падміргнуў мне, каб не зважаў я на гэтыя словы.

— А дзе наш шныранец? — спытаўся Іван Сямёнавіч.

— Дамоў пабег,— першым сказаў Міхась Рыгоравіч.

— Ох смоўж, прыстасаванец! — паківаў галавой дырэктар.— Малады, а такі хітры. Ніякіх абавязкаў не хоча ведаць. Толькі пра сябе думае, на ўсё згодны, абы яму добра было.

— І адкуль толькі такія бяруцца? — здзіўляўся і Міхась Рыгоравіч.— Бацьку ж яго ведаю,— франтавік, рабацяшчы, каваль.

— Вось мы, відаць, і сапсавалі сваіх дзяцей,— сказаў дырэктар.— Мы трыццатыя гады, вайну цяжкую перажылі, нічога добрага не ўбачылі, думалі: няхай хоць нашы дзеці пажывуць цяпер, дагаджалі ім, а яны выраслі і толькі ведаюць, што ім трэба, а таго, што павінны яны рабіць, добра не знаюць, гэтага не ўталкавалі мы ім,— дырэктар гаварыў і, відаць, меў на ўвазе і сваіх дзяцей.

— Гэта праўда,— сказаў Алёсь Трахімавіч, які дасюль маўчаў і не ўступаў у гаворку (увогуле, убачыў я, што ён рэдка на перапынках з кім гаворыць, сядзіць, слухае ўсіх ці газеты чытае),— распесцілі мы сваіх дзяцей, кволымі, безадказнымі і спажыўцамі выгадавалі, а вучні нашы цяпер яшчэ ў большым дастатку жывуць, з імі яшчэ цяжэй будзе...

— Мы, канечне, такімі не былі,— сказаў дырэктар,— мы больш пра работу думалі, як пра сябе. А цяпер яны саромеюцца высокія словы гаварыць, вялікія аўтарытэты сабе выбіраць.

— Ахайваеце вы нас,— паспрабаваў абараніцца я.

— Як ні апраўдвайцеся, але няма ў вас нашай загартоўкі,— сказаў дырэктар.— Мацнейшымі, смялейшымі мы былі, нават дзяўчат мацней любілі, нейкую бескарыслівасць большую да работы, справы ведалі.

Калі мы з Міхасём Рыгоравічам засталіся адны, я сказаў, што наглядаю за Алесем Трахімавічам, здзіўляюся і ніяк не зразумею яго: вечна ён маўчыць, спытаешся што-небудзь — адкажа, не загаворыш,— дык і прасядзіць дзень у настаўніцкай моўчкі.

— Я табе скажу: настаўнік ён залаты, цяпер не многа такіх знойдзеш,— сказаў Міхась Рыгоравіч,— сорак гадоў працуе ў школе, ды як працуе! Дай бог нам палавіну такой працавітасці і сумленнасці мець. А вось з Іванам Сямёнавічам не ладзяць. Даўно Іван Сямёнавіч дачакацца, мусіць, не можа, калі ўжо выправіць старога на пенсію. Алесь Трахімавіч і прыпісак не любіць, дырэктара на педсавеце за работу крытыкуе, за гарод і за іншае, а Іван Сямёнавіч пасля злуецца, на другім выязджае.

— А я думаў, што ў школе ўсё добра, зладжана,— сказаў я.— Аказваецца, тут таксама ўсякае ёсць.

— Ёсць,— усміхнуўся завуч,— папрацуеце, дык яшчэ больш убачыце. А вы сур'ёзна хочаце з Ларысай Іванаўнай жаніцца?

— Я зусім пра жаніцьбу не думаю,— сказаў я.

— Не бяры яе,— падтрымаў Міхась Рыгоравіч.— Ох, брат, і пілка, ды яшчэ тупая. Яе сама Вольга Піліпаўна асцерагаецца.

— Ларыса сумленная,— сказаў я,— гэтага ўжо ў яе не адбярэш.

Завуч прамаўчаў, усміхнуўся і незразумела кіўнуў галавою.

## 12

У сярэдзіне лістапада стала холадна; модны вецер нагнаў нізкіх дзжкіх хмар, і аднаго дня пайшоў вільготны шэры снег. Ён доўга не мог улежаць, раставаў на мокрай зямлі, пакуль не сцягнуў вады,— тады стала бела, прасторна, падхапіўся марозік, усё падшэрхла, пацвярдзела, і было відаць, што легла зіма.

Адным днём я нават доўга стаяў на двары і здзіўляўся: было сонечнае, з густым блакітам неба, па якім плылі па-летняму белыя воблакі, іскрыўся снег, капала са стрэх і раставала ля сцен — і здавалася, што стаіць сакавік, калі суцішыліся, збеглі мяцеліцы, аслабеў мароз, з кожным днём вышэй паднімаецца сонца.

Тады я выйшаў са школы, захваляваўся, што такі светлы, іскрысты дзень, і нават не хацеў ісці дамоў, як убачыў Ларысу. Я замітусіўся, паспяшаўся ісці, але Ларыса дагнала мяне, пайшла побач.

— Чаго ты ўсё дзьмешся? — спыталася яна.

— Я не злуюся.

— Што я — дурная, не бачу? — сказала Ларыса.— Баба ты вясковая. Гэта я павінна была прагнаць тады цябе з хаты, а цяпер не гаварыць з крыўлякам. Хоць бы папрасіў прабачэння...

Я ўсміхаўся і маўчаў, стараўся не глядзець на Ларысу. Цяпер я разумеў, што вінаваты быў я, рабіў тое, што падказвала злое зелле.

— Чаго маўчыш?

— А што табе сказаць? — усміхнуўся я.

— Ганарлівы,— сказала Ларыса.— Ну, як хочаш. А мне Віктар пісьмо прыслаў.

— І што ён табе піша?

— Просіць, каб замуж выйшла, клянецца, што будзе любіць да смерці. Ад бацькоў маіх не вылазіць...

— Ну, а ты што?

— Як і раней... Калі ўжо за яго ісці, дык лепш векавухай быць.

— Глядзі — упусціш шчасце.

— Гляджу,— сказала Ларыса.— Што ты сёння будзеш рабіць?

— Чытаць ці сшыткі правяраць,— адказаў я.— Што мне яшчэ рабіць?

— Памажы ты мне яшчэ сёння кнігі падклеіць. А то і дзеці хочуць чытаць, і дырэктар падганяе, дзесяткаю, якую плацяць за бібліятэку, папракае. Прасіла дзяўчат памагчы, дык не хочуць, гавораць: часу няма, нейкім вязаннем заняліся.

— Памагу,— згадзіўся я.— Толькі чым ты мне плаціць будзеш?

— Заплачу нечым, не бойся. Ты ж любіш штосьці, пачастую... Хоць гаваркі будзеш, бо так слова з цябе трэба выцягваць.

Я зачырванеўся і нічога не мог сказаць, ішоў і слухаў, як рыпіць пад нагамі снег, гадаў, што сказаць, як апраўдацца, але так нічога і не прыдумаў, маўчаў ды саромеўся за сябе.

— Не чырванеј,— сказала Ларыса,— я ўжо забылася пра ўсё тое.

Пасля полудня і кароткага адпачынку я пайшоў да Ларысы. Яна ўжо чакала мяне, сядзела абутая і апранутая.

— Сёння пасядзім хоць да раніцы, але трэба прывесці гэтую бібліятэку ў парадак,— сказаў я.— Колькі мы ўжо будзем таптацца там, глытаць старажытны пыл.

— Надакучыла?— спыталася Ларыса.— Ці на другое што час трэба?

— Што ты хочаш сказаць?

— Можа, чытаць трэба, пісаць ці Ленка не пускае?Ёй жа сумна адной дома...

— Як гэта цябе брыгадзір адну са мной пускае? — жартаваў я.

— Брыгадзір да мяне ўжо не ходзіць. Як не паехала з ім на танцы, дык больш і не заглянуў,— адказала яна.— Гэта Ленка ваша, гавораць, плацце ўжо белае заказала, а гаспадар гарэлкі стараецца.

— Давай не будзем пра гэта больш, Ларыса, а то мы сапсуём адно аднаму настрой,— сказаў я.— Ты дарэмна на сябе ўсё бярэш, магла і тэхнічкам сказаць, каб памаглі.

— Зробім і самі,— сказала Ларыса,— Ты вось яшчэ мне памажы: напішы ты Віктару, што я не люблю яго.

— Дзівосы,— усклікнуў я.— Хіба я ведаю: любіш ты яго ці не, можа, вы толькі паспрачаліся і хутка памірыцеся...

— Не, Паўлік. Я, мусіць, няшчасны чалавек.

— Чаго?

— Я баюся, што я ўмею любіць, магу, а мяне вось ніхто так і не палюбіць.

— А Віктар?

— Гэта не любоў. Я хачу лепшага кахання, вялікага, хоць, здаецца, цяпер няма яго такога. Як пачытаеш, паглядзіш у кіно,— некалі лепш любіліся, неяк усё гэта было высока, чыста, недаступна...

— У наш час і дзяўчаты не тыя,— падтрымаў яе я,— нешта страцілі яны. Многія кураць, п'юць, непастаянныя, памужчынелі, ды гэтыя моды... Раней мужчыны млелі, калі бачылі ножку жанчыны, а цяпер сядзіш у аўтобусе і не ведаеш, дзе вочы дзець ад гэтых ног... Дзяўчаты нейкія зусім не гордыя, а мне здаецца, і цяпер шукаюць Тацяну Ларыну, Ядвіську ці грынаўскую Асоль...

— А яны і ёсць, толькі іх трэба знайсці,— сказала Ларыса.— Сама бачыла, як могуць любіць дзяўчаты, гараваць, таіць у сабе каханне, бо не могуць такога знайсці ў адказ. Ці мала ёсць такіх матылькоў, якія прыліпаюць, ашукваюць дзяўчыну, кідаюць і не думаюць, як цяжка ёй потым... Вось як сумна бывае...

— Ведаеш што? — сказаў я.— Магу штосьці параіць.

— Што?

— Сачыняць оперу. Садзіся і пішы оперу; сум пяройдзе да другіх, а самой будзе легка.

— Ты жартуеш, бо сур'ёзна яшчэ не жывеш, не думаў пра гэта,— сказала Ларыса.— Зачыні, калі ласка, дзверы.

— Чаго нам зачыняцца,— усміхнуўся я,— не будзем жа мы цалавацца тут?

Ларыса ўсміхнулася, схапіла нейкую тоўстую кнігу і накінулася на мяне: «Грубіян!» Я ледзь паспеў выскачыць на калідор, вярнуўся толькі тады, калі Ларыса паабяцала, што не будзе біцца. Я зачыніў дзверы, каб не было скразняку, і мы пачалі раскладаць, падклейваць парваныя кнігі, бачачы, што гэтым вечарам ужо ўправімся і заўтра Ларыса зможа выдаць кніжкі дзецям.

Я прынёс вады, цёр венікам падлогу, а Ларыса ўслед мыла. Калі яна сабрала ля парога ваду, выцерла ўсё суха, то міла было глянуць вакол — як не тая была бібліятэка.

— Ой, як спіна баліць! — паскардзілася Ларыса.

— Во гультайка!— сказаў я,— Відаць, што песціла цябе маці. Дырэктар правільна гаварыў, што моладзь цяпер такой загартоўкі не мае, як раней...

— Трапло! — сказала Ларыса.— Але дзякуй за помач. Каб спадзяваліся на каго, самі не папрацавалі, то і гэты год яшчэ бібліятэка закрытая была б.

Мы абчысціліся, памылі рукі, выключылі ў школе святло і пайшлі дамоў: было позна, нават музыкі не паслухалі.

— Ну, як табе падабаецца работа? — спытаўся я.

— Не вельмі,— сказала Ларыса.— Вучылася, думала: буду неяк лепш працаваць, а гэта вельмі ўсё ж неяк проста. Планы, урокі, сшыткі, дзеці не так вучацца, як я хацела, настаўнікі не тыя... Адно і

тое ж у іх: дзе што купіць, дзе хто сказаў. Каб яшчэ ў сярэдняй школе рабілі, можа б, які большы прастор быў, весялей, больш рамантычней было б. А то сухая, сумная проза...

— А ёсць дзеці, што хочуць вучыцца,— сказаў я.

— Ёсць,— згадзілася Ларыса.

— Ты толькі не смейся,— пачаў я,— парабіў я толькі два месяцы, паглядзеў на дзяцей, іх вучобу і ўбачыў, што сама ахвотна са старэйшых класаў вучацца ў чацвёртым і пятых класах; стараюцца, цікавяцца; правядзі добра ўрок — яны будуць за бога цябе лічыць, давяраць табе ўсе свае тайны.

— І я ўбачыла гэта,— прызналася Ларыса.

— Не перабівай, я яшчэ не закончыў свае «педагагічныя нагляданні». У шостым дзеці нечакана адчулі, што яны пасталелі, што дзяўчынкі і хлопчыкі — не толькі вучні, але і людзі рознага полу. Прыходзіць першы абдуманы сорам, хлопцы шукаюць ідэалаў і ніколі не палічаць ім жанчыну. Пугачоў, Кутузаў, Чапаеў, «Няўлоўныя мсціўцы», Банівур — вось іх ідэал... І яны тут жа ахаладнелі да навукі.

— Праўда! — не ўтрымалася Ларыса.— Ой, прабач...

— І чаму, чаму яны халаднеюць? Ці не таму, што пасталелі, што цвяроза глядзяць на жыццё, ужо неакрэслена бачаць сваё месца ў ім? — гаварыў я, пра што сапраўды многа апошнім часам думаў.— А сёмы клас... Гэта пераломны клас. Тут ужо ідзе рэзкі падзел на тых, хто вўчыцца і будзе вучыцца, і на тых, хто не хоча, не ўгаворыш яго нічым. Сямікласнікі ведаюць: трэба ім вучыцца ці не, што дасць ім вучоба, яны ўважліва прыглядаюцца да старэйшых і часта бяруць ад іх не самае лепшае. Дзяўчынкі-сямікласніцы яшчэ працавітыя, старанныя, яны гуляюць дома са сваімі меншымі брацікамі ці сёстрамі, мыюць падлогу, бялізну, яны і ў школе ахвотней пойдуць спяваць, выпускаць газету. А вось хлопцы... Яны нейкія абыякавыя, і я тут яшчэ не зразумеў: дзе, хто дапусціў памылку, што яны такія выраслі? З чаго гэта пачалося?..

— Ты і праўда другім Сухамлінскім будзеш,— усміхнулася Ларыса,— ці паробіш яшчэ трохі — і кандыдацкую напішаш.

— Не смейся,— працягваў я.— Многа вінаваты бацькі, што іхнія дзеці такія. Але я пра нас, настаўнікаў. Дзе памыліліся, не дарабілі, не дагледзелі мы? На педсаветах, у класах мы злуёмся на гэтых двоечнікаў, гультаёў, лаем іх, лаем штодзень. Але пра тое, што яны добра рабілі летам у саўгасе, цяпер многа памагаюць дома, любяць тэхніку і іншае, мы мала думаем. На ўроках мы бачым іх «распусту», іх не «матэматычную» і не «філалагічную» здольнасць, іх пасіўнасць. Мы

здзіўляемся, чаму яна ёсць, але мала шукаем, адкуль яна бярэцца, як яе выкараніць...

— Так, далёкія мы ад вучня,— сказала Ларыса.— Пабудзем з ім сорак пяць хвілін, пагаворым афіцыйна, а так добра і не ведаем, чым ён і як жыве...

— І вось мне здаецца, Ларыса, яны пасіўныя таму, што іх прымушаюць толькі «вучыцца». Можа быць, дзеці ў многа раз ахвотней і вучыліся б, каб у школе, а дома асабліва, былі і добра цаніліся другія віды працы, якую якраз любяць яны, у якой яны модныя. А то яны цікаўныя, усёзнайкі, хочуць ведаць многае, а бацькі гавораць: «Адчапіся!» — і мы тое не раз гаворым: то нам часу няма, то ахвоты. Вось дзеці і асякаюцца... А то бацькі гавораць: «Ты вучыся, а не працуй. З віламі паспееш напрацавацца».

— Ой, Паўлік, ды ты — педагагічны геній! — усклікнула Ларыса.

— А ты думала, я дарэмна настаўніцкі хлеб ем? — мусіць, ганарыўся я.— Часу вольнага хапае, вось і думаю. Ды і ўцягваюся пакрысе ў работу, пачынае яна нават падабацца.

— Ты разумны, Паўлік,— сказала Ларыса.— Ты сапраўды хутка пачнеш педагагічныя артыкулы пісаць,— і я нават у цемнаце ўбачыў, як яна міла, радасна, з нейкай незразумелай мне павагай, захапленнем ці зайздрасцю глянула на мяне.

— А ты пра гэта не думала?

— Ды думала, гадала, але так выказваць усё, як ты, не магу,— прызналася Ларыса.— У мяне не хапае на на гэта і розуму і назіральнасці, настаўнікаў я неяк лепш пазнаю.

— Розныя людзі ў школе робяць,— сказаў я.

— А мы з табою яшчэ і не рыба і не мяса,— сказала Ларыса,— «самалёты без апазнавальных знакаў». Без сваёй цвёрдай думкі, свайго голасу, мы часта робім не тое, што думаем, а так, як гэта падабаецца другім. Мірымся са злом, баімся паказаць на яго пальцам, назваць уголас.

— Нам дваццаць два гады,— я пачынаў ужо гарачыцца,— а мы ўсё яшчэ маладыя, зусім не сталыя, і, канечне, ніхто нас сур'ёзна не прымае, не цэніць.

— І ці ацэняць яшчэ?

— А гэта ўжо будзе залежаць ад нас,— сказаў я,— чалавек цэніцца не тым, як і што ён думае, нават што робіць, а тым, што ён зробіць, які пакіне след.

— Дык ці будзе гэты наш след глыбокі, чаго мы тут даб'ёмся, у гэтай васьмігодцы? У гэтай маленькай вёсачцы?

— Не ведаю, не ведаю,— пацішэў я.— Пакуль што мы даём толькі ўрокі, адкрылі бібліятэку, правялі бацькоўскі сход у далёкай вёсцы і выпусцілі баявы лісток на свінагадоўчай ферме.

Мы падышлі да кватэры Ларысы, я яе і сёння правёў да сянец, прыпыніўся. Стала і Ларыса, не падзякавала, як заўсёды, і не пабегла ў цёплую хату; тады бег і я, марыў, што хутка траплю ў цяпло, а пасля лягу ў халодную пасцель, але хутка сагрэюся, і мне будзе цёпла, утульна, добра і крыху трывожна. Але скажу сабе: спаць, спаць — і засну, рады, што пражыў дзень, гадаючы, што будзе заўтра...

Было холадна, стыла: халадзіў снег, моцны вецер, які выдзімаў астатняе цяпло, наганяў сівер, і неба было цёмнае, нізкае, халоднае.

— Холадна! — я сказаў праўду і пажартаваў, паскакаў на адной назе, прылажыў сваю шчаку да шчакі Ларысы.— Ратуй сваім цяплом, памажы сагрэцца.

Ларыса не адхінулася і не адняла сваёй шчакі, я прыцісну ўся мацней, трэба было жартаваць, пакуль не скажа свайго слова Ларыса, не адхіне мяне.

Я чуў, што і яе шчака халодная, нават пякучая, але яна хутка сагрэлася, я чуў, як яе вейка шоргала па маім воку. І нечакана я падумаў, што Ларысе ўсё гэта падабаеццц і яна жартуе са мною; вусны яе, таксама халодныя, сасмяглыя за дзень, былі блізка, і я не ўтрымаўся, прыхіліў Ларысу да сябе і пацалаваў яе.

Ларыса не адрывалася, абхапіла маю шыю рукамі і таксама пацалавала, задыхалася, пасля адарвалася, але не адпіхнула мяне, прытулілася да маіх грудзей.

Мне было няёмка, я не ведаў, што рабіць і ці жарт гэта быў.

— Паўлік, я чакала гэтага,— прашаптала яна, хоць у такую познань нас ніхто не мог пачуць, і тут я мігам здагадаўся, чаму яна расказвала мне раней пра свайго Віктара, злавала брыгадзірам, прызналася, што прыехала сюды толькі таму, што трапіў сюды я.

Я спалохаўся, што гэта ўсё шчыра, стала, а я не магу быць да Ларысы такім жа шчырым, добрым.

— Ты не ведаеш, чаму я чакала гэтага?

— Не,— зманіў я.

— Які ты сляпенькі! — зноў прытулілася, прылажыла сваю шчаку да маёй.— Ці хочаш, каб я яшчэ сказала гэта?

— Ты жартуеш? — Я ўсё яшчэ не верыў.

— Не, Паўлік, не,— адказала яна.— Я даўно з табой не жартую...

Прызнацца, я разгубіўся: гэта, відаць, было так, Ларыса за штосьці пакахала мяне, цяпер яна не жартавала, таілася дасюль, чакала добрай, удалай хвіліны, а цяпер прызналася. Другою парою і я

сказаў бы: «І я люблю цябе»,— сказаў бы, тут жа забыўся б пра гэтыя словы, загаварыў пра кіно ці надвор'е, нашых вучняў, але цяпер я баяўся пакрыўдзіць Ларысу: усё гэта было сур'ёзна і важна. Яна мне стала цяпер блізкая, знаёмая, як сястра. Я паважаў яе, мог бы пайсці цяпер за яе ў халодную ваду, але, мусіць, не любіў яе і не ведаў, ці палюблю. Я адчуваў, што магу быць добрым, паслухмяным, кахаць, але не зусім верылася, што яно, мае каханне, будзе толькі для Ларысы.

— Ты дакараеш ці насміхаешся з мяне? Скажы.

— Не. Я...— я замоўк: не ведаў, што сказаць.— Я думаю: насміхаешся ты...

— Не верыш? Я яшчэ ў інстытуце глядзела, каб якая цытра не прычапілася да цябе.

— Што ты гаворыш? Я не заўважаў...

— Ты і цяпер не вельмі відушчы...

— Можа.

— Ты не любіш мяне? — спыталася Ларыса.

— Не ведаю, Ларыса, не буду маніць, я аб гэтым не думаў,— прызнаўся я.

— Чалавек заўсёды да чалавека горнецца, ён не можа адзін,— сказала Ларыса,— Я не змагла больш маўчаць, мучыцца. Толькі ты скажы...

«Што я ёй скажу?»

— Скажы мне толькі адно: ты ненавідзіш мяне... ну, зусім не любіш?

— Не, Ларыса, я прывык да цябе.

— Значыць, не любіш, будзеш горам для мяне.

— Ларыса, я не ідэал. Ды ты не ведаеш мяне, які я... Я нічога не магу табе абяцаць, я нічога не маю...

— Што ты гаворыш, Паўлік? Мне не трэба ніякія выгоды, мне трэба сам ты, твая адданасць і каб ты быў мой. Мне трэба зусім мала, але і столькі многа... Ты ненавідзіш мяне цяпер, скажы, калі ласка?

— Не, Ларыса,— сказаў я.

— Хоць я не вінавата, ты, можа, больш вінаваты. Сама дзіўлюся, што ты зрабіў са мною, як засланіў мне свет...

Я маўчаў і думаў, што дзяўчына гаворыць мне аб важным, прызнаецца сур'ёзна, стала, з душою, і забываць гэтых слоў не трэба, смяяцца з іх тым больш. «Што рабіць, што сказаць, думаў я, хоць бы знайшоўся хто, падказаў».

— Я разгубіўся, Ларыса,— прызнаўся я,— зусім не чакаў гэтага, цяпер не ведаю, за што мяне можна любіць. Я сур'ёзна яшчэ нікога не любіў.

Цяпер маўчала Ларыса.

— Можа, Ларыса, табе стала сумна і табе здалося...

— Здалося... пяць гадоў таму назад,— абарвала яна мяне.— Я ўжо ведаю цябе, як і сябе. Бачу, калі ты злуешся ці радуешся, нават адчуваю, калі ты штосьці хочаш сказаць і маўчыш,— тады ты дыхаеш не так... Цяпер я толькі паверыла, што могуць яшчэ кахаць людзі і ёсць, жыве яно, гэтае каханне... Ідзі цяпер, я хачу пабыць адна.

— Добрай ночы, — сказаў я і, прызнацца, зарадаваўся, што яна так сказала, адпусціла,— відаць, рашыла, што і мне лепш пабыць аднаму, падумаць. Я задумаўся: цяпер нельга нават гаварыць і не думаць, трэба ўсё добра ведаць, сачыць за кожным сваім словам, за кожным сваім крокам.

«Божа мой, якое яно, гэтае жыццё! Як цяжка быць сталым, пачынаць стала жыць...»

У тую ноч я сагрэўся хутка, але доўга не мог заснуць, думаў пра сябе, Ларысу, што будзе заўтра.

## 13

Было цёпла, выяснілася, і мы, мужчыны, выйшлі пакурыць, прасвяжыцца. Бегалі па двары і радасныя дзеці, біліся снежкамі, выслізгалі сцежку і коўзаліся па ёй, піхаліся, крычалі і смяяліся.

— Усё жыццё наша праходзіць у гэтым крыку, смеху,— сказаў Міхась Рыгоравіч,— дзеці мяняюцца, а для нас яны аднолькавыя.

— Гэй, Карпека!— закрычаў дырэктар.— Хадзі сюды, падшыванец!

Светлавалосы пяцікласнік перастаў бегаць, апусціў галаву і падышоў да нас.

— Ідзі, прынясі той куст, што зламаў,— вярнуў яго дырэктар.

Вучань паслухмяна прынёс зламаныя галіны, прыпыніўся і апусціў галаву.

— Ты і дома па кветках, кустах бегаеш? — спытаўся ў яго Іван Сямёнавіч.

— Не...

— Дык чаго ты тут пасадкі ломіш? — дырэктар узяў гэтыя дубцы і патрос імі перад вучнем. — Дык ці можна ламаць? Чаго маўчыш?

Вучань сказаў, што не будзе больш бегаць, і адышоўся.

— Дзеці,— прамовіў я.— І мы так бегалі...

— Ды не трэба цяпер патураць,— сказаў дырэктар.— Як быццам гэта мне толькі аднаму трэба глядзець за партамі, частаколам, дрэвамі.

— Вы трохі груба з ім абышліся,— сказаў я,— ён пакрыўдзіўся.

— Дык выходзіць, што я павінен быў хваліць яго? Ці баяцца, што паважаць, слухаць на маіх уроках не будзе? Не, пакуль я дырэктар, то яны мяне будуць баяцца. Ды і вы, калі што якое, то да мяне шумліўца адразу вядзіце.

— Раней і настаўнікаў баяліся,— уставіў сваё слова Міхась Рыгоравіч.

— І вучыліся лепш, — дадаў Іван Сямёнавіч.— А цяпер вучань можа аблаяць настаўніка, і часта ў гэтым толькі сам настаўнік вінаваты. З вучня, калі патрабуеш, то будзе толк, распусціш — тады плач...

— І ўсё ж з дзецьмі трэба быць ветлівым,— стаяў я на сваім.

— Пачакай, гэта ты яшчэ толькі адну восень робіш, — парабі гадоў пяць, я пагляджу, якія тады ў цябе будуць нервы. Канечне, Уладзімір Пятровіч наш захавае іх. Іду сёння па калідоры і чую: пяцікласнікі шумяць, аж клас, здаецца, паднімаюць. Адчыняю дзверы — дзеці бегаюць, б'юцца, а Уладзімір Пятровіч сядзіць за сталом, сабе работу ў інстытут рыхтуе. «У нас самастойная работа цяпер»,— апраўдаўся.

— О, ён робіць важна,— падтрымаў дырэктара Міхась Рыгоравіч,— абы даць урок, абы прабыць дзень у школе, каб толькі было гэта ў зарплатнай ведамасці. А дзеці ўсё ж гэта бачаць.

— Ды цяпер яны яшчэ такія хітрыя...— сказаў дырэктар,— кіно, тэлевізар, кабінеты — усё ёсць, а вучыцца ахвоты не прыбаўляецца. І ў нас добра вучыць жадання мала: адны — старыя, стаміліся, другія — маладыя, лянуюцца.

«Не так усё гэта проста,— падумаў я,— мы кожнага дня гаворым, што дзеці не хочуць вучыцца, але ніхто не скажа: чаму? Хоць бы хто прасачыў за якім вучнем, паглядзеў за ўсім яго рабочым днём».

Мы вярнуліся ў настаўніцкую..

— О, боты новыя! — усклікнуў Іван Сямёнавіч, аглядаючы боты на нагах настаўніцы біялогіі. Тая збянтэжылася і схавала ногі, пасля закрыла іх хусткаю.

— Добрыя боты,— гаварыў дырэктар. — Цяпер ужо хлопцы павінны вас заўважыць і ацаніць. О, як сёння нафарбавалася Ада Іванаўна, на вочы, мусіць, сажы з паўпуда намазала,— і засмяяўся, за ім зарагатаў Міхась Рыгоравіч.

— Смяюцца ўсе, церпяць знявагу,— сказала ціха мне Ларыса.

Я згадзіўся, кіўнуў галавою.

— Аб чым вы там усё шэпчацеся? — падышла да нас Вольга Піліпаўна.— Усё нешта сакрэтнічаеце, не падабаецца вам усё ў нашай школе.

— Чаму не падабаецца? — спакойна сказала Ларыса.— Школа як школа. Але ж можна і падумаць, сказаць штосьці сваё.

— А вы гаварыце, каб усе чулі,— халаднавата сказала жонка дырэктара.— Я ж па вас бачу, што не падабаецца вам Іван Сямёнавіч.

— Ён жа не маладзёнак-халасцяк, што павінен падабацца,— не ўтрымалася Ларыса.— Вам спадабаўся, дык вы і выйшлі за яго замуж...

— Ох! — выдыхнула Вольга Піліпаўна і адвярнулася. Відаць, стрымлівала сваю злосць, сказала толькі: — Калі будзеце дырэктарам самі, то і заводзьце свае парадкі. А пакуль другія тут, то падпарадкоўвайцеся і не жартуйце так са старэйшымі калегамі: вы — дачка мне...

— Распарадку школьнага я не парушаю,— стрымана адказала Ларыса,— Вы, калі ласка, не блытайце адно з другім,— і пайшла на калідор, хоць мы ўсе зразумелі, што яна хацела сказаць.

— Ох, дзевачка! — сказала толькі Вольга Піліпаўна.

— Перастань,— спыніў жонку Іван Сямёнавіч.— Чаго ты прычапілася да яе?

— А ты патурай больш!— узлавалася на яго жонка.— Яны, нашыя маладыя, яшчэ пакажуць сябе, сядуць табе на шыю.

— Не выдумляй,— суцешыў яе Іван Сямёнавіч,— можа, мы замнога да іх прыдзіраемся...

Вольга Піліпаўна хмыкнула і нічога больш не прамовіла. Дырэктар сеў, таксама маўчаў, а пасля стаў чытаць газету. Ідучы на ўрок, я падышоў да Ларысы, супакоіў яе.

— Не трэба,— сказала яна.— Проста я не хачу смяяцца, калі смяецца Іван Сямёнавіч, не хачу абгаворваць за вочы сваіх калег, калі абгаворвае яго жонка, не хачу кожнага дня пытацца ў яе, як яе здароўе, ці добра еў сёння іхні парсюк...

Я і сам, калі пажыў, папрадаваў у школе, прыглядзеўся да Івана Сямёнавіча, то ўбачыў, што ён любіць пасмяяцца з каго-небудзь. Многія не любяць, а то і баяцца яго жартаў, а жартаваць ён умее, можа прыкмеціць такую дробязь і так высмеяць яе, што пасля тыдзень не паднімеш на яго вачэй. Яму толькі быць Крыловым, Салтыковым-Шчадрыным ці Сервантэсам, а так вялікі яго талент прападае на падкавырачкі.

...Калі цяпер я зноў перачытаў «Гора ад розуму», сам убачыў, як я глыбей глянуў на Фамусава, Чацкага, Малчаліна, як выдатна пісаў Грыбаедаў, як ён умеў бачыць, любіць і ненавідзець...

Я хацеў, каб гэта добра зразумелі і мае васьмікласнікі, каб яны нават за гэты час падраслі, пасталелі, многа чаго ўбачылі, прачытаўшы «Гора ад розуму». Яны смяяліся, калі я чытаў, як выкручвалася, маніла Ліза Фамусаву, добра слухалі тое месца, дзе апісвалася, як з-за мяжы «прыляцеў» Чацкі...

Прыйшоў назаўтра я на ўрок і пачаў апытваць. Тое, што чыталі, разбіралі ў класе, расказалі добра. Пра тое, што давалася чытаць дома, ніхто сам не прасіўся адказваць.

Я не люблю такіх урокаў. Люблю, калі вучні паднімаюць рукі, просяцца адказваць, многа гавораць, нават не вытрымліваюць і выкрыкваюць з месца, не згаджаюцца і просяць расказаць пра тое, чаго няма па праграме.

Сёння яны былі вялыя і нецікавыя, апускалі галовы. Я зразумеў, што не чыталі дома, а калі і чыталі, то не разабраліся: хацелі чытаць легка, не задумваючыся, а трэба было ўдумвацца ў кожнае слова...

Я спытаўся яшчэ раз, хто хоча гаварыць, але ўсе маўчалі. Мне стала крыўдна, што ніхто не хоча; значыць, няма ў класе тых, хто па-сапраўднаму моцна любіў літаратуру, тое, што вельмі люблю я, выкладаю ў школе, што стала маім жыццём.

Я стаў выклікаць па журнале. Ніхто не мог нічога сказаць талковага. Пераказвалі, як пісалася ў кнізе, не бачылі, што было пад радком... Так жа яны раней не маглі зразумець «Недарасля», вершаў Рылеева, Дзяржавіна, і я падумаў, што нядобра ў школе выкладалася літаратура, настаўнікі не вывучалі з вучнямі яе, а толькі гаварылі пра яе. А дзяцей трэба вучыць так, каб яны ўсё разумелі, умелі думаць. Ох, уздыхнуў я, як гэтага дабіцца?

— Што — усяму класу двойкі ставіць? — спакойна спытаўся я.— Такая сіла, моц, прыгажосць, а вы не чытаеце...

— Нецікавае, Павел Мікалаевіч, гэтае «Гора...»,— сказаў Іван Пакрыла, сын дырэктара саўгаса.— Вось каб «Следства вядуць знатакі» ці які шпіёнскі фільм расказаць... А гэта нудна.

— Каб мы так, Ваня, адносіліся да фізікі, матэматыкі,— перапыніў я яго,— то не было б у нас Курчатава, Келдыша, Каралева, не было б атамных электрастанцый і ледаколаў, палётаў на Месяц.

— Павел Мікалаевіч, то ж матэматыка, фізіка,— усміхнуўся Іван, — а гэта — «Гора ад розуму». Тата мой кажа: ты зубры матэматыку, фізіку і хімію, гэта галоўнае, а кніжак ты пасля начытаешся... Ён сам толькі хімію добра вучыў, бо хацеў аграномам стаць. Цяпер ніякіх кніжак не чытае, толькі фільмы глядзіць, гаворыць: «Мне і без раманаў, вершаў тых клопатаў і думак хапае».

Я, мусіць, пачырванеў, бо ўзлаваўся: не люблю, калі хто так зняважліва гаворыць пра літаратуру. Наш Міхась Рыгоравіч і то маракуе, што многа на яе даюць гадзін, лепш прыбавілі б на матэматыку. Цяпер век фізікі і матэматыкі, кажа ён.

Клас заціх, глядзіць на мяне, чакае, што я скажу. Іван Пакрыла амаль на кожным уроку спрачаецца з настаўнікамі, і маладыя настаўнікі баяцца яго,— каб не падлавіў на якой дробязі. Вучыцца ён слабавата, але здольны, смелы, задзірысты,— што ён скажа, тое робіць увесь клас. Гаварылі з бацькам, прасілі памагчы — нічога не змянілася...

— Добра, што ты сказаў тое, што ты думаў,— сказаў я і ведаў, што гэтым крыху саб'ю яго задзірыстасць.— Згодны з табой, што мастацкая літаратура непасрэдна не ўплывае на развіццё сучаснай фізікі, хіміі, кібернетыкі ці біёнікі. Але вялікі Эйнштэйн неаднойчы гаварыў, што ў яго думках пра тайны космасу яму вельмі памаглі творы вялікага Дастаеўскага, памаглі рабіць адкрыцці.

— Толькі памаглі,— злавіў мяне на слове Іван Пакрыла.

— Ты пачакай, паслухай,— стрымана сказаў я,— Вось яшчэ адзін вучоны, Ламаносаў. Асабліва ім хваляцца фізікі, хімікі і матэматыкі. Цудоўна! Але ж вялікі памор быў вялікі не толькі ў руднай справе, але і ў паэтычнай прасодыі. Ён не толькі стаў поплеч з вялікімі вучонымі Лавуазье, Лапласам, Эйлерам ці Франклінам, але і заснаваў навуковую граматыку рускай мовы, стаў адным з вялікіх паэтаў свайго часу. Усе лічаць, што ў яго рабоце паэзія дапамагала фізіцы так, як фізіка — паэзіі. Другі вялікі вучоны, Барадзін, пісаў музыку, а хіба мала значыць для людзей геніі слова Пушкін, Талстой, Бальзак...

— Тата гаворыць, што цяпер Пушкіных няма,— махнуў рукою ўсё той жа Іван,— многа паэтаў, але так ніхто не напіша.

— Не ведаю, ці так іменна гаворыць твой тата,— сказаў я,— ды тут іншая гаворка...

— Ну, цяпер матэматыка ды фізіка болей чаго дае,— зноў не ўтрымаўся Іван,— болей чым «Гора ад розуму»,— усміхнуўся, глянуў на клас — усміхнуліся і хлопцы, дзяўчаты стрымаліся і глядзелі на мяне, чакалі маіх слоў.

— Мы жывём у атамны век,— стараўся не расхваляваца, абараняўся я,— і бачым, што свет цяпер ідзе такім шляхам, што «прафіліруючымі» навукамі сталі навукі фізіка-матэматычныя, звязаныя з тэхнікай. Таму воляй-няволяй мы гэтым навукам аддаём першае месца на «шумным балі ведаў».

— І я гэта гаварыў,— усміхнуўся Іван, глянуўшы на сваіх сяброў.

— Памыляюцца тыя,— сказаў я і не паглядзеў на гэтыя ўсмешкі,— хто думае, што чалавек можа быць вялікім, разумным, калі будзе ведаць толькі тыя навукі, якія выйшлі цяпер уперад. «Прафіліруючымі» для росту асобы з'ўляюцца ўсе кругі навуковага пазнання, гуманітарныя навукі таксама,— сказаў я і падумаў, што, мусіць, незразумела гавару, трэба неяк прасцей сказаць, дадаў: — І пашана на гэтым «шумным балі ведаў» «Гору ад розуму», «Анегіну», «Вайне і міру», «Новай зямлі», «Ціхаму Дону», «Людзям на балоце»...

Іван скрывіўся, але змоўчаў. Я ў душы ўзлаваўся на яго, але стрымаўся, не крыкнуў «замаўчы!», сказаў:

— Вось чаму вучыць, развіваць вас, моладзь, на фундаменце толькі адной з гэтых ліній развіцця чалавечай культуры ніхто не збіраецца, хоць той-сёй і пасміхаецца з гуманітарнага, не цэніць яго, але некалі зразумее, што «Гора ад розуму» шмат чаго дасць, паможа зразумець такіх чацкіх, малчаліных, якія ёсць і сёння, дапаможа і самому стаць чалавекам. Па літаратуры мы пазнаём эпоху, час, людзей, мы глыбей можам вывучыць саміх сябе.

Я папрасіў адкрыць кнігі, пачаў чытаць п'есу і расказваць, тлумачыць.

Празвінеў званок. Вучні, як раней, не ўскочылі са сваіх месц і не пабеглі ў калідор, а павольна падняліся і падышлі да мяне.

— А скажыце, Ленін чытаў «Гора ад розуму»? — спытаўся мяне выдатнік Мікола Купрэй.

— Канечне,— сказаў я,— Ленін вельмі добра ведаў рускую літаратуру.

— А праўда, што і цяпер ёсць такія Малчаліны?

— Відаць, ёсць,— сказаў я.

— А хто Малчалін у нашым саўгасе? — спыталася Ніна, бойкая вучаніца.

— Не ведаю,— усміхнуўся я.

— А мы ведаем,— сказала Ніна.— А наш дырэктар падобен на...

— О, так не трэба,— перапыніў я яе,— так не трэба. І вельмі непрыстойна.

— Вы, Павел Мікалаевіч, таксама баіцеся яго?

— Чаго мне баяцца, ён — мой калега.

— А мы баімся яго.

— Не трэба баяцца,— сказаў я.— Трэба паважаць і слухаць,— і ўсё роўна ўбачыў, што не пераканаў іх, што яны недалюбліваюць Івана Сямёнавіча.

Яшчэ я падумаў, ідучы ў настаўніцкую, што ўсё ж я слаба гавmanaged. Толькі адчуў, як нялёгка, але добра быць настаўнікам, вучыць

дзяцей; але буду настаўнічаць, і не таму, што больш нічога рабіць не ўмею, а таму, што школа за гэты час паспела мне спадабацца.

Толькі цяпер я адчуў сябе настаўнікам, які зробіць тое, чаго іншыя не зробяць.

## 14

Нядобрым быў гэты дзень і для Ларысы: спярша яе невядома за што папракала Вольга Піліпаўна, а пасля яе засмуцілі васьмікласнікі.

У гэтым класе Ларыса вяла нямецкую мову. Са старэйшых настаўнікаў ніхто па-нямецку не ўмеў чытаць і пісаць, дык спачатку нямецкую мову вёў я, але пасля некалькі гадзін далі і Ларысе.

Хвілін за дзевяць да канца ўрока Ларыса, як яна сама расказвала пасля мне, напісала на дошцы колькі сказаў і выклікала перакласці іх самага шумнага вучня — Івана Пакрылу. Той паглядзеў на сказы, падумаў, а пасля паклаў крэйду на палічку.

— Што такое? — спыталася Ларыса, якая была ўвесь урок разгубленая.

— Гэтыя сказы, Ларыса Іванаўна, нельга перакласці і за пяцігодку,— адказаў вучань.

— Што гэта значыць? — успыхнула Ларыса, якая яшчэ з перапынку не магла супакоіцца.

— Словы вашы напісаны не зусім правільна і артыклі пераблытаны.

— Ты не запісаў слоўнікавых слоў і не запомніў іх,— злавалася ўжо Ларыса, — Я пастаўлю табе зараз двойку.

— Новыя словы раней вы запісалі з кніжкі правільна,— сказаў вучань,— а вось сказы запісалі цяпер няправільна.

— Ты — грубіян! — не ўтрымалася Ларыса.— Садзіся! І не думай, калі твой бацька...

Іван не даслухаў, павярнуўся і выйшаў з класа. Ларыса разгублена глядзела яму ўслед, пасля не вытрымала, не дачакалася званка, а схапіла журнал і прыбегла ў настаўніцкую. Кінула на стол журнал, села на канапу і закрыла твар рукамі.

— Што такое? — спытаўся Іван Сямёнавіч.

Ларыса маўчала. Мусіць, моўчкі плакала.

Празвінеў званок, і ў настаўніцкую пачалі заходзіць настаўнікі. Дырэктар паслаў Уладзіміра Пятровіча, класнага васьмікласнікаў, схадзіць да дзяцей і спытацца, што было на ўроку.

Уладзімір Пятровіч хутка вярнуўся і расказаў, што здарылася.

— Самім яшчэ вучыцца трэба, а не фарсіць,— сказала Вольга Піліпаўна,

— Перастань! — Сыкнуў на яе Іван Сямёнавіч.

Вольга Піліпаўна сціснула вусны, схапіла стос сшыткаў і, раззлаваная на мужа, выскачыла на калідор.

— Разбярыце гэты выпадак на камсамольскім камітэце,— сказаў дырэктар піянерважатай, і тая пабегла сказаць, каб засталіся, не ішлі дамоў камсамольцы: урокаў больш не было, і дзеці маглі паразыходзіцца.

На камітэт пайшлі і мы, настаўнікі, толькі Ларыса засталася ў настаўніцкай. Камсорг Ніна Пятрэвіч, збіваючыся, чырванеючы, адкрыла сход, абвясціла парадак дня — «Аб невучнёўскіх, некамсамольскіх паводзінах Івана Пакрылы».

Той даволі бойка сказаў, што ён зрабіў на ўроку, напісаў словы так, як іх напісала настаўніца, а пасля паправіў, як трэба пісаць, пераклаў сказы. Стаяў ля дошкі і пасміхаўся.

— Што будзем рабіць? — спыталася камсорг.

Дзеці маўчалі, піянерважатая паглядзела на Івана Сямёнавіча, Міхася Рыгоравіча, Уладзіміра Пятровіча.

— Хай папросіць прабачэння ў настаўніцы за нетактоўнасць,— сказаў я.

— Не буду,— адказаў Іван.

— Як гэта — «не буду»? — спыталася піянерважатая.

— Я не вінаваты перад ёю,— сказаў Іван.

— А чаго ты пайшоў з класа? — спыталася піянерважатая.

— Яна мяне знявважыла. Я пайшоў, каб не нагаварыць...

— Не будзеш прасіцца? — спыталася піянерважатая.

— Не.

— Тады галасуем,— сказала піянерважатая камсоргу. Дзяўчаты і хлопцы паднялі рукі, каб Іван першы падышоў да настаўніцы і папрасіў прабачэння.

— Трэба больш да ўрокаў рыхтавацца, Ларыса Іванаўна,— зайшоўшы ў настаўніцкую, сказаў Іван Сямёнаві.— А ты, Пятровіч, зайдзі да Пакрылы, раскажы яму пра сына.

— Ларыса Іванаўна, не перажывайце,— калі ўсе акрамя мяне, выйшлі, сказаў Алесь Трахімавіч.— Я разумею, чаго вы сёння расхваляваліся, памыліліся ў класе... І мы, маладыя, памыляліся, і цяпер, пасля стольжіх гадоў работы, зрываецца часамі памылка. Важна не тое, што настаўнік асекся. Важна тое, як ён пасля сябе павядзе. Узлуецца, будзе крычаць — палічаць вас дзеці за недавучаную, зусім паважаць не будуць. Вучань сказаў, што няправільна запісана, настаўніку можна лагодна ўсміхнуцца: «Праўда? Давайце разбяромся! Сапраўды, праўда! Малайчына, разумны, уважлівы! Так як запісана

нельга перакласці. Прашу прабачыць, дзеці. Давайце паправім. Правільна».

Ларыса нават нечакана для мяне ўсміхнулася.

— Я так рабіў,— прамовіў Алесь Трахімавіч,— і дзеці мне верылі, здаецца...

— Дзякую, Алесь Трахімавіч,— сказала Ларыса і паклікала мяне ісці разам дамоў,— і я нешта зраблю такое заўтра...

Алесь Трахімавіч усміхнуўся, зірнуў на нас і паківаў галавою; зноў усміхнуўся; ён, відаць, маладзеў з намі, успамінаў сваю маладосць...

Вечарам я пайшоў да Ларысы. Яна сядзела і афармляла газету для чырвонага кутка свінагадоўчай фермы; колькі мы ні прасілі заатэхніка, ветурача памагчы — адмаўляюцца. Дадуць лічбаў, назавуць людзей — і стараюцца збегчы: вы, настаўнікі, умееце пісаць, дык і пішыце, а ў нас і сваёй работы многа...

— Ну, як настрой? — спытаўся я.

— Ай,— адмахнулася яна.— Трэба неяк спакайнейшай быць. Табе гэта ўдаецца, а мне не.

— Што там удаецца,— сказаў я,— сярэднія ўрокі...

— Цябе дзеці палюбілі,— не згадзілася Ларыса.— Ты мужчына, цябе болей слухаюць, а я часамі гавару, даказваю, ледзь не крычу, а яны — сваё. А дырэктару нічога не скажаш, ён адкажа табе адно: ты вядзеш урок — ад цябе і ўсё залежыць. Не ўдаецца — трэба было не ісці ў школу, шукаць лягчэйшай работы. Дык у мяне, мусіць, і таленту вялікага няма быць настаўнікам: умець расказваць, зацікавіць дзяцей, павесці іх за сабою...

— У нашай школе Алесь Трахімавіч, мусіць, толькі такі,— сказаў я.

— І цябе Іван Сямёнавіч хваліць, гаварыў сёння Уладзіміру Пятровічу, каб вучыўся ў цябе як урокі даваць, да дзяцей звяртацца, заваёўваць аўтарытэт.

— Я проста, можа, хутчэй падключыўся, паробіш — у цябе выходзіць будзе.

— А ўсё-такі талент трэба...

— Ды не выстаўляйся ты бяздарнасцю,— не вытрымаў я.— У інстытуце ўсё амаль на пяцёркі здавала, а тут заплакала. Усе мы яшчэ толькі пачынаем рабіць, і адзін бог ведае, што будзе з нас праз пяць ці дзесяць гадоў... Можа, яшчэ абрасцём тут гаспадаркамі, садкамі, пчолкамі, зусім забудземся пра «души прекрасные порывы», будзем толькі жыць ад васемнаццатага да васемнаццатага, напіхаць панчоху грошыкамі...

— Пра гэта ўжо і сёння думае твая гаспадыня,— сказала Ларыса,— хоча зрабіць цябе вялікім гаспадаром.

— Не выдумляй, Ленка яе зрабіла пашпарт і паедзе ў горад.

— А табе не шкада? — яна і жартавала, і перажывала.

— Глядзі,— усміхнуўся я ёй, узяў з яе рук ручку і напісаў: «Я цябе л...

Ларыса пачырванела, усміхнулася.

— Я цябе людзям аддам,— сказаў я.

Ларыса прамаўчала, і я зразумеў, што яна пакрыўдзілася на мяне, што я абы-што ляпнуў не падумаўшы.

— І хочацца табе здзекавацца з мяне,— толькі і сказала яна.

— Не злуйся,— папрасіў я,— больш не буду.

— Ладна,— сказала яна і пайшла вячэраць. Зайшла гаспадыня і паклікала перакусіць з імі мяне, але я адмовіўся, сказаў, што пад'еў дома.

— Вас Пётрычыха добра глядзіць, мусіць,— сказала Ларысіна гаспадыня з хітрынкай, але ўбачыла маю стрыманасць і папраўілася: — Ды яна і мае ўсяго, не тое, што я, гаротная ўдава.

Я застаўся адзін. Па радыё перадавалі знаёмую песню, я паслухаў яе і ўспомніў Веру, у якую я закахаўся ў дзевятым класе, з якой перапісваўся колькі гадоў, а пасля яна мне перастала пісаць, напісала: нічога ў нас не выйдзе... Я нямала памучыўся, а пасля быў і рады, што так у нас скончылася: з Верай я толькі нацярпеўся б гора — лёгкая і бяздумная яна была... Адно шчымела сэрца: затое прыгожая і стройная — так міла магла глядзець, смяяцца, было ў яе лёгкае дыханне, высокія грудзі, што ўздымаліся пры смеху...

Але цяпер я не страціў бы з-за яе галавы, не адчайваўся б так, як некалі, хоць і не мог нікога палюбіць, чакаў, што вось-вось сустрэне мяне гэтае каханне; калі Ларыса прызнавалася мне, я не мог паверыць, што яно само, гэтае каханне, прыйдзе за мною ў Міланькі...

Вярнулася Ларыса. Была яна хмурая, нават злосная, прыйшла, села і нават не загаварыла са мною.

— Што такое?

— Нічога,— адмахнулася Ларыса.

— Ты ўзлавалася на мяне?

— Ай, у мяне сваё...

Зайшла гаспадыня, маленькая, гарбаценькая, таксама не сказала і слова, пабралася на ляжак.

Падбіла сабе пасцель і пачала мацаць вянок цыбулі. Я зразумеў, што яна хоча штосьці сказаць нам.

— Пенсіі мне яшчэ не далі,— сапраўды хутка сказала яна.— Гаспадаркі вялікай трымаць не магу, таму грошай мне ледзь на хлеб ды цукар хапае, а свет у нас позна гарыць, накруціць за яго нямала...

— Не бойцеся, цётка,— сказала Ларыса,— буду я плаціць за святло.

— Людскія бабы з мужчынамі, а я век адна гаравала,— як заплакала гаспадыня.

Ларыса мігнула мне, выключыла святло, і мы выйшлі на кухню.

— Ох, заесць яна мяне, Паўлік,— уздыхнула Ларыса.— Кожнага дня бульбаю і сырым салам корміць, чаем поіць. Я трыццаць пяць рублёў ёй плачу. Вушы яна мне прагудзела, што ў яе нічога няма, а сама бакоўку замыкае, праз дзень грошы пералічвае і перахоўвае. Толькі нядаўна парсюка на базу здала, смятану і яйкі на кірмаш валачэ, а мне ўсё плача, што бедненькая, і абы-чым корміць.

— А ты памяняй кватэру,— сказаў я.

— Прыйдзецца, мусіць,— згадзілася Ларыса, села ля акна, да яе падсеў і я.

Узышоў, холадна засвяціў месяц; снегу вялікага яшчэ не было, але ад марозу было бела. І добра было, што на двары холадна, стыла, патрэсквае частакол, а тут цёпла і светла ад месяца, добра, што сядзіць Ларыса, ласкава глядзіць на мяне. Да мяне падкацілася нейкая цёплая хваля, радасць, і я прытуліў Ларысу да сябе, пачаў лашчыць яе галаву.

— Не бядуй,— сказаў я,— пакуль я тут, то не дам табе прапасці.

— Праўда? — яна ўзняла галаву, і я ў святле месяца ўбачыў яе твар, які засвяціўся нейкай жаночай дабратою, радасцю, і сама яна цяпер была добрая, нават прыгожая.

Я глядзеў на Ларысу і не мог зразумець, чаму яна так папрыгажэла, што яе ажывіла, напоўніла, толькі душою адчуў, што да яе цяпер прыліла вялікая сіла, якая робіць жанчыну неразважлівай, але гордай, мужнай, моцнай, калі яна можа зачараваць мужчыну сваім каханнем. Гэтая сіла, усё тое невыказнае перадалося і мне,— я не разумеў, што робіцца са мною. Я пацалаваў Ларысу, задыхнуўся, у галаве маёй затуманілася, і разам з тым я адчуваў, што ніколі так не цалаваў дзяўчат.

— Як я люблю цябе, Паўлік! — прашаптала Ларыса.— А ты любіш мяне?

— Ага,— азваўся я.

— Агацька мой! — сказала яна і прытуліла галаву да маіх грудзей.— Разумееш, хадзіла з Віцем, з другімі — нічога і блізка такога не было, а гэта проста не разумею... Я ўсё зраблю, што ты захочаш,— я нават хачу, каб ты камандаваў мною, заўсёды быў са мною.

— Тады мацней абдымай мяне.

— Ты ўсё жартуеш, а я сур'ёзна. Ты — мае шчасце і мае гора.

— Мусіць, найбольш гора,— сказаў я.— У мяне дрэнны характар, многа благіх прывычак, ды і эгаіст я вялікі.

— А хіба ёсць бязгрэшныя людзі?

— Можа, і ёсць,— сказаў я.

— Тады мы з табой,— прашаптала Ларыса.— Гэты твой кірпаты носік, надзьмутая, вечна злосная твая верхняя губка... Але божа мой, каб уведалі нашы вучні, аб чым тут мы, настаўнікі, гаворым!..

— Пра ўрокі жыцця,— усміхнуўся я,— без чаго і школа не мілая...

— Ох, як успомню пра школу, дык настрой псуецца: зноў будуць глядзець на цябе дзяўчаты, а ты хіхікаць з імі,— сказала Ларыса.— Але табе пара ўжо дадому, ідзі, а то і твая гаспадыня дасць чосу.

Мы выйшлі ў сенцы; пацягнула халадком, было чуваць, як на дварэ патрэсквае, мацнее нанач мароз.

— Ну, бывай,— сказала Ларыса, але я не пайшоў, прытуліў яе, і мы задыхнуліся ў пацалунку, не маглі цяпер разысціся, стаялі і цалаваліся.

І хутка я пачуў, што ў мяне баляць вусны, шчымяць, на іх так і чуецца Ларысіна цяпло.

— Ну, ідзі,— адпраўляла мяне Ларыса, я ступаў, вяртаўся развітацца, і мы зноў цалаваліся, ніяк не маглі разысціся.

## 15

У школу зусім нечакана прыйшла Пакрыліха — жонка дырэктара тутэйшага саўгаса. Была яна ў пуховай хустцы, крыху даўгаватым паліто, у замшавых чорных ботах, убачыўшы якія, нашы дзяўчаты-настаўніцы аж зяхнулі ад зайздрасці.

Як я чуў, гэтая Ада Сямёнаўна не мела ніякага дыплома, не была вялікаю красуняю, і Пакрыла не хацеў яе, сваю былую сакратарку, браць нават і тады, калі яна была цяжарная ад яго. Гавораць, яго прымусілі, і ён ажаніўся, прыдбаў і другое дзіця, але жонкі не любіў.

— Івану часу няма, дык я прыйшла,— сказала цяпер Ада Сямёнаўна.— Што вы ніяк з нашым сынам не паладзіце?

— Гэта сын ваш ніяк з намі не паладзіць,— сказаў я.

Ада Сямёнаўна глянула на мяне, але нічога не сказала, звярнулася да дырэктара школы:

— Я слухаю вас, Іван Сямёнавіч.

Дырэктар расказаў ёй пра ўрок нямецкай мовы, праўда, ён стараўся ўсяляк абараніць Ларысу, зрабіць больш вінаватым сына Пакрылы.

— Ваня гаварыў, што настаўніца памылілася, а ён яе толькі паправіў,— абараняла Ада Сямёнаўна свайго сына.

— Ну, гэты эпізод мы разбіралі на камсамольскім сходзе,— сказаў Іван Сямёнавіч,— і дзеці самі рашылі, што ваш сын павінен прасіць выбачэння перад Ларысай Іванаўнай, хоць ён і не думае гэтага рабіць. Мы вас яшчэ выклікалі і з-за другога: сын ваш часта хуліганіць на ўроках — кідае настаўнікам зневажальныя рэплікі, прымушае дзяцей не адказваць, маўчаць, зрывае ці крэсліць насценную газету, калі яго пакрытыкуюць.

— Бо некаторыя настаўнікі і прыдзіраюцца да яго,— Ада Сямёнаўна расчырванелася, не даслухала Івана Сямёнавіча.— Вось хто ў восьмым вядзе літаратуру?

— Я,— азваўся я.

— Чаму вы парторгавай дзевачцы за чвэрць паставілі чатыры, сыну эканаміста вывелі нават пяць, а нашаму — дык толькі тры?

— Яны лепш ведаюць, болей вучаць, чым ваш сын.

— А я б гэтага не сказала,— запярэчыла Ада Сямёнаўна.— Усе яны часта ў нас збіраюцца, гуляюць ці тэлевізар глядзяць, дык я сама апытвала іх — усе яны аднолькава ведаюць літаратуру, наш яшчэ і больш фільмаў глядзіць... Ён усё — самае малое — на чатыры ведае. Ды хлопцу цяпер і не вельмі трэба гэтая літаратура, яму трэба добра ведаць матэматыку...

— Але ж спецыяльная пастанова выйшла, што цяпер і сачыненне і дыктоўка — тыя ж «прафіліруючыя» прадметы,— сказаў я.— Так што кожны адукаваны чалавек павінен ведаць не толькі фізіку, матэматыку, але і літаратуру. А сын ваш яе не хоча ведаць, чытае толькі дэтэктывы, гаворыць, што яго бацька ўладзіць у інстытут на агранома і ніякая літаратура яму не трэба...

Ада Сямёнаўна ўспыхнула, глянула на мяне і не ведала, што сказаць.

— Схадзі, Павел Мікалаевіч, паглядзі, чаго там дзеці шумяць,— мусіць, наўмысна адаслаў мяне на калідор Іван Сямёнавіч.

Я паслухаў і выйшаў.

У мяне была «фортачка», і я згадзіўся пайсці разам з Ларысаю ў восьмы на ўрок нямецкай мовы — пасядзець, паглядзець, як будзе сябе паводзіць Пакрыла.

Ларыса зайшла ў клас, павіталася — дзеці таксама прывіталіся і сядзелі як укапаныя, нават не варушыліся. Відаць, адчувалі няёмкасць перад настаўніцай.

А яна, нічога не гаворачы, запісала на дошцы сказы, глянула на клас:

— Ну, хадзі, Іван, выпраў памылкі,— сказала, усміхнуўшыся, Ларыса.

Пакрыла нехаця падняўся, прыйшоў да дошкі, сцёр адзін артыкль, напісаў новы, больш не знаходзіў памылак. Тады Ларыса ўзяла з рук вучня крэйду і паправіла ўсё сама.

— Хто яшчэ заўважыў на мінулым уроку гэтыя памылкі? — спыталася яна.

Дзеці маўчалі.

— Ну, што ж, Іван, ты самы ўважлівы быў тады,— усміхнулася Ларыса.— Я, можа, і дарэмна пагарачылася. Была расхваляваная і не заўважыла, як дапусціла памылкі. А гэта яшчэ раз даказвае, што да ўсяго, здаецца, нават і прасценькага, трэба падыходзіць сур'ёзна і ўважліва...

Дзеці пераклалі сказы, адчулі сябе смялей, ажывіліся, Ларыса пачытала ім па-нямецку, дала новыя словы, і яны пачалі перакладаць далей тэкст самі.

...Ужо вечарам Ларыса расказвала мне, што пасля ўрокаў яе чакаў на двары Іван Пакрыла, таптаўся, бянтэжыўся, пасля папрасіўся:

— Я не буду болей так, Ларыса Іванаўна...

— Ладна, Іван, згода,— усміхнулася Ларыса, нацягнула яму на вочы вушанку.

## 16

Канец лістапада прынёс школе і мне асабіста многа нечаканасцей. Пачалося ўсё з таго, што ў райана выклікалі нашу настаўніцу біялогіі Людмілу Карпаўну і сказалі ёй пераязджаць у другую вёску. Людміла Карпаўна, якая працавала першы год у школе, паспела палюбіць Міланькі, ёй не хацелася выязджаць. Яна плакала і расказвала, што да нас на яе месца прыйдзе тутэйшы аграном, які ідзе з саўгаса «па ўласнаму жаданню» і хоча дацягнуць год да пенсіі ў школе. Людміла Карпаўна плакала, што Іван Сямёнавіч пра гэта ведаў, але нічога не гаварыў, даў згоду адпусціць яе і ўзяць агранома.

Тутэйшага агранома, адзінокую, пажылую жанчыну, я крыху ведаў, бачыў колькі разоў, як яна праязджала на машыне. Чуў пра яе многа. Гаспадыня мне расказала, што гэтая Святлана Міхайлаўна «не баба, а чорт»: баявітая, смелая, п'е, курыць, па-мужчынску лаецца.

Нават гаспадыня здзіўлялася, што бяруць «аграноміху» ў школу, бедавала, што тая ўсіх дзяцей паразганяе.

— Методыкі ў яе ніякай не будзе, гэта я ведаю,— гаварыў Іван Сямёнавіч,— але агарод яна нам зробіць. Будзе ўсяго: і яблыкаў, і бульбы, і памідораў, і капусты...

Для мяне ж лістапад быў нечаканы яшчэ і таму, што сталі выклікаць мяне ў ваенкамат, пагаворваць, што адзенуць хутка на мяне вайсковае; я прасіўся ў начальства, каб цяпер не бралі, далі да

вясны павучыць дзяцей, але мне коратка і ясна сказалі: калі будзе трэба, тады і возьмуць.

— Тады ладна,— згадзіўся я.— Той не мужчына, хто не пабываў у войску.

Пра гэта ўведалі і ў вёсцы, сталі гаварыць, што ў школу прыйдзе «аграноміха», што бяруць у войска «таго маладзенькага, што жыве ў Пётрычыхі», што зажурылася, бядуе Сямёнішына настаўніца, а яшчэ праз колькі дзён да нас з Ларысаю дайшло праз дзесятыя вусны, што «так яно не абышлося, калі позна сядзелі, не палілі святла — настаўніца стала пры надзеі...»

...Педсавет прызначылі на шэсць, але пачаўся ён ля сямі: не было дырэктара. Мы бачылі, як ля шасці гадзін ён выганяў паіць карову, насіў ваду ў хату.

Нарэшце прыйшлі Іван Сямёнавіч і Вольга Піліпаўна, абое разам, задыханыя: спяшаліся.

Пра вучобу і дысцыпліну за першую чвэрць зрабіў даклад Міхась Рыгоравіч.

Апошнім часам я стаў прыслухоўвацца да яго, разумець, што ён за чалавек. Цяпер ён гаварыў пра задачы, якія стаяць перад школай, пра тое, што мы ўжо зрабілі. Ён пахваліў «змястоўныя, выхаваўчыя» ўрокі Івана Сямёнавіча, Вольгі Піліпаўны, Алеся Трахімавіча, сказаў, што стараецца Ларыса, я, пра Уладзіміра Пятровіча, Наталлю Васільеўну і настаўніцу другога класа, з якой даўно не ладзілі дырэктар і яго жонка, прамаўчаў. Затое наваліўся на Людмілу Карпаўну, якую колькі дзён таму назад перавялі з нашай школы ў другую. Аказваецца, яе ўрокі былі і антынавуковымі, і без методыкі, а сама настаўніца была непісьменная, грубая з дзецьмі, зусім не старалася.

Я слухаў і здзіўляўся, чаму не гаварылі такога, калі Людміла Карпаўна была ў нас, калі Міхась Рыгоравіч хадзіў на яе ўрокі і... хваліў яе.

Я слухаў і асцерагаўся, што пакрытыкуюць зараз за літаратурны гурток і мяне: ідзе другая чвэрць, а я выпусціў толькі адну газету і то вершы, апавяданне, надрукаваныя ў ёй, амаль сам напісаў: не пішуць іх дзеці, калі і пішуць, то саромеюцца мне даваць. Але Міхась Рыгоравіч не назваў мяне, сказаў толькі: «Амаль не працуюць у школе гурткі, запушчана пазакласная работа...» Ён яшчэ называў недахопы, упушчэнні па школе, але ніводнага прозвішча настаўніка, які быў вінаваты ў гэтым, не назваў.

— Хто хоча выступіць? — спытаўся Іван Сямёнавіч, калі завуч скончыў свой даклад.

Усе маўчалі і апускалі галовы, тады дырэктар пачаў паднімаць усіх па парадку. Першай ён падняў настаўніцу другога класа, але тая сказала, што з усім згодная, што казаў Міхась Рыгоравіч.

— А што ў вас добрага, дрэннага?

— Дзеці вучацца, толькі не ўсе слухаюцца,— адказала настаўніца.

— Дысцыпліна ў класе, ды яшчэ ў пачатковым, залежыць толькі ад настаўніка,— сказаў Іван Сямёнавіч. Настаўніца села і замоўкла.

Мне многа чаго хацелася сказаць: і пра свае ўрокі, і пра ляноту вучняў, і пра бацькоў, да якіх я заходзіў, пасылаў запіскі,— дзеці па-ранейшаму ўрокі прапускаюць, не чытаюць.

Я і пачаў з таго, што цяжка рабіць першы год у школе.

— Наталлі Васільеўне цяжка: ёй няма ўмоваў. Нам, моваведам, нейкія ўмовы ёсць, але зноў-такі рабіць нялёгка. Можа, і таму, што многае нам не даецца, не выходзіць.

— А мы не думаем вас вучыць,— перапыніў мяне Іван Сямёнавіч.— На гэта вы інстытут канчалі, дыпломы маеце. Калі мы арганізуем для вас яшчэ тут курсы, то гэта дзяржаве дорага абыдзецца.

— Я не пра гэта,— збянтэжыўся я,— я пра другое. Не раз і добра знаеш матэрыял, але не ведаеш, як яго даць. А да нас на ўрокі ходзяць Іван Сямёнавіч і Міхась Рыгоравіч, людзі сталыя, што не адзін год папрацавалі ў школе, сядзяць, слухаюць, штосьці запісваюць, але нічога табе не скажуць, не папpавяць, не адзначаць. Толькі ўжо ад другіх людзей чуеш, што сказалі пра цябе і твой урок. А варыцца ў сваім саку нялёгка...

Я хацеў яшчэ сказаць, што тая ж дзяржава дырэктару і завучу плаціць грошы не толькі за тое, што яны ходзяць на ўрокі настаўнікаў, але і за тое, каб хадзілі часцей, разбіралі гэтыя ўрокі, дапамагалі расці настаўніку, лепш рабіць; думаў, хацеў сказаць, але стрымаўся: не вельмі смелы я быў.

Уладзімір Пятровіч не захацеў выступаць, сказаў, што тут ужо аб усім гаварылі; Алесь Трахімавіч, які быў задрамаў ля грубкі, падхапіўся, гаварыў ясна і разумна пра сваю працу, а пасля падтрымаў мяне, што маладым сапраўды трэба памагаць, а ў нас у школе няправільная з імі работа.

Сам Іван Сямёнавіч гаварыў спакойна, пачаў ён з цытат пра асвету, пасля перайшоў гаварыць пра веды, дысцыпліну, сказаў, што многа мы ўпусцілі за першую чвэрць, і маладыя настаўнікі рабілі напаўсілы, але цяпер за імі будзе большы кантроль, ён і завуч будуць часцей хадзіць на ўрокі, кантраляваць, хваліць, крытыкаваць, папраўляць.

— Я асабліва да вас звяртаюся, маладыя,— закругляўся дырэктар,— вы павінны не толькі гаварыць высокія словы, але і працаваць, ахвяраваць усім дзеля свайго прызвання. Толькі тады мы штосьці зробім у школе.

На гэтым педсавет закончыўся. Усе сталі апранацца і разыходзіцца.

— Дарэмна гарачыўся,— сказаў мне Уладзімір Пятровіч, калі мы выйшлі на школьны двор,— гэта ўсё роўна нічога не зменіць. Ці ты хочаш у начальства прабіцца?

— Нашто гэта мне? — сказаў я.— Няўжо няможна сказаць праўду, каб нешта паправіць, зрабіць лепшым?

— Можна, чаму не,— усміхнуўся Уладзімір Пятровіч,— але ці варта яе заўсёды гаварыць? Ёсць праўда, якую ўсе ведаюць, але якой ніхто не гаворыць. Ды можна так толькі сабе пашкодзіць...

— Калі ваўкоў баяцца, то не трэба ў лес хадзіць,— не здаваўся я.

— Пачакай, смяльчак, ажаніся, пажыві, павыступай,— тады многае ўбачыш,— усміхнуўся Уладзімір Пятровіч.— Будзеш рамантыкам, Дон-Кіхотам — ад бяды не ацярэбішся. Жонка першая адхінецца ад цябе. Пакіне, пойдзе да другога, хто ўмее жыць.

Я глянуў на Уладзіміра Пятровіча — у модным паліто, модных туфлях, з шырокім, па-цяперашняму, гальштукам— і нічога не сказаў.

Мы падаліся са школьнага двара.

— Нам у розныя бакі,— я развёў рукамі.

— Давай, будзь здароў,— усміхнуўся Уладзімір Пятровіч.— Падумай добра.

Я пачакаў дзяўчат і пайшоў разам з імі.

— Але мы сёння крыху падсыпалі свайму шэфу,— радавалася Наталля Васільеўна.— Не такія мы ўжо бяззубыя, як яны думаюць.

## 17

Назаўтра мы, маладыя настаўнікі, хадзілі ў суседнюю вёску, цэнтр саўгаса, на камсамольскі сход. Там мяне выбралі ў прэзідыум, а пасля і ў «начальства» — членам камітэта камсамола саўгаса, даверылі ідэалагічны сектар — выступаць з дакладамі, выпускаць баявыя лісткі і газеты на фермах.

Выбралі ў камітэт і Уладзіміра Пятровіча, даручылі яму думаць пра фізкультуру; праўда, ён і дасюль быў у «начальстве», павінен быў старацца па той жа фізкультуры, але за мінулы год не правёў нічога.

Пасля сходу, калі мы з Уладзімірам Пятровічам сабраліся ісці дадому, да нас падышоў дырэктар саўгаса Іван Карпавіч. Уладзіміра

Пятровіча ён ведаў, часта браў у яго кніжкі, а мяне яшчэ не ведаў, цяпер пазнаёміўся.

— Вы не паэт? — спытаўся ён мяне.

— Не,— усміхнуўся я.

— Звычайна на ваш факультэт ідуць толькі паэты...

— Не, не паэт,— зноў усміхнуўся я.— Няма таленту.

— Вось што, хлопцы, прашу да мяне, пасядзім, так сказаць, культурнаю кампаніяй, пагамонім,— узяў нас за локці Іван Карпавіч, і, прызнацца, ён мне спадабаўся, здаўся не такім сярдзітым, як ягоная жонка.

Мы згадзіліся зайсці да яго.

Дырэктар саўгаса жыў у двухпавярховым доме, на першым паверсе; у кватэры яго было вадзяное ацяпленне, газ, як у горадзе. Убачыўшы нас, сын дырэктара вышмыгнуў з хаты, жонка стрымана прывіталася і пайшла ў другую палавіну. Следам за ёю пайшоў і Іван Карпавіч, яны доўга шапталіся, па асобных моцных словах, што даляталі сюды, я зразумеў, што яны спрачаюцца, жонка не задаволена нашым прыходам. Я кіўнуў Уладзіміру Пятровічу пайсці адсюль, але ён прытрымаў мяне, шапнуў:

— Не спяшы. Ніколі не адмаўляйся ад таго, што даюць,— і шматзначна ўсміхнуўся.

— Я, хлопцы, раніцою з жонкаю крыху схапіўся, дык цяпер злуе,— вярнуўшыся, сказаў Іван Карпавіч, і нялоўкасць, што была дасюль у мяне, прайшла. Тут жа ўвайшла і дырэктарава жонка, прынесла пузатую пляшку з трыма зорачкамі, дастала з халадзільніка каўбасу, з кантэйнера — хлеб. Рабіла яна ўсё гэта моўчкі, незадаволена, і я зразумеў, што яна злуе і на мужа, і на нас.

— Садзіся з намі, Сямёнаўна,— запрасіў яе муж, але яна адмовілася, буркнула, што ёй яшчэ многа работы.

— Баба з воза — каню лягчэй,— усміхнуўся Іван Карпавіч.— Здаецца, так Крапіва пісаў? Ну, будзем, хлопцы, здаровыя.

Мы выпілі.

— З цяперашніх пісацеляў я нікога не ведаю,— закусваючы, гаварыў Іван Карпавіч.— Чытаў Пушкіна, Гогаля, з нашых — Купалу і Коласа. Хто хоць цяпер добра піша, хто самы лепшы паэт?

Я назваў некалькі прозвішчаў.

— Пра некаторых чуў, а каторых упершыню чую,— сказаў Іван Карпавіч.— Няма часу чытаць, калі сваіх папер па горла. Прагартаю толькі газеты ці тэлевізар пагляджу. Сын мой і то больш ведае: то ў школе пачуе, то з журналістамі з раёна гаворыць.

— І ўсё роўна тройку па літаратуры мае,— сказала з другой палавіны дырэктарава жонка.

— Вы, Павел Мікалаевіч, мусіць, вельмі строга да яго адносіцеся,— усміхнуўся Іван Карпавіч.— Парторгаў чацвёрку мае, эканамістава — нават пяцёрку...

— Яны болей за вашага вучаць і болей ведаюць,— сказаў я.— Для мяне ўсе дзеці роўныя.

— Вы ўжо не будзьце такія строгія, — зноў усміхнуўся Іван Карпавіч.— Мы з Іванам Сямёнавічам ды Уладзімірам Пятровічам пасябравалі, разумеем адзін аднаго...

— Ды пастаў ты яму чацвёрку,— сказаў Уладзімір Пятровіч.— Што табе зробіцца: рука самлее? Не раз жа, каму трэба ставіць двойку, ставіш тройку...

— Я не стаўлю,— запярэчыў я.

— Паставіш,— сказаў Уладзімір Пятровіч.

— Мне за гэтым саўгасам няма калі пaглядзець за сваімі дзецьмі,— гаварыў Іван Карпавіч.— А так хочацца, каб яны добрымі людзьмі сталі.

— Ці пабагацее ваш саўгас, Іван Карпавіч, калі вы падпішаце большую ўраджайнасць ці на паперы павысіце надоі малака? — спытаў я.

— Ну, тут грошы,— сумеўся Іван Карпавіч.— Ведаеце, за колькі мільёнаў я адказваю?..

— А я адказваю за навучанне, развіццё, выхаванне чалавека, які пасля, можа, стане на ваша месца,— сказаў я.— І калі я буду яго вучыць..

— Кінь ты высокія словы! — перапыніў мяне Уладзімір Пятровіч.— Трэба жыць жыццём, а не фразамі.

— Ладна, хлопцы,— сказаў Іван Карпавіч, бачачы, што мы можам паспрачацца.— Хай мае тое, што зарабіў. Я пастараюся ўзяцца за яго...

Сядзелі мы і доўга гаварылі пра школу, саўгас.

Калі мы з Уладзімірам Пятровічам сабраліся ісці дадому, Іван Карпавіч сказаў пачакаць крыху, ён зараз пакліча свайго шафёра, і той развязе нас па кватэрах.

— Не трэба,— сказаў я.— Ноч зорная, свежая, пры такім паветры люба прайсціся,— але мяне тузаў Уладзімір Пятровіч, каб я маўчаў.

— Усё ж далека ісці,— сказаў ён, падміргнуўшы мне.

— Тады хадзем, я скажу суседскаму хлопчыку, каб ён збегаў па шафёра,— сказаў Іван Карпавіч, які быў амаль згадзіўся са мною не

чапаць ноччу чалавека, прапусціў Уладзіміра Пятровіча, мяне прытрымаў у парозе, глянуў сваімі жывымі вачамі ў мае і сказаў:

— Малайчына! І заўсёды будзьце такім.

Сказаў і моцна паціснуў мне руку.

## 18

Мяне выклікалі ў ваенкамат, каторых вясковых хлопцаў ужо нават забралі ў войска, і я адчуў, што хутка і мяне возьмуць на год служыць.

Пачынаўся снежань, але да зімы было яшчэ далека: пацяплела, адпаў мароз, зноў дажджы налілі вады. Мокрая зямля не паспявала яе ўсмоктваць, і на двары стаялі лужы, была непралазная хлёпанка.

Аўтобусы ўжо даўно не хадзілі, лепш сказаць, не дабіраліся да нашай вёскі, даходзілі да Агароднікаў, што былі за пятнаццаць кіламетраў ад нас.

Я ў горад не ездзіў, ляжаў дома на канапе і чытаў кнігі ці хадзіў да суседзяў на тэлевізар, быў з Ларысаю; колькі разоў выклікалі ў раённы педкабінет на семінары, але паленаваўся ісці пеша столькі вёрст. А ў ваенкамат трэба — не адмовішся.

Я падняўся рана-раненька і падаўся ў суседнюю вёску, дзе была кантора, але мне там сказалі, што сёння ніводная машына ў раён не пойдзе.

Я занепакоіўся: да горада трыццаць кіламетраў, такая цяжкая дарога,— калі я дабяруся сваімі нагамі, то спазнюся. Але ж трэба быць у ваенкамаце.

Не было ў канторы Івана Карпавіча, кудысьці паехаў яшчэ ўчора і не вярнуўся, а без яго ні аграном, новы чалавек у саўгасе, ні парторг нічым не маглі мне памагчы.

— Пачакайце,— затрымаў мяне на калідоры заатэхнік,— тут збіраецца цішком гаспадарнік у горад ехаць на «лятучцы». Вы падыдзіце да яго, папрасіцеся, каб узяў, але не гаварыце, што гэта я падказаў.

Я пабег шукаць гаспадарніка: толькі ён адзін мог мяне цяпер выратаваць. Яго я не знайшоў, але напаткаў шафера, якога ўжо абкружыла многа людзей і прасіла падкінуць у горад.

— Я яшчэ сам не ведаю, куды мы паедзем,— адмахваўся шафёр.— Ды пусціце вы мяне, дайце схадзіць чаю папіць,— вырваўся, сеў у «лятучку» і паехаў.

Усчаўся дождж, спачатку дробны і цёплы, пасля пагусцеў, пацабаніў, як з вядра. Я з мужчынамі і кабетамі то стаяў ля сцяны канторы, хаваўся ад дажджу, то выбягаў глядзець, куды ідзе машына.

Праз якую гадзіну пад'ехала «лятучка», у кабіне ўжо сядзеў гаспадарнік, сталы, пасівелы мужчына, трое яго дзяцей хадзілі ў нашу школу.

Мы пабеглі да «лятучкі».

— О, вас тут як мышэй сабралася,— вылез з кабіны і сказаў гаспадарнік.— У мяне месца няма ўсім. Ты лезь і ты,— і ён паказаў пальцам, каму лезці.

— Таварыш Бурдзей, мяне ў ваенкамат выклікаюць,— папрасіў я яго.— Дазвольце і мне пад'ехаць.

— Я ж сказаў, што няма месца, ці ты глухі? — Ён падышоў да мяне, адпіхнуў ад машыны.

— То настаўнік, Адольфавіч,— падказаў шафёр.

— А мне што, няхай дзяцей вучыць, а не па горадзе раскатваецца.

— Мяне выклікаюць у ваенкамат.

— Я ж сказаў ясна: няма месца,— Бурдзей зачыніў дзверы «лятучкі» і пайшоў да кабіны.

— Яго трэба ўзяць,— сказаў шафёр.

— Усё роўна ўсіх не возьмеш,— сярдзіта сказаў яму гаспадарнік,— А мне яшчэ трэба пяць мяхоў бульбы прыхапіць, брату завезці. Таксі мне тут знайшлі,— і ляснуў дзверцамі.

Машына паехала.

— Ідзіце, пазваніце ў ваенкамат ці ў райком,— сказалі мне мужчыны, якіх таксама не ўзялі.— Нагрэюць такога начальніка, быць не можа. А то зусім ужо нос задраў — бачыце, яму трэба бульбу завезці...

— Я ў раён зайду,— сказаў я і пашыбаваў пяшком, хоць не верыў, што паспею прыйсці на камісію, але, разгублены і пакрыўджаны, не мог абдумаць усё і пабег.

Я быў такі злосны, што ледзь стрымліваўся, каб не заплакаць, толькі падумаў сабе: калі не забяруць цяпер у войска, то вясною з'еду адсюль. Канечне, такога раю, пра які марыў вялікі Рабле, я не знайду нідзе, але буду старацца паступіць у аспірантуру,— абы з'ехаць адсюль. Не хачу такіх дырэктараў, завучаў, Уладзіміраў Пятровічаў, такіх дарог...

Не паспеў я выйсці з вёскі, падысці да лесу, як ужо прамок, набраў у туфлі гразі, запэцкаў штаны. Калі прыйшоў у лес і мяне тут ніхто не мог бачыць, я пабег.

Я бег і лічыў, за колькі часу я магу дабрацца ў горад. Выходзіла, што за чатыры гадзіны. Пасля я пакаяўся, што не папрасіў у каго веласіпеда, дзе сцежкаю, дзе полем усё ж хутчэй дабраўся б, як пехатою.

За лесам мяне пачала даганяць машына; калі аглянуўся, я пазнаў «лятучку». Я не стаў чакаць яе, заспяшаў подбегай, сышоў з дарогі на сцежку.

— Сядайце,— дагнаўшы, шафёр адчыніў дзверцы і паклікаў мяне.

Я нібы не чуў.

— Сядайце, не злуйцеся,— гаварыў шафёр.— Цяпер машын не будзе, прайшлі ўжо ўсе.

— Дзякую,— сказаў я.— Давязіце хоць бульбу.

— Ладна там выступаць,— не выцерпеў гаспадарнік,— садзіся, пакуль бяру, а то пяшком будзеш перці ўсю дарогу. Ганарлівец мне знайшоўся.

— Гэта мы ў райкоме ўстановім сёння, хто з нас ганарлівец, а хто...— ад крыўды я не мог сказаць тое, што думаў.

— Ён яшчэ палохае. Едзь. Чуеш, я табе гавару: едзь! — крыкнуў Бурдзей, і машына сарвалася, хутка паехала. Я таксама пабег, спяшаўся датуль, пакуль не самлелі ногі. Стаміўшыся, пайшоў спакойна, аддыхваўся.

За паваротам, за дробным алешнікам, зноў убачыў «лятучку». Яна засела ў гразі і буксавала. Яе папіхаў і сам гаспадарнік, і тыя шчаслівцы, якіх ён узяў ля канторы ў будку.

— Пракляў нас, халера,— усміхнуўся Бурдзей.— Але шпарыш добра, як алімпіец!

Я не стаў слухаць яго, пайшоў далей, ішоў многа, пакуль не падабраў мяне трактар «Беларусь». Малады прыгожы хлопец прыпыніўся, запрасіў пад'ехаць, і я палез на прычэп, нагружаны дровамі. Так і даехаў да горада, вымак, накалаціўся ад холаду. У ваенкамаце маёр, як і трэба было чакаць, адчытаў за спазненне.

Але я не пакрыўдзіўся, быў вельмі рады, што паспеў, што прайшоў камісію. Каторым тут жа далі позвы ў войска, мне пакуль што не далі, сказалі ехаць дамоў, працаваць і чакаць.

Дамоў мне таксама пашчасліліла крыху пад'ехаць — падабраў на сваім «казле» дырэктар суседняга саўгаса, а з палавіну дарогі прыйшлося праперці пеша. Вымак, прагаладаўся. Адчуваў, што гэтая дарога так мне не абыдзецца: балела галава, трэсла, ужо не мог пацягнуць носам...

— Вы яшчэ не тое ўбачыце,— пасміхаўся назаўтра Іван Сямёнавіч, калі я расказаў у настаўніцкай пра сваю ўчарашнюю паездку ў горад.— Усіх тутэйшых шафёраў і трактарыстаў я вучыў у школе, але рэдка каторы з іх дроў ці сена прывязе, калі пляшкі не паставіш. А вы ж іх не вучылі.

— Дык дзяцей іхніх вучу,— сказаў я, шморгаючы носам: усё-такі ўчора я добра прастудзіўся.

— Вы за гэта грошы маеце — лічаць яны, хоць за грошы можна па-рознаму рабіць,— сказаў Іван Сямёнавіч.

— Веска цяпер разумная, на ўсё глядзіць цвяроза,— сказаў Міхась Рыгоравіч,— шануе не так талковага чалавека, як «патрэбнага»... Настаўніку звычайна і каня ў апошнюю чаргу даюць бульбу пасадзіць ці выбраць, і траву горшую на лузе выбіраюць.

— Яшчэ вось чаму настаўніку цяжка рабіць,— загаварыў Алесь Трахімавіч.— Вы, мусіць, амаль штодня чытаеце ў газетах, слухаеце па радыё, бачыце па тэлебачанню пра даярак, ткачых, шафёраў, аднагодкаў Паўла Мікалаевіча ці Ларысы Іванаўны. Гэта вельмі добра, што ў нас шануюць рабочых людзей. Але ці часта вы бачылі, каб хвалілі, узнагародзілі медалём ці ордэнам настаўнікаў ў дваццаць тры ці ў дваццаць пяць, а то і трыццаць год? А рабочых людзей у гэтыя гады ўжо ўзнагароджваюць, бачаць, і гэта крыўдзіць маладога настаўніка: дзесяць гадоў ён вучыўся ў школе, пяць — у інстытуце, цяпер стараецца, аддае ўсе сілы, дае добрыя ўрокі, а працу яго мала хто бачыць, калі не лічыць казённых заўваг інспектара.

— З гэтым я згодзен,— сказаў Іван Сямёнавіч.— Бывае так, што вядомасць, прызнанне працы, заслуг прыходзіць да настаўніка, калі ён пастарэе, дажыве да юбілею. У горадзе яшчэ больш бачаць яго работу, а ў нас, на вёсцы, настаўнік знаходзіць прызнанне выслугай год...

— Колькі ў нашай школе рабіла моладзь, як яны стараліся, давалі такія добрыя ўрокі, працавалі год, два ці тры і — уцякалі, ішлі ў райком, газету, міліцыю,— сказаў Алесь Трахімавіч,— Якую ўсё-такі самаадданасць, ахвярнасць трэба мець маладому настаўніку!

— Вось чаму адны настаўнікі папрацуюць у школе і ўцякаюць, другія — б'юцца сумленна і свету не бачаць, а трэція — робяць сабе паціху, напаўсілы ды грабуць капейку,— уставіла слова Вольга Піліпаўна.

— Да гэтага даводзіць вось што,— сказаў Алесь Трахімавіч, і я здзівіўся, што ён так сёння разгаварыўся.— Зразумець і ацаніць працу той жа даяркі ці агранома проста — яна ясна бачыцца ў літрах малака, у цэнтнерах зерня. Усё, чаго яны дабіліся, можна ўбачыць, узважыць. А хто вымерае, узважыць вось тыя цудоўныя якасці — дабрату, патрыятызм,— скажам, Паўла Мікалаевіча, якія ён дае вучням на ўроку літаратуры? А дзеці ж паразумнеюць, падабрэюць, і ад гэтага некалі будзе вялікая карысць. А настаўнік, як і тая даярка, стараўся, рабіў...

— Так што ясна цяпер, чаму вас не ўзялі ўчора на машыну,— усміхнуўся Міхась Рыгоравіч.

— Калі будзе горш рабіць аграном, даярка, адразу ўсе гэта ўбачаць: панізіліся надоі, упаў ураджай,— працягваў Алесь Трахімавіч.— Дадуць дырэктару, а ён насядзе на агранома і даярку. Горш будзе рабіць настаўнік — не заўсёды заўважыць гэта дырэктар ці завуч, бо ён пры іх будзе старацца, паказвацца. І бацькі гэтага не заўсёды заўважаць, ды яны часта думаюць пра нашу работу толькі, калі глядзяць на адзнакі ў дзённіку сваіх вучняў. А адзнакі стаўляем мы. Таму з аграномам, даяркаю, камбайнерам лічацца — не дай бог, падвядзе. А з настаўнікам можна і не лічыцца, урокі ён будзе даваць...

— Я думаў, што ў школе рабіць прасцей,— сказаў, усміхнуўшыся я.— Загадзя ўсё спланавана...

— Спачатку здаецца, што жыць таксама проста,— усміхнуўся Алесь Трахімавіч.— Пажывеш — думаеш: а як далей жыць? Як рабіць, да ўсяго адносіцца? Нехта добра сказаў: добры настаўнік не той, хто бачыць сябе ў настаўніцтве, а настаўніцтва ў сабе. Будзьце такім, Павел Мікалаевіч, і ўсе вы, маладыя,— сказаў Алесь Трахімавіч і задыхаўся, закашляўся.

Я паслухаў яго і паспакайнеў, падумаў, што ўсё ж добра працаваць у школе і трэба толькі быць настаўнікам, нікуды не ўцякаць, а калі палюбіш сваю работу, то зусім іншым, светлым і шчаслівым, здаецца жыццё.

«Буду толькі настаўнікам,— думаў я,— і добрым, шчырым, працавітым, а слава... А слава знойдзе. Ды што пра яе многа думаць, пра гэтую славу».

## 19

Я душою, усім сэрцам адчуў, што не магу без Ларысы, што мне трэба быць з ёю — тых хвілін, калі мы бачыліся ў школе, на кватэры ў Ларысы, мала. Нечакана ўбачыў я, што яна і прыгожая, і разумная, і добрая, здзівіўся, чаму я раней не мог гэтага разгледзець. Цяпер адчуў, чаму так стараецца не адпусціць ад сябе Ларысу і Віктар,— відаць, таксама здолеў распазнаць яе.

Яшчэ ў верасні Ларыса гаварыла мне, што прыехала сюды дзеля мяне,— відаць, і яна знайшла ўва мне штосьці добрае, тое, чаго няма ў другіх. Што? Што ўва мне ёсць такое, што павяло за мною Ларысу?

Мне было ясна адно: пачынаецца мая сталасць.

Ці будзем мы шчаслівыя з Ларысаю? Ці будзе, як у другіх: палюбіліся, ажаніліся, а праз год развяліся? Можа, адразу не варта

завязваць вузла — ці тая Ларыса нявеста, што нарадзілася дзеля мяне?

Я не пайшоў колькі вечароў да Ларысы, сядзеў дома, чытаў, пісаў (гаспадыня ў гэтыя дні паласкавела да мяне, нават смачней карміла). Калі ўбачыў, якая Ларыса стала сумная, ледзь жывая была ў школе, то не вытрымаў, пайшоў да яе.

— Ты? — здзіўлена і неяк сумна спытала Ларыса, адшчэпліваючы мне, і я ведаў ужо, што няма дома гаспадыні: Ларыса, застаўшыся адна, рана зашчэплівае дзверы.

— Што робіш? — спытаў я.

— Што можа рабіць настаўнік-моваед? Гібею над сшыткамі...

— Ох, гора наша, гэтыя сшыткі! — жартаўліва ўздыхнуў я і прытуліў Ларысу да сябе.

Яна неахвотна падалася, схавала твар, прыціснулася да майго пляча. Я пастаяў хвіліну і пачуў, што яна плача.

— Чаго ты? — спытаў я.

— Мне здаецца, што ты толькі жартуеш і водзіш мяне за нос...

Я прамаўчаў: не ведаў, што сказаць.

— Не муч ты мяне больш,— глянула мне ў вочы Ларыса. Я таксама глянуў ёй у вочы, выцер слязінку на яе шчацэ; без слоў мы прыпалі адно да другога і пацалаваліся.

— Я не мучу цябе,— сказаў я,— я сам больш пакутую. Зусім не ведаю, калі шчыра прызнацца, што са мною робіцца. Калі не падурнеў, то стаў, як сонны...

— Чаго, Паўлік?

— І работа, і ты...

— А што я?

— Не ведаю, Ларыса,— сказаў я,— боязна неяк...

— Чаго, Паўлік? Ты не рады, што ёсць я, што ў нас...

— Не, Ларыса,— я доўга падбіраў патрэбнае слова.— Я хачу, каб усё ў нас было добра, каб мы былі шчаслівыя.

— А чаму нам не быць шчаслівымі, Паўлік? — прытулілася да мяне Ларыса, пасадзіла мяне на крэсла і села мне на калені, прыціснуўшыся сваей шчакой да маёй.— Я ж табе, хоць і зусім старамодна, па-старому, але шчыра гавару: я люблю гэты носік, крыўдлівую тваю губку,— пацалавала мяне,— хоць і душою чую, што нешта нас разлучыць.

— Войска,— сказаў я,— Мяне хутка могуць забраць у войска. На цэлы год.

— На цэлы год! — успляснула рукамі Ларыса.— Што я буду рабіць, Паўлік, без цябе?

— Разлюбіш,— сказаў я.— Знойдзеш каго другога.

— Гэта ты забыць мяне можаш. Але яшчэ, можа, цябе не возьмуць.

— Што мы будзем тады рабіць?

— Працаваць у школе.

— І сустракацца кожнага вечара тут? — спытаў я.

— А што?

— Не можам жа мы век хавацца ад людзей, псаваць нервы тваёй гаспадыні...

— Што ты хочаш сказаць? — здзіўлена глянула на мяне Ларыса.

— Трэба думаць, каб быць ужо разам,— сказаў я і крыху засаромеўся.

Пачырванела і Ларыса, паглядзела на мяне, усміхнулася, саскочыла з маіх каленяў і села на крэсле паблізу, толькі вымавіла:

— Ну цябе!..

— Павінна ж гэта некалі быць, не магу ж я да сівых валасоў бегаць да цябе, сядзець да світання, а пасля, не выспаўшыся, бегчы ў школу...

— Пабегаеш.

— Я сур'ёзна, Ларыса — сказаў я,— Людзі ўжо ведаюць, што мы ходзім, нават тое-сёе выдумалі... Нам застаецца толькі пайсці ў сельсавет з заявай.

— Ой!— Ларыса закрыла твар рукамі,— Ты забіваеш мяне без нажа.

— Я не ведаю, як гэта бывае ў людзей,— сказаў я,— але ў нас штосьці...

— Ты пакрыўдзіўся, Паўлік? — Ларыса падышла і зноў села мне на калені. — Усё гэта нялёгка. Я чакала гэтага, але сказаў ты мне цяпер — і я нечага збаялася... Вось што дзіўна. Здаецца, я ўжо даўно гатова быць сямейнаю, некаму жонкаю. Здаецца, з таго часу, як пачала гуляць з лялькамі. Гуляла, імітавала сталых, а пасля гадавала малодшых сёстраў, і гэта была, мусіць, інстынктыўная падрыхтоўка да... Ой, Паўлік, саромеюся...

— У нас з табой першы будзе сын,— сказаў я.

— Перастань такія словы гаварыць! — Ларыса жартаўліва замахнулася, але я перахапіў яе руку, і ўжо ў маім пацалунку яна паспела толькі вымавіць:

— Не...

— Калі ты не хочаш дзяцей,— адпусціўшы Ларысу, сказаў я,— чаго нам тады жаніцца? Сям'я, гавораць,— гэта дзеці, а дзеці — наша будучае.

— Ой, перастань ты са сваімі цытатамі!

— Не будзем жа мы век з табою толькі сшыткі правяраць ды гаварыць пра сваю работу...

— Паўлік, перастань, не гавары так.

— Я гавару тое, што думаю, а ты хітруеш нечага,— сказаў я.— Сама ж гаварыла, што даўно рыхтавалася да сям'і.

— Рыхтавалася,— усміхнулася Ларыса.— Кожная дзяўчына да гэтага рыхтуецца, асабліва вясковая. Вучыцца ад маці шыць, вязаць, варыць.

— І ты ўсё гэта ўмееш?

— Умею.

— Выдатна!

— А ты не радуйся,— сказала Ларыса.— Будзеш і ты посуд, падлогу мыць, з чарпаком бегаць.

— Паглядзім,— прыгразіў я.

— На «двайны» рабочы дзень я не згодна,— сказала Ларыса,— у нас раўнапраўе.

— Ладна,— згадзіўся я,— у нас будзе раўнапраўе пры маім кіраванні.

— Ого, у цябе замашкі манарха.

— Як ва ўсіх мужчын,— сказаў я.— Але, слухай, было б добра, каб у нас быў нейкі інстытут ці якія курсы, дзе можна было б павучыцца, як жыць сям'ёю.

— Якой ты хочаш навукі?

— Яна і ён у сям'і, сямейны бюджэт, дзеці, побыт.

— Не смяшы людзей,— сказала Ларыса.— Такую навуку і сам асвоіш.

— Я сур'ёзна, Ларыса.

— Усё залежыць ад саміх,— усміхнулася Ларыса.— Але, таварыш сямейнік, як бацькам напісаць...

— Проста. Ты сваім пісала ўжо пра мяне, нават абяцала прывезці знаёміцца...

— То я пажартавала,— разгубілася Ларыса,— Ды і Віктара хацела адагнаць...

— А цяпер напішы, што не жартавала,— сказаў я,— а я сваіх не баюся, напішу: так і так. Маці даўно мне сказала: жонкі выбіраць табе не буду, табе з ёю жыць, сам і знаходзь. Але глядзі, не памыліся, не вазьмі якой шэльмы, каб не атруціла табе жыццё. Калі будуць у войска браць, паедзем да нас мяне праводзіць...

— Што ты! — замахала рукамі Ларыса.

— А што мы будзем рабіць, калі мяне цяпер не возьмуць у войска?

— Не ведаю.

— Тады пасля Новага года, на канікулах, і злучым свой лес...

— Што на цябе сёння найшло? — здзівілася Ларыса.

Патухла святло; у хаце стала цёмна, ды цемната была такая густая пасля электрычнасці, што, здаецца, нават сцішэла, стаілася ўсё на свеце. Я не бачыў Ларысы, толькі, працягнуўшы руку, знайшоў яе, прыгарнуў да сябе, і мы моцна абняліся, задыхнуліся ў пацалунку. Павяла галава, і я адчуў, што ўсё вакол плыве, ці гэта я ў паветры плыву, не чую зямлі пад нагамі.

— Ларыса, я застануся сёння,— адарваўшыся ад пацалунка, прашаптаў я, адчуваючы, што гэта павінна быць толькі так.— Чуеш, Ларыса? — шаптаў я, але яна маўчала, здалася нейкаю цяжкою, вялікаю, здавалася, я адпушчу яе — і яна ўпадзе.— Ларыса...

— Не, Паўлічак, не,— таксама прашаптала яна.

— Чаму, Ларыса?.. Я ж толькі твой, ты мне верыш?

— Веру, і я твая, Паўлік,— шаптала Ларыса.— Але сёння ты павінен пайсці дахаты,— і павяла мяне да дзвярэй.

Я спрабаваў абняць яе, але яна не далася, не захацела застацца ў сенцах, як заўсёды, пастаяць тут, пашаптацца, нацалавацца.

— Ідзі, Паўлік,— прасіла яна.— Мне баліць сёння галава, вельмі моцна баліць галава.

— Ты пакрыўдзілася, Ларыса?

— Не, Паўлік, не. Што ты! — сказала яна, цмокнула мяне ў шчаку, выпусціла на двор і тут жа зашчапілася.

— Шчаслівай ночы, Паўлік,— нейкім слабым голасам сказала яна, але рукі з кручка не здымала, ад дзвярэй не адыходзіла.

— І табе шчасліва,— адказаў я.— Якое неба, колькі зорак, відаць, будзе моцны мароз...

— Ідзі, Паўлік,— прасіла Ларыса, і я паслухаў яе, пайшоў, калі, можа, і не трэба было ісці.

Але так хацела Ларыса.

## 20

Мяне даўно хвалявала, што я колькі разоў заводзіў гутаркі з васьмікласнікамі, каб яны болей чыталі, любілі кнігу, разумнелі, дабрэлі,— і не задавальняўся ад свае гутаркі, душою чуў, што я нечага не дагаварыў, многа сказаў не так, як трэба. Мусіць, і дзеці не ўсе і не ўсяму паверылі, бо не вельмі пагарнуліся да кнігі, не павалілі ў бібліятэку.

Я рашыў правесці анкету, дазнацца, што ж яны любяць чытаць і колькі. У горадзе, як гавораць гарадскія настаўнікі, дзеці любяць

чытаць дэтэктывы, фантастыку, а то часамі і «другасортнае», нашы ж васьмікласнікі, як пасля я выявіў, любяць чытаць класіку: «Дуброўскага», «Дрыгву», «Міколку-паравоза»... Амаль ніхто і не заікнуўся пра Агату Крысці ці Жоржа Сіменона, мала ведалі пра Бонда і Шэрлока Холмса, не чулі пра караля рок-н-рола Прэслі.

І я, прызнацца, застаўся рады, што мода ў вёску, да нашых дзяцей, даходзіць не так хутка. Але дзеці прызнаваліся, што многа глядзяць тэлевізар — любяць фільмы, спорт, «мульці»; і нават тое, што чытаюць у школе, стараюцца паглядзець па тэлевізары: «Не трэба тады чытаць».

«Век тэлевізара,— думаў я,— і гэта добра, людзі ўсё бачаць, усё ведаюць. Але ці добра, што «Гора ад розуму», «Яўгенія Анегіна», «Вайну і мір» глядзяць, а не чытаюць?»

Я сказаў пра гэта Міхасю Рыгоравічу.

— І добра, што глядзяць,— сказаў ён.— Музыка, акцёры... словам, усё на воку... Будзе чытаць — толькі адчуе, а тут і ўбачыць...

— Горш, калі і не чытаюць і не глядзяць,— сказаў Іван Сямёнавіч, які чуў, пра што мы гаварылі.

— Але ж пасля гэтага яны не чытаюць твораў,— сказаў я.

— Добра, што хоць паглядзелі,— махнуў рукою Іван Сямёнавіч.— Ды так і цікавей, і часу меней пойдзе.

«Не вельмі ведаеце вы тады, таварышы педагогі, што такое літаратура»,— падумаў я і сказаў пра гэта Алесю Трахімавічу.

— Вось у гэтым і наша, літаратараў, бяда, што нас не ўсе разумеюць,— сказаў мне Алесь Трахімавіч.— Я цэлы век гарую за гэта, але наша дзела — не маўчаць, гаварыць з дзецьмі, вучыць іх разумець літаратуру.

«Трэба пагаварыць з дзецьмі,— падумаў я,— на ўроку для гэтага можна знайсці ўсяго хвілін дзесяць, а тут гаварыць трэба многа. Трэба гаварыць; які ж я пасля таго настаўнік літаратуры, калі дзеці кніжак не чытаюць і не ўмеюць чытаць, трацяць тое, што пасля, можа, не знойдуць, будуць бяднейшымі, і я ў гэтым буду вінаваты... То мне трэба адкрыць ім вочы, узбагаціць душу, навучыць іх радавацца, дабрэць, кахаць і ненавідзець...»

Я папрасіў Уладзіміра Пятровіча дазволіць мне схадзіць у яго восьмы клас і пагаварыць. Ён адмовіўся, сказаў, што праводзіць класную гадзіну ўсё роўна трэба, дык нашто яе адцягваць? Калі я сказаў, што ён можа маю гутарку запісаць на сябе, ён згадзіўся, нават быў рады, што так усё выйшла.

Я, калі прыйшоў да васьмікласнікаў, расказаў, што яны чытаюць, колькі, заўважыў, што гарадскія дзеці чытаюць больш.

— А што ім рабіць? — пачаў першы Іван Пакрыла.— Прыйдуць са школы, пад'ядуць ды чытаюць... А нам трэба бульбу памагчы выбіраць, кароў пасвіць, дровы калоць, сена грэбці.

— Не столькі вы робіце, як гаворыце,— паківаў я галавою,— хоць памагаць бацькам і трэба.

— А яшчэ ўрокі трэба рабіць,— азвалася Ніна, самая бойкая дзяўчынка ў класе,— Ды і кніжак цікавых у бібліятэцы мала, усё нейкія тоўстыя...

— Кнігі і тоўстыя цікавымі бываюць,— адказаў я.— Скажы, Ніна, колькі вось ты можаш чытаць у дзень?

— Гадзіны дзве ці тры,— адказала тая.

— Калі ты будзеш чытаць тры гадзіны ў дзень, то ў месяц — дзевяноста,— падлічыў я,— кнігу ў старонак дзвесце, выходзіць, ты можаш прачытаць за тыдзень.

Значыць, за месяц прачытаеш чатыры. Можаш ты хоць столькі чытаць?

— Павел Мікалаевіч,— зноў пачаў белавалосы Пакрыла,— а мы, хлопцы, любім яшчэ ў футбол, хакей пагуляць, ды што — чатыры кнігі? За месяц па трох праграмах я магу шэсцьдзесят кінафільмаў паглядзець, многа канцэртаў, перадач розных. Ды «Вайну і мір» я паўгода чытаў бы, а па тэлевізары я за чатыры дні ўсё прагледзеў, за гэты час нехта яшчэ і двухсот старонак не прачытае, а я ўжо ўсё ведаць буду...

«Такіх аднадумцаў, толькі сталейшых, разумнейшых, бачыў я яшчэ і ў інстытуце,— падумаў я.— Праўда, навін яны будуць ведаць больш. Яны лепш змогуць «паказацца» пры размовах пра новыя дэтэктывы, пра спорт, адкрыцці. А вось той, які цярпліва, да кожнага радочка, прачытаў тоўстую кнігу класіка, можа не ведаць столькі новага, быць нават «сумным і не модным», хоць ён узяў нешта глыбей, лепш зразумеў лес герояў, філасофію твора, маральную пазіцыю пісьменніка».

— На Захадзе,— сказаў я ўголас,— каб не траціць многа часу на чытанне «тоўстых» кніг, выдаюць спецыяльныя «дайджэсты», у якіх сюжэты кніг класікаў выкладзены на двух-трох лістах. Сёння там многія ўжо задумаліся, ці варта траціць дарагі час на гэтыя старыя кнігі, дзе герой на трыццаці старонках думае, ці можна яму падысці і запрасіць гераіню на вальс, калі сёння і сам «вальс устарэў»...

Васьмікласнікі маўчалі, не перапынялі мяне, не выкрыквалі, з чым яны не пагаджаюцца, а ціха сядзелі і слухалі мяне.

— Але часамі гэтыя вундэркінды стамляюцца ў дваццаць гадоў,— сказаў я,— расчароўваюцца, бо яны мала думалі, хто і чым жыве ў кнізе, чаму яна напісана. А кніга заўсёды сябар, бывае, што адна і тая

ж, а бывае, што з узростам прыходзіць другая і дае адказ на твае новыя пытанні. Бывае так, што ў кнізе і не знаходзіш адказу на свае пытанні, тады звяртаешся да дзённікаў, пісьмаў пісьменнікаў, іх мемуараў.

Я расказаў далей, чаму Чукоўскі назваў Уітмэна сваім, Цвятаева — Пушкіна...

— Мы хочам глыбей разумець жыццё, час,— працягваў я.— Вось тут добрыя кнігі — «пісьмы, адрасаваныя ўсім». Мудры вузялок, завязаны на памяць Векам. Тое, што робіць час,— не заўсёды дабро, але ён ідзе наперад. Насуперак часу, у лад з ім, у барацьбе пісьменнікі стараюцца зразумець яго, нават, калі яны не згодны з ім. Таму настае дзень,— захапіўся і не мог я стрымацца,— калі, нахапаўшыся «вяршкоў», стаміўшыся ад іх мноства, станеш адчуваць у сабе «белыя» плямы. Тады некаторыя пачынаюць думаць: быць такім і далей ці пачаць перавучвацца, засесці за тыя ж «тоўстыя» кнігі, а той, хто іх заўсёды чытаў, далёка абгоніць...

Вучні па-ранейшаму не перапынялі мяне.

Уважліва глядзелі на мяне і слухалі, хоць, можа, і не ўсё разумелі.

— Пра тэлевізар,— працягваў я.— Праўда, за месяц можна ўбачыць сорак, а то і больш кінафільмаў. Цяпер стараюцца экранізаваць «старыя» кнігі, бо яны цікавыя і нават добрыя і ў наш век. Але не прачытаеш «Вайну і мір», убачыш толькі фільм,— то не ўсё зразумееш і пра самога Талстога...

Ніна пацiснула плячыма, азірнулася на другіх; Пакрыла апусціў галаву і вадзіў пальцам па парце, у астатніх дзяцей вочы блішчалі і так добра, нават міла глядзелі на мяне.

Я сеў і звярнуўся да класа:

— Аб чым бы вы хацелі мяне яшчэ спытаць?

Дзеці маўчалі і не завіхаліся падняцца і пабегчы на калідор.

Яны чакалі, калі ўстаў я, прапусцілі мяне ў дзвярах і пайшлі за мною.

Я адчуў, што сёння мне ўжо ўдалося тое-сёе сказаць, хоць многае я толькі закрануў, часамі пераскокваў з аднаго на другое, не мог лагічна давесці думку да канца. Але не ўсё адразу!

## 21

Аднаго дня заехаў да мяне тутэйшы брыгадзір, ён жа быў і сакратаром камсамольскай арганізацыі саўгаса. Я разгубіўся: брыгадзіру таксама падабалася Ларыса, ён нават прасіў яе пайсці з ім у загс. Я чакаў, што ў нас будзе размова пра Ларысу.

Разгублены быў і брыгадзір.

— Вы ў нашым камітэце адказваеце за ідэалагічны сектар,— хвалюючыся, сказаў ён.— Вось вам пуцёўка, схадзіце на свінаферму і пачытайце лекцыю. Тэма тут напісана,— ён паклаў паперку, развітаўся і выскачыў з хаты.

Я ўзяў паперку і стаў чытаць: лекцыя была на міжнародную тэму. Я ўзяў кіпу газет, навыразаў заметак, выпісаў колькі цытат з работ Леніна, з перадавых «Праўды».

...Свінагадоўчая ферма, абнесеная новым частаколам, была за вёскаю, ля вялікага, з хмызняком, лугу. Месца тут таксама было нізкае, у дажджы залівалася вадою, перамешвалася машынамі, людзьмі, і летам тут было гразка. Цяпер, у маразы, сцялося, прыцвярдзела, і было б зусім добра, каб не коўзка — выездзілі машынамі і санямі.

Час быў позні, да канца работы заставалася некалькі хвілін, я не пайшоў адразу ў «чырвоны куток», а завярнуў на ферму. Зайшоў — і аж залажыла ў вушах: стаяў густы, здавалася, невыносны шум. Машыны высіліся да самай столі, паблізу шыпела і булькала вада,— тут вараць свінням есці.

Я выйшаў з цэха і зайшоў у другі, там у загарадках стаялі ці ляжалі свінні, я нават здзівіўся, якія яны вялікія, тлустыя.

— Во скваркі! — пачуўся мужчынскі голас, я азірнуўся і ўбачыў перад сабою суседа, рабочага гэтай фермы.

Я павітаўся.

— Каб гэткую закалоў сабе, то і за год не з'еў бы,— сказаў мужчына.

— Але ж трэба было і парабіць, каб такую выгадаваць.

— Трэба было,— згадзіўся сусед.— Добра робяць нашы бабы.

— Здрасце,— падышла да нас і прывіталася маладая жанчына. Была яна чыста апранутая, нават з сумачкаю, і я зразумеў, што яна тут, відаць, загадчыца.— Вы не з рэдакцыі?

— Не,— усміхнуўся я.

— З райкома камсамола?

— Ды гэта наш настаўнік,— сказаў мой сусед,— Павел Мікалаевіч.

— А,— кіўнула жанчына,— дзеці мае яшчэ малыя, не ходзяць у школу, дык я і не ведаю ўсіх маладых настаўнікаў. Але пра вас чула...

Яна не дагаварыла, але я зразумеў: хацела сказаць, што чула пра мяне і Ларысу, але стрымалася.

— Можа, мяса захацелі?

— Не,— усміхнуўся я,— з лекцыяй прыйшоў.

— Добра,— сказала жанчына.— Скажу зараз бабам, можа, зойдуць. Завядзі іх, Пятро, у ленпакой, а я пайду і скажу рабочым, каб зайшлі.

Мы зайшлі ў невялікі, але чысценькі, абвешаны паперамі пакойчык. І пакуль вычытаў я ўсе лісткі, то пачалі заходзіць жанчыны, у куфайках і гумовых ботах. Яны віталіся са мною, садзіліся і гаварылі пра сваё, раз за разам пазіралі на гадзіннікі.

Зайшло некалькі і маладых дзяўчат, я нават не ведаў, ці яны падмянялі каго, ці рабілі тут, яны глядзелі на мяне і пасміхаліся.

— Вось і ўсе нашы,— сказала загадчыца,— толькі Ванда пабегла дадому, кажа, у яе дзеці малыя адны дома.

Я назваўся жанчынам і пачаў чытаць свой даклад. Слухалі мяне ўважліва, я нават не разумеў, ці зацікавіліся, ці слухаюць з-за прыстойнасці.

— Скажыце, вы болей чытаеце кніжак ды газет, якія налета моды будуць? — спытала мяне маладая, толькі, мусіць, пасля дзесяцігодкі, дзяўчына.

Я нават разгубіўся: і не чакаў такога пытання, і не ведаў, што сказаць.

— Можа, пытанні ў канцы давайце,— папрасіў я.

— Ды вы не слухайце іх, балаўніц,— сказала пажылая жанчына.— Модніцы мне знайшліся! Адзенься чыста, вымыйся — дык і пекная, модная будзеш.

Я пачаў расказваць, што дзе робіцца на свеце: калі расказаў усё са сваіх выразак, нагадаў пра пытанні. Стаяў іназіраў на стомленых жанчын.

— Я разумею, што пытанне моды таксама адзін з аспектаў грамадства, як палітыка і мастацтва, можа быць арыентацыяй у сучасным жыцці,— сказала тая ж маладая жанчына.— Дык якія нам сукенкі насіць трэба: доўгія, кароткія?

Я ўсміхаўся і маўчаў.

— Насі кароткія, бо доўгія свінні абарвуць,— сказала загадчыца, і ўсе жанчыны выбухнулі здаровым рогатам.

— Я нават і не ведаю,— прызнаўся я.— Здаецца, міні ўжо не ў модзе.

— Ды не слухайце вы іх, чалавек, а ты, Таня, не дуры галавы з сваімі модамі. Пазнее ўжо, а яшчэ трэба і сваіх свінней накарміць, вячэру згатаваць,— загаманілі жанчыны.

— Я магу толькі ўхваляць, што ў модах успомнілі цяпер слова «сціпласць»,— сказала загадчыца.

— Тут не пра моды думаеш, а гадаеш, як у горад з'ездзіць, калі зіма на дварэ, а аўтобусы не ходзяць,— сказала пажылая жанчына,— магазін ужо з месяц закрыты, з горада магазіншчыкам ніхто ехаць не хоча, а вясковых не знаходзіцца.

— Можа, ведаеце вы, калі ўжо яслі якія ў нас адкрыюць? — запытала маленькая пажылая кабета.— Дальбог, няма дзе дзяцей дзяваць.

— Пішыце, прасіце, дык і адкрыюць,— сказаў я.— І нам, настаўнікам, лепш будзе: дзеці будуць больш навучаныя.

— Гэтыя дзеці цяпер зусім вучыцца не хочуць,— сказала пажылая жанчына.— Мой Сяргей ніколі кніжкі ў рукі не возьме, не сядзе пісаць, пакуль не прымусіш.

— А прымусь ты, дагледзь, калі во да якой пары на рабоце,— падхапіла яе думку маленькая пажылая кабета.— Прыйдзеш дадому і не ведаеш, за што ўхапіцца. А раніцою бяжыш, калі дзеці яшчэ спяць...

— Падурэлі цяпер дзеці,— сказала тая ж пажылая кабета,— хіба гэта мы пасля вайны адразу так адзяваліся, елі такое, бачылі тыя тэлевізары? Кніжка адна на ўсіх была. Але вучыліся.

— Ды хіба школа такая была? Гэта цяпер сталовая, тэлевізар, кіно ў школе, вучоныя настаўнікі...

— Мой, мусіць, слаба вучыцца?

— А я ўжо пра свайго дык і саромеюся пытацца.

— А як сын Пакрылы вучыцца?

— Бач, бацька дужа разумны, а сын вучыцца не хоча.

— Не прападзе, не будзе з намі рабіць.

Жанчыны пагаманілі яшчэ, усе разам дапытваліся ў мяне пра сваіх дзяцей, а пасля ўспомнілі пра дом, пабедавалі, што яшчэ ўперадзе столькі работы, і дружна высыпалі з пакоя.

— Вы «Известия» выпісваеце? — спытала мяне маладая дзяўчына, якую жанчыны называлі Таняй.

— Выпісваю,— сказаў я.

— Я і бачу, што знаёмымі словамі гаворыце. А што такое эскалацыя?

— Мусіць, разгортванне, расшырэнне,— збянтэжыўся я, што гаварыў нядаўна пра тое, што людзі ўжо ведаюць.

— Дзякуем, Павел Мікалаевіч, за даклад,— сказала мне загадчыца.— Прыходзьце яшчэ, не забывайце.

Я развітаўся з людзьмі, выйшаў на двор, падумаў: не так мне трэба было рыхтавацца да лекцыі, не так...

Прыйшла ў школу «аграноміха», пажылая, ужо сіваватая, з мноствам маршчынак на твары. Яна мне не вельмі спадабалася: басавіты мужчынскі голас, шырокія плечы, цвёрдая мужчынская хада. Глянуў я на яе — і адразу прыпомніўся мне пра яе вершык, які напісаў нейкі тутэйшы жартаўнік; я чытаў яго, смяяўся і нават запомніў крыху на памяць.

«Маладая настаўніца» прыйшла, калі канчаліся ўрокі, прывіталася і сказала:

— Святлана Міхайлаўна, ваш біёлаг.

— Прыемна,— сказаў Іван Сямёнавіч, устаў і падаў ёй руку.

Святлана Міхайлаўна пацiснула руку і ўсім нам.

— Колькі мне гадзін будзе?

— З дваццаць тры набярам,— адказаў Іван Сямёнавіч.

— Малавата,— цмокнула Святлана Міхайлаўна,— але нічога, на сёлета хопіць, пакуль прывыкну. Але праз год мне на пенсію...

— На другі год нешта прыдумаем,— сказаў Іван Сямёнавіч.

— Гэта па-чалавёчы,— сказала Святлана Міхайлаўна.— З заўтрашняга пачынаю працаваць. А цяпер папрашу прыняць мяне ў ваш калектыў,— і патрасла сумкай, у якой штосьці бразгала і булькала.

— І гэта па-чалавечы,— хіхікнуў Міхась Рыгоравіч, павесялеў, кінуў штосьці пісаць, загарнуў сшытак і паклаў яго ў шуфляду.

— Як заведзена,— сказала Святлана Міхайлаўна,— прашу ўсіх у вашу сталовую, там і пагаворым пра ўсё.

Прыйшлі з урокаў астатнія настаўнікі, прывіталіся з «маладым».

— Баба што трэба! — шапнуў мне незаўважна ад другіх Міхась Рыгоравіч.

Мы пагаманілі аб тым-сім і пайшлі ў сталовую. Святлана Міхайлаўна дастала са сваёй сумкі двухлітровы слоік, каўбасу, хлеб; Міхась Рыгоравічміргнуў мне вокам, гэта заўважыў і Уладзімір Пятровіч, усміхнуўся: добра ведаў слабінку нашага завуча.

Тут жа ўсё разрэзалі, разлілі, і Іван Сямёнавіч сказаў тост за «новенькую»; мужчыны дружна пацягнулі, дзяўчаты памачылі вусны і паставілі шклянкі. Іх пачала ўгаворваць Святлана Міхайлаўна, крыўдзіцца, што яны яе не паважаюць, не хочуць лічыць яе сваёю.

— Вам, Ларыса Іванаўна, то і трэба выпіць,— сказала Вольга Піліпаўна.— Паедзеце да свякроўкі, не будзеце магчы і кроплі ўзяць, то сорамна будзе.

Ларыса зачырванелася, хацела штосьці злоснае сказаць, але змоўчала.

— Навучыцца,— сказала Святлана Міхайлаўна.— Ды могуць яны, гэта толькі паказваюцца, што не бяруць і ў рот. Ведаю я іх, цяперашніх маладых. Прыкідваюцца толькі сціпленькімі.

— Нашы маладыя настаўнікі не такія,— абараніла нас Вольга Піліпаўна.

— Але Павел Мікалаевіч і Ларыса Іванаўна ўсё мудруюць штосьці,— прыжмурыў вока Міхась Рыгоравіч,— усё нешта цягнуць...

— І што мы павінны прыцягнуць? — спытала Ларыса.

— Як што? Не прыкідвайцеся, не маніце нам, што вы толькі інстытуцкія сябры,— сказаў Міхась Рыгоравіч.— Мы людзі бывалыя, бачым, як адно на аднаго паглядаеце.

— Хопіць вам,— сказаў Алесь Трахімавіч,— людзі самі ведаюць, што робяць.

— Цяпер моладзь разумная,— сказала Святлана Міхайлаўна.— Але давайце паўторым, каб добра жылося і вялося.

Дзяўчаты не давалі сваіх шклянак, хавалі іх пад стол, але Святлана Міхайлаўна сказала такое слоўца, што я зажмурыў вочы, а дзяўчаты хуценька пастаўлялі шклянкі на стол. Сабе «новенькая» наліла столькі, колькі і нам, мужчынам. Бачачы, што дзяўчаты анямелі ад яе слоўца, яна апраўдалася:

— Жанчына павінна быць мужная, як мужчына.

— Але заўсёды быць жанчынай, прыгожай, культурнай, нават лірычнай,— сказаў я.

Святлана Міхайлаўна нават і не глянула на мяне, запрасіла выпіць Івана Сямёнавіча і яго жонку, адным махам кульнула шклянку.

— Паглядзела я сёння на ваш агарод, сад і аж за галаву ўзялася: усё зарасло, здзічэла, куды толькі дырэктар з завучам глядзелі,— сказала яна.

— Дасюль у нас біёлагі былі абы-якія, нават не ведалі, як гуркі ці цыбулю садзіць,— адбіваўся Міхась Рыгоравіч.

— Гэта відаць,— сказала Святлана Міхайлаўна.— Калі Іван Сямёнавіч пенсію мне добрую зробіць, я вас засыплю ўсім. Бульбай, гуркамі, капустай, птушынае малако выведу...

— Давайце,— пасміхаўся Іван Сямёнавіч.

— Не верыце? Я зраблю агарод, айву, паўночны вінаград пасадзім, кветак развядзём, што ні ў адной школе раёна таго не будзе. У саўгасе ўбачаць, каго страцілі, яны яшчэ прыйдуць мяне прасіць назад, без мяне яны ўсё заваляць,— Святлана Міхайлаўна ўжо

крыху ап'янела, гаварыла гучна і стукала кулаком.— Але я праслаўлю вас, я старая, мне многа не трэба, а школу вашу праслаўлю.

— Здаецца, ты гадоў сем такое абяцала і саўгасу,— пасміхнуўся Іван Сямёнавіч,— а на сённяшні дзень саўгас наш ля ста тысяч доўгу дзяржаве мае.

— Яны не ўмеюць ні рабіць, ні кіраваць,— апраўдвалася Святлана Міхайлаўна.— Я не магла з імі працаваць.

— Вы б не ўцякалі ад недахопаў, а выправілі б іх,— сказаў я.

— Ты яшчэ малады папракаць мяне,— агрызнулася Святлана Міхайлаўна.

— Малады, а не зялёны,— абараніў мяне Іван Сямёнавіч.— Самая наша надзея, будучы дырэктар нашай школы, таленавіты настаўнік.

— Раз такі вундэркінд, то чаму трапіў у васьмігодку, а не ў аспірантуру ці дзесяцігодку? — спытала яна.

— Работа ці пасада, дзе робіць чалавек, не заўсёды бывае меркай яго інтэлекту,— стрымана адказаў я.

— Я не літаратар, але дам зараз колькі пытанняў, на якія ты ніколі не адкажаш.

Я ўбачыў, што Міхась Рыгоравіч рад быў пасмяяцца з мяне: дырэктарам школы марыў быць ён.

— Хто такі Анры Бэйль? — спытала Святлана Міхайлаўна; усе прыціхлі, каб хто ведаў, то ўжо сказаў бы, але ўсе маўчалі.

— Гэта Стэндаль,— спакойна адказаў я.

— Сэмюэл Клеменс? — Святлана Міхайлаўна аж прылегла на стол.

— Марк Твен,— зноў адказаў я.

А Міхась Рыгоравіч, каб ніхто не бачыў, паціснуў мне пад сталом руку.

— Не так удала ты адказаў, як я ўдала падабрала пытанні...

— Усё ясна,— сказаў я.— Скажыце цяпер вы: што такое літаратура?

— Якая літаратура? — Святлана Міхайлаўна чакала, відаць, не такога запытання, а цяжэйшага.

— Мастацкая.

— Дзіцячыя пытанні. Вершы ды раманы. Я, мой мілы вундэркінд, і сама пішу, і крыху лепш за нашых сённяшніх пісьменнікаў,— кіўнула яна мне, але я зразумеў, што мяне знелюбіла.— Я яшчэ друкавацца буду, многім падатру нос, над маімі творамі плакаць будуць. Хто цяпер пісаць умее?

— Ты пакуль што нам агарод паднімі, біялогію добра вядзі, дацягні да пенсіі, тады ўжо ў пісьменнікі ідзі,— сказаў Іван Сямёнавіч.

— А вы не яхіднічайце, я ім падатру нос.

— Падцірайце, падцірайце,— сказаў Іван Сямёнавіч,— толькі не перастарайцеся,— усміхнуўся, падняўся, развітаўся і пайшоў са сваёю жонкаю дамоў.

— Стары дэмагог! — калі дырэктар добра адышоўся, сказала пра яго Святлана Міхайлаўна.— Ён акасцянеў ужо, даўно завучанымі словамі гаворыць. Я з ім яшчэ счаплюся. Гэта ён вас у кулаку ўсіх трымае, кіруе, як хоча, а я не дамся, буду рабіць, як захачу.

Такое пра дырэктара я пачуў упершыню. Дзе тут жарт, дзе тут праўда?

— О, наш дырэктар — чмель. У яго ядавіты талент іроніі, талент пацяшацца з чалавека,— сказаў Міхась Рыгоравіч.

Дзяўчаты, відаць, не хацелі болей слухаць такія размовы, сабраліся і пабеглі дамоў. Як іх ні прасілі пабыць яшчэ тут, яны не засталіся.

— Козы! — скрывілася Святлана Міхайлаўна,— ім не школа, а хлопцы ў галаве.

— Наш Павел Мікалаевіч нарасхоп тут,— усміхнуўся Міхась Рыгоравіч,— ён адзін халасцяк, а дзяўчат во колькі...

— Не спі,— сказала Святлана Міхайлаўна.— Калі не п'еш, не курыш — то мужчына яшчэ, калі баб не любіш — то ўжо не мужчына.

Падняўся і Алесь Трахімавіч, сказаў, што баліць сэрца, болей не можа заставацца, пойдзе прымаць валяр'янку. Падняўся і я, Міхась Рыгоравіч мяне не пускаў, затрымліваў, але я яго не паслухаў.

— Ну, што вы, Алесь Трахімавіч, думаеце пра новую настаўніцу? — спытаў я, калі мы выйшлі са сталовай.

— Тое думаю, што думаюць другія,— сказаў стары настаўнік.— Год колькі ў нас вучыў дзяцей бібліятэкар, які прыехаў да нас з горада, каб пенсія была большая... Школа ад раёна далёкая, дарогі дрэнныя, праверак мала бывае, і вось іх прысылаюць сюды.

## 23

— Таварышы, паведамляю «незвычайную навіну»: да нас едзе рэвізор! — сабраўшы ўсіх настаўнікаў на вялікім перапынку, сказаў трагічным голасам Іван Сямёнавіч.— Я не жартую і не мудрагельствую. Нас будзе правяраць камісія аблана, у тым ліку і грозны Дубкоў. Нікому не спаць, не есці, але зрабіць усюды парадак. Праверка гэта ў тры гады бывае, і ад таго, як мы да яе падрыхтуемся, будзе залежаць, што пра нас будуць гаварыць на некалькі год уперад.

Іван Сямёнавіч стаў пералічваць, што трэба зрабіць: каму — замяніць старыя вучнёўскія сшыткі на новыя, запоўніць добра журналы, пісаць вялікія планы...

— Мы не толькі настаўнікі, але і прапагандысты,— пасля сказаў ён і пералічыў, каму пайсці на якую ферму, прачытаць які даклад ці выпусціць баявы лісток.— Словам, уражанне мы павінны зрабіць самае найлепшае, паказаць, што хоць і жывём у маленькай і далёкай школе, але стараемся, і ніхто не павінен з камісіяй спрачацца, гаварыць: «Так, так, пастараемся ўлічыць, выправіць».

— Іван Сямёнавіч, я нядаўна быў на свінагадоўчай ферме, чытаў даклад,— сказаў я.

— Дык добра. Цяпер схадзіце ў кароўнік.

— Але, Іван Сямёнавіч, ці ёсць сёння сэнс ісці на ферму, поле і чытаць людзям газету, калі ў нас даўно няма непісьменнасці? — запярэчыў я.— Гэта некалі настаўнік мог запасціся газетнымі выразкамі, і яго не толькі б слухалі, але яшчэ і здзіўляліся б: адкуль што бярэцца? Цяпер у кожнай сям'і людзі з сярэдняй адукацыяй маюць газеты, радыё, тэлевізар...

— Вы, Павел Мікалаевіч,— сказаў мне Іван Сямёнавіч, — малады, а ўжо вялікі дэмагог.

— Гэта не дэмагогія,— запярэчыў я,— Сёння настаўнік перастаў быць адзіным «універсітэтам» на вёсцы, людзі змяніліся, паразумнелі.

— Вы пішыце іншаму каму свае «вучоныя» заметкі, даказвайце сваё, але ад мяне патрабуюць, каб настаўнікі былі прапагандыстамі, то і будзьце імі.

— Я не супраць,— сказаў я,— але трэба рабіць лепш.

— Вось і рабіце,— сказаў Іван Сямёнавіч,— але мне, як дырэктару, будзе лепш, калі настаўнік выступіў пяць разоў, хоць і слабавата, чым адзін раз, але моцна. Тады і школу пахваляць, а так на кожнай нарадзе перцу даюць.

— Гэтак нядобра,— сказаў я.

— Ладна, ты малады яшчэ, пажыві, тады паглядзіш, што добра, а што блага,— сказаў Іван Сямёнавіч.— І мы маладымі не такія былі, усяму здзіўляліся, выступалі, але час усіх ставіць на свае месца. Каб усё, што я назваў, было зроблена, выпушчана, аформлена ў справаздачы. Сёння сесія сельсавета, і каб усе на ёй былі, а паслязаўтра адкрыты партыйны сход саўгаса, і таксама каб усе прысутнічалі. Мы, настаўнікі, павінны быць у самай гушчыні жыцця вёскі.

...Сесія была прызначана на шэсць гадзін вечара, але людзі доўга не збіраліся — у кожнага нешта сваё. Старшыня сельсавета адчытваўся пра работу за год. Гаварыў пра ўраджаі, надоі ў саўгасе, шкадаваў, што яны невялікія, расказваў, што сельсавет выкапаў сёлета калодзеж, пасадзіў тысячу дрэў, выдзеліў многа людзям шыферу і яшчэ больш плануе даць яго ў новым годзе.

Пасля прызнаўся, што многае і не зроблена: моладзь выязджае ў горад, клуб зачынены на замок, няма ясляў, няма фізкультурнай работы, канцэртаў, хоць і трэба «праблемы сацыяльнага развіцця, культуры, аздараўлення побыту зрабіць прадметам асаблівага клопату, як гэта дыктуе наш сённяшні дзень».

«І праўда,— думаў я, слухаючы старшыню,— усё, што ён ні гаворыць, праўда»,— але, калі выслухаў далей, пачуў, што ў каштарысе на «фізкультуру і аздараўленчую і культурную работу» на новы год не было выдзелена і рубля.

...Назаўтра я і Ларыса зноў пайшлі на фермы: я — ў кароўнік, а Ларыса — на свінагадоўчую. Я зноў выпісаў з газет, часопісаў і чытаў — гаварыў тое, што, можа, людзі і ведалі, пытанняў па маім дакладзе не было; а калі людзі разышліся, я застаўся, узяў у загадчыка фермы — маладой дзяўчыны, якая закончыла сельскагаспадарчы тэхнікум,— лічбаў, прозвішчаў даярак і дома сядзеў яшчэ да паўночы, выпускаў баявы лісток. У гэты вечар мы з Ларысай ужо не сустрэліся: пісала баявы лісток і яна.

## 24

Камісія, а з ёю і грозны для настаўнікаў інспектар Дубкоў, прыехала ў той дзень, як і папярэджвалі Івана Сямёнавіча.

У гэты дзень хваляваліся і дзеці, і настаўнікі: прыехала ажно сем чалавек, людзі ўсе пажылыя, тварамі сярдзітыя.

Пачалі яны сваю работу з праверак нашых планаў і адразу пазнаходзілі многа дробных недаробак: то сачыненняў і ізлажэнняў мала было запланавана, то на які ўрок нагляднасць, паўтарэнне не былі ўказаны, то яшчэ што-небудзь іншае было прапушчана.

— Паправім,— гаварыў Уладзімір Пятровіч.— Дзякую, паправім.

— Пракантралюем,— дадаваў Міхась Рыгоравіч,— усе заўвагі будуць выпраўлены.

У маім каляндарным плане вялікіх агрэхаў не знайшлі, сказалі толькі ўвесці раздзел «Міжпрадметныя сувязі» і дабівацца, каб на ўроку была сувязь з другімі ўрокамі.

— Ды і мы гэтага дабіваемся,— бегаў перад Дубковым Міхась Рыгоравіч,— але ён яшчэ малады, першы год у школе працуе, вопыту няма.

Інспектар нічога на гэта не сказаў, папрасіў паказаць яму мае рабочыя планы.

— Трэба больш разгорнутыя пісаць,— пагартаўшы іх, сказаў ён,— цяперашні ўрок патрабуе ад настаўніка вялікай падрыхтоўкі.

— Але цяперашні ўрок немагчымы і без імправізацыі, дыялогаў, маналогаў, што ўзнікаюць у ходзе ўрока, ды яшчэ ўплывае на ўсе і асоба настаўніка,— сказаў я, крыху хвалюючыся.

— Хачу схадзіць з вамі на ўрок,— ўсміхнуўся інспектар,— паглядзець, як робяць цяпер маладыя, што яны новае нясуць.

Я сказаў, што будзе мова ў сёмым класе, запрасіў ісці і, прызнацца, не хваляваўся, бо не ведаў, чым іменна грозны гэты інспектар.

Але, калі ўвайшоў у клас, то захваляваўся, на першых хвілінах аж перахапіла дыханне. Гэта і перадалося дзецям, яны таксама хваляваліся, збіваліся пры адказах, але, як я спакайнеў, спакайнелі і яны, спакойна і акуратна рабілі ўсё, што я гаварыў. А я ліхаманкава думаў, як весці ўрок, даваў нават тое, чаго да ўрока даваць не збіраўся, сачыў за кожным сваім словам.

Калі празвінеў званок, я зразумеў, што гэты ўрок забраў у мяне вельмі многа сіл і нерваў, у другі раз я столькі не страціў бы здароўя і за тыдзень.

Інспектар прагартаў журнал, дзе былі запісаны мае ўрокі, перабраў кожны сшытак з кантрольнымі работамі, сачыненнямі і ізлажэннямі, папрасіў мяне пайсці ў клас і прынесці рабочыя сшыткі дзяцей. Другія інспектары гэтак жа «трэслі» астатніх настаўнікаў, а адна жанчына ўвесь час не адпускала ад сябе дырэктара і завуча, прасіла іх вадзіць яе па класах, кабінетах, бібліятэцы, майстэрні, правярала іх планы.

— Вы многа ставіце троек і двоек па мове і літаратуры,— сказаў мне Дубкоў.— Па літаратуры павінны быць толькі «4» ды «5». Вось невялічкае параўнанне. Матэматыка лічыцца цяжэйшай за літаратуру. Але ў пятым класе па матэматыцы двоек менш, чым па мове, нават менш, як па літаратуры. Я чалавек свежы ў школе, не ведаю вас, але мне так і хочацца сказаць: Уладзімір Пятровіч робіць лепш, як вы.

— Але ж, паважаны інспектар,— мусіць, пачырванеў я, бо разгубіўся,— у ацэнках не толькі паказчык выкладання, ведаў, але і патрабавальнасць...

— Яно так,— усміхнуўся Дубкоў,— але і бацькі дзяцей і мы ацэньваем вашу работу па адзнаках.

— Але ж адзнакі стаўлю я,— запярэчыў я, хоць неўпрыкмет Міхась Рыгоравіч і цягаў мяне за рукаво, каб я маўчаў, не спрачаўся, але я яго не слухаў: — Каб я меў права, то і атэстаты каторым выдаваў бы з двойкамі, каб усюды бачылі гультая, а то некаторым мы і ў рот гатовае кладзём, а ён праглынуць не хоча, прасі яго вучыцца, а ён зусім лянуецца, не мае ахвоты да гэтага.

— Можа, вы залішне патрабавальныя ўжо,— усміхнуўся інспектар,— ды часамі пра сябе не думаеце ці яшчэ не...

— Калі толькі пра сябе думаць,— зразумеў я яго,— то можна даваць дзяржаве высокі адукацыйны ўзровень, але малаякасны.

— А вы ўжо думалі, чаму некаторыя не хочуць вучыцца?

— Думаў,— адказаў я і расказаў пра свае размовы пра літаратуру, пра працу дзяцей у саўгасе і дома.

— Гэта добра,— згадзіўся інспектар,— хоць чаму сёння не ўсе дзеці добра вучацца, ніхто толкам не ведае. Разумееццa, даследаваць усе аспекты гэтай праблемы не пад сілу ні асабіста вам, ні педкалектыву школы, нават раёна.

— Значыць, не трэба і старацца? — спытаў я.

— Я такога не сказаў,— усміхнуўся інспектар, запытаў у Івана Сямёнавіча: — Дзе вы, таварыш дырэктар, такога энтузіяста ўзялі?

— Раён прыслаў,— адказаў Іван Сямёнавіч, відаць, гадаючы: інспектар мяне хваліць ці ганіць.

— І ў школе трэба тварыць,— сказаў інспектар,— але па-сяброўску вам падкажу: будзьце крыху ашчадней з двойкамі.

— Трэба быць хітрэй крыху, Павел Мікалаевіч,— сказаў мне Міхась Рыгоравіч, калі інспектары пайшлі зноў на ўрокі.— Я табе даўно ўжо гаварыў: пастаў лепш у журнал тройку, а май на ўвазе двойку. І не заводзь ты такіх размоў з інспектарам, прамаўчы лепш, ты не ведаеш, як ён цяпер размалюе цябе.

— Але ж нельга так, Міхась Рыгоравіч.

— Нельга, але што зробіш? Хочаш жыць — умей круціцца,— усміхнуўся Міхась Рыгоравіч, я прамаўчаў, мне проста было непрыемна з ім гаварыць.

Камісія працавала ў школе і на другі дзень, хадзіла на ўрокі, гутарыла з дзецьмі, правярала ўсё, што можна праверыць.

— Пра вашы поспехі і недахопы мы напішам, прышлём на районa,— сказаў Дубкоў, калі адыходзіў.— А вас, малады чалавек,— ён звярнуўся да мяне,— мы будзем мець на ўвазе...

— Ну, дадуць табе, Павел Мікалаевіч,— сказаў Міхась Рыгоравіч.— Не трэба было звязвацца з імі, трэба было маўчаць.

— Дадуць! — перакрываіў Іван Сямёнавіч.— На твае ці мае месца паставяць. Павел Мікалаевіч малады, але хітры, здолеў падысці, гэткім Сухамлінскім паказацца.

— Нічога не хацеў я паказацца,— узлаваўся я.— Усе маўчалі, падтаквалі, мне сорамна стала, хацелася сказаць, што ёсць і тое, аб чым не трэба маўчаць.

— Скарыстаў момант,— не згаджаўся Іван Сямёнавіч.

Міхась Рыгоравіч глянуў на мяне і прамаўчаў, нічога не сказаў і Уладзімір Пятровіч, які пакуль што не мог зразумець, як могуць яшчэ хітрэй, чым ён, рабіць людзі.

## 25

Двойкі гэтыя прымусілі мяне задумацца: што зрабіць, каб іх было меней, а то і зусім не было?

— Што ты прыдумаеш, калі дзеці не хочуць вучыцца? — заўсёды адказваў на гэта Міхась Рыгоравіч.— Калі другі хоча, то вучыцца.

Дык чаму адны хочуць вучыцца, а другія не? Чаму? Ці, можа, і мне махнуць на гэта рукою, як Уладзімір Пятровіч, не старацца, нетраціць свайго вольнага часу, а спакойна адробліваць гадзіны і бегчы дадому? Хто заўважыць, хто ацэніць? А дзеці, калі не стануць інжынерамі, урачамі, то будуць трактарыстамі, рабочымі, няхай вучацца, як хочуць, чаму іменна табе думаць, што яны зробяць у будучым, якую яны прынясуць карысць? Зарабляй паціху свае сто рублёў і не нервуйся, шануй сябе, навошта табе які Вася, Пеця, пастаў ты ім тройку... І больш пражывеш, і здаравейшы будзеш..

Аднаго дня на выхаваўчай гадзіне ў сваім сёмым класе я правёў анкету. Паставіў дзецям колькі пытанняў і прасіў іх адказаць, які прадмет яны любяць, за што, з якога ўрока каму хочацца ўцячы, колькі ён вучыць дома, чаму ў яго ёсць двойкі, тройкі, чаму ён не вучыцца толькі на «4» і «5», словам, пытанняў я падабраў ля дваццаці.

Не ўсе дзеці праўдзіва адказалі, каторыя рашылі аб сім-тым змоўчаць, але былі адказы і цікавыя, якія закраналі і школу, і сям'ю, і вуліцу, сяброў.

Я стаў меней ставіць двоек, а то зусім не ставіць, а даваць двоечнікам на ўроку лягчэйшае, пакідаць іх пасля ўрокаў і рабіць з імі. Пасядзелі яны колькі дзён, а пасля сталі прасіцца дамоў — то галава ў іх балела, то жывот, то работа важная была, а пасля прызналіся:

— Лепш стаўляйце вы двойку, а пасля ўрокаў не пакідайце.

А адзін шасцікласнік, як толькі надыходзяць мае ўрокі, стаў уцякаць, пра што скора даведалася Святлана Міхайлаўна і паскардзілася дырэктару.

— Вярні мне яго ў школу,— сказаў мне Іван Сямёнавіч,— бо на цябе напішу ў райана: мне ж за невыкананне ўсенавуча будзе. Што хочаш рабі, але каб ён хадзіў у школу.

Таго ж дня я выпісаў на паперку ацэнкі некаторых сваіх вучняў і рашыў пабыць вечарам у іх дома. Пайшоў я ў суседнюю вёску, да тых бацькоў, у якіх яшчэ ні разу не быў. Рашыў зайсці і да тых, чые дзеці

добра вучацца, і да тых, чые мала хочуць брацца за вучобу. А таксама меркаваў заглянуць да шасцікласніка, які з-за мяне пачаў уцякаць з урокаў, а то і зусім не прыходзіць у школу.

Прыйшоў я туды надвечарам, калі блізка над зямлёю стаяла вялікае барвовае сонца, вычырвоньвала небакрай, і яра пёк мароз. У вёсцы якраз паілі кароў, насілі ў хату дровы — на ўсю вуліцу рыпелі калодзежы, дзверы, снег пад нагамі людзей.

Сустрэўшы на вуліцы маладую кабету, я загаварыў з ёю і добра распытаў, дзе жывуць мае сямікласнікі, яна расказала мне, і я па колеру вокнаў, па новых і старых частаколах запомніў тыя хаты, што мне былі трэба.

Я пабаяўся ісці да апошняй хаты і пачынаць з яе: вучні мае маглі згледзець мяне і схавацца дзе ці тут жа сесці за ўрокі, паказацца, што яны штосьці робяць. Я хацеў зайсці да іх знянацку.

Падышоўшы да дома з «белымі вокнамі», як гаварыла мне маладая кабеціна, я павярнуў да сянец, паспеў заўважыць, што дом новы, смалісты, яшчэ звонкі, выцацкаваны, на двары яго стаяў матацыкл з каляскай, на страсе высока ўзнімалася тэлевізійная антэна.

Я пастукаў у сенцах у дзверы, але мне ніхто не адказаў. Тады я зайшоў сам і ўбачыў, чаму мяне не запрасілі зайсці: маладая яшчэ жанчына, мокрая, з закасанымі па локці рукавамі, мыла бялізну, стаяла ля пральнай машыны і, відаць, ад шуму нічога не чула.

Убачыўшы мяне, выключыла машыну, прывіталася.

— Я настаўнік, класны вашага Мішы,— пазнаёміўся я.

— Відаць, нешта ўжо вытварыў у школе?

— Не,— сказаў я,— я хацеў пра яго вучобу пагаварыць, паказаць ацэнкі, якія могуць быць у яго за другую чвэрць.

— Не хоча вучыцца,— сказала маці,— зусім не горнецца да кніжкі. Я і лупцавала, а цяпер дык і рукою махнула, кажу яму: будзеш трактарыстам ці з віламі ў саўгас хадзіць. А ў хаце ж усяго хапае, не галодны, не голы, работы не даю, хаця вучыся...

— А дзе Міша цяпер? — спытаў я.

— Дзе той Міша? Гуляе недзе, галаву згубілі за гэтым хакеем,— забедавала маці.— Дацямна гэту шайбу ганяюць, з разбітымі галовамі прыходзяць.

— Ён яшчэ і не рабіў урокаў?

— Дзе ён там рабіў, хапіў штосьці ў руку, кінуў у кут сумку і пабег. От звязаўся з гэтымі Зміцеравымі, душу за іх аддае, а яны паганыя хлопцы.

— Вы б не пускалі...

— Хіба ён паслухае мяне, ён толькі бацькі яшчэ баіцца, але той не глядзіць за дзецьмі, кажа: няхай настаўнікі вучаць, яны за гэта грошы бяруць.

— Гэта правільна, грошы нам плоцяць,— сказаў я.— Але ж трэба за родным дзіцём і вам паглядзець, калі яно можа пяць двоек за чвэрць мець, невукам быць.

— Хіба ім укажаш, гэтым мужчынам,— жанчына страсянула пену з рук, падышла да дзвярэй у другую палавіну, адчыніла іх і сказала:

— Пеця, хадзі сюды.

— Чаго? — пачуўся мужчынскі бас.

— Хадзі, настаўнік прыйшоў, пахваліць, што сын добра вучыцца.

— Хай ідзе сюды.

Я зайшоў у другую палавіну, убачыў высокую прыгожую шафу, вялікі тэлевізар, кафляную грубку, халадзільнік; за сталом, пакрытым паверсе сурвэты газетамі, сядзелі некалькі мужчын і пілі гарэлку.

— Хадзі сюды,— махнуў рукою малады, чырвоны ў твары мужчына, і я здагадаўся, што ён гаспадар хаты.

— «Хадзі сюды»,— перакрывіла яго жонка.— Яшчэ як іначай не мог прыдумаць?..

— Вінават,— усміхнуўся мужчына,— хадзіце сюды. Пасядзім і пагаворым.

— Не, дзякую,— адмовіўся я, ведаючы, што будуць запрашаць выпіць і цяжка будзе адмовіцца, а выпіўшы будзе нядобра, сорамна заходзіць да другіх.

— Хадзіце,— запрасілі і другія мужчыны,— і пра майго раскажыце.

— Знайшлі калі пытацца,— накінулася гаспадыня.— Пра дзяцей сваіх успомнілі. Калі такія добрыя бацькі, чаму на бацькоўскі сход вас не загнаць?

— Не вучыцца наш? — спытаў мяне гаспадар.

— Во якія могуць быць ацэнкі,— сказаў я і падаў паперку.

— Ну, я яму сёння дам на арэхі.

— Гэта ты ўмееш,— сказала яго жонка.

— Не хочуць вучыцца цяпер дзеці,— загаварылі за сталом.— Ці цяпер настаўнікі не строгія, ці яшчэ што.

— Некалі былі строгія, помню, калі Іван Сямёнавіч...

— Калі самі не можаце памагчы, то хоць паглядзіце, каб ён дома што чытаў ці пісаў,— сказаў я.

— Паглядзім, паглядзім,— сказаў гаспадар; бачачы, што ён хоча пасадзіць мяне за стол, я пайшоў з хаты, папрасіў толькі гаспадыню паказаць, дзе жывуць бацькі Лёніка Логвіна.

— А што — і Лёнік слаба вучыцца?

— Не,— сказаў я,— ён добра вучыцца.

— Скажыце, во ўдасца добрае дзіця — хіба ён з'есць, што наш, ці паспіць у такім чыстым, а да кніжак ахвоту мае. Калі ні прыйдзі, усё чытае,— сказала гаспадыня.

— Ён — выдатнік.

— Удаўся такі,— сказала гаспадыня.

— А можа, і выхаваўся,— сказаў я.— Выдатнікам не народзяцца.

— А бог яго ведае,— сказала гаспадыня.— Я ж таксама хачу, каб мае дзіця вучылася, чалавекам было, а яно не думае пра гэта.

Я развітаўся з гаспадыняй, яна падзякавала мне і правіла да варотцаў.

Да Логвінаў было недалёка, ды я ўбачыў Лёніка, які нёс два вядры вады, і пайшоў за ім. Заўважыў, што пагніў, абурыўся ў Логвінаў частакол, асела, пагніла ў падрубах і хата, была пакрыта гонтаю, ужо даўно пазелянелаю, абраслаю мохам.

Лёнік убачыў мяне, засаромеўся, шмыгнуў за гумно. Я зайшоў у цёмныя сенцы, пастукаў, але мне ніхто не адчыніў: у хаце стаяў шум і піск.

Я абмацаў клямку, адчыніў дзверы — і адразу пацішэла: дзеці, якіх было вельмі многа, стаіліся, утаропіліся на мяне.

— Добры вечар! — выйшла з-за цяглянай, некалі белай, а цяпер ужо абкуранай дымам грубкі невысокая жанчына і адказала на мае прывітанне, папрасілася: — Выбачайце, як усходзіцца гэта пламета, то ўсю хату пераварочвае.

— Багата іх у вас,— усміхнуўся я.

— Ды не спім з гаспадаром,— усміхнулася і жанчына.

— Ну, я з адно забяру, а то ў мяне няма дзяцей,— пажартаваў я.

— Бярыце хоць усіх,— падтрымала жарт жанчына,— Галаву яны мне празванілі, як выйду на двор, дык і не хочацца ў хату заходзіць.

— Каторае мне тут выбраць,— я ступіў, і дзеці сарваліся з месца і ў адно імгненне ўжо сядзелі на печы.

— Я настаўнік,— сказаў я.

— Я ведаю вас, неяк паказвалі мне ў Міланьках.

— Гэта я хаджу і гляджу, што вучні мае робяць дома.

— Наш сядзеў дагэтуль, пісаў нешта, цяпер кароў поіць,— расказвала гаспадыня,— Тэлевізара вельмі хочуць, а, ведаеце, сям'я вялікая, я дома сяджу ды хваравітая, гаспадар адзін робіць, то вельмі і няма з чаго купіць. Ёсць цялё, кажу: гадуйце, выгадуеце, прададзім, тады і тэлевізар купім. І кормяць, і пояць, і кожнага дня мераюць, колькі падрасло. Як ён там вучыцца?

— Добра,— сказаў я,— на вашых дзяцей не крыўдзімся.

— Большы, што да вас ходзіць, паслушны, працавіты, меншыя не такія будуць.

— Дык, кажаце, зрабіў ужо ўрокі?

— Зрабіў, на хакей прасіўся, але не пусціла, кажу: кончыш сёмы клас на пяцёркі, то куплю канькі, а цяпер нечага боты драць, бо грошы самі не сыплюцца.

— Павінен добра кончыць,— сказаў я.

— Нешта з галавою часта жаліцца,— сказала гаспадыня,— ці мо есць мала, ці рост такі, я ўжо не раз кажу: не чытай ты, ляж, паляжы, дык не, кажа: дужа цікава напісана.

— Суседзі вашы, бацькі Мішы Мытніка, добра жывуць,— сказаў я.

— Ён брыгадзір, добра палучае,— сказала гаспадыня,— Кажуць, зімою будзе машыну купляць, нам не дараўняцца да яго.

Я развітаўся з ёю і пайшоў. На дварэ ўжо цямнела, сонца не было, над небакраем стаяла вінная чырвань, снег быў нейкі сіні, моцна рыпеў пад нагамі, ужо даўно была зімовая пара, але вялікага снегу, моцных завірух яшчэ не бачылі.

Я прайшоў з паўвёскі, падзівіўся на маладзік, які невядома адкуль узяўся і холадна свяціў на небе, і нават не заўважыў дома, «пакрытага шыферам і з вялікай верандай»: усе дамы на гэтай вуліцы былі высокія, з вялікімі вокнамі, верандамі, з антэнамі.

Прыйшлося зайсці ў бліжэйшую хату і запытацца. Як паказалі, то я шпарка зайшоў, сказаў сабе многа не рассядацца, перагаварыць усё хутка.

— Вы хочаце Сашу бачыць? — перапытаў мяне высокі нявголены мужчына.— Вунь тэлевізар глядзяць.

Я глянуў у другую палавіну хаты: на крэслах, пасцелях, на падлозе сядзела больш дзесятка падлеткаў і аж вішчалі ад нейкага дэтэктыва.

— Бяда адна — гэтыя тэлевізары,— сказала гаспадыня.— Сядзяць і сядзяць ля яго, як пачне ісці пра гэтых танкістаў ды сабаку, то гора адно: паўвёскі збягаецца, так падлогу стопчуць, што пасля не дамыцца, зубамі не аддзярэш.

— Хлопцы, вы вучылі ўрокі? — спытаў я.

Дзеці паўгіналі галовы і маўчалі, пазіралі адзін на аднаго і пасміхаліся.

— З вамі ж настаўнік гаворыць,— павысіў голас мужчына, падышоў і выключыў тэлевізар.— Вы зрабілі ўрокі? А ты? — звярнуўся ён да сына.

Сын апусціў галаву, дзеці ўсхапіліся і вышмыгнулі з хаты.

— Думаеце, вучыцца пойдуць? Засядуць у некага другога,— сказала жанчына.— Дзень і ноч глядзелі б. Вось і наш бальшун дзень у хакей гуляе, а вечарам тэлевізар глядзіць, калі ён вучыць, не ведаю. Спытаю калі, дык ён адказвае мне: а нам сёння нічога не задавалі. Я сабе і думаю: што цяпер за настаўнікі, што нічога дзецям дадому не задаюць?

— Не задаюць, Саша? — спытаў я.

— Задаюць,— чырванеючы, прызнаўся мой сямікласнік.

— Во, хараша,— перакрывіў яго бацька.— Роўны са мною, а абы-што робіш. Пэўна, многа двоек маеш?

Я паказаў паперку з ацэнкамі сына.

— Ай-яй-яй! Колькі двоек! — аж здзівіўся бацька.— Ды за што я цябе кармлю? Ведаеце, я на ферме раблю, днямі дома не бываю. Прыйду — спяць ужо, іду на работу — то ж яшчэ спяць. Вось ён і робіць, што хоча. Я колькі разоў гаварыў: будзеш трактарыстам, бензінам пахнуць. Дык ён мне адказвае: «А я не буду таптацца ў гразі і зямлёю пэцкацца — паеду на завод, буду асфальтаванымі тратуарамі хадзіць»,— «А хто ж вас, гэткіх гарадскіх, карміць будзе,— пытаю,— бульбы, мукі, капусты хто вам дасць?» Маўчыць, зямлі яму не трэба. Во якая цяпер маладзёж!

— А я, помню, скончыла перад вайною чатыры класы, хацела ісці далей, але бацькі не пусцілі, дык колькі я паплакала,— успомніла гаспадыня. — Ды хіба тады было так вучыцца, як цяпер? Ці тое людзі мелі?

— Не хоча, дык і не трэба,— сказаў бацька,— адумаецца некалі, за локаць сябе ўкусіць.

...Шасцікласнік Пеця быў не «мой» вучань, але ён уцякаў з маіх урокаў, зусім не прыходзіў у школу, з-за яго мяне дырэктар папікаў, і я рашыў зайсці і да яго бацькоў. Зайшоўшы, адразу даведаўся, што ў яго няма бацькі — недзе «сабакам сена косіць». Маці пабедавала, што яе зусім не слухае, звязаўся з дрэннай кампаніяй, калі яна пачне крычаць, то збяжыць куды ці замкнецца і не пусціць яе у хату. Пастаіць тады ці пасядзіць у суседзяў, а пасля просіцца, каб упусціў. І ў школу, калі дасць грошай ці паабяцае што, то ходзіць, калі не дасць, чаго хоча, то не ідзе.

Пеці дома не было, а я вельмі хацеў яго ўбачыць, я сеў так, каб мяне не было відаць з двара і стаў чакаць вучня, слухаючы расказы яго маці.

Сядзеў я доўга, аж надакучыла ўжо. Думаў, што і не дачакаюся, як пачуў скрып снегу, а пасля і сам Пеця бразнуў дзвярамі і зайшоў у хату. Убачыў мяне — і анежывеў.

— Што, сынок, сорамна стала? — жаласна спытала маці.— Мне самой сорамна, як настаўнік усё пра цябе расказаў.

— Ты зрабіў назаўтра ўрокі? — спытаў я.

— Не,— апусціў галаву Пеця.

— Малайчына! — сказаў я.— Добра думаеш пра сябе і пра старасць маці. Але правядзі мяне, а то позна, яшчэ заблуджуся я.

— Правядзі, сынок, настаўніка,— папрасіла гаспадыня.

Мы выйшлі ў сенцы; калі Пеця адчыніў дзверы з сянец, я прытрымаў яго, падышоў упрытык і прыціснуў яго да сцяны, другою рукою падціснуў яму бараду. Пеця прыпыніўся, аж перастаў дыхаць ад нечаканасці.

— Калі ты, малец, будзеш уцякаць з маіх урокаў, а то і зусім не хадзіць у школу,— расцягваючы, знарочыста цвёрдым, страшным голасам сказаў я,— то я цябе ў міліцыю завязу. А то і ў дзіцячую калонію. Зразумеў?

Пеця не мог вымавіць ад неспадзявання і слова, толькі лыпаў вачыма.

— Ясна? — перапытаў я.— Будзеш хадзіць у школу?

— Буду,— прашаптаў ён.

— Глядзі, капітан! — сказаў я, падняў яго, страсянуў і апусціў на зямлю.— І каб матку шанаваў, а не здзекаваўся з яе. Ясна?

— Ясна,— сказаў разгублена Пеця.

— Як мяне завуць?

— Павел Мікалаевіч.

— Помні гэта,— я адпусціў яго, а сам выскачыў на двор...

Сцямнела, пашарэла светлая палоска на захадзе, як і шэрым, з мноствам зорак было неба, толькі там, дзе ярка свяціў месяц, неба здавалася блакітным і чыстым. Убачыў я гэта і ўспомніў, што трэба цяпер зайсці да Ларысы: даўно ўжо не быў у яе.

...Назаўтра я наўмысна зайшоў у шосты клас: Пеця сядзеў за партай і гартаў падручнік, у гэты дзень ён са мною нават два разы паздароўкаўся, і другі раз, калі вітаўся, нават збянтэжыўся, чаго з ім мала калі было.

## 26

Пара была блізкая да Новага года, і я ўжо ведаў, што сёлета мяне ў войска не возьмуць. Забяруць, відаць, вясною.

Я чакаў зімовых канікул: стаміўся за восень, нагаварыўся з дзецьмі, наслухаўся іх адказаў, смеху, крыку, хацелася пабыць аднаму, адпачыць і падумаць. Ужо тое-сёе я сам уведаў за гэтыя месяцы, тое-сёе падказалі людзі,— і трэба было ўсё гэта абдумаць.

Непакоіла і іншае: а як будзе з Ларысаю? Ці нам хавацца ад людзей, таіцца на рабоце, сустракацца толькі вечарам, ці зрабіць так, як робяць усе,— распісацца, сабраць грошай і згуляць вяселле, пачаць жыць разам? Адною работай, аднымі клопатамі?

— Мо пачакаем крыху,— прасілася Ларыса.— Чаго нам спяшацца так?

— Можа, ты баішся, што пайду вясною ў войска?..

— Нічога я не баюся,— не падабаліся Ларысе мае словы.— Давай во з'ездзім на канікулах да нашых, пагаворым...

— Не, не!— замахаў я рукою.

— Чаго ты!

— Саромеюся бацькоў тваіх,— сказаў я.

— З'ядуць цябе,— пакрыўдзілася Ларыса.

— Не з'ядуць,— сказаў я,— але і яны, і суседзі будуць глядзець на мяне як на дзіва.

— Усё роўна ж некалі будуць глядзець,— усміхнулася Ларыса.

— Тады будзе другое.

— Я адна дамоў не хачу ехаць,— гаварыла Ларыса.— Зноў прыйдзе Віктар, будзе прасіцца і абяцаць залатыя горы, і нашы скажуць: не соладка, дзеўка, замужам, але табе ўжо дваццаць трэці год, глядзі...

— Хоць ты едзь ды выратуй цябе.

— Канечне, трэба з'ездзіць. А дзе мы з табой пасля жыць будзем? Хто нас возьме сям'ёю на кватэру?

— Яно праўда,— сказаў я.

— Трэба шукаць другой школы, дзе маглі б даць якую страху.

— Але ж я прывык ужо да гэтай, Ларыса. Не так да школы, як да дзяцей.

— І я прывыкла,— сказала яна,— Але што рабіць?

— Трэба падумаць. Здаецца, у суседняй вёсцы будуюць двухпавярховы дом. Каб папрасіцца, можа, і далі б які пакойчык.

— Сходзі ты, даведайся, я-то не пайду.

— Канечне, схаджу: галава ж сям'і я.

— Галава!..

...Аднаго дня Уладзімір Пятровіч сабраўся ісці ў суседнюю вёску і пабедаваў, што не хочацца аднаму ісці. Я падахвоціўся схадзіць з ім, не так за кампанію, як хацеў уведаць пра той дом, што будуецца ці пабудаваўся, уведаць, ці можна спадзявацца на якую кватэрку ў ім.

Па дарозе я паспрабаваў загаварыць пра гэты дом з Уладзімірам Пятровічам, ён расказаў, што ў доме будзе шаснаццаць кватэр з вадзяным ацяпленнем, газам,— словам, з усімі гарадскімі выгодамі.

На ўчарашні дзень падало ўжо на гэтыя кватэры заяў дванаццаць чалавек.

«Яшчэ чатыры кватэры ў запасе,— радасна падумаў я.— Можа, пашанцуе і нам атрымаць. Трэба сёння ж напісаць заяву».

— Я так, Мікалаевіч, прыкмячаю, што і ты жаніцца збіраешся,— усміхнуўся Уладзімір Пятровіч.— Ды і гавораць аб гэтым.

Я нічога не сказаў, толькі ўсміхнуўся.

— Я табе параіў бы не спяшацца,— ужо сур'ёзна сказаў Уладзімір Пятровіч.— Канечне, халасцякі мала думаюць пра такія словы жанатых, разважаюць: я люблю яе, яна любіць мяне, і мы будзем шчаслівыя. Так думаў і я, ажаніўся, не паслухаў добрых людзей... Ты мовавед. Твая прафесія падыдзе і ў рэдакцыі, выдавецтве і райкоме; ажэнішся — не вельмі вырвешся са школы, жонцы работу знойдзеш. А халасцяком ты вольны вецер, ніякіх клопатаў, а жанчын мець можна процьму.

— Але гэта не тое,— запярэчыў я.

— Ты, канечне, Ларысу Іванаўну лепш ведаеш, вучыўся з ёю,— гаварыў Уладзімір Пятровіч.— Здаецца, добрая, відная дзяўчына, але толькі настаўніца і век ёю будзе. І ты век настаўнікам будзеш. А ты паехаў бы ў горад, узяў бы дачку якога шпунціка, каб была машына, кватэра, і пажыў бы па-чалавечы. У цябе ўсё для гэтага ёсць: і рост, і краса, і розум, і язык падвешаны, ты можаш не такую дзеўку хапнуць.

— Можаш «хапнуць» і не праглынуць,— сказаў я.

— Лепш добрае не праглынуць, чым поснае сёрбаць. Але я даўно бачу, што не робіш нават тое, што можаш. Другія за тое, што маеш і можаш ты, тысячы далі б, а ты марнуеш дарэмна, зусім не думаеш пра сябе і сваё будучае. Хочаш вельмі правільна, так сказаць, жыць. Але, я табе скажу, даб'ешся ты так таго, чаго дабіўся Алесь Трахімавіч.

— Сорак год працуе ў школе, вучні яго міністрамі, інжынерамі, урачамі, шафёрамі робяць...

— А што яму з гэтага?— запытаў Уладзімір Пятровіч.— Жыве ў маленькай хатцы, хоць вучні былыя маглі б даўно палац адляпаць. Не хоча.

— Кожны чалавек выбірае сам, як яму жыць,— сказаў я.

— Але не абавязкова ў жыцці вучыцца толькі на сваіх памылках,— зафіласофстваваў Уладзімір Пятровіч.— Лепш вучыцца на памылках другіх, старэйшых... Я-то не быў бы ў гэтай школе, а то і зусім не падаўся б у асвету, каб мне не інстытут канчаць ды дзяцей сваіх на ногі паднімаць.

— Рыба шукае, дзе глыбей,— сказаў яму ў тон я.

— А мне глыбей тут пакуль што,— усміхнуўся ён і пачаў расказваць пра сваю вучобу, як ён здае залікі і экзамены.

Так мы дайшлі да канторы саўгаса, зайшлі да дырэктара.

— А, педагогі!— даволі радасна сустрэў ён нас, пасадзіў на канапе, жартаўліва запытаў у мяне: — Пішуць яшчэ раманы пісьменнікі?

— Пішуць,— усміхнуўся я.

— Яны, мусіць, добра маюць за сваё пісанне? — ужо сур'ёзней спытаў ён.

— Не ведаю,— сказаў я.— Толькі ведаў такіх паэтаў, што і ў студэнтаў нават грошы пазычалі.

— Есць і сярод іх браціі басякі,— закурыў і сказаў дырэктар.— А мне, хлопцы, сёння ўскрутка была,— і ён расказаў, як змарозілі ў адной брыгадзе бульбу.

Мы слухалі і спачувалі яму.

— Я чуў ад сваіх кабет, што ў вас, у школе, вяселле завязваецца? — усміхаючыся, спытаў мяне Іван Карпавіч.

— Ды збіраецца,— падтакнуў яму Уладзімір Пятровіч.

Я маўчаў, толькі ўсміхаўся, але адчуваў, што трэба ўставіць і сваё слова, вывудзіць у гэтым жарце карысць для сябе.

— Неяк я бачыў яе, нічога, стройная, прыгожая дзяўчына,— сказаў Іван Карпавіч.— Мне спадабалася.

— І яму, відаць, падабаецца,— падтакнуў Уладзімір Пятровіч.— Вы толькі глянулі, а ён і пасядзеў ужо ля яе...

Я незадаволена глянуў на свайго калегу, Іван Карпавіч перахапіў мой гэты позірк, стрымаўся з жартамі, сказаў сур'ёзна:

— Дзела маладое. Хто з нас не быў малады, на зоркі не глядзеў...

— Як жаніцца, калі жыць няма дзе? — здалёку пачаў я.

— З жыллём цяпер праблема,— уздыхнуў Іван Карпавіч.— А на сваю хату век рабіць будзеш. Мы вось пабудавалі для саўгаса шаснаццацікватэрны дом, а заяў маем пятнаццаць. І не адмовіш: просяцца спецыялісты, моладзь, без якіх саўгас не можа быць. Табе, Уладзімір Пятровіч, мо як і выхітруем.

— Трэба,— сказаў Уладзімір Пятровіч,— а то гаспадыня бурчыць, скардзіцца, што прызванілі ёй вушы свае дзеці, надакучылі за век, а цяпер чужыя звоняць...

— Будзем старацца,— сказаў Іван Карпавіч,— але ж сам падумай: прыходзіць шафёр ці трактарыст малады, хлопец толькі з войска, гаворыць: «Дасце кватэру — буду жаніцца і ў вас рабіць, не дасце — паеду ў горад, ажанюся і на чаргу стану». Не дасі — з'ездзе, а ў нас

цяпер во колькі тэхнікі... А паспрабуй эканамісту, аграному, бухгалтару якому прыезджаму свайго кута не даць...

— А мы спадзяваліся на вас,— сказаў я, і ў душы маёй апала ўсялякая надзея на свой кут.

— Скажу, Мікалаевіч, па сакрэту табе, ёсць пакуль што адна вольная кватэра, трымаем яе для новага агранома. Прыедзе сямейны — яго, халасцяка прышлюць — тады яшчэ можна падумаць ці паглядзець.

— То, можа, напісаць на ўсякі выпадак вам заяву? — спытаў я, і ўва мне зноў ажыла надзея, спадзяванне на шчасце.

— Калі пісаць, то не мне, а рабачкому,— сказаў дырэктар.— Але, як я вам ні спачуваю, нічога не абяцаю. І вы патрэбны чалавек у саўгасе, але вы не мой работнік.

— Дык мы вам рыхтуем работнікаў,— заступіўся за мяне Уладзімір Пятровіч.

— Гэта мы ведаем,— усміхнуўся Іван Карпавіч,— чуем і самі гаворым.

Я, спадзеючыся на шчасце, напісаў ад імя Ларысы і сябе просьбу даць нам, калі можна будзе, кватэру ў новым вялікім доме.

— Трэба было табе не так падыходзіць,— калі мы выйшлі з канторы, сказаў Уладзімір Пятровіч.— Ці размову зусім з іншага пачынаць, ці не ў гэтым месцы. Праварoніў ты сёння, словам. Вось і разумны, а людзей не ведаеш.

— А што мне трэба было рабіць? — спытаў я.

— Пасля скажу,— усміхнуўся Уладзімір Пятровіч.

— Калі сабе кватэру атрымаеш? — ледзь не са злосцю спытаў я.

— Ну, чаму...— пачаў адгаворвацца мой калега, нават крыху паружавеў, што я ўгадаў яго думкі, якія ён не вельмі хацеў выказваць.

## 27

Ішлі апошнія дні работы ў школе ў гэтым старым годзе — пісаліся сачыненні, ізлажэнні, стаміліся і дзеці, і настаўнікі. Чакалі Новага года, новага снегу, зімовых ледзь не двухтыднёвых канікулаў. Хто хоць крыху парабіў у школе, ведае, якая гэта асалода, вялікая радасць — канікулы!..

Я правяраў кантрольныя работы, выстаўляў адзнакі за чвэрць і бачыў, што за гэта я сам больш перажываю, як дзеці. Добра помніў, як калаціўся вучнем за гэтыя адзнакі, як глядзелі на іх мае бацькі, параўнаў, як глядзяць на іх цяперашнія дзеці і іх таты і мамы. Думаў я пра гэта, і нешта здавалася мне, што і мы, настаўнікі, і бацькі недзе штосьці перагнулі, недагледзелі.

Я сам яшчэ ўспомніў, як мне ў школе гаварылі настаўнікі, а дома такое ж выказвалі бацькі, суседзі, ды і цяпер гавораць на сваіх уроках дзецям Міхась Рыгоравіч ды Уладзімір Пятровіч: вучыся, калі не думаеш пасвіць кароў, не прыбіраць на фермах гной, не глытаць за трактарам пыл. Вучыся, калі хочаш хадзіць пад гальштукам ці пад капелюшом, вучыся, калі хочаш выбрацца ў горад...

І дзеці, як і цяпер каторыя, вучацца ўжо ў школе думаць пра «гальштукі», цураюцца вёску. Але веска змянілася, людзі не так сталі баяцца фермы, калі там усё механізавана, добра плоцяць, калі свінарка, пастух не толькі атрымліваюць больш за «спецыяліста з дыпломам», але і шануюцца людзьмі.

Сёння мае ўсе сямікласнікі ведаюць, што яны пойдуць на заводы і заробяць не менш за мяне, настаўніка, што яны і культуры, аб якой я гавару ім, хочуць большай, чым можна знайсці тут. Хоць культуру яны няправільна разумеюць.

«Але ці не замнога я хачу? — часамі думаў я.— Так можна і заблытацца. Але так, як робім мы, рабіць мала, трэба нешта шукаць і новае... Ці не шукаць, не думаць пра гэта, як робяць некаторыя?»

— Але хапае работы ў школе,— гаварыў я сабе ўслых.— Ёсць аб чым думаць, што шукаць — і можна тое-сёе знайсці.

...Апошнім днём старога года я нажыў непрыемнасць для сябе. Мае сямікласнікі паскардзіліся мне, што дзве іх чарніліцы, якія яны купілі за свае грошы, узялі дзеці з пятага класа, класнай якіх была Вольга Піліпаўна. Самі яны не пайшлі забіраць, пабаяліся.

Я пайшоў да пяцікласнікаў і, ведаючы, што дзеці любяць гаварыць праўду, запытаў:

— Скажыце, хто ў вашым класе такі нехарошы, што чарніліцы нашы забраў?

— Пеця і Вася,— у адзін голас закрычалі дзяўчынкі.

— Чаму вы іх узялі? — спытаў я хлопчыкаў.

Тыя паапускалі галовы. Я прысарамаціў іх і аддаў сваім дзецям іх чарніліцы, а сам пайшоў у настаўніцкую.

Следам за мною ўскочыла Вольга Піліпаўна, падбегла да мяне, аж сіпела і не магла нічога вымавіць.

Я здзівіўся і глядзеў на яе.

— Вы... вы...— выцісквала Вольга Піліпаўна, усе настаўнікі таксама са здзіўленнем глядзелі на нас.

— Што такое? — спытаў я.

— Вы яшчэ жартаваць думаеце са мной? — нарэшце знайшліся ў яе словы.— Хто я вам: вучаніца ці стары педагог?

— Вольга Піліпаўна, я не разумею...

— Вы тады — хам!. — ужо крычала Вольга Піліпаўна.— І жарты вашы такія. Стаю ў класе, грэюся ля грубкі, заходзіць, забірае чарніліцы і аддае гэтым хуліганам з сёмага. Я перад дзецьмі спыняю: «Павел Мікалаевіч! Павел Мікалаевіч!» — а вы хоць бы глянулі.

— Чэснае слова, я вас не бачыў і не чуў,— збянтэжыўся я,— Ды і чарніліцы былі маіх дзяцей. Навошта нервавацца з-за такой дробязі?

— Гэта для вас дробязі, а для мяне гэта не дробязі,— ужо спакойней, але яшчэ гучна гаварыла Вольга Піліпаўна.— Вы аўтарытэт мой падарвалі.

— Не падрываў я вашага аўтарытэту,— апраўдваўся я.

— Вы святы, нічога дрэннага не робіце,— перакрывіла мяне Вольга Піліпаўна,— Добранькі, разумненькім прыкідваецеся, а самі цішком і пад Івана Сямёнавіча падкопваецеся, старым ды адсталым яго паказваеце.

— Каб ён быў стары ці адсталы, то яго райана зняў бы з пасады,— сказаў я.

— Чаго вам і хочацца...

— Не выдумляйце,— узлаваўся і я.

— Малады яшчэ, папрацуйце, работу ўведайце,— сказала Вольга Піліпаўна і спакайнела, гаварыла цішэй:— А паказвацца разумнымі ды добранькімі ўсе ўмеюць.

Уладзімір Пятровіч і Міхась Рыгоравіч маўчалі, хоць бы сказалі слова.

Вольга Піліпаўна замоўкла, пагардліва прайшла ля нас і выйшла на калідор.

— Ну і аса!— хіхікнуў Міхась Рыгоравіч.— Яна ўжо даўно збіралася...

— І вас, настаўнік і завуч Міхась Рыгоравіч, папрашу: перастаньце,— сказаў Алесь Трахімавіч,— абараніць іх вы маглі і раней.

Міхась Рыгоравіч асекся, збянтэжыўся, замармытаў:

— Я нічога, я толькі...

— Не трэба вашага гэтага «нічога»...

Празвінеў званок, і ўсе пачалі моўчкі збірацца на ўрокі. У мяне ўрока не было, я падышоў і стаў глядзець у акно, за якім гулі на далёкую вясну драты, праз нейкую шчылінку тонка свістаў і дзьмуў мне ў скронь холад, але я не адыходзіў і стаяў, глядзеў на блакітнае з белымі воблакамі, як і летам, неба, на яснасць, белату на двары і нават не верыў, што там цяпер холадна і стыла. Ні аб чым не думалася, не гадалася, толькі калі забалеў зуб, я зразумеў, што і я жыву на свеце, стаю вось ля акна, і мне чамусьці не зусім добра на душы.

Хтосьці мне паклаў руку на плячо. Я азірнуўся: ля мяне стаяў Алесь Трахімавіч.

— Я стары чалавек, Павел Мікалаевіч, гэтым летам на пенсію пайду, хоць і не ведаю яшчэ, як буду жыць без школы,— гаварыў Алесь Трахімавіч.— Але вам скажу, што адзін дыплом вы ўжо абаранілі. У інстытуце, як і ўсе. Але трэба абараніць яшчэ дыплом на смеласць, сумленнасць, цярплівасць, настойлівасць. Яго людзі абараняюць усё жыццё. Я толькі цяпер, пад старасць, зразумеў, што некалі хацеў сказаць Маркс, калі ў яго запыталі, у чым ён бачыць шчасце. «Барацьба»,— адказаў ён. Я толькі цяпер зразумеў гэтае слова «барацьба», і, каб мне ўдалося перажываць свой век, то і жыў бы гэтай барацьбою, раней і лепш абараніў бы свой другі дыплом...

Я стаяў і слухаў старога чалавека і, здаецца, разумеў яго.

— І вы ніколі не бойцеся, што вы робіце ўсё, што робяць усе, але рабіце так, як не робіць ніхто. Толькі так і варта жыць. І не трэба спакойненька глядзець ды з усмешачкай думаць: мне гэта не падабаецца, гэта ўсё дрэнна, я зрабіў бы лепш. Зрабіў бы — зрабі, змагайся, хоць гэта і накліча на цябе зайздрасць, помету, не бойся гэтага, не старэй душою і не чарсцвей. Веды, што далі ў інстытуце,— гэта не толькі наша справа, але і справа Радзімы. А адказнасць у нас заўсёды ясная: адказнасць перад людзьмі... Так што ў вас усё яшчэ наперадзе...

Я слухаў старога настаўніка, верыў яму і глядзеў у акно, за якім аціхла злая мяцеліца, улеглася, стаілася недзе за лесам. Са страхі сыпнула сухім снегам, закруціла — і тут жа аспакайнелі ўсе разлогі, выбеліліся, заіскрыліся, сталі светлымі і шырокімі.

1972

## ЮЛЯ

### 1

Юля хацела ўжо зваліць бярозу, апусціла на снег сякеру і, колькі мела сілы, націснула на ствол плечуком, пахіляла яго ў бакі — дрэва страсянулася, заківалася верхавінкаю, густа акрапіла Юлю талаю вадою, але ўтрымалася і не ўпала.

Тады яна абтаптала высокі наздраваты снег ля камля, абламала паблізу тонкія кусцікі, за якія чаплялася сякера, і пачала падсякаць ствол, адчуваючы, як слабеюць, выпускаюць тапарышча рукі, як ныюць плечы і хутка-хутка, моцна стукае ў скронях.

Бяроза нарэшце хіснулася, нахілілася, павісела хвіліну на асіне, але не ўтрымалася, трэснула, садрала ля камля кару і паляцела долу. Юля задаволена разагнулася, усміхнулася, аблізнула сухія вусны, абмахнула мокрым, белым ад бярозавай кары рукавом пот, пастаяла хвіліну і, ледзьве паднімаючы сякеру, абцерабіла бярозу ад вецця, перасекла яе на палавіне і падягнула камель да саней.

Снег тут, у маладым лесе, ляжаў яшчэ глыбокі, рыхлы, пад ім збіралася вада — ногі правальваліся, на кані сюды нельга было пад'ехаць. Трэба было дягаць дровы за сотню крокаў.

Такой парой гаспадарліваму чалавеку і ў галаву не прыйшло б ехаць у лес. Але Юля спаліла ўсе дровы. Папрасіла каня, перагаварыла з лесніком і прыехала ў лес.

Нізка свяціла цёплае ўжо сонца, у зацішку ўгравала: блізка і чуйна цягнула адталаю зямлёю, спрэлым, сплеснелым лісцем, шыгаллем, чарнічнікам, верасам, травою — усім тым, што засыпаў восеннюю снег. Незразумела лёгкае было паветра з яшчэ няблізкім, кволым, але такім знаёмым свежым пахам вясны, і цяпер бярозавік, святло, высокае зіхаткое неба захвалявалі, і Юля затрывожылася, быццам, калі растане, сцячэ ручайкамі апошні снег, вернуцца з песнямі, сваімі клопатамі птушкі, зацвіце, закрасуе зямля,— настане зусім іншая, больш дзівосная і шчаслівейшая пара...

Калі цягнула камель да саней, правальвалася, набірала ў боты снегу. Прывалакла, кінула паблізу сякеру і хацела прысесці, але не села: ведала, што тады цяжка будзе падняцца. Яна толькі нагнулася, згарнула счарнелы зверху снег, зачарпнула белага і лізнула яго.

— Не змёрз? — спытала ў сына, які сядзеў на санях і складаў з трэсачак хатку.

— Не,— адказаў Пецька.

— Прагаладаўся?

— Ага.

— Паедзем зараз, сынок,— сказала Юля.

— І я буду кіраваць канём?

— Ты, сынок,— суцешыла сына Юля і вярнулася па апошнюю на бярозавай палянцы верхавінку. Рашыла болей не секчы, хопіць...

Верхавіна была лёгкая, і Юля, пакуль амаль улегцы ішла з ёю адчула, што адышлі рукі і плечы, перастала стукаць у галаве. Калі дайшла, палажыла ўпоперак саней два палены і пачала накладаць на іх дровы.

Узлажыўшы бярэзнік на сані, абцягнула яго ланцугом, зашчапіла крукам за кольца другога канца, высекла, як гэта робяць мужчыны, тонкі кіёк, падсунула яго пад ланцуг, закруціла, колькі хапала сіл,—

каб не гайдаліся, не развальваліся дровы. Сын таксама памагаў, мітусіўся пад рукамі, і яна радавалася, што выседзеў столькі ў лесе, не замінаў ёй.

«Хопіць на месяц паліць,— падумала,— а там пацяплее».

Сабрала растрэсенае канём сена, ускінула на сані, адвязала ад асіны лейцы, дала іх сыну, цмокнула на каня. Конь ірвануў прымёрзлыя да снегу сані, выцягнуўся, аж затрашчала дуга, але сарваў з месца, пайшоў павольна. Месцамі ён глыбока правальваўся, станавіўся, сын тузаў лейцамі — і конь выскокваў з глыбокага снегу, сам выбіраў цвярдзейшае месца.

На вялікіх светлых палянках снег раставаў, на іх падсыхала галлё, леташняя трава. Лясную ж дарогу выездзілі, выкаталі за зіму, цяпер на ёй яшчэ ляжаў тонкі цвёрды лёд, які паволі адтаваў, сцякаў вадою і блішчаў на сонцы. Узбоч дарогі снегу зусім не было, там было мокра, а на ўзгорках абсыхала, бялелася зямля — там бегалі ўжо неспакойныя мурашкі.

Не паспела Юля падумаць, што па такой дарозе ўжо не пара ездзіць у санях, як яны мігам саслізнулі на ўзбочыну, і адзін полаз зашаргацеў па пяску. Конь стаў. Юля сама тузала яго лейцамі — конь сцінаўся, ірваўся з месца, але выцягнуць цяжкія сані на дарогу не асільваў.

Яна адламала паблізу асінавую галіну, абцерабіла яе ад веццяі сцебанула каня — той ірвануўся, але саней нават не скрануў. Юля зноў дала сыну лейцы, папіхала сані і крычала на каня, пасля зайшла і хацела прыпадняць аселы, угрузлы бок — сані былі цяжкія, і падняць іх не хапала сілы.

— Мама, і я памагу,— азваўся Пецька.

— Сядзі, сынок,— папрасіла Юля, падышла і села ля яго.— Не здолеём мы з табой выпіхнуць на снег сані.

— А баба наша здолее? — спытаў сын.

— Каб была тут баба, то, відаць, далі б рады,— Юля ссадзіла сына, адпусціла ланцуг, каб скінуць на зямлю дровы, выехаць на цвёрдае ездавое месца і зноў нагрузіцца. Ужо адчапіла крук, скінула сякеру і сена, як убачыла лесніка Міколу, што выйшаў са стрэльбай за плячыма са старога лесу.

— Ці не задрамалі тут на сонцы? — усміхнуўся ён.

— Не выедзе во конь,— збянтэжылася Юля.

— Дзе ж ён тут табе выедзе,— сказаў Мікола, абышоў і агледзеў сані.— Тут і трактар не вывалача. Ужо трэба ў калёсах, маладзіца, ездзіць. Пажартаваў з цябе конюх, калі пасылаў з санькмі.

— Разгрузіцца, мусіць, трэба,— прамовіла Юля.

— Не трэба, лішняя работа толькі. Сячы голле і давай яго сюды,— сказаў Мікола.

Юля абсекла з бліжэйшай алешыны голле, збіла зялёны густы ядловец, маладую пушыстую елачку і падала ўсё Міколу. Той выцягнуў з-пад ланцуга верхнюю палку, падлажыў яе пад сані і паклікаў Пецьку: «Хадзі сюды, мужчынка!» Яны ўдвух прыпаднялі сані, а Юля падкінула пад полаз мокрае і слізкае галлё.

— Дужы ты, Пецька! — усміхнуўся Мікола, апусціў сані і сказаў Юлі паганяць каня.

Юля цмокнула, конь крануўся і лёгка выйшаў на ездавую дарогу.

— Дзякуй табе, Мікола,— усміхнулася, пашчаслівела Юля,— сама я не здагадалася б на такое.

— Ты сыну свайму дзякуй,— сказаў той,— добры ў цябе малец. Ды і во колькі дроў насек.

— Гэта не я сек, а мама,— засаромеўся Пецька.

— Мама твая магла б сама ў лес і не ездзіць,— сказаў Мікола,— мог бы ездзіць мужчына, каб маці...

Юля прамаўчала, адвярнулася, ускінула на дровы сена, пасадзіла сына і тузанула каня за лейцы.

— Я ўжо дужы, мама,— калі ад'ехаліся, азваўся Пецька.— Каб не я, то дзядзька Мікола не падняў бы саней.

— Ты ж мужчына, сынок,— усміхнулася Юля,— пяты гадок ужо табе.

— Я буду яшчэ больш есці, каб дужэць.

— Еш сынок.

— Тады буду адзін у лес ездзіць.

— Будзеш.

— І нікому не дам пакрыўдзіць цябе,— па-сталаму сказаў сын.

— Дзякуй, мой асілак,— Юля пацалавала Пецьку і накіравала каня па коўзкай цвёрдай дарозе, баючыся, каб зноў не саслізнулі на пясок сані.

## 2

Конь цягнуў паціху сані, палазы слізгалі па лёдзе, рыпелі гужы — і Юля суцішылася, ішла, трымалася за бярозавы сук. Прыціх і Пецька, сядзеў на дровах, што верабей, і думаў аб нечым сваім.

Юлі ўспомнілася, што вось так было і раней: яе з сабою ў лес браў бацька, яна зносіла і паліла галле, а то гуляла па лесе, збірала ягады ці кветкі ці сядзела ля воза і чакала, калі паедуць дадому.

Бацька, зрабіўшы сваю работу, садзіў яе на воз, і яны ехалі дахаты. Ехала яна, а бацька ішоў, трымаўся за ўсаджаную ў палена

сякеру, курыў і жартаваў. Працаваў ён моўчкі, любіў, каб яму не перашкаджалі, але пасля быў вясёлы.

Цяпер вось едзе на возе яе сын, а ідзе яна. Хоць, падумала, павінен ісці бацька гэтага дзіцяці, а цешыцца яздою — сын. Але ў Пецькі бацькі няма.

Юля спрабавала ўявіць, як жыла б яна з мужам. Відаць, не ездзіла б сама ў лес, не рэзала і не калола б дроў, не касіла і не арала б... Не памёр яе муж, жывы, працуе недзе; Пецька і не ўспамінае яго, відаць, забыўся, затое яна часта ўспамінае, думае, што нядобра разышліся. Не разводзіліся, паспрачаліся, яна сабрала чамадан, узяла дзіця і паехала да маці. Можа, і трэ было вярнуцца да мужа, але не дазваляе гонар: Генадзь не прыязджае і не піша ей, не просіць, каб вярнулася.

— Мама, мама, кветачка!

Яна прыпыніла каня і паглядзела, куды паказаў сын, на сонечнай палянцы ля старога, некалі абгарэлага, а цяпер цёплага лому відаць была блакітная пралеска. Юля зняла з дроў сына, і яны пайшлі да лому.

— Якая прыгожая! — здзівілася Юля. Як магла пры такім холадзе з'явіцца такая кволая кветка? Сарвала яе і падала сыну.— Не пахне, але колькі красы! Давай пашукаем яшчэ, збяром букецік.

Яны адышліся ад палянкі, абыходзілі лапіны снегу, але пралесак больш не знайшлі.

— Відаць, ты будзеш шчаслівенькі, мой мужчынка,— абняла сына за плечы Юля.

— Я буду дужы,— запярэчыў сын,— буду памагаць табе.

— І дужы будзеш,— супакоіла яго Юля,— але і дужаму, і нядужаму таксама шчасце трэба...

Сын, канечне, не разумеў яе, сядзеў на дровах і трымаў кветачку, кіравала канём Юля.

Калі выехалі з лесу, Юля ўбачыла маці. Тая, відаць, не магла дачакацца іх і выйшла насустрач.

— Трэ было не секчы столькі,— сказала старая.

— Прывязём, дык будзе,— адказала Юля.

— Я думала, заселі недзе. Якая пара, а вас няма.

— А я памагаў дзядзьку паднімаць сані,— пахваліўся Пецька.

— Жывы яшчэ, верабей? — усміхнулася бабуля.— Не змёрз?

— Не.

— Я ўжо і перажывала, што пусціла цябе ў лес. На во, пагрэйся,— яна дала ўнуку лусту хлеба, памазанага мёдам.

— Каб адна была, то сядзела б без дроў.— сказала Наталля, Юліна маці.

— Пасадзім бульбу, навозім дроў, каб на ўсю зіму было.

— Паедзеш, можа... Я ўжо сама неяк збяру ці папрашу каго.

Юля прамаўчала, не магла сказаць тое, што ведала, рашыла. Маці здагадвалася аб гэтым і болей не напаміналa, думала, што дачка сама знае, што ёй рабіць.

— Анька прыехала,— сказала Наталля.

— Адна ці з сям'ёю?

— Адна.

З Анькаю Юля разам хадзіла ў школу, ездзіла па вярбоўцы на работу, там яны і выйшлі замуж: Юля — за Генадзя, шафера, Анька — за начальніка ўчастка.

У Юлі не ўдалася сям'я, Анька была шчаслівая — як пісала лісты, то хвалілася: «Жыву і жыць хочацца».

Юля ведала, што Анька прыйдзе вечарам, будзе хваліцца і растрывожыць душу. Юлі не хацелася з ёю сустракацца.

## 3

Як звечарэла і ў хатах запалілі святло, па-далікатнаму пастукаўся і зайшоў Мікола-ляснік. Юлінаму малому прынёс пакуначак пацёртых за дзень у кішэні, цёплых цукерак, старой — букецік блакітных пралесак.

— А табе, маладзіца, нічога няма,— усміхнуўся, шчыпнуў Юлю.— Ты сама мне тое-сёе вінавата...

— Сядай, Мікола, будзь госцем,— таксама ўсміхнулася Юля, змахнула ручніком стол, схадзіла ў кладоўку і прынесла кавалак мёрзлага сала.

— Уключы плітку ды падсмаж сала,— сказала ёй маці.— Чалавек за дзень намёрзся, то яму цяпер пагрэцца трэба.

— Не трэба, цётка Наталля,— махнуў рукою Мікола, сеў ля стала.— Чалавек я свойскі, не ганарлівы. Што ёсць, тое і добра. Рэж, Юля, і мёрзлае... Хадзеце, цёця, вып'ем, каб дровы добра гарэлі.

— Хіба кропельку мне, сынок, ды за дровы,— старая сёння ахвотна згадзілася выпіць і сама капнула сабе ў шклянку.— Выпі, Міколка, яшчэ, можа, сухастою дасі. На падпалку. Сам ведаеш, без мужчыны жывём: я старая, а яна...

— Мама! — папрасіла Юля.— Перастаньце...

— Што — мама, што — перастаньце?!— не вьщерпела, зазлавала маці.— Калі мама сама не папросіць чаго, то ты век не папросіш...

— Дадзім, цётка, якую сасёнку, не будзеце без дроў сядзець,— усміхнуўся Мікола.— Абсохне скора, то галля саберацe, сухастоіну якую паваліце. Свае ж людзі, суседзі...— Мікола ўжо недзе выпіў,

пасядзеў крыху тут, у цёплай хаце, то яго добра разабрала. Стаў ён надта вясёлы і добры.— А ты, гаспадар малы, чаго на катовай горцы грэешся? Злазь, хадзі да нас!

— Намезрлася дзіця ў лесе, няхай адагрэецца,— заступілася за ўнука Наталля.

— Канём ужо спраўна кіруе,— сказаў Мікола,— і сані выпіхаў з пяску на лёд, так упёрся, ажно пачырванеў у твары... І Юля пачырванела...

— Мой ты сынок, Міколка,— пабедавала старая,— хіба бабе ў лес ездзіць, секчы ды пілаваць?

— І я, цётачка, ёй так казаў. Гавару: магла б сама ў лес не ездзіць, ля дому мужчынскую работу і не рабіць. Трэба толькі...— нахіліўся Мікола да Наталлі і зашаптаў ёй на вуха.— Трэба, цётка, зяця добрага браць. І лягчэй жыць будзе, і ёй весялей стане...

— Я ёй, Міколка, ніколі не замінала і цяпер не замінаю...— сказала Наталля і пабралася да ўнука на ляжанку.— Хай сама робіць, што хоча. Не маладзенькая, свой розум мае...

— І не піша зяць пісем, не збіраецца сюды прыехаць ці да сябе забраць? — спытаў Мікола.

— Дзе ён піша...— прамовіла старая.— Каб хацеў жыць разам, ужо даўно, як ты кажаш, прыехаў бы сюды, застаўся б ці да сябе паклікаў. Ой, Міколка, ты добры чалавек, нікому нічога не скажаш, дык я табе прызнаюся: як выйшла яна замуж, так і жыве! Чаго было ёй перціся на тыя заробкі, сыходзіцца з чужым чалавекам? Хіба тут работы не было ці свае хлопцы не маглі б замуж узяць? Не падумала вось добра...

— Перастаньце, мама,— незадаволена сказала Юля.

— Вось і ўся яе гаворка са мною. Перастаньце ды памаўчыце...— прамовіла Наталля.— Жыве як старая баба, хаваецца ад усіх. На днях тутэйшы настаўнік, такі талковы, сталы чалавек прыходзіў, мяне ды яе ўсё па бацьку называў, цукеркамі частаваў. Відаць, што хоча да нас у прымы прыстаць. Хай бы і брала яго. Дык дзе табе: сказала слова ды збегла з хаты... Шафёр барысаўскі, таксама важны чалавек, на тым тыдні сватаўся — і ў горад браў, і тут згаджаўся быць — адмовілася... Чакае нечага...

— Ой, мама, як надакучылі мне вашы песні! — сказала Юля і зірнула ў акно: ёй здалося, што хтосьці прайшоў па двары.

Яна ўстала, падышла да акна і паўглядалася, але нікога не заўважыла.

— Давай, Мікола, яшчэ вып'ем,— сказала яна.

— Давай, Юлька,— згадзіўся ён.— Люблю цябе за дабрату і сціпласць. Харошая, талковая ты баба. Звязалася во з нейкім круціхвостам, засмуціла сабе жысць. Каб некалі, як я бегаў за табою, не з'ехала, пайшла за мяне, то я цябе вельмі шанаваў бы. Усім людзям на зайздрасць мы з табой жылі б.

— За цябе, Мікола, я пайшла б, каб ведаць магла такую сваю цяперашняю долю,— прызналася Юля.— Але вось бяда: усяго не ведаеш спачатку...

У дзверы хаты далікатна пастукалі. Калі Юля запрасіла зайсці, дзверы адчыніліся і ў хату нясмела зайшла жонка Міколы, Любка,— невысокая, светлавалосая, вельмі раўнівая жанчына.

— Добры вечар!— стрымана прывіталася яна, непрыхільна агледзела мужа і Юлю.— Хадзем, Мікола, дадому.

— Прысядзь, жонка, выпі маю долю,— сказаў ён,— а то мне можа, ужо і мнагавата сёння будзе.

— Прысядзь, Любка,— запрасіла і Юля.

— Пайшлі, Мікола,— Любка стаяла ў парозе, маленькая, жаласная, з крыўдаю на вуснах і слязьмі ў вачах.— Хадзем, Мікола, нешта з нашым малым сталася...

— Я толькі што заходзіў дадому і бачыў: гуляе хлопец,— сказаў Мікола і не думаў паднімацца і ісці дахаты.

— Садзіся, Любка,— усміхнулася Юля, здагадваючыся, што зараз на душы ў суседкі.

Гэтая Юліна ўсмешка пакрыўдзіла госцю. Яна плюснула вачыма, усхліпнула і «ўзарвалася»:

— Я не спадзявалася на цябе, Юлька, што ты можаш такое... Чужых мужчын зманьваць, ад дзяцей бацьку забіраць... Красівая, маладая, вось яны і ліпнуць да цябе... І вам, цётка, брыдка: век пражылі, але патураеце...— вусны Любкі затрымцелі, яна не магла больш гаварыць, заплакала.

— Ты Булькі не чапай, не лі на яе бруду! — узлаваўся, ускочыў з лавы Мікола,— ты яе не варта...

— А я раўняцца з такімі не хачу,— азвалася яго жонка,— не развялася са сваім мужам і другіх не зманьваю...

— Ну! — падскочыў да жонкі Мікола са сціснутымі кулакамі.

— Вар'ят! — закрылася тая рукамі, адскочыла.— Можаш і не ісці дахаты, да дзяцей сваіх. Цягайся па чужых хатах...— папракнула і выскачыла на двор.

— Ну і дурная! — Мікола прысеў на лаве і не мог ад злосці гаварыць.— Прыйдзе ж во ў галаву... Не злуйся ўжо, Юля...

— Я не злуюся...— спакойна сказала Юля, але відаць было, што спакой гэты вельмі вымушаны, за ім у душы хаваецца зусім іншае...

— Ты не засмучайся, Юлька,— прасіў Мікола,— я ўсё ўладжу.

— Толькі ты не шумі, дзетка, не чапай сваю кабету,— сказала Наталля,— можа, і навёў які паганы чалавек, пазласлівіў. А сэрда бабскае такое: паверыла, нават не падумала, ускіпела...

— Усё будзе добра, цётка,— паспрабаваў усміхнуцца Мікола. Відаць было, што ён усміхнуўся, каб не так супакоіць старую, як Юлю, якая маўчала, перажывала ўсё моўчкі.

Мікола закурыў, пасядзеў яшчэ крыху, пагаварыў, увесь час стараючыся перавесці гутарку на іншае, а пасля пайшоў дахаты.

Юля не ўставала з-за стала, сядзела аблакаціўшыся, абхапіўшы галаву рукамі. Заплюшчыла вочы, слухала, як звонка цікаў гадзіннік, ціха сядзелі на печы сын і маці, чула, як балюча стукае ў скроні, туманеюць, макрэюць шчокі...

## 4

Юля ўсхапілася на світанні, калі загудзелі правады і моцна зайграла радыё.

Яна выключыла прыёмнік, каб паспалі яшчэ маці і сын, выскачыла з цёплай пасцелі — і цяпер яе агарнуў холад; у галаве праяснілася: зноў лажыцца не варта, трэба пачынаць гаспадарскую работу.

— Я і сама ўжо ўстала б, паляжы яшчэ,— загудзела з печы маці.

— Ляжыце, мама.

— Я ўжо адляжала бакі на печы за свой век,— маці прыўзнялася, знайшла свае цёплыя валёнкі, абулася і спаўзла з чарэні.— Як ні палі, усё роўна холадна ў хаце,— сказала яна, пацяпнула плячыма.— Відаць, ператрухлела ўся. Даўно пара новую ставіць. Я дажыву і ў гэтай, а пра сябе ты ўжо сама думай.

Юля выпіла халоднага ўчарашняга кампоту, апранулася і выйшла на двор. Гулка стукнулі дзверы, на ганку Юлю працяло калючым холадам, яна нахвіліну прыплюшчыла вочы, стаілася, стараючыся адолець дрыготку. Ныла пасля ўчарашняга спіна, круціла паясніцу, балелі рукі.

Юля зайшла ў гумно, наскубла шорсткага халоднага сена, чуючы, як яно церпка пахне, занесла і ўкінула яго карове. Падабрала растрэсенае кароваю, падчапіла віламі і ўскінула на вышкі — перамяшаецца з саломай, перарэжацца на сечку, абальецца цёплаю вадою, сыпнецца дзеля паху мукі — з'есць пасля карова, нідзе не дзенецца.

Потым Юля зайшла на дрывотню, набрала халодных, заінелых дроў. Звычайна яна ці маці прыносілі дровы ў хату вечарам, лажылі падсушваць на гарачы под. Учора забавіліся, забыліся пра іх.

Юля прынесла бярэмак дроў і скінула ля вілачніка, і яе работу перахапіла маці, нібы далей сама, як старэйшая, магла зрабіць лепш: узяла палена, палажыла яго ў печ, паблізу прыладзіла другое, накідала на іх астатнія.

Сукасты, гарбаценькі камлючок скаціўся на под, і маці паправіла яго, нават не чуючы, што даткнулася лбом да засажанага чалесніка, вычарніла лоб. Юля ўсміхнулася, але прамаўчала, ведала, што не трэба спыняць маці, адрываць ад такой няхітрай штодзённай, але радаснай работы: успыхнуць дровы, заліжа агонь паднябенне, ажыве хата... Юля наліла ў сагана вады, пачакала, пакуль маці налажыла дроў і запаліла. Тады Юля падняла, паставіла сагана на прыпек і пайшла па ваду.

Калі яна, пагаварыўшы крыху з суседкай, прынесла поўныя вёдры, маці ўжо наабірала і цёрла на дранікі бульбу.

Юля дастала з печы саганок, зачарпнула конаўкай цёплай вады, паліла на ручнік, узяла вядро і падалася ў хлеў. Абцёрла мокрым канцом ручніка вымя каровы, пасля абмахнула сухім, падставіла вядро і пачала даіць, слухаючы, як звонка б'е ў вядро малако.

Юля толькі нядаўна навучылася даіць карову, прызвычаілася да ўсялякай гаспадарскай вясковай работы — дзяўчынаю не хацелася, ды і маці аберагала, гаварыла: вучыся. Пабыла ў леспрамгасе, і толькі калі вярнулася дамоў, навучылася і ў лес ездзіць, і араць — вядома, як жыць у вёсцы без мужчыны. Аднагодкі яе не ўмелі рабіць такой работы, а яна ўмела: навучылася. Не раз трэ было і старацца, каб людзі менш бачылі, што цяжка.

Карова сёння дала многа малака, з паўвядра,— відаць, таму, што ўчора пахадзіла па двары, пагрэлася на сонцы і пачула вясну — ахватней вечарам апаражніла цэбар сечкі, выпіла тры вядры вады.

Юля прынесла малако ў хату, працадзіла.

— Макарону зварым ці рысу? — спытала маці.

— Зварыце што-небудзь,— адказала Юля.

— Не прыйшла во ўчора, не праведала, хоць і таварышкавалі некалі.

— Можа, стамілася за дарогу,— сказала Юля, ведаючы, што маці гаворыць пра Аньку.

— Не так, мусіць, стамілася, як гонару набралася,— запярэчыла старая.— Хваляцца Саладухі, што надта добра жыве, муж працавіты, добры, не курыць, не п'е, грошы вялікія прыносіць.

— Пашанцавала,— сказала Юля.— Шчасце ўсім пароўну не даецца: аднаму прываліць, другога абыдзе...

— Бацькам, канечне, добра, калі дзеці ладна жывуць,— прамовіла маці.— Сямёніха хвалілася ўчора ўсім, што надта дарагія хусткі ды валёнкі ёй дачка прывезла.

— Умты хіба? — спытала Юля.

— А чорт іх там бачыў, хунт яны там ці болей.

— Унты, мама, боты такія...

— А чорт яго ведае, як там па-вашаму, па-цяперашняму, хіба я, век са сваёй вёскі не выязджаючы, разбяруся. Як назавуць што, дык аж галава трашчыць,— сказала Наталля, адцягваючы далей ад агню саганок.— Але зайздросна слухаць, што ў некага ўсё ладна выходзіць.

— Хіба, мама, я не хачу шчасця? — спытала Юля.

— Бог цябе ведае, дачка,— сказала маці.— Жылі столькі гадоў, дзіця гадавалі і — не паладзілі... Па табе бачу: не голая, не галодная была, а вось як ты гаворыш, шчасця не маеш. Сядзіш цяпер, як і я, удава старая. Калі сама вінаватая, папрасіла б...

— Не так усё легка ў нас, як вы, мама, думаеце,— сказала Юля.

— Я толькі думаю, што сям'ю сваю зберагаць трэба,— адказала маці.

...Пад'еўшы, ведаючы, што сёння на работу ісці не трэба, Юля хацела пачакаць пакуль пацяплее, і прылегла.

Заснула яна хутка, адразу начала сніць, што апынулася дзесьці ў цёмным, сырым месцы, пасля прыйшло на розум, што гэта іхні стары лес за Лысаю гарою.

Агледзеўшыся, яна ўбачыла, што трапіла на бярозавую палянку з вострымі пнямі. Яна прайшла па вытаптанай сцежцы і ўбачыла знаёмага каня, запрэжанага ў сані, а на іх многа бярозавых дроў, перавязаных ланцугом.

Конь сам крануўся з месца, пайшоў. Трымаючыся за дровы, пакрочыла і яна. Сані легка слізгалі па лёдзе, і так усё гэта было чуйна, што Юля соcну адчула лес, яго прахалоду, шчырае, нямоцнае яшчэ веснавое сонца. Конь стаў, забіў капытамі і чалавечым голасам сказаў: «Чаму ж ты не кіравала мною? Я сам зусім не ведаў, як і куды мне ісці».

Юля паганяла каня, але ён не кратаўся з месца.

Нечакана выйшаў з-за дрэў чалавек, Юля глянула на яго і ледзь не звалілася з ног: гэта ішоў Гена, яе муж, і такі ён быў стомлены, што хістаўся, ледзь стаяў на нагах. Ён быў высокі, чорнавалосы, але цяпер з вострым носам, з такімі памутнелымі вачыма, што яна жахнулася. Ён трымаў у руках вядзерца са снегам і паказваў, каб яна высыпала

снег пад полаз. Яна ўзяла вядзерца, а Гена ўпаў. Юля закрычала... і прахапілася...

«Гену кепска, вельмі кепска,— адыходзіла яна ад сну,— і ён, відаць, думаў пра мяне, можа, нават хацеў, каб я памагла яму»,— і гэтая думка цэлы дзень не выходзіла з галавы.

## 5

Управіўшыся па гаспадарцы, Наталля, ці Пётрычыха, як яе называлі суседзі, пайшла гуляць на вёску; Юля падмяла, выцерла ў хаце падлогу, пасля апранула малога і падалася з ім на двор.

Цёпла, ярка свяціла сонца, але ішоў тонкі, свежы холад ад зямлі — і было стыла, як і зімою ў сонечны марозны дзень, хоць ужо і гаварылі, што нехта бачыў, як ляцелі над полем буслы.

Юля вынесла з дрывотні пілу, старыя, пасечаныя і спілаваныя козлы, пастукала да іх сякераю — падагнала, змацавала ножкі, палажыла бярозу.

— Хадзі, мужчына, — усміхнуўшыся, паклікала сына,— разрэжам колькі пален.

Сын падбег, з радасцю хапіўся за пілу, цягаў, ірваў ці моцна ціснуў яе ўніз — піла выскоквала; пакуль адпілавалі паленца, бяроза была ў адных надрэзінах, але ўсё ж сын трымаўся і цягнуў за ручку, піла не ківалася па баках, і лягчэй было рэзаць, чым адной.

Першае палена сын памог разрэзаць з ахвотаю, на другім пачаў цягаць пілу павольней, паглядаў на бакі, не мог дачакацца, калі маці дазволіць яму марсянуць на вуліцу. Юля ўгаворвала яго, абяцала купіць новыя штонікі. Пасля ўзлавалася і пачала крычаць. Сын насупіўся, цягаў пілу і хліпаў сабе ў нос.

— Што ты, дзеўка, дзіця мардуеш,— загаманіла маці, якая прыйшла нечакана дадому.— Самі разрэжам ці Маньчынага Пецьку папросім,— старая падышла і забрала з рук унука пілу.

Той заскакаў, што нечакана збавіўся ад прымусовай работы, і панёсся кудысьці на вуліцу, дзе даўно ўжо гукалі, смяяліся і крычалі дзеці.

— Разрэжам на заўтрашняе ды і не будзем больш— сказала Наталля,— схаджу я ў Малышкі, апытаю ў каго і куплю сена.

Юля памаўчала, і старая таксама больш не загаворвала, лічыла, што сказала ўсё ясна, моўчкі цягала пілу, думала штосьці сваё. Калі яна сказала «хопіць» і панесла ў дрывотню пілу, Юля ўзяла сякеру і пачала дзяўбаць палена. Калолася бяроза цяжка: была намёрзлая, маладая, цвёрдая, а сякера тупая, шчарбатая і адскоквала ад палена.

Выйшаў са свайго двара і павітаўся з ёю сусед Сцяпан.

Можна было папрасіць яго, мужчыну, навастрыць сякеру бруском ці напілкам.

Юля ведала: Сцяпан паспачуваў бы, мог бы даць нават сваю сякеру ці наладзіць гэту, усміхаўся б, слаўся б лістам: «Нясі, Юлька. Давай, Юлечка. Табе папраўлю, пастараюся».

Юля даўно ведала яго «ласку» і баялася яе, старалася ніколі не спатыкацца з гэтым мужчынам.

Вяскоўцы лічылі Сцяпана добрым, спагадлівым чалавекам, так думала пра суседа і Юля: жывучы блізка, ён часта па сваёй волі заходзіў разбіць тоўстае сукастае палена, разагнаць бульбы ці занесці ў склеп поўныя мяхі, пачысціць кнырчука ці зацягнуць у лыч парасяці драціну. Часта Сцяпан заходзіў вечарамі, асабліва зімовымі, адзін ці з жонкаю, пасядзець, пагаварыць, запрашаў на хрэсьбіны ці на свежаніну, яго таксама запрашалі.

Нядаўна, калі Наталля папрасіла яго памянящь прасла ў іхнім плоце, калі Юля памагала яму заразаць у слупах зарэзіны, Сцяпан, амаль аднагодак Юлі, бацька траіх дзяцей, усё жартаваў, кпіў з яе.

— Чаго ты не зжылася са сваім мужыком? — дапытваўся ён.

— Ростам малы быў,— адказала Юля.

— Калі не ў рост пайшоў, дык, відаць... Ого, малыя — дужыя мужчыны!

— Ідзі ты! — сказала Юля.— Распусціў язык, як пугу.

Пад вечар, калі выпілі за полуднем, Сцяпан асабліва жартаваў. Пасля, азірнуўшыся, падышоў да яе, шапнуў, каб сёння не спяшалася зашчэплівацца, калі добра ўцямнее.

Юля засмяялася і сказала, што позна яму падходжваць, калі ўжо жонку займеў, трое дзяцей на карку мае; хутка пара будзе сыну нявесту шукаць.

Сцяпан яшчэ пажартаваў, Юля слухала, пасля і забылася пра гэтыя жарты, палівала яму вечарам на рукі, зноў частавала і заплаціла за работу тры рублі. Сцяпан адмаўляўся, не браў, Наталля сама паклала яму грошы ў кішэню.

Той ноччу Юлі спаць не хацелася; схадзіла спярша да суседзяў на тэлевізар, пасля ляжала і думала пра кіно, пра свайго сына, што гадуецца без бацькі, прыносіць з вуліцы ўсялякія словы, з кожным днём становіцца ўсё больш непаслухмяным. Думала пра свайго мужа, як яны нечакана, дзіўна сустрэліся, жылі, як яна моцна кахала яго, а ён часамі не разумеў яе, не слухаўся, часта прыходзіў з работы позна, злаваўся, што яна залішне прыдзіраецца, хоча прыручыць да сваёй спадніцы, асароміць перад яго сябрамі... Яна гадала, як ён жыве цяпер, паправіўся ці па-ранейшаму такі шалапутны, помніць яе, сына ці

забыўся пра іх... Ляжала, думала, як пачула ціхі стук у акно, пасля ў дзверы. Яна прыслухалася; стук ягачэ раз паўтарыўся.

Маці спала; Юля паднялася, накінула на сябе цёплую вялікую хустку і выйшла ў сені.

— Хто там? — спытала яна, але дзверы не адшчэплівала.

— Я,— пачула яна Сцяпанаў голас.

— Чаго табе?

— У мяне е пляшка віна.

— Позна ўжо, ідзі дадому,— сказала Юля,— ці адзін выпі.

— Выйдзі, Юлька, я хачу пагаварыць з табою.

— Ці не здурэў ты? Ідзі дадому,— сказала Юля і пайшла ў хату. Толькі цяпер яна здагадалася, што Сцяпан не жартаваў, сапраўды набіваўся ў «жаніхі»...

## 6

Юля дакалола астатнія палены, зложыла іх кастром на прыгуменні, каб выветрыліся; пасля набрала абярэмак і занесла на кухню.

У хаце было цёмна, ціха, і не хацелася заставацца тут, цягнула на халодны, з нізкім няяркім сонцам двор, дзе чулася вясна, радавала і трывожыла.

Юля хацела запаліць святло, пстрыкнула ўключальнікам — лямпачкі не загарэліся; відаць, электрык нечага адключыў святло на станцыі.

Хтосьці незнаемы затупаў на двары, доўга, не ведаючы, лэпаў па дзвярах, шукаў клямку. Юлька глянула і не пазнала нечаканую госцю, што зайшла ў хату. Адзета яна была не па-тутэйшаму, па-гарадскому: у тоўстым варсістым футры, бліскучых высокіх ботах, тоўстай пуховай хустцы, з моднай невялічкай сумачкай.

— Не пазнала? — усміхнулася, знаёма сказала госця.

Юлька таксама ўсміхалася, выцірала аб ручнік рукі
і прыглядалася.

— Анька?

Юля кінулася да былой сваёй сяброўкі, яны абняліся і моцна пацалаваліся.

— Я і не ведала, што ты дома,— сказала Анька, хоць словам яе цяжка было паверыць: ёй расказала недзе адразу ўсе вясковыя навіны яе маці.

— Дома, як бачыш,— прамовіла Юля.

— І даўно?

— Ды з восені жыву.

— І што ты робіш тут?

— Работы ёсць,— адказала Юля,— вару дзецям есці ў школьнай сталовай, бегаю дзень з чарпаком ля катлоў, памагаю маме па гаспадарцы. Учора ў лес па дровы ездзіла.

— А я, Юлька, ужо не змагла б са свіннямі ды каровамі...

— Ты ж вясковая, не гарадская...

— Ды адвыкла.

— Каб трэ было, то і навучылася б скора,— сказала Юля.— Але як ты жывеш?

— Ды не скарджуся. Жывая, здаровая, і дзеці растуць, у садзік ходзяць.

— Вялікія, мусіць, ужо твае хлопцы? — спытала Юля.

— Большаму шосты годзік, меншаму чацвёрты.

— Дзяўчынку яшчэ вам трэба.

— Што ты!— усміхнулася Анька.— Пракорміць ды адзець знайшлі б за што, але я вучыцца надумала, паступіла летась у інстытут, дык часу мне трэба многа.

— Ого! — здзівілася Юля.

— Ніякай жа спецыяльнасці няма, трэба вучыцца.

— Удалая ты,— сказала Юля, надрала з бярозы кары, налажыла ў грубку дроў, падпаліла, пачакала, пакуль угарыцца, тады зачыніла дзверцы і адкрыла паддувала — загуло, усхапіўся агонь, аблізаў палены. Анька прысела на лаве.

— У нас цеплавое,— азвалася яна.— Любата! Не трэба гэтых дроў. Цяпер, каб ты бачыла, як вырас наш горад... А Мішу майго павысілі, большы аклад, «Волгу» далі. Ведаеш, Іван, гэта шафёр яго, на работу мяне возіць і з работы забірае.

— Добра табе,— сказала Юля,— а я бегаю пяшком у Міланькі.

— Міша папаўнеў, салідны такі. Быў нядаўна ў Ленінградзе, паліто мне купіў, не дае вады піць, яблычнымі сокамі поіць.

— Глядзіць цябе.

— Ды не скарджуся, як другія. Што хачу, тое і маю. Можа табе што трэба дастаць?

— Дзякуй,— сказала Юля,— усё ў мяне таксама ёсць.

— Сумна табе, мусіць, тут жывецца? — спытала госця.

— Жыву, Анька,— Юлька ўстала, прынесла кавалак мёрзлага з зімы сала, каўбасы, нарэзала невялікімі скрылікамі, ускінула на скавараду і паставіла ў грубку.

— Святла няма...— цмокнула Аня.

— Гэта сёння нешта няма, так яно заўсёды гарыць,— як апраўдвалася Юля.— Цяпер добра жыць сталі. У каго сям'я рабочая ды на харошай рабоце стаяць, стараюцца, то па-гарадскому жывуць:

тэлевізары, матацыклы, халадзільнікі маюць, каторыя настаўнікі ды экскаватаршчыкі «Жыгулі» ды «Запарожцы» пакуплялі. У хату зойдзеш — чысценька, чаго там толькі няма.

— Усё роўна ў вёсцы я ўжо не жыла б,— перабіла яе Аня.

— Цяпер нічога страшнага і тут няма,— не згадзілася з ёю Юля,— Ты адна прыехала дадому?

— Адна. Мішава работа не дазваляе абы-калі раскатвацца, ён такі заняты, так прылягае да сваіх спраў, што і на сям'ю мала глядзіць. Калі возьме водпуск, мы ўжо ў Крым паедзем. Ведаеш, я пятае лета запар туды паеду.

— Мне хоць бы раз за сваё жыццё паглядзець тыя курорты,— сказала Юля.

— Чаго ты са сваім разышлася? — спытала Анька.

— Ды я не разышлася...

— Піў ці біў цябе? Нечага ж вы з ім не паладзілі?

— Многа, Анька, расказваць,— сказала Юлька, апусціла вочы,— ды і наша ўсё гэта, усё роўна ты не зразумееш.

— Ты не перажывай,— прамовіла Анька,— калі кінуў цябе — ну і чорт з ім. Выйдзеш і за другога, яшчэ вартнейшага. Толькі трэба ў горад выязджаць і не сядзець тут, бо ў вёсцы з дзіцём нялёгка замуж выйсці, а ў горадзе добрыя людзі возьмуць.

— Ды не спяшаюся я другі раз замуж,— сказала Юля.— Мужа я знайду сабе, але ці знайду бацьку сыну?

— Гэтыя дзеці і трымаюць нас,— згадзілася Анька.— Мы і жывём цяпер дзеля іх, пра сябе не думаем.

Нечакана загарэлася святло. Юлька і Анька на хвіліну ад яркасці заплюшчылі вочы, асвоіліся, пасля разгледзелі адна адну.

— Ты пастарэла, Юлька.

— Хутка трыццаць год, дакуль жа тая маладосць ды краса будуць.

Грукнуўшы ў сенцах дзвярыма, у хату ўбег Пецька; убачыўшы незнаемую, утаропіўся і засаромлена стаў у парозе.

— Ой, які ж Ты мурзаценькі! — здзівілася Аня, дастала з кішэні плітку шакаладу і працягнула Пецю. Той апусціў вочы долу, саромеўся падысці і ўзяць гасцінец.

— Вазьмі, Пецька,— сказала Юля.

— Ой, які стыдун. Прападзеш такі! — падківала галавою Анька,— Бяры, малец, і падыдзі сюды, гляну, у каго ты ўдаўся: у маці ці ў бацечку свайго.

Аня не дачакалася, сама падышла і дала ў руку малому шакаладку.

— Скажы дзякуй,— вучыла сына Юля.

Пецька маўчаў, не ўзнімаў ад падлогі вачэй, пасля прайшоў за грубку і схаваўся на печы.

— А мае хлопцы смелыя...— сказала Анька.

— Хадзі, сынок, памыемся нанач, а то чуў, як гарадская цётка пасміхалася з нас,— сказала Юля сыну, зняла яго амаль соннага з печы, калі Анька пахвалілася пра сябе, свайго мужа, лёгкае сваё жыццё, панавучаўшы, як Юлі лепей, крыху хітрэй жыць, і пайшла дахаты.

Юля наліла ў ночвы цёплай вады, раздзела і пасадзіла ў іх Пецьку, намыліла яму галаву, вушы, пацерла мачалкаю спіну.

— Каб ты, сынок, не капаўся ў пяску, заўсёды чысценькі быў, дык і маме менш работы было б,— гаварыла Юля,— а то ты ж зусім не слухаешся ні мяне, ні бабы, усё па-свойму робіш. Нялюдскі ты.

— А гэта цёця прыйдзе яшчэ? — спытаў сын.

— Прыйдзе, і калі ты будзеш чысценькі, харошы, то і зноў шакаладку прынясе.

— Я буду чысты, мама.

— Ну і добра,— сказала Юля, зняла з грубкі нагрэтую прасціну, загарнула, як маленькага, у яе Пецьку і панесла на ложак, выцерла, адзела новую майку, трусікі. Укрыла коўдрай, пацалавала сына ў лобік, хвіліну пастаяла, радуючыся, што такі вялікі, прыгожанькі яе сын, яе радасць, уцеха; як ёй бывае часам цяжка, нядобра, і сын яе суцешыць, супакоіць; ужо тое, што ён толькі жыве, як штодня гаворыць Юлі: не гаруй па сваім жыцці, каго ты страціла ці цябе страцілі— табе трэба жыць. Дзеля сына, дзеля яго жыцця. Юля цяпер разумела, што значыць маці жыць не для сябе, а для сваіх дзяцей.

Яна адышла ад сына, разгарнула ў стаяку жар, пабіла галавешкі, зліла ў вядро ваду з ночваў і вынесла яе на двор; хвіліну пачакала, пакуль прападзе ў грубцы сіні агонь, тады зачыніла юшку. Маці, відаць, засталася начаваць у сваякоў, паленавалася ноччу ісці дадому; Юля пачакала яе і зашчапіла дзверы.

— Мама,— прытуліўся да яе сын,— а дзе наш тата?

— Працуе, сынок.

— Ён прыедзе да нас?

— Прыедзе. І я ж чакаю яго,— сказала Юля.

— І мне веласіпед такі, як у Лёнькі, прывязе?— сын падняўся, з такой радасцю глянуў Юльцы ў вочы, што яна здзівілася, пасля зразумела ўсё і адчула, як кальнула ў сэрца, перавярнула нутро.

«Мой ты сынок,— падумала яна,— як жа табе хочацца бацькі!»

— Прывязе, Пецька,— сказала яму.

— І біцца тата не будзе, як дзядзька Сцяпан?

— Не будзе, сынок. Тата наш вельмі добры.

— А я веласіпеда Лёньку таксама не дам,— сказаў сын і лёг,— бо Лёнька б'ецца.

— Дасі, сынок, не трэба быць скупым і помслівым.

— Тады толькі адзін раз дам праехаць ад іхняй хаты да нашай,— сказаў сын.

— Ну, хоць раз, але трэба даць.

Сын хутка заснуў, усміхаўся. Яму, відаць, сніўся бацька, што нечакана прыехаў дадому і прывёз веласіпед.

## 7

...Калі цяплелі вясною ночы, густа пахла бэзам, травою, моладзь збіралася вечарамі ля ракі на тупкім лужку, дзе школьнікі зрабілі, вытапталі валейбольную пляцоўку. Вечарам тут былі танцы.

Тады, нават гадоў пятнаццаць ці дзесяць назад, у вёсцы было гусцей моладзі, праз кожную хату жылі падлеткі-хлопцы, незамужнія маладыя дзяўчаты, сталыя хлопцы-халасцякі; вёску пакідалі толькі тыя, хто ішоў у армію ці каго бралі замуж, і зусім мала было тых, хто з'язджаў кудысьці шукаць лепшай работы і пабагацець.

Музыканты былі свае, звычайна ігралі Сцяпан і Алесь; іх загадзя хлопцы частавалі, задобрывалі, і тады яны ігралі вальсы ды полькі напераменку цэлую ноч, да рання.

Юля падлеткам не прапускала ніводных танцаў, тоўпілася з дзецьмі вакол танцавальнай пляцоўкі. У дзевятым і асабліва ў дзесятым класе на яе пачалі заглядацца хлопцы, запрашаць у танцы, стараліся правесці яе дамоў. Асабліва вытанцоўваў ля яе кучаравы Мікола, што адслужыў ужо ў арміі і ўладкаваўся на работу ў тутэйшае лясніцтва. У вёсцы нават пагаворвалі, што ён, калі Юля скончыць школу, збіраецца заслаць да яе сватоў, ды толькі пабойваецца, ці аддасць Наталля замуж такую маладую дачку...

Зімою, як накручвала з поля снегу вышэй платоў, замятала пляцоўку, збіраліся доўгімі вечарамі ў хаце Сямёніхі.

Хата ў Сямёніхі была вялікая, на дзве прасторныя палавіны, пустая — гаспадыня жыла адна з дарослымі дочкамі; вось сюды і збіраліся павесяліцца, схаваўшыся ад бацькоў, сталыя і маладыя кавалеры, прыпляталіся цікаўныя жанкі — глянуць, хто паглядае на яе дачку ці на каго яна кідае позірк, ці проста наглядзецца і назапасіцца на заўтрашняе гутаркай.

Юля хацела прыгожа апранацца. Яе кароценькія, выцвілыя вучнёўскія ці перашытыя з матчыных старых плаццяў сукенкі, матчыны старамодныя туфлі — усё ёй не падабалася і не падыходзіла.

Маці толькі што аддала замуж старэйшую дачку — Маньку, многа патрацілася на вяселле і не магла ва ўсім дагаджаць Юлі. Заспакойвала: «Самая меншая, паспееш яшчэ прыбрацца, хадзі ў тым, што ёсць, яшчэ ніхто на свеце не памёр, што модна не адзяваўся». Юля перажывала, але не крыўдзілася, разумела маці; яна прыпала да вучобы, да кніжак, многа чытала і марыла стаць настаўніцай, такой, як іхняя класная Паліна Міхайлаўна.

Юля позна сядзела зімовымі вечарамі, чытала, глядзела ў цёмнае, замёрзлае, з хітрымі ўзорамі акно, слухала, як дзіка вые на двары мяцеліца, нібы плача малое дзіця, як шорстка сыпле ў вокны снег.

Да яе часта, абсыпаная снегам, радасная, прыбягала сяброўка Аня.

Анька была любімая дачушка ў сям'і. Яна вельмі ганарылася, што адзявалася лепш не толькі за вучаніц, але і за настаўніц, што была прыгожая. Яна не засмучалася, што цягнулася на слабыя троечкі, і ўвесь час гарнулася сябраваць з Юляй, можа, толькі таму, што спісвала ў яе задачы, а мо і тайна зайздросціла, што Юля, як і яна, была такая самая прыгожая ды яшчэ добра вучылася: ёю не маглі нахваліцца настаўнікі...

Недзе зімою, калі прайшла пара мяцеліц, моцных марозаў, калі ўжо днём па-веснавому свяціла сонца і асядаў снег, Анька таксама зайшла да Юлі, паклікала гуляць.

— Не хочацца, Анька, — адмаўлялася Юля.

— Хадзем,— прасіла Аня,— ведаеш, сёння хлопцы з Восава прыйшлі, свайго музыканта прывялі.

— Хутка экзамены, трэба чытаць.

— Ты і так усё ведаеш, зубрыла,— сказала Анька.— Хадзі, я табе светлую блузку дам.

Анька здагадвалася, чаго не хапала Юльцы.

— Не трэба,— сказала Юля, хоць ёй тая блузка і вельмі падабалася: яна разумела, што ўся веска бачыла, ведала гэтую светленькую прыгожую блузку, і калі надзенеш яе, то ніхто не звядзе з яе вачэй, цэлы вечар будуць шаптацца, абгаворваць.

Тою зімою Юлька ўпарта адмаўлялася, і Анька бегла на танцы адна, але таго вечара Анька не выходзіла з хаты, настойвала, так прычапілася, што Юлька не вытрывала, загарнула кніжку, апранула, што мела лепшае, і пабегла з Анькаю да Сямёніхі, у хаце якой ужо сабралася вельмі многа моладзі.

...Юля многа танцавала ў той вечар вальсаў, полек. Бралі яе Сцяпан, Мікола, восаўскія хлопцы. Анька ўвесь вечар круцілася са

сваім Лёнькам, выбягала з ім на двор, падоўгу недзе прападала, вярталася чырвоная ў твары, з дзіўным бляскам у вачах.

Юля танцавала і бачыла, як за ёю цікуе Мікола, чырванеецца, злуе, калі яе запрашаюць танцаваць восаўскія хлопцы. Яна гадала, чаго такі Мікола, чаму ён так адносіцца да яе, і калі пачынала здагадвацца, адчуваць сваім дзявочым сэрцам — ёй рабілася трывожна і страшна. Яна хацела забыць гэта, думаць пра штосьці іншае, але тое шчымлівае і страшнае ажывала, як ручаёк пад рыхлым снегам: недзе ціснецца, блукае, хоча вырвацца наверх і не вырываецца, блудзіць, толькі трывожыць душу...

Юля не кахала Міколу.

Калі Сцяпан зайграў развітальны марш і ўсе паразбіваліся на пары, павалілі з хаты, яна таксама выскачыла на двор. Хтосьці выбег за ёю. Яна азірнулася: апранаючыся, ішоў следам Мікола. Хутка дагнаў яе, пайшоў поруч.

Юля ніколі не перажывала столькі страху, як тады. Спяшалася ісці і не чула сваіх ног, моўчкі завіхаўся побач і Мікола. Толькі ля яе хаты схапіў за руку, затрымаў, прыгарнуў да сябе. Калі блізка пачулася яго дыханне, Юля зразумела, што Мікола хоча пацалаваць яе. Яна церабнулася, але ён трымаў моцна, гарнуў да сябе.

— Пусці, крычаць буду! — пагразіла яна.

— Юлечка, канчай сваю школу і выходзь за мяне...

— Пусці,— Юля не магла вырвацца і заплакала.

— Не буду, Юлька. Не злуйся, харошая. Сам бачу, што ты не для мяне,— Мікола выпусціў яе, і яна не пабыла больш на двары і хвіліны, пабегла ў хату.

— Рана пачала таньчыць, дзеўка. Бачыла праз акно, як ліпнула да Кастусёвага,— пагрозліва сказала з печы маці.— Глядзі, дзеўка...

...Восенню, калі Юля ўжо скончыла школу, не прайшла па конкурсе ў педагагічны інстытут, паехала з Анькаю ў суседні раён, стала працаваць у леспрамгасе.

Праз месяц сяброўкі напісалі, што Мікола згуляў вяселле, узяў дробненькую, непрыгожую, але гаспадарлівую дзяўчыну з суседняй вёскі.

## 8

— Схадзі ты, маладзейшая, да Саладухі,— сказала маці,— папрасі машыны, скажы, што на адзін толькі раз укінуць карове сена засталося.

— Схаджу,— згадзілася Юлька: Саладуха быў Аньчын бацька, старшыня калгаса, і Юльцы хацелася не толькі папрасіць машыны, але і пагаварыць з сяброўкай.

— Паслухай, як хваліцца будуць,— сказала маці,— усім не нахваліцца, што зяць дужа добры, па тры сотні палучае, машыну мае, ім надта добры падарунак прыслаў; а так ужо глядзіць Анечку, што халоднай вады не дасць напіцца.

Схіляла на вечар. Няярка і нячуйна прабівалася праз асмужаную шэрасць сонца, падхопліваўся нямоцны, але дзёрзкі вясновы марозік.

«Вясна! Колькі таго ўжо сена трэба, але бегай вось,— падумала Юля.— Калі б не мама, здала б я гэтую карову ў калгас ды выпісвала малако. І гора ніякага з сенам і падсцілам не ведала б».

Яе маці была не толькі старая гадамі, але і жыла падаўнейшаму, зусім не прызнавала, што нешта змянілася ў вёсцы і што трэба пановаму жыць. Нават падумаць яна баялася, як гэта можна жыць без каровы, свінней, курэй, не хацела купляць тэлевізара: «Нічога я ў ім не разбіраюся, толькі грошы марна пераводзіць. Звініць во ў хаце радзіва, і гаворыць, і пяе — і хопіць. Памру, тады сабе што хочаш купляй».

Юля, калі хадзіла ў школу, спрачалася з маці, нават даказвала, што няма бога і чарцей на свеце. Маці злавалася, папракала: «Надта вы вучоныя сталі, разабраліся ва ўсім».

У хаце Саладухі гучала незнаемая музыка, відаць, навезла модных пласцінак Анька, цяпер сядзела, сумавала ў «дзярэўні» і круціла іх, забаўлялася.

На кухні нікога не было. Юля толькі дзеля прыліку далікатна пастукала і зайшла ў лепшую палавіну, пры такім шуме яе ўсё роўна ніхто не мог пачуць. Адразу ўбачыла засланы абрусам стол, хлеб, каўбасу на ім. Не паспела нічога падумаць ці здзівіцца (у старшыні госці частыя), глянула лявей і знежывела: за занавескамі Анька, з распушчанымі валасамі, босая, абдымалася з мужчынам, твару якога не было відаць. Юля так разгубілася, што не магла нічога прамовіць. Яна выскачыла з хаты.

«Во табе яблычныя сокі...» — падумала яна, азірнулася, ці не бачыў яе хто. Калі выходзіла з двара, затрымалася, каб зашчапіць варотцы, і ўбачыла за гумном Саладухі незнаемую, з заглушаным маторам машыну.

Вечарам, калі Юля накарміла вінсней, укінула карове астатняе сена і збіралася пайсці да суседкі на тэлевізар (было «харошае, пра любоў» кіно), нечакана прыйшла Анька.

— Гаварылі, ты да нас прыходзіла? — спытала Анька і ўважліва паглядзела Юлі ў вочы.

— Хадзіла,— разгубілася Юля,— хацела ў бацькі твайго машыны на гадзіну якую папрасіць, але ўбачыла чужы «козлік», пабаялася зайсці,— прыманіла Юля і адвяла ўбок свой позірк.

«Як сама вінавата ўсё роўна. Каб ты згарэў, такі характар!»

— Гэта з раёна... Мой даўні знаёмы, так сказаць,— сказала Анька.— Пагаварылі крыху. А ты што робіш?

— У кіно збіралася. Днём паўспамінала, як мы з табой у школу хадзілі, танцы рабілі.

— Ды і я не раз прыпомню, што някепска некалі было, весела мы жылі,— сказала Анька.— А я ўжо ад'язджаю заўтра.

— Гэта ўжо ўсе твае госці?

— Ай, растрывожылася сёння... Многа згубіла я, што не вучылася, паспяшыла замуж пайсці за Мішу,— сказала Анька.

— Цяпер можна ўсяго дабіцца, калі захочаш,— прамовіла Юля.— З нашай вёскі ўжо многа ў людзі павыходзіла: інжынерамі, урачамі, настаўнікамі робяць. Нават адзін паэт ёсць, кнігі выпускае. Я тож, каб больш глядзела на свае здольнасці, не паспяшалася з замужжам, магла б настаўніцай ці яшчэ кім быць.

— У мяне, Юлька, такое... Як табе сказаць... Ты, Юлька, даўняя мая сяброўка, нікому не скажаш, я табе даверуся, хоць у першы вечар я і табе не хацела казаць,— Анька нахілілася да Юлі.— Ты ж ведаеш майго Мішу... Глядзіць ён мяне, адзяе, але дзе дзенешся, калі ён старэйшы за мяне на дваццаць год, вечныя яго камандзіроўкі, работа ад цямна да цямна, нарады, канферэнцыі... Ды такі нейкі ўпарты, аддадзены, што толькі і бачыць, жыве сваёй работай. А мне яшчэ і трыццаці няма, і я жыць хачу...

«Ну і Анька! — пранеслася ў галаве ў Юлькі.— Не так ужо ў цябе ўсё ёсць, як ты ў першы дзень хвалілася».

— Толькі ж ты, Юлечка, нікому не гавары, а то разнясецца па вёсцы,— убачыўшы разгубленасць Юлькі, сказала Анька,— І ён бачыць стаў, што не люблю я яго.

— Двое ж дзяцей у вас,— паразважаўшы, нясмела сказала Юля.

— Вось дзеці і трымаюць,— прызналася Анька.— Я ўжо на многае рашылася б, але дзеці... Любяць яны яго, і ён без іх не можа. Але з кожным днём мне цяжэй быць з ім, нават глядзець не магу. Прыехаў сёння Коля, убачыліся, пасядзелі — і так растрывожылася я, што можна іначай жыць і лепш. І так сёння палаяла сябе, што не выйшла некалі за Колю, пабаялася, што век электрыкам будзе, прасядзіць жыццё на слупах... А яно вось як выйшла, во якім бокам абярнулася!

— Я думала, што я толькі адна нешчаслівая...— сказала Юлька.

— Мае ў тым і няшчасце, мусіць, што я доўга думала, што я шчаслівая,— сказала Анька,— пакуль жыццё само мне не паказала іншае... А цяпер і не ведаю, як гэты вузел развязаць.

— Не ведаю і я, Анька, што табе сказаць,— прамовіла Юля,— толькі я і раней баялася так, як ты, жыць. Каб яшчэ не мама, дзіця малое, то, можа, па-іншаму было б, а так я пра іх больш думаю, чым пра сябе, тапчуся дзень ля хаты і сапраўды нічога не бачу.

— Думала, супакоюся дома,— сказала Анька.— Супакоілася...

— Складанае жыццё чалавечае,— прамовіла Юля.

— Не складанае яно,— не згадзілася Анька,— гэта мы самі часам блытаем усё, а пасля на жыццё скардзімся.

— Можа быць,— уздыхнула Юля.

— Не можа, а сапраўды ўсё так. Толькі вось нешта прымушае нас рабіць такія крокі.

— Можа, таму гэта бывае, што думаем мы мала.

— Можа,— згадзілася Анька.

Паслухала Аню Юля і ўспомніла свайго мужа: любілі, пажаніліся, добра жылі, пасля выдумаў нехта, што яна здрадзіла яму, загуляла з Толікам, пагарачыўся, не захацеў разабрацца...

І яна ўзгарачылася, не стала апраўдвацца, пакрыўдзілася, што не паверыў, і прыехала да маці.

«І невядома, каго трэба тут вінаваціць. Толькі не жыццё,— падумала Юля.— Усяго ў жыцці мы дабіваемся самі: і добрага і нядобрага...»

## 10

...Зіма выдалася на дзіва халодная, мяцелістая і снежная; нават у сакавіку, калі праходзіць пара вялікіх заварух, модных, траскучых марозаў, паваліў буйны сыпкі снег, засыпаў, закідаў дарогі. Прапалі набоістыя каляіны, якія выездзілі, дасюль, і снег тут, у лесе, асабліва стаў глыбокі, мяккі. Рабочыя правальваліся па пояс, цягалі па снезе пілы, вымакалі за дзень і не маглі за ноч высушыцца. Часцей сталі бачыць худых ласёў: выгаладваліся, стамляліся поўзаць па такім снезе і часта здаваліся, ляжалі на жыватах, цяжка саплі, пускаючы клубы пары. Стомленых ласёў падпільноўвалі рысі і скакалі проста на шыю. Вось і ўчора знайшлі хлопцы аб'едзенага старога ласяя...

Генадзь, адчуўшы, як мякка аселі колы, так жа мякка апусцілася машына, зразумеў, што з'ехаў са старой цвёрдай дарогі (ранішні яе след замяло),— ён сполашна крутнуў управа баранку, газануў, але было позна: цяжкі лесавоз раўнуў і ўгруз. Генадзь пагазаваў, пасля пабаяўся, што пасадзіць газоўкаю колы, зарыецца ў снег, збавіў газ і

вылез з кабіны. Адразу ўбачыў, што прычэп, нагружаны тоўстай высакаствольнай хвояй, заваліўся на левы бок, левае кола задняга маста было ледзь відаць са снегу.

«Не маглі пазначыць вешкамі дарогу,— злосна падумаў Генадзь пра брыгадзіра, які не паслаў людзей ці вольнага, «выхаднога» шафера з такою работай,— цяпер усе чэрці на свеце не памогуць выехаць».

Сёння на гэтай трасе Генадзь быў адзін. Тыя разы паспяваў яшчэ ехаць па сваім ледзь прыкметным следзе, ды пад вечар снег пагусцеў, засыпаў дарогу. Іншыя шафёры з яго брыгады тралявалі сёння лес на Лысоўцы, іх перакінулі «рабіць» план: пацяплее, распусціць дарогі — тады доўгі будзе «прывал», пара «курортаў». Яго, як больш сталага, пакінулі тут аднаго.

— Пасядзім, Сцяпанавіч,— сказаў Генадзь, пастукаў нагою па скатах,— але дзела наша знаёмае, шафёрскае.

Ён закурыў, дастаў шуфель і пачаў адкідаць ад колаў снег. Азірнуўся: вакол стаяў высокі лес, не было чаго дробнага ссекчы пад колы. Адкінуўшы снег, Генадзь зноў пачаў газаваць, разгойдваць машыну. Матор натужліва роў, машына падавалася, пасля, як было відаць з кабіны, колы саслізнулі яшчэ лявей, зарыліся, болей нахіліўся прычэп, збіліся, з'ехалі на адзін бок бярвёны.

«Забі цябе гром з яснага неба! — вылаяўся Генадзь.— Газаваць больш не варта».

Ён вылез з кабіны і, правальваючыся ў снезе, абышоў і агледзеў прычэп. Як убачыў, што спаўзлі ўлева тоўстыя бярвёны, стала ясна: ніколі ён сам не выедзе, і не варта болей старацца выскачыць, бо і машыну сапсуе і перакуліцца можа. Трэба ісці, пакуль зусім не замяло ды не звечарэла, у брыгаду і папрасіць Жэньку, каб выцягнуў тралёвачным.

Нечакана ўверсе, на бярвенні, пачуўся кароткі глухаваты трэск. Генадзь, як толькі пачуў яго, адразу зразумеў: ланцуг не вытрымаў бярвёння, што спаўзло ў адзін бок, і парваўся; ён добра ведаў, што будзе за гэтым,— і не стаў азірацца, кінуўся ўцякаць ад прычэпа. Але глыбою снег не даў завіхнуцца, Генадзь паваліўся, і яго ногі тут жа накрыла тоўстымі цяжкімі бярвёнамі, якія падалі з прычэпа, круціліся, каціліся адно па адным.

Ламанула левая нага, моцна, ажно як шылам, кальнула ў галаве; Генадзь ціснуўся ў снег, баяўся, каб не пляснула зараз па галаве. Ён чуў боль у нагах, моцны, нясцерпны, падумаў, што снег глыбокі, пульхны і выратаваў яго. Каб не гэты снег, то яго раздушыла б на блін...

Пасля яму нічога не стала думацца, пацямнела ў вачах, забалела галава, потым ён адчуў, як пячэ ў шчокі снег, растае,— і яму стала лягчэй, тая часіна, калі ён мог страціць прытомнасць, прайшла.

Генадзь накратаў правую нагу і не адчуў яе. Здаецца, яна была цэлая, толькі яе моцна прыціснула, і яна анямела. Спрабаваў тузануць левую — і аж завыў ад болю, заплюшчыў вочы і паваліўся тварам у снег.

Калі апаў гэты вялікі боль, зразумеў, што з левай нагой нядобра: або вывіх, або перелом. Зноў крануўшы правую нагу, адчуў, што яна не баліць, яе толькі ўціснула ў снег, спрабаваў вырваць яе з-пад таўшчэзнага камля — не хапала на гэта сілы.

Генадзь абціснуў локцямі снег, каб ён быў цвярдзейшы, і спрабаваў падняцца, але тут жа зноў апаў долу: забыўшыся, незнарок крануў левую нагу. Асцерагаючыся, ён яшчэ болей абціснуў снег і пачаў аграбаць бліжэйшую да рук правую нагу, каб вылезці з-пад бярвення.

Калі ён усё ж торгаў левай нагой і тая моцна балела, спыняўся, чакаў, пакуль аціхне боль, тады зноў выграбаў з-пад правай нагі снег.

Гула мяцеліца, кідала сухім калючым снегам, які сыпаўся за каўнер, раставаў, апякаючы холадам спіну. Качанела левая рука, якой ён адкідваў снег; ён дасюль нават не думаў, што снег можа быць такім халодным, так паліць ледзяной лютасцю пальцы. Генадзь браў пальцы ў рот, грэў іх, лажыўся на бок і адпачываў, пасля зноў падымаўся, падпіраўся локцем правай рукі і вызваляў нагу, сцінаючы зубамі вусны...

Гудзеў матор, і Генадзь з радасцю падумаў, як добра, што ён не выключыў яго: надвор'е марознае, стылае, а вада не спушчана — магла замерзнуць.

Нарэшце ён выцягнуў з-пад бервяна правую нагу, паварушыўся і сцяўся ад болю: левая балела ўсё больш і больш, і яе вызваліць, падумаў ён, будзе цяжэй. Калі ўцямнеецца, яго павінны схапіцца, павінны здагадацца, што ён недзе забуксаваў, і выехаць на трактары насустрач. Але калі яшчэ гэта будзе; каб былі жонка ці маці, блізкія, яны падумалі б пра яго хутчэй, а суседка яго можа і не папярэдзіць начальства, яна прывыкла, што ён вяртаецца дамоў позна, часамі і зусім не прыходзіць начаваць...

Ён адграбаў снег, дакуль мог сагнуцца; цямнела; мяцеліца, здаецца, суцішвалася, не сыпала снегам; халаднела, і ён адчуў, што памацнеў мароз. Генадзь прылёг на бок і рашыў адпачыць, а заадно і сагрэць руку. Дзьмухаў на яе — нічога не памагала, тады ён прасунуў яе да грудзей, абмяк увесь...

Успомнілася Юля. Ён нават здзівіўся, чаму яна ўспамінаецца яму тады, калі цяжка — калі ў яго непрыемнасці на рабоце, калі яго нехта пакрыўдзіць ці ён каго і яго тады асуджаюць.

«Мусіць, таму ўспамінаецца яна мне ў цяжкую часіну, што ў мяне няма цяпер таго блізкага чалавека, з якім я мог бы дзяліцца ўсім сваім запаветным, патаемным, а яна магла б усё зразумець і падтрымаць».

І ён палаяў сябе, што жыве вось так: мае жонку, дзіця, любіць іх, але набраўся нейкага гонару, самалюбства, а то і ўпартасці, не напіша Юлі, не папросіць вярнуцца.

«Ды не пісаць трэба,— падумаў ён,— трэба з'ездзіць да яе, сустрэцца, пагаварыць... Што скажаш, таго не напішаш, што напішаш, таго не скажаш... Трэба з'ездзіць, абавязкова з'ездзіць...»

І Генадзь, адчуваючы, што сагрэлася рука, падняўся, пачаў адкідаць снег. Ён адчуў, што не трэба было лажыцца, астываць, бо боль цяпер быў мацнейшы, працінаў усё цела.

«З'езджу... Адпрашуся на пару дзён і з'езджу».

...Агні ён убачыў, калі зусім ужо стаміўся, выбіўся з сіл.

«Цяпер будзем жыць, будзем жыць, усіх чарцей перажывём»,— радасна падумаў ён і апаў на снег, і апалі ўсе яго сілы, ён не чуў, як да яго падбеглі рабочыя, выцягнулі з-пад бервяна і панеслі да трактара, што стаяў зусім блізка, ціха гудзеў.

## 11

Генадзю выдалі бюлетэнь, загадалі ляжаць у пасцелі. Ніколі не хварэў ён, ні слаба, ні моцна, а вось цяпер пачуў прыкрае знясіленне, пякучы боль: гарэла нага — яе паламала ля костачкі.

Ён адзінока ляжаў і думаў, як нядобра ўсё выйшла, пасля, як ніколі, адчуў, што бесталкова ён жыве, гоніцца за жураўлямі ў небе. Калі падумаць, не трэба яму гэты леспрамгас, гэтыя вялікія лясы, трасы, грошы; даўно, відаць, варта было пакінуць сваё нікому не патрэбнае кавалерства, глядзець сваю сям'ю ды жыць у згодзе, жыць для некага, не толькі дзеля сябе, і з прыемнасцю бачыць, што для цябе таксама нехта жыве.

Канечне, ад хлопцаў, з якімі столькі гадоў прарабіў, нялёгка будзе адвыкнуць. Зжывуся.

Ён востра цяпер адчуў, як нестае Юлі. Дзе яна, што робіць?

На грошы Юля кваплівая не была: колькі ні бубніў ён пра тысячы, пра машыну, яна не зайздросціла; калі паслухаў чужых плётак, прычапіўся, ударыў аднаго разу, узлавалася і з'ехала. Нядобра, канечне, з ёю выйшла, але не толькі ён вінаваты. Была яна нейкая

дзіўная, вельмі ўжо вясковая, жыла па-свойму і хацела яго пасвойму перайначыць, і яна прымусіла ўзлавацца, падняць руку...

...Сябры прынеслі з сабой і павывальвалі на стол два боханы хлеба, кансервы, каўбасу. Самі распрануліся, паскідалі на ложак целагрэйкі. Хлопцы недзе ўжо дагэтуль добра падвыпілі, былі цяпер вясёлыя, добрыя, клапатлівыя.

— Як, стары, твая нага? — спытала Тонька, што таксама прыйшла з хлопцамі; яна расчырванелася ад марозу, гарэла тварам, што жар.

— Нармальна,— незадаволена сказаў Генадзь, паволі і нехаця падняўся з пасцелі, накінуў на плечы-кажух.

— А мы перажываем за цябе,— сказаў Жэнька, адкаркоўваючы пляшкі, Алік рэзаў лустачкамі хлеб, Толік дзёўб нажом кансервы, Тонька чысціла і наразала скрылёчкамі каўбасу.

— Не нам, рабочым людзям, хварэць,— сказала Тонька.— Мы яго хутка падымем на ногі, хутчэй нават за ўрачоў.

Падрыхтаваўшы закусь, хлопцы саставілі крэслы і паселі вакол стала.

Яны паднялі шклянкі, чокнуліся, паглядаючы, падбадзёрваючы адзін аднаго, але не пілі, усе глядзелі на Генадзя. Ён усміхнуўся, асцярожна падняў сваю шклянку, пакруціў яе, паднёс да рота, глытнуў крыху і паставіў на стол.

— Не!

— Так не пойдзе, так за сваё здароўе не п'юць! Нельга сабе зла пакідаць.

— Што з табою, Генік? — здзівілася Тоня, зноў падала Генадзю яго шклянку.— Выпі, Генка, я ж ведаю тваю сілу.

— Ты слаба, Тонька, ведаеш маю сілу, і не тую,— не гледзячы на дзяўчыну, сказаў Генадзь, адвёў яе руку з гарэлкай і кусануў каўбасы. Хлопцы паціснулі плячыма, глянулі адзін на аднаго, выпілі крыху, паставілі шклянкі і таксама пачалі закусваць.

Усе елі моўчкі. Даўно не было ў гэтай дружнай кампаніі такога няёмкага, незразумелага маўчання, даўно так ніхто не думаў доўга, якое ж сказаць слова.

— Паўторым,— азвалася Тонька і даліла ўсім у шклянкі, сабе зноў напалавініла.— За здароўе нашага слаўнага Генкі!

Сказала, адным махам выпіла ўсю гарэлку, толькі крактанула і, выцершы рукавом вусны, скрывілася і панюхала хлеб. Хлопцы выпілі, хто колькі асільваў, глядзелі на Генадзя. Той зноў толькі памачыў у гарэлцы губы і паставіў шклянку на стол.

— Ты што? — абурылася Тонька.— Чаго такі сёння не ў гуморы?

— Я рашыў больш не піць.

— З гэтага вечара,— хіхікнуў Жэнька.

— З гэтага вечара.

— Дык і давай вып'ем за тое, каб ты захаваў сваё нутро, чалавекам стаў,— падала Генадзю шклянку Тонька.

— За гэта я ўжо адпіў,— ён адвёў руку дзяўчыны.

— Во напалохаўся,— засмяялася Тонька.— Колькі ты ні асцерагайся, а пражывеш усё роўна столькі, колькі табе адведзена.

— Трэба нам, хлопцы, крыху разумней жыць,— спакойна сказаў Генадзь.— Робім мы добра, хваляць нас, але пасля работы вольны час свой абы-як праводзім. Я вось думаю, што многа я страціў у жыцці... Страціў добрага, самага чалавечага...

— І многа ты аб гэтым ужо думаў? — спытала Тонька.

— Ды нямала,— сказаў Генадзь.

— І што ты страціў?

— Многае,— прамовіў Генадзь, памаўчаў, нават не глянуў на яе, сам наліў усім і сабе поўныя шклянкі, асцярожна падняў сваю.

— Давайце, хлопцы, вып'ем астатні раз, каб мы болей не ганяліся за гэтым зеллем, нешта другое і лепшае бачылі. Давайце вып'ем, каб шчаслівыя былі, каб людзі ад нас ніколі не плакалі.

Усе выпілі.

— А цяпер, хлопцы, ідзіце. Я хачу пабыць адзін.

Сябры сёння не разумелі Генадзя, якога паважалі; маўчалі, лыпалі вачыма, гадалі, што ён задумаў.

Генадзь праскакаў на аднойназе, адчыніў дзверы, і хлопцы высыпалі з хаты; толькі там, на зімовым двары, чуваць было, што яны перагаворваліся, стараліся дайсці да толку.

— Артыст ты, Генка!— усміхнулася Тонька,— Так разыграць сяброў.

Яна засталася, села на Генадзеў ложак, скінула з ног валёнкі.

— Апранайся, Тонька, і ідзі дадому,— сказаў Генадзь.— Не трэба гэта.

— Ты зусім нядобры, Генка,— пакрыўдзілася Тонька, — Я не люблю цябе.

— Тады ты не ведаеш, як можна любіць,— сказаў Генадзь,— а так ты і Аліка любіш, і таго карэспандэнта любіла, што ў лютым прыязджаў да нас...

— Дык хто я, па-твойму? Ну, скажы? — Тонька, расхваляваная, раззлаваная, устала і падышла да яго,— Культурны, не гаворыш. Тады скажы, назаві мне тую, што ўмее любіць.

— Юлька.

— І я цябе люблю, і даўно,— прыхінулася да яго.— Я добра бачу, бабскім сваім сэрцам чую, што ты яе не забыў, хаваеш у памяці, і я чакала таго дня, калі табе гэта ўсё надакучыць і ты захочаш па-іншаму жыць.— Тонька абхапіла яго рукамі.— Я хацела цябе ўсяляк утрымаць — і гарэлкаю, і ўсім... А з другімі нічога не было... Бачыла, што ты мяне не любіш, думаеш пра другую...

— Прабач, Тонька, ты харошая дзяўчына і будзеш шчаслівая.— Генадзь падняў дзяўчыну, глянуў ёй у вочы.— Жонка яна мне, хоць і хачу забыць яе, але не магу. Ды сын у мяне ёсць...

— Не забываецца яна, твая Юля?

— Не.

— А я?

— Ты, Тонька, добрая дзяўчына. Каб я быў халасцяком, то ніколі ад цябе не адмовіўся б. А так...

Тонька глянула на яго, жаласліва сціснула вусны і заплакала: бачыла — любіць ён сваю жонку, не забудзе...

## 12

— Мама, хадзі сюды,— убег у хату і паклікаў Пецька,— хадзі нешта пакажу.

Юля мыла посуд, паслухала сына і ўсміхнулася: заўсёды нешта заўважыць і выдумае ён, да чаго яна ніколі не дадумалася б. Неба было чыстае, днямі шэрыя, як попел, хмары, што нізка віселі над зямлёю, крануліся і папаўзлі на захад. Каторы ўжо дзень дыхала сакавіцкім цяплом.

— Глянь, мама,— паказаў сын на страху.

Яна паглядзела і ўбачыла зеленаватую гонту, што цяпер была мокрая, цёмная; толькі з краёў, дзе шастаў вецер, выдзімалася, высыхала.

— Ну, што? — здзівілася Юля.

— Ды ты на ваду глядзі,— падказаў сын.

Толькі цяпер Юля ўбачыла, што здзівіла сына: на сярэдзіне страхі, дзе быў раўчучок ад стрэшкі акенца, вада цякла ручайком, звонка лілася на зямлю, а на астатніх месцах страхі збіраліся кроплі, буйнелі, абвісалі і падалі ўніз.

— Бачыла? — спытаў сын.

— Бачыла,— усміхнулася Юля.

— Што вы там угледзелі? — пацікавілася маці, якая не выцерпела і таксама выйшла з хаты.

Юля паказала ёй на кроплі.

— Падзяцінелі: і сталая, і малое,— сказала маці і вярнулася ў хату, дадала адтуль: — Ідзі мый посуд, а то вада астыне.

— Ну, ты паглядзі,— сказала Юля,— а я пайду, бо, чуеш, баба злуецца.

— Мама, я намалюю гэта.

— Намалюй, сынок, хто ж табе не дае,— усміхнулася Юля.— Калі ўбачыў, то намалюй.

Юля зайшла ў хату, узялася дамываць посуд, на душы ў яе было легка. Каб не маці, то і заспявала б.

— Сёння настаўніка вашага спаткала,— сказала Наталля— Затрымаў мяне, паздароўкаўся. Пра цябе распытваўся...

— Кіньце вы, мама.

— Гавару, што чула,— сказала маці.— Кажа: мне лягчэй з вамі гаварыць, як з Юльянай.

— Яму пара ўжо ўнукаў гадаваць, а не...

— Не такі ён ужо стары,— запярэчыла маці.

— Ну і не маладзёнак,— сказала Юля,— лысіна на галаве...

— Добры, кажуць людзі. Не п'е. Кажа: хацеў я з вашай Юльянай пагаварыць, але саромеюся.

— Яшчэ што! — абурылася Юля.

— Прыйдзе вечарам.

— Уцяку з хаты,— сказала Юля.— Не трэба ён мне.

— А я б на тваім месцы, дзеўка, не завіхалася гнаць такога чалавека,— прамовіла Наталля.— Жывеш зіму, а твой табе ніводнага пісьма не прыслаў, значыць, не трэба ты яму. Нядобры ён, я гэта і тады, на вяселлі вашым, бачыла, але што магла сказаць. Сама выбірала...

Юля адказала б нешта, але ля акна мільгануўся чалавек. Яна глянула: Уладзімір Сямёнавіч.

Зайшоў у хату, павітаўся.

Наталля запрасіла яго прысесці, загаварыла з ім пра надвор'е, пра школу, згаджалася, што не хочуць цяпер вучыцца дзеці.

Юля вымыла посуд, выпаласкала яго, з настаўнікам не загаварыла, хацела ўцячы з дому, але пасаромелася.

Пасля Наталля пачаставала госця. Мусіла з ім сесці і Юля, хоць і адмаўлялася выпіць, скардзілася, што баліць галава. Уладзімір Сямёнавіч, відаць, здагадаўся, што Наталля перагаварыла з дачкою і што Юля супроць, каб выйсці за яго.

— Я, Наталля Пятроўна, пайду, мусіць, ужо дадому,— пагаварыўшы са старою пра вёску, сказаў ён.

— Пасядзіце яшчэ,— гаварыла Наталля.— Ноч вялікая, выспіцеся.

— Ночы вялікія цяпер, але спаць не хочацца,— сказаў Уладзімір Сямёнавіч, паглядаючы на гладка прычасаную, у новай кофце Юлю, якая сумавала цэлы вечар, не піла, не ведала, дзе прыкласці рукі, куды глядзець.

— Пасядзіце яшчэ,— прасіла Наталля.

— Хіба з Юльянай Іванаўнай,— збянтэжыўся госць.

— Выпіце, пагаварыце,— запрашала Наталля, і пажылы, лысаваты Уладзімір Сямёнавіч запалаў, што падлетак, закруціўся на крэсле.

— Гаворка наша, Наталля Пятроўна, адна,— сказаў ён,— сталы я, у мае гады можна ўнукаў ужо мець, а ўсё ніяк не магу прыбіцца да якога берага, нясе мяне вада, кідае... Юльяна Іванаўна тож адна, нудзіцца. Гаруеце вы, гарую я... Трэба, каб вы ўзялі мяне ў сваю хату за гаспадара; вясковую работу я магу рабіць, мальца глядзець буду і вас, старую, не пакрыўджу.

— Дамаўляйцеся вы ўжо з маладою, мне жыць на гэтым свеце мала засталося,— сказала Наталля.— А яна няхай сама глядзіць, як жыць надалей, як хлопца на ногі падняць,— дабавіла, устала, палічыла, што сваё яна сказала, і палезла на печ, дзе, сціснуўшыся, натапырыўшыся, што верабей, сядзеў і назіраў за ўсім унук.

— Давайце сёння, Юльяна Іванаўна, усё рашаць,— сарамеючыся, сказаў Уладзімір Сямёнавіч.— Знаёміцца нам не трэба, сябе хваліць тож. Не адзін месяц разам рабілі, ведаемся. Возьмеце — застануся ў вас, адмовіце — з'еду вясною, не магу я так больш. А дзіця глядзець буду, я ж не маладзёнак, што папракаць вас буду, ды сам такі: жанаты быў, не зжыўся з жонкаю, развяліся...

— Я веру вам, Уладзімір Сямёнавіч,— сказала Юля,— толькі вы якую настаўніцу, жанчыну разумнейшую, падбярыце сабе: жыццё наша вядомае, сялянскае... І работа мая такая, кухарская: абы дзецям смачна есці варыць.

— Я і сам вясковец, Юльяна Іванаўна, а вам другая і настаўніца не дакажа ні красою, ні работаю, ні розумам,— гаварыў Уладзімір Сямёнавіч і схіляў галаву. — Дужа вы чалавек добры, разумны, да чужога гора чулая. Добрыя людзі вамі не нахваляцца. Я пражыў ужо нямала, пагледзеў людзей, але такіх, як вы, мала сустракаў. Вам верыш адразу, вам цяжка адмовіць... Вяселля нам, Юльяна Іванаўна, вялікага можна не рабіць, не маладзенькія мы жаніхі, людзей весяліць не збіраемся, а сваякоў блізкіх вашых, настаўнікаў нашых можна паклікаць.

— Чаго ты маўчыш там? — азвалася з печы Наталля.— Скажы адно чалавеку — прымеш у гаспадары ці не? Я толькі скажу, што трэба думаць, як жыць,— гаварыла старая, папраўляючы сабе пасцель,—

гэта ж не жыццё, што самой, бабе, у лес ездзіць, рэзаць, калоць дровы трэба, дзіця бязбацькавічам гадуецца.

— Ціха вы, мама,— сказала Юля.

— Я ў цябе нічога не разумею, параіць не магу,— пакрыўдзілася маці.

— Скажыце што, Юльяна Іванаўна...— папрасіў настаўнік.

— Няма мне вам што сказаць,— панурыла галаву Юля.— -Задумалі вы сур'ёзнае, сур'ёзнае хочаце, а ў мяне сын. Глядзець вы яго будзеце, але бацькам не станеце.

Уладзімір Сямёнавіч разгубіўся, сядзеў і не ведаў, што сказаць.

— Я не папракаю вас, але баюся...

— Я разумею вас, Юльяна Іванаўна. Вы — маці, а я бацькам некалі быў, я разумею вашу трывогу. Толькі цяжка вам адным...

— Ды неяк жа жыць будзем,— прамовіла Юля.— Што самі зробім, што людзі памогуць.

Яно так,— згадзіўся Уладзімір Сямёнавіч.— Прабачце. Я не думаў вас пакрыўдзіць, я хацеў, каб было як лепей і вам і мне.

— Не трэба,— сказала Юля, і ёй стала шкада пажылога чалавека, хоць не магла нічым хоць бы крыху памагчы яму.

— Ну, я пайду,— збянтэжана сказаў Уладзімір Сямёнавіч.

— Хачу да мамы! — тоненька азваўся з печы Пецька.

— Ляжы ты, смала! — загаварыла да ўнука старая. Малы заплакаў. У Юлі сцялася сэрца — здаецца, перавярнулася ўсё ўнутры.

— Прабачце, Уладзімір Сямёнавіч,— сказала настаўніку,— не магу я...

— Не апраўдвайцеся, я разумею ўсё,— папрасіў той.

— Не злуйцеся.

— Я не злуюся на вас, Юльяна Іванаўна,— сказаў настаўнік і пачаў апранацца.— Як не любіш, то ўсё не міла. Можа, і праўда, не трэба нам неразважлівага кроку рабіць. Але я вам жадаю шчасця і вялікага кахання, вы варты яго,— Уладзімір Сямёнавіч узяў бяссільную руку Юлі, пацалаваў і хутка выйшаў з хаты.

— Ах ты, блазнюк! — закрычала раптам на ўнука Наталля.

— Хадзі сюды, сынок,— паклікала Юля.

Пецька саскочыў з печы і перабег да маці.

— Ну, дзеўка мая, лепшага табе ўжо не дасць бог,— сказала Наталля.— Пашкадаваў ён цябе яшчэ, пасылаў добрага чалавека, з дзіцём браў — сама адмовілася. Відаць, век будзеш гараваць з дзіцём, удавою. Не веру я, каб твой вярнуўся.

— Але ж не магу я за нялюбага ісці,— сказала Юля.— Ды і яго жыццё будзе якое...

— Глядзі сама, дзеўка. Я ж хачу толькі, каб табе добра было,— прамовіла маці.— Ды і дзіцця не многа ўбачыць, калі будзе на стрэхі глядзець.

— Дасць бог, нешта ўбачыць,— сказала Юля.

## 13

Днём ярка выбліснула вясновае сонца, парадавала першым прыпёкам — мігам сагнала са стрэх апошні снег, пацяклі мутныя ручайкі. Сцены ўжо награваліся, сохлі, у зацішку, на прызбах, грэліся куры, спрабавалі капацца ў пяску, што таксама прасыхаў, бялеў і пыліўся.

Юля дастала з кубельца цяжкі кумпяк, за зіму прасолены, размяклы ад расолу, ачысціла яго, абхінула марляю, вынесла і навесіла на цвіку пад страхою. Убіла яшчэ колькі цвікоў і развесіла на іх каўбасы, паляндвіцу. Сёння, бачыла яна, каторыя прывозілі з лесу ядловец, падграбалі трэскі, ладзілі старыя курыльні — збіраліся вэндзіць.

Юля хацела падсушыць мяса і таксама прадыміць яго. Яна вельмі любіла вяндліну з хлебам ды са шчаўем, падпячы з яечкам, любіла гэты пах дыму, ядлоўцу; лічыў за лепшыя прысмакі вяндліну і Пецька.

Ён увесь час круціўся ля яе, выносіў сала з кубла, абчышчаў, стаяў на панадворку і не падпускаў вераб'ёў.

— Мама, дзядзя больш не прыйдзе да нас? — нешта ўздумалася пасля яму запытацца.

— Не, сынок, не прыйдзе,— адказал Юля.— Не трэба ён нам.

— І тата не прыедзе?

— А тата прыедзе і не забудзецца прывезці табе веласіпедзік,— немаведама чаму маніла сыну Юля, якая і сама не вельмі верыла, што Генадзь можа вярнуцца да яе.

— А дзе наш тата? — спытаў Пецька,— Баба гаварыла, што ён ніколі не прыедзе да нас.

— Няпраўда, сынок, прыедзе.

— Баба наша маніць?

— Не, сынок,— сказала Юля,— баба наша добрая, яна не маніць. Яна не ведае таты, таму і думае, што ён не прыедзе.

— А тата наш добры?

— Добры, сынок,— сказала Юля.— Толькі з дрэннымі людзьмі вадзіўся, не ведаў часамі, што робіць. Ды і ён цябе не ведае: каб бачыў, што ты такі высокі, прыгожы, то даўно прыехаў бы.

— А ты напішы яму, мама,— ажывіўся Пецька, бліснуў вачыма.— Ты ж цёці Мані пісьмы пасылаеш, то і яму напішы.

— Не, сынок, пісаць мы яму не будзем, некалі я табе скажу — чаму, цяпер ты яшчэ не разбярэшся ў гэтым... — Юля яшчэ штосьці

хацела сказаць, але змоўкла: ішла паштарка. Тая павіталася, дастала з сумкі і аддала газету, але сумкі за плячо яшчэ не закінула, выцягнула пачак пісем, разабрала іх; Юля чакала, што будзе матчына пенсія, як паштарка дастала ліст.

«Манька наша прыслала»,— падумала Юля, узяла пісьмо, глянула на яго і — здзівілася: почырк, якім быў надпісаны адрас, здаўся ёй зусім незнаемым. Здаецца, яго яна ні разу не бачыла.

Відаць, ён быў чужы, незнаемы і паштарцы; яна стаяла, чакала, мусіць, што Юля скажа, ад каго ліст: заўсёды хацела ўсё ведаць. І яна знала, якім бацькам у вёсцы дзеці пішуць мала, а якім многа, ведала, якой дзяўчыне і колькі піша хлопец з арміі...

Але Юля не вельмі любіла хваліцца сваімі навінамі, расказваць пра сябе іншым, таму не разарвала канверт, а панесла яго ў хату.

Зацікаўленая сама, яна хуценька абарвала канверт, дастала ліст і пачала чытаць. Пецька стаяў ля стала і глядзеў на яе. І чым больш мяняўся яе твар, тым сын пільней глядзеў на яе.

Юля прабегла вачыма па пісьме, зноў пачала чытаць, удумваючыся, стараючыся разабраць кожнае слова; прачытаўшы, зразумела ўсё, жахнулася і схапілася ад страху, жалю за галаву, сціснула яе рукамі, зажмурыла вочы, чула, як моцна стукае кроў у скроні...

Нешта дапытваўся ў яе сын, тузаў за рукаў, але яна не магла пачуць малога: такое было нечаканае гора, што звалілася на яе...

— Мама, і гэта тата наш прыслаў?

— Тата,— не сваім, нейкім глухім голасам адказала яна.

— Баба, тата пісьмо прыслаў! — заскакаў Пецька, схапіў ліст і панёс бабулі.— А ты казала, што ён не напіша нам, не прывязе мне веласіпед.

Наталля ўзяла пісьмо, паднесла да вачэй, але не магла разабраць літар. Тады яна спаўзла з печы, дзе драмала нядаўна, дастала з шафы свае старыя, падрапаныя Пецькам, з ніткамі замест дужак, акуляры, пачапіла іх на нос, паднесла ліст да акна і пачала голасна чытаць. Прачытала, зняла акуляры і паглядзела на Юлю, але тая не падымала ад стала галавы. Цяжка было разабраць: яна плакала ці так, без слёз, бедавала. Наталля падышла, палажыла ля Юлі пісьмо, села паблізу і глядзела на нядаўна вясёлую, цяпер такую нярадасную дачку.

— Захварэў, з'язджаць надумаўся... Хай едзе, косіць сабакам сена,— сказала маці.

— Гэта не ён пісаў,— азвалася Юля, не падымаючы галавы.

— Дзе ж ён сам напіша, сорамна, сабаку, было. Вось і папрасіў некага.

— Што вы, мама, гаворыце: сам ён можа напісаць, але другіх не папросіць, я яго ведаю,— сказала Юля і падняла галаву, на шчоках яе былі слёзы.

— Ведаеш ці не ведаеш, дзіця, але ссушыў ён цябе.— Маці ўстала, чамусьці не магла глядзець у вочы Юлі.— І цяпер во чарнець па ім будзеш.

— Паеду я, мама.

— Дзеўка, ён хворы, можа, які,— абярнулася, холадна бліснула вачыма маці. Юля аж сцялася ад гэтага халоднага позірку.— Не ведаў ён цябе дагэтуль, з дзіцём у свет пусціў, столькі гора табе прынёс, забудзь і ты пра яго.

— Што вы, мама, гаворыце? Хіба вытрываю я? — вымавіла Юля, а сама падумала са страхам: «Божа, што я ўчора нарабіць магла...»

— З тваім характарам лепш не радзіцца,— сказала Наталля.— А другая паказала б яму. Ужо як за такім жыць, дык лепш ніякага не мець. Чалавек сам учора да цябе прыходзіў, ды добры чалавек...

— Паеду я, мама,— сказала Юля.— Не будзе мне шчасця, нішто не будзе міла...

— Едзь,— згодна сказала маці.— Хіба я цябе трымаю? Я век патурала табе. Каб меней патурала, стражэйшая крыху была, і ты шчаслівейшая была б.

...Юля прыбралася, апранула, што мела лепшае, падвяла бровы, пафарбавала вусны, пакруцілася ля люстэрка, паўглядалася на сябе з сумам і затоенай радасцю.

Ля грубкі стаяла і ўважліва глядзела на яе Наталля, дробненькая, сівая, з парэпанымі рукамі. Ёй, непрыгожай ад старасці ды і ў маладосці не надзеленай красою, сцінался, балела сэрца, што дачка яе такая яшчэ маладая, прыгожая, як адзелася чыста, дык і ў горадзе, здаецца, такой красы не знойдзеш. Але старая не сказала пра гэта дачцэ, паказвала, што злуецца, не хваліць, што тая надумалася рабіць па-свойму.

— Ну, будзьце здаровы! — Юля завязала хустку, яшчэ раз паглядзелася ў люстэрка.— Слухайся, сынок, бабулю.

— Вазьмі хлеба, каўбасы, з'ясі ў дарозе.

— Дзякуй, мама! — пасвятлела тварам Юля і пацалавала маці ў шчаку,— Добрая вы!

— Добрая! — змахнула фартухом слёзы маці.— Я ніколі, дзіця, табе ворагам не была. Едзь, калі надумалася.

— Паеду, мамачка!

Юля пацалавала сына і пайшла на аўтобус.

Суседзі трапіліся негаваркія, маўклівыя: старэнькі сівы дзядок прыхінуўся да сцяны і драмаў, і маладзенькая дзяўчына ўвесь час глядзела ў акно ці чытала.

Юля сядзела і думала; у дарозе, калі няма з кім пагаварыць, хораша і ясна ўспамінаецца, што было ды прайшло, ацэньваецца, якім яно было ці магло быць; таксама цягне памарыць, пагадаць, уявіць сваё жыццё і сябе лепшым, шчаслівейшым.

Юля думала пра Генадзя. Прачытаўшы ліст, яна крыху здзівілася, што ён не забыў яе, і па-жаночы спагадала: як ні злавалася, але не жадала чалавеку гора. Падумала, чаму Генадзь сам не напісаў ёй, не папрасіўся: верыў у сваю ранейшую выдумку ці пасаромеўся? Прасіў знаёмую напісаць ці яна сама даведалася, вышукала неяк яе адрас і напісала? Пасля падумалася, што, можа, ён цяжэй захварэў, чым як піша знаёмая.

...Звялі іх сцежкі неспадзявана, на танцах, як часта цяпер бывае гэта ў маладых. Генадзя, высокага, шырокага ў плячах, Юля бачыла ўпершыню ў клубе.

Анька таго ж вечара пайшла дамоў з сябруком Генадзевым. Юля не падала за хлопцамі, нават баялася іх, помніла перасцярогі маці.

У леспрамгасе многа хлопцаў, і чубатых, і лысых, і «рабацяг», і начальнікаў, спрабавалі загаворваць з ёю, падкочваліся з падарункамі, але, убачыўшы яе асцярогу, нават вясковую дзікаватасць, хутка адыходзілі.

Аднойчы Юлю на роўнай дарозе, як кажуць людзі, спаткала бяда: адною нядзеляю, калі асабліва было сонечна, ярка на дварэ, яна каталася з сяброўкамі на лыжах. Паехала з высокай гары, не ўтрымалася, кульнулася ў снег і вывіхнула руку.

Наверсе смяяліся, аж браліся за бакі. Калі яна, паспрабаваўшы падняцца, войкнула і зноў упала, усе затрывожыліся, пад'ехалі і абступілі яе.

Яна плакала. Генадзь скінуў з яе ног лыжы, узяў Юлю на рукі, панёс у пасёлак. Юля абшчапіла яго за шыю, сцінала зубы і ціха войкала ад болю, нават не саромелася, што яе нясе на руках хлопец, пра якога не зусім добра гаворацъ у пасёлку, якім страшаць пажылыя кабеты маладых неразважлівых дзяўчат. Яна захвалявалася, разгубілася, калі назаўтра Генадзь прыйшоў праведаць яе, прынёс цукеркі, варэнне.Ён пасядзеў ля яе хвілінку і хутка пайшоў. І Юля пашкадавала, што яна, такая сумная, не зацікавіла яго.

Неспадзявана Генадзь зноў наведаўся, а пасля перастаў хадзіць. Юля чакала яго, і хацела гэтай сустрэчы, і баялася яе. Яна нават

баялася падумаць сабе, што нечакана закахалася ў незнаёмага хлопца.

...Помніцца, у той зімовы позні вечар было цёмна, шэрым здавалася поле, асабліва густым і чорным выдаваў лес, і не відаць было, як сыпаў ціхі начны снег; толькі пры святле, што падала з акон, бачылася, як цярусяцца сняжынкі, якія яны белыя і пушыстыя.

— Я сірацiна,— гаварыў Генадзь,— бацькі мяне згубілі ў вайну. Нават не ведаю, ці сапраўды я называюся Генадзем. Колькі ні пісаў ды людзей ні прасіў — так і невядома, адкуль з'явіўся, нібы бусел мяне ў два гады ў Мінск прынёс.

— Дык ты сам з Мінска? — спытала Юля.

— Відаць,— адказаў Генадзь.— Адзінокі во цяпер як пень.

— Затое ёсць сябры,— сказала Юля.

— І ты,— узрадаваўся Генадзь і прыхіліў яе да сябе.

Юля здзіўлялася, гадала, чаму ён такі чалавек: на людзях нахабны, сярдзіты, нават злосны, не можа жыць, каб не абразіць каго, а застаўшыся з ёю адзін, губляецца, саромеецца, загаворвае пра сваіх невядомых бацькоў, сваё няўдалае жыццё.

Тым вечарам яна ўпершыню зайшла на кватэру да Генадзя. Хлопцаў дома не было, паразбягаліся недзе па пасёлку. Юля і Генадзь гулялі ў шашкі, пілі гарачы чай.

Нечакана патухла святло. Стала вельмі цёмна, ціха, здаецца, нават чуваць было, як шаргацеў на двары снег.

Генадзь перасеў да Юлі, абняў яе за плечы. Ёй стала страшна, а Генадзь гладзіў яе валасы, ціснуў сваю шчаку да яе шчакі. Яна адчувала, як штосьці незнаёмае туманіць ёй галаву, і Генадзь, відаць, адчуваў гэта: пачаў моцна цалаваць яе.

— Пусці, Генадзь,— папрасіла яна, але такім ціхім, нязлосным голасам, што ён не звярнуў на гэта ніякай увагі, а можа, і зусім не чуў яе слоў. Юля не магла адштурхнуць яго...

## 14

Цягнік у Мінск прыбыў своечасова, спазніўся хіба на якія дзветры хвіліны.

Юля ўзяла свой чамаданчык і выйшла на перон. Сталіцу яна крыху ведала: прыязджала колькі разоў, ездзіла гасцяваць да цёткі. Цяпер яна выпіла з дарогі шклянку газіроўкі, падалася ў вакзал.

Білет ёй удалося ўзяць хутка. Перакусіла ў буфеце, пахадзіла па гулкіх залах і не магла нідзе знайсці месца, каб прысесці: усё пазаймалі людзі — сядзелі, драмалі ці чыталі газеты.

Юля падалася да кніжнага кіёска, каб купіць на дарогу якую кнігу, і ўбачыла знаёмы твар. Прыгледзелася, прыслухалася. Вельмі знаёмым здаўся ёй і голас.

Так, гэта была яе сяброўка, Анька.

Юлі здалося, што Анька таксама згледзела яе ў гэтую хвіліну, але паўглядалася толькі адно імгненне, тут жа адвярнулася, па-ранейшаму гаварыла з нейкай жанчынай.

— Аня! — Юля кранула сяброўку за руку.

Тая хутка павярнулася і так здзіўлялася, што Юля зразумела: Анька заўважыла яе раней, але не хацела сустракацца.

— Ой, Юлька! — прытворна ўзрадавалася Анька, абняла і пацалавала ў шчаку.— Так прыфранцілася, што я цябе не пазнала... Куды ты выбралася?

— Ой, Анечка,— уздыхнула Юля,— гора ў мяне. Вось еду па бядзе.

— Што такое?

— Гена ў бальніцы,— сказала Юля.

— Напісаў усё-такі?

— Знаёмая пісьмо прыслала, напісала, што мучыцца ён без нас даўно, зблажэў зусім...— Юля дастала з сумачкі пісьмо і падала Аньцы.

— Любіць ён цябе,— прачытаўшы, сказала тая,— Паспрачаліся вы, раз'ехаліся, думаў мо: едзь, выжыву і без цябе. Цяпер не вытрываў, ные сэрца, што недзе ёсць сын, ты, вось і перажывае. І ў цябе злосць, відаць, адышла...

— Адышла,— сказала Юля.

— Ты яшчэ ўсё можаш паправіць,— уздыхнула Анька.— Паспрачаліся, пажылі адно без другога і ўбачылі, што вам трэба быць толькі разам.

— Ну, а як ты жывеш, Анька? — спытала Юля.

— І не пытайся...

— Не памірыліся?

— А мы і не злаваліся, не спрачаліся,— сказала Анька.— Мы абое ўбачылі, што ўсё не так, як мы думалі. І мы мучымся, і дзеці сталі прыслухоўвацца. Пазіраюць на нас і здзіўляюцца...

— Ты яго зусім не любіш?

— Я яго, Юлька, ніколі не любіла,— прызналася Анька, — толькі спачатку думала — прывыкну, зжывуся, абы па-чалавечы жыць пачаць...

— Нялёгка табе,— паспачувала сяброўцы Юлька,— як і мне.

— Яшчэ можа і цяжэй. Ты хоць цяпер у штосьці верыш, на нешта спадзяешся...

— Я ніколі і не ганялася за лёгкім шчасцем,— сказала Юлька.— Жыла, верыла, кахала і даражыла гэтым каханнем, таму спадзявалася і цяпер спадзяюся на сваё шчасце.

— А я вось вузялок завязала, самой і развязаць прыйдзецца,— прамовіла Анька.— Ты цягніком паедзеш?

— Цягніком.

— Ну, шчасліва табе,— скупа ўсміхнулася Анька.— Калі любіш, то едзь, не любіш — лепш не ехаць.

— Паеду,— сказала Юля.

— Ну, дай табе бог шчаслівай долі.— Анька прыцягнула Юлю да сябе і пацалавала, хацела яшчэ, мусіць, штосьці пажадаць, але не сказала, адвярнулася; выцерла хустачкай вочы і пайшла ў горад.

Юля выйшла з вакзала і пачала глядзець услед Аньцы. Глядзела і здзіўлялася: Анька, прыгожая, стройная дасюль, шчаслівая, стала нейкая маленькая, згорбілася, і кожны, хто раней ведаў яе, відаць, цяпер здзівіўся б гэтаму.

## 15

Гарадскую бальніцу Юля знайшла хутка. Распытала, даехала з вакзала аўтобусам і прайшла крыху.

Убачыўшы бальніцу, разгубілася — не ведала, як сустрэцца з Генадзем, што сказаць яму. Ды як ён выглядае, трымаецца цяпер?

Прыпынілася ля варот, удыхнула на поўныя грудзі паветра, пастаралася аддыхацца, супакоіцца, прыдумаць, што сказаць. Тое, што прыходзіла ёй у галаву за дарогу, здавалася цяпер няёмкім, нядобрым, а то і недалікатным.

Юля пастаяла, так і не супакоіўшыся пайшла ў бальніцу. Яна думала, што цяпер на яе глядзяць з усіх акон, але хворыя, урачы хадзілі спакойна па двары і на яе не зважалі.

Юля зайшла ў бальніцу, патапталася. Убачыла маладую прыгожую дзяўчыну, якая сядзела за сталом і пісала,

— Добры дзень! — нясмела павіталася Юля.— Выбачайце, скажыце, як мне ўбачыць Генадзя Матусевіча?

— З якой палаты? — спытала дзяжурная.

— Я здалёку прыехала, не ведаю,— адказала Юля.

— Як прозвішча хворага?

Юля паўтарыла.

— А, ведаю,— ажывілася сястра, палажыла ручку,— гэта шафёр той.

— Скажыце, што з ім? — падалася да яе Юля.

— Не бойцеся, нічога страшнага,— заспакоіла яе дзяўчына,— звычайны пералом нагі.

— А я абы-што думала,— сказала Юля, села і выцерла лоб хустачкаю.— Ну, дзякуй богу, што добра ўсё.

— Вылечым вашага мужа,— прамовіла сястра.— Ваш чалавек сумаваў толькі, што да яго ніхто не прыходзіць.

— Я не ведала...— сказала Юля і апусціла вочы.— Сяброўка толькі на днях напісала...

— Вы хочаце яго пабачыць?

— Хачу,— сказала Юля, адзела белы халат, бальнічныя тапачкі і не сваімі, як драўлянымі, нагамі пайшла ўслед за сястрой...

— Вось,— сказала сястра і піхнула нечакана дзверы. Юля зайшла ў палату, адразу ўбачыла з правага боку пакоя накрытага прасцінаю чалавека, які ляжаў тварам уніз.

— Матусевіч! — паклікала сястра.

Хворы і не варухнуўся.

— Спіць,— сказала дзяўчына.— Вы пасядзіце, адпачніце.

Калі сястра выйшла і зачыніла за сабою дзверы, Юля ўзяла крэсла, ціхенька паставіла яго ля ложка, села.

Генадзь павярнуўся, прасціна спаўзла з яго плячэй, і Юля ўбачыла знаёмы твар, толькі ёй здалося, што на ім з'явілася болей маршчынак. Паўглядаўшыся, яна ўбачыла на яго скронях сівую валасінку.

— Спі, Генка,— прашаптала яна, нахілілася і пацалавала мужа ў скронь.

Генадзь падняў галаву, глянуў на яе. Юля таксама глядзела на Генадзя, але паступова бачыла яго менш і менш: вочы засцілалі слёзы, яна нават сама не ведала, чаго плакала.

— Юля! — выдыхнуў Генадзь.

— Я, Генка,— сказала яна, падалася, і яны модна пацалаваліся.

— Калі ты прыехала?

— Толькі што,— прамовіла Юля.— Прыехала ў Вішнёўку, хата на замку. Сказалі суседкі, што тут ты... Напалохаў ты мяне...

— Адкуль ты ўведала?

— Суседка напісала,— сказала Юля.— Што ты зрабіў з нагою?

— Дрэвам прыціснула ў лесе. Ты адна прыехала?

— Адна. Пашкадавала Пецьку разводдзем цягаць.

— Як ён там?

— Добра. Гуляе з бабаю, а я на работу ў школу хаджу.

— Нядобра ў нас выйшла,— сказаў Генадзь.

— Пецька падрос, поўненькі такі,— Юля дастала з сумачкі здымак і падала мужу.— Усё не можа дачакацца, калі татка прыедзе і

веласіпедзік прывязе.— Пасля яна не вытрымала і хліпнула: — Толькі крыўдзяць яго дзеці...

Генадзь узяў здымак, моўчкі глядзеў на свайго сына, і відаць было, як у яго калаціліся рукі. Ён пазіраў доўга, з нейкім добрым замілаваннем.

— Чаму крыўдзяць? — спытаў ён.

— Бязбацькавіч...

— Ляжаў я тут і думаў: папраўлюся, стану хадзіць — паеду да вас, трэба разабрацца... — гаварыў Генадзь, і Юля адчула, што перадумаў шмат за тэты час і ён.— А я ўжо і забыўся, які Пецька... Ляжу, успамінаю і не магу ўбачыць...

— Вялікі. Спрабуе маляваць,— усміхнулася Юля.— Са мною ў лес ездзіць, пілуе дровы.

— Нашто ты яго мучыш?

— Сам просіцца. Кажа: «Мама, вырасту, падужэю, буду за цябе рабіць, не дазволю крыўдзіць цябе...» — Юля расказвала і расчулена плакала.— Каб не ён, то мне і цяжка было б, а так пагаворым, загуляемся — лягчэе на душы...

— А я адзін быў,— прамовіў Генадзь, і Юлі стала шкода яго, як і сына.

— Ты, Генка, і цяпер верыш таму, што гаварылі пра мяне? — спытала яна.

Генадзь пачырванеў, не ведаў, што сказаць.

— Не было нічога,— сказала Юля. Хваліўся Толя, а людзі паўтаралі яго словы, прыбольшвалі.

— Вінаваты я моцна... Не магу табе ў вочы глядзець...

— Разлюбіў ці другую маеш? — насцярожылася яна.

— Не маю я другой,— сказаў Генадзь,— але што гаварыць. На, пачытай вось,— і ён выхапіў з-пад падушкі ліст і падаў Юлі.

«...Я тож, Гена, надумаўся выязджаць адсюль,— чытала Юля.— Ты, стары, не памыляешся: трэба пачынаць жыць інакш, па-чалавечы. Жыццё даецца нам адзін раз, і трэба яго добра пражыць.

Заехаць развітацца да цябе не магу. Прызнацца, часу хапае, і гадзін колькі пахадзіў ля тваёй бальніцы. Рашыў перадаць гэта пісьмо, не магу асмеліцца сустрэцца з табой. Ты прабач, стары; мы былі добрымі сябрамі, нямала разам папрацавалі, але я не заеду пацiснуць табе лапу.

Многа гадоў я быў вялікім дурасліўцам, такім жа, як і ты, я зайздросціў табе і па зайздрасці адпаліў адну агіднасць. Ты, канечне, помніш, не забыў яшчэ Юлю. Ты хадзіў з ёю, ажаніўся, а я кіпеў, праклінаў цябе, бо яна і мне падабалася. Адбіць яе ў цябе я не мог,

дык вось па дурной галаве я рашыў звесці вас. Я наўмысна аднойчы пры выпіўцы, ведаючы твой гарачы характар, тваю помслівасць, нагаварыў пры хлопцах на Юлю...

І на тую сустрэчу яна прыйшла не дзеля мяне, а дзеля цябе; ёй я сказаў, што выклікаеш ты, а цябе я падкалоў: прыходзь, глянь, як буду сустракацца з тваёй «улюблёнай, чэсненькай...»

Юля не стала далей чытаць, успомніла Толіка, рыжага шафера, Генадзевага сябра, які сапраўды спрабаваў, калі яна была ў леспрамгасе, бегаць за ёю.

— Ну, вось і добра,— сказала Юля.— З крыўды я не выскачыла замуж, а ты ведаеш, што я не вінавата, што не падманьвала цябе.

— Думаеш, мне лягчэй ад гэтага? — спытаў Генадзь.

— Я тож добрая была...— сказала Юля.— Не пагаварыла з табою, сабрала манаткі і з'ехала.

— Не варты я цябе, Юля.

— Ты пра сына не думаеш,— папракнула Юля.— Каб думаў, шкадаваў, то не дапусціў бы, каб яго бэнсем называлі. — Юля закусіла вусны, адвярнулася.— Пра мяне тож падумаць не хочаш... Гавару ж табе, знаходзіліся людзі, заступаліся, бралі, а мне так хацелася, каб у дзіцяці родны бацька быў, каб і я, маладая, шчасця паглядзела. А аднаму — сам ведаеш, як жыць...

— Прабач, Юля! — Генадзь схапіў яе пасіверaныя, паабдзіраныя таркаю, не раз парэзаныя нажом рукі і стаў цалаваць іх, закрыў імі свой твар. І яна ўпершыню ўбачыла, як скупа, але моцна можа плакаць мужчына.

— Ой, я і забылася! — схапілася Юля, узяла сумку і дастала адтуль кольца каўбасы, булку хлеба, агуркі і слоік соку.

Генадзь расчулена ўсміхаўся, выціраў вочы і дзякаваў.

— Спрабуй, сама рабіла,— частавала яго каўбасою Юля.— Мацуйся, каб хутчэй стаў на ногі. Я ў цябе і не спытала,— працягвала яна і складала ў столік прыпасы,— як ты падлез пад тое дрэва?

— Засела машына, нахілілася, я аглядаў яе, а ланцуг ў гэты час не вытрымаў.

— О божа! І ты адзін толькі быў у лесе?

— Адзін,— усміхнуўся Генадзь.

— Мог бы і змерзнуць пад бярвеннем,— сказала Юля, і ёй стала страшна.

— Я сам амаль выбраўся, ды і хлопцы, не дачакаўшыся мяне, выехалі насустрач.

— Дзякуй богу, што ўсё так добра абышлося,— узрадавалася Юля.— Магло і горай быць. Аж страшна падумаць.

— Спачатку дома ляжаў,— расказваў Генадзь,— пасля, калі нядобра ступіў і разбалелася нага, сюды забралі, сказалі ляжаць.

— І сам есці варыў сабе? — здзівілася Юля.

— Надзя карміла. Зварыць дома булёну і мне ў місачцы нясе... Грошы пасля даваў, не ўзяла.

— Надзя — добрая жанчына,— сказала Юля — ведала сваю суседку,— Ну, а я, мусіць, паеду, бо на цягнік спазнюся.

— Куды паедзеш? — спытаў Генадзь і захваляваўся.

— Паеду ў Вішнёўку, пагляджу кватэру, пасля з'езджу да мамы, забяру Пецьку.

— Толькі хутчэй, Юлька, не затрымлівайся,— Генадзь прыцягнуў яе і абняў.— Надакучыла мне аднаму...

— І мне,— прызналася Юля,— і па табе засумавала...

— А я, каб ты ведала...— Генадзь моцна пацалаваў яе і не адпускаў ад сябе.

— Ну, добра, Генка,— прашаптала яна,— я хуценька. Толькі хацелася б маме памагчы бульбу садзіць і дроў навазіць.

— Паздаравею — удваіх тады паедзем.

— Ну, добра, не затрымаюся. На гэтым жа тыдні з сынам у цябе будзем,— абяцала Юля.— Хопіць, набылася адна...

Генадзь аддаў ключы ад кватэры, якую ім летась даў леспрамгас, і Юля выйшла з палаты.

...Разгубленая, радасная, Юля стаяла ў сваёй кватэры, на кухні, у якой не была з восені. Трымала ў руках сумку і не здагадвалася яе пакласці, як не надумалася і сесці, і глядзела на ўсё знаёмае, сваё.

На тым жа месцы, на цвічку ля дзвярэй, вісела яе фуфайка, без аднаго гузіка, з вышмальцаванымі локцямі, ледзь вышэй яе звінеў лічыльнік, на якім ляжала парудзелая разліковая кніжка.

На лаве стаяў посуд; кантэйнер быў адчынены, у ім ляжала булка сухога хлеба.

Юля зайшла ў другую палавіну хаты, убачыла такія ж, як і на кухні, цёмныя фіранкі, запыленую накрыўку на тэлевізары.

На стале стаяў будзільнік і не цікаў, і ад таго ў хаце было так ціха, што яна пачула, як вые ў коміне вецер. Глянула на грубку: каля дзверцаў адскочыла гліна, і часта, відаць, з-за гэтага дыміла — быў цёмны стаяк.

«Што значыць, калі хата пабыла на замку»,— падумала Юля, падышла да стала і завяла гадзіннік. Адразу прапала цішыня.

Тады яна адчыніла дзверы, каб праветрылася хата, палажыла сумку, узяла вядро і пайшла па ваду. Пашаравала вядро і некалькі

разоў выпаласкала яго. Наліла поўнае вады і прынесла ў хату. На месцы, пад столікам, ляжала і ануча мыць падлогу.

Намачыла венік і спырскала хату. Тады зняла з акон фіранкі, паразбірала пасцелі і пачала выціраць з шафы, плафона, сцен пыл, сабрала і запхнула ў грубку старый газеты.

Успомніла пра свой і Генадзеў партрэты, што віселі ў спальні. Рамка і шкло былі так запылены, што не відаць было твараў. Юля абцерла фартухом — партрэты ажылі, а яна, здаецца, на здымку ўсміхалася; недзе здалёку, з вачэй бачыўся шчаслівы смех.

Пасля яна стала мыць падлогу. Падумала, што трэ было прынесці вады ў чыстым вядры і паставіць грэць — мыць посуд. Пайшла на кухню і не ўбачыла гэтага вядра — можа, узяла суседка, але да яе заходзіць не хацелася. Можна прынесці вады і ў чайніку ці каструлі.

Яна пачала выціраць падлогу, і тая свежа блішчала, ажно можна было глядзецца.

## 16

Юля зірнула на Генадзя — высокага, у выцертым асеннім паліто, вушанцы — і падумала, якая яна ўсё-такі дзіўная: столькі гаравала, чакала ўсё Генадзя, верыла, што пачнуць добра жыць, адыдзе ўсялякая горыч.

А Генадзь, стомлены дарогай, непаголены, вельмі ўжо смешны ў караткаватых штанах, худы і слабы ад хваробы, спакойна ішоў, углядаўся ў незнаёмыя мясціны, штосьці думаў сваё... І такіх людзей, як ён, звычайных, нечакана падумала яна, відаць, ёсць многа на свеце.

«А ён самы харошы, і толькі адна я, можа, гэта ведаю»,— Юля тарганула Генадзя за рукаў.

...Нечакана мяккая вясновая цішыня прарвалася — палілася па наваколлі шчырая і радасная песня. Юля і Генадзь глянулі ўверх: недзе зусім блізка, у сіняй бездані неба, звонка і чыста выспеўвалі нябачныя жаўранкі, радуючыся, што прыляцелі з далёкіх краін у родную старану, на свае знаёмыя палі, перацярпеўшы ростань, вялікую дарогу, а цяпер пачынаюць нанова жыць.

1971

# 2

# Апавяданні

## ЦЯПЛО НА ПЕРШАЦВЕТ

*Трыпціх*

### КАУНЕР З ЗАМОРСКАГА ЗВЕРА

**1**

— Сынок! Га, сыне! — хтосьці дужы тузаў мяне за плячо, але я не мог прачнуцца і пазнаць голасу: вельмі хацелася спаць.

Мяккім і ўлежным здаваўся сяннік, хоць напхнулі яго толькі ўчора: за зіму леташняя салома ў ім збілася, перасеклася, нібы яе стачылі мышы, і спаць на ёй было надта мулка. Бацька распароў сяннік, занёс яго ў хлеў і вытрас гэтую «сечку» карове на подсціл, схадзіў у гумно і выбраў жоўценькай саломы. Была яна халодная, доўга ляжала ля грубкі і грэлася. Калі стала сухая і цёплая, бацька запхнуў яе ў сяннік і зашыў яго. Сяннік выйшаў тоўсты, гарбаты, калі я лёг на яго, то не мог утрымацца і скаціўся долу.

«Абтапчы»,— усміхаўся задаволены бацька, і я скакаў, уціскаў салому, аж нацёр калені аб вострыя яе камлюкі.

— Стасік! — зноў пачуў я хрыплаваты голас і пазнаў: будзіць мяне бацька.

Не хацелася нават расплюшчваць вачэй: так было цёпла, утульна, мякка, але бацька настойліва, нават з нейкім сполахам клікаў мяне, што я пераадолеў сон, глянуў, адразу зажмурыўся ад яркага, як здавалася, святла газоўкі. Зразумеў, што яшчэ вельмі рана: і спаць хочацца, і не днее, і маці не відаць ля печы.

— Уставай, сыне, імчы да бабы. Скажы, хай да нас ідзе...

У мяне адна баба, матчына маці, жыве за лесам, за добрую вярсту ад нас. Яна сама кожнага дня прыходзіць, спрасоння думаю я, чаго яе клікаць у такую рань! Вось і ўчора была, не дазваляла маме насіць поўныя вёдры, скубці і даваць карове сена, паднімаць на прыпек цяжкія саганы, а рабіла ўсё гэта сама. Дамоў пайшла вечарам, паабяцала, што назаўтра зноў прыйдзе.

— Скажы, што мама... захварэла...

Калі я пачуў гэта, усхапіўся, хуценька апрануўся: вельмі любіў маму і цяпер прыпомніў, што, мусіць, вінаваты ў яе хваробе: учора не паслухаўся, не прынёс у хату дроў, а пабег коўзацца на сажалку. Мама хадзіла па іх сама, прывалакла бярэма, апусціла ля грубкі, абаперлася аб яе, заплюшчыла вочы, не глядзела, што выцірае рукавом мел, доўга стаяла і аддыхвалася — так ёй было цяжка...

Я глянуў на ложак, на якім штоночы спіць маці: і цяпер яна была там, ляжала тварам да сцяны і цяжка стагнала, часам нават ускрыквала. Я захваляваўся, таму паслухмяна надзеў порткі і камізэльку, якія мне падаў бацька, уссунуў на босыя ногі гумовікі, ушчапіў на галаву аблавушку і выйшаў з бацькам на двор. Было яшчэ цёмна, не відаць ні лесу, ні поля. Толькі за лугам на небе выплывала светленькая палоска, паднімалася, і я не ўбачыў, а толькі адчуў недалёкую, ціхую, яшчэ замёрзлую, нежывую рэчку, на якой тоўсты сіні лёд, праз яго ўдзень ледзь-ледзь відаць чырвона-жоўтае дно, усыпанае маленькімі бліскучымі каменьчыкамі, адчуў халодную, залітую талай вадой сенажаць, а на ёй два рудыя стагі, якія не паспелі перавезці. Калі добра прыгледзеўся, то ўбачыў блізка частаколіны, а на іх анучы і збаны.

У хляве ціха стагналі свінні і цяжка дыхала карова. Нечакана галасіста запеў певень. Здаецца, ніколі я не чуў, каб ён так моцна гарланіў.

— Ужо другі,— прамовіў бацька.

Рана, ціха, цёмна і страшна, думаю я. А ў лесе...

— Спушчу сабаку, пабяжыш з ім,— кажа бацька, нібы адгадвае мае думкі.— Трымай за ланцужок. Смялей будзе.

Ён ідзе да будкі і, пазвоньваючы зашчапкаю аб дрот, адвязвае і прыводзіць Шарыка.

— Не бойся,— заспакойвае мяне бацька.— Цяпер ціха... Прабяжыш. Ну...— Ён дае ў мае рукі халодны ланцужок і падштурхоўвае ў спіну.

Сабака нюхае зямлю і цягне мяне, я падаюся за ім, нічога не бачу, але трапляю выйсці з варотаў, падацца за хлеў. За ім — дарога да лесу.

У полі холадна: цягне стылым ад зямлі і павявае вясновы колкі вецер. Снегу ўжо няма — счарнеў за сакавік, растаў на ваду і сцёк. Мясцінамі, дзе ніжэй, трымаецца толькі лёд — стары, яшчэ асенні, скамянелы за зіму,— блішчыць днём на сонцы і нехаця слязіцца — танчэе і асядае; маладзенькі, вясновы лядок, што сабраўся ноччу на лужынах, тонкі, нямоцны, хрумсціць, як папера, і ломіцца пад нагамі. Днём паднімеш кусок, танюсенькі і празрысты, як шкло, і доўга не патрымаеш: хутка растае ў цёплых руках, і халодныя, аж пякучыя, кроплі цякуць у рукаво, халодзяць...

У лесе яшчэ цямней, я не бачу сцежкі, бягу, куды вядзе сабака. Але дарогу адчуваю добра: помню кожную ямінку, узгорачак, камень, ля якога абтапталі пясок. Летась аб адзін такі валунец тут, ля Ваўкавенькі, за выгібам, які будзе скора, я збіў палец.

У бары ціха, толькі чуваць мае крокі і ціхенькае рэха, якое коціцца следам за намі. Страшна, вельмі страшна. Здаецца, за кожным кустом стаіўся воўк, каб схапіць мяне і завалачы ў пушчу. Хоць і цёмна, я заплюшчваю ад страху вочы і імчу за сабакам, ды так хутка, што часамі наступаю яму на ногі. Але думаю, што бягу памалу: уперадзе яшчэ многа дарогі, далека да бабулі, а маме цяжка... Стараюся бегчы яшчэ хутчэй, каб прамінуць гэты лес, за якім будзе бабуліна хата.

Калі нарэшце прыпыняемся ля бабулінай хаты, мне няма чым дыхаць. Адчуваю, што памлелі і ногі.

Я пастукаў кулаком у дзверы — бабуля тут жа пытаецца, хто гэта, і пускае мяне ў сенцы. Здаецца, і не здзіўляецца, што я так рана прыбег да яе.

— Ест што ці яшчэ няма? — толькі запытала яна.

Я зусім не разумею, пра што яна пытаецца, паціскаю плячыма.

— Ну, дзіцяці яшчэ няма?

— Не,— гавару я.

— Пабяжым тады,— кажа бабуля.

Яна качаргою раскідала ў печы дровы, якія ўжо ўгарэліся, заліла агонь, узяла вузялок, што ляжаў на стале, патушыла газоўку, і мы выйшлі на двор.

— О божа! Як ты толькі бачыў дарогу? — здзіўляецца яна,— Я сваімі старымі вачамі дык нічога не бачу, не паспяшу такою цемраю.

Я і сам ведаю, што яна не можа хутка ісці: пажылая, хваравітая, ды перад самаю вайною яшчэ зламала нагу, цяпер ходзіць з палачкаю.

Бабуля распытвае ў мяне, што рабіла нядаўна маці, а пасля нечакана кажа, што ў нас сёння «прыбавіцца сям'я — дасць бог хлопчыка ці дзяўчынку».

Цяпер я прыпамінаю, што маці з бацькам даўно дапытваліся ў мяне, ці хачу, каб «купілі сястрычку». Я гаварыў, што «не трэба яна нам». Добра, смяяліся яны, не будзем збіраць на яе грошай.

Цяпер я задумаўся: дык адкуль жа возьмецца сёння ў нас малое?

— Ты вырас ужо, дзяцюк,— кажа бабуля,— сем годзікаў маеш. Падобраму, пара даўно мець і другое. На гэтым жа свет стаіць... Але як будзеце жыць, не ведаю. Ратоў прыбаўляецца, а яды... Ды маці нікуды надта не адвернецца, будзе сядзець ля калыскі. Каб не гэтая вайна яшчэ... Такая бясхлебіца...

Калі мы, спяшаючыся, дайшлі да нашай хаты, пачало выплываць чырвонае сонца, калюча і холадна асвяціла небакрай. Мы тупалі і бачылі ўжо дарогу. Ногі мае закарчанелі ў гумовіках.

Маці ляжала на тым жа ложку, толькі цяпер была нейкая вялікая, на ўсю пасцель, глянула на нас, калі мы ўвайшлі, і зноў заплюшчыла вочы. Я заўважыў, што ў яе бледныя вусны, сухія, аж патрэсканыя, як зімою ў мароз.

— Ну, што тут? — спытала бабуля ў бацькі.

— Ды во! — сарамліва ўсміхнуўся ён і паказаў рукою на маці.

Бабуля падышла да пасцелі, нагнулася, разгарнула невялікі белы скрутачак, паглядзела і сказала:

— Ну, во і добра, дзяўчынка...— Пасля паклікала мяне: — Ідзі глянь, і ты некалі гэтакі быў, тож так у руках трымала...

Я падышоў і ўбачыў загорнутае ў чысценькае прасцірадла маленечкае дзіця, здзівіўся: адкуль яно ўзялося?

— Не зачыніў учора коміна,— папракнуў мяне бацька,— вось і ўкінуў нам бусел дзіця. Раз не дапільнаваў, то будзеш цяпер гуляць з ім.

Я разгубіўся, стаяў і лыпаў вачамі.

— Не слухай, сынок, бацька насміхаецца. Гэта твая сястрычка,— ціха сказала маці.— Паглядзі, яна на цябе і падобная.

Бабуля апусціла ніжэй гэтае не пекнае дзіця, але я, разгублены, блізка не падышоў і добра не зірнуў на сястрычку.

Так і не дабіўшыся, каб я прылашчыў хоць позіркам малое, бабуля адышла ад мяне, палажыла дзіця, сказала бацьку прынесці ночвы, выпаласкаць іх і наліць цёплай вады. Я пастаяў, патоўкся пад рукамі і, калі ўбачыў, што лішні, ніхто на мяне не глядзіць, нікому я не трэба, выйшаў на двор. Не ведаў, што буду рабіць там, але падаўся за хлеў, на поле, далей ад дому. Таптаў на лужынах тонкую намаразь, коўзаўся па старым лёдзе, быў неспакойны, не рады, што вырваўся з хаты. Але вяртацца ў яе не хацелася.

З лесу пачулася, як заляскалі па прымерзлай зямлі колы, зарыпелі гужы ды драбіны. Я ведаў, што едзе мамін брат, дзядзька Янусь, такі ж высокі, дужы, як і мой бацька.

Дзядзька Янусь добры, ён увесь час жартуе, расказвае цікавае ці прынясе які ласунец. Ён амаль штодня катаў мяне на калёсах, садзіў ля сябе і даваў «кіраваць». Я моцна трымаўся за лейцы, ехаў і здзіўляўся, чаму такая вузкая дарога: конь кідаўся з абочыны на абочыну. Дзядзька пасміхаўся і гаварыў, што канём не трэба кіраваць, тузаць яго — ён і сам умее выбіраць дарогу.

Цяпер, як бачылася, дзядзька спяшаўся і не думаў заязджаць да нас. Раней, бывала, заскочыць, пастравіць ля хлява каня, падкіне яму сена, зойдзе ў хату, паснедае і паедзе далей.

Сёння ён не заехаў, павярнуў ля сажалкі, што была за паўвярсты адсюль, і выехаў на дарогу-сыпанку, якая вяла да суседняй вёскі, Ніўнага.

У Ніўным ужо з паўгода быў калгас, і нашы хутарскія мужчыны часта хадзілі туды глядзець, як жывуць «калгоснікі». Дзядзька Янусь таксама бываў, памагаў свайму брату-ніўнянцу — вазіў з іхняга калгаснага лесу дровы да «хаткі», дзе варылі калгасным цялятам і коням бульбу, каб падмяшаць яе ў сечку. Я часта ездзіў з ім у Ніўнае, заходзіў да другога свайго дзядзькі, Антуся, які працаваў конюхам.

Дзядзька Антусь — не карэнны ніўнянец. Сям'я яго, жонка і двое дзяцей, жылі да нядаўняга часу ля нас у зямлянцы. Але дзядзька Антусь, як толькі вярнуўся з вайны, не захацеў жыць болей на хутары, схадзіў да ніўнянскага старшыні калгаса, дамовіўся з ім і пераехаў туды, уступіў у калгас і стаў працаваць на канюшні: вельмі любіў коней, ён і на вайне быў кавалерыстам.

Дзядзька Антусь, відаць, расказаў старшыні, што мой бацька каваль, бо на днях той, высокі, вусаты, у ваенным адзенні, але без пагонаў, з адным пустым рукавом, якое было заткнута за рэмень, прыязджаў да нас і ўгаворваў, каб і мы перабіраліся ў Ніўнае, прасіў бацьку працаваць кавалём, перавозіць туды і нашу «кузеньку», агораную ўсёй бацькавай раднёю яшчэ да вайны.

Я слухаў і глядзеў на старшынёву, некалі зялёную, а цяпер пабялелую, гімнасцёрку з медалямі, здзіўляўся, як іх многа, з зайздрасцю аглядаў яго выцвілую фуражку, на якой не было зорачкі, а бачылася толькі на яе месцы плямінка і дзірачка. Старшыня быў заклапочаны, худы, зусім не смяяўся, пільна глядзеў на бацьку і гаварыў: «Каваль нам надта трэба, бо даюць трактар, сеялкі, плугі, а правіць іх няма каму, бо ўсе кавалі нашы на вайне паклалі галовы... А ты што тут, на хутары, будзеш рабіць і што заробіш? Хутаранец многа табе не заплаціць, калі ты яму які серп склеплеш».

Бацька згадзіўся, што тут яму няма чаго рабіць і заработкі малыя, ён не супроць працаваць у іхняй калгаснай кузні. Ведаў, што там яму будзе «разгарненне», але бедаваў, што тут у яго стаіць яшчэ дзедава хата, і будзе многа клопатаў, калі яе раскідаць, перавезці, злажыць: паспрабуй крані толькі — пасыплецца ўся. А памагчы надта няма каму: сваякі самі будуюцца. Ды ўвогуле мужчын мала, усе будуюцца, не хочуць жыць у зямлянках.

— Можа, буду хадзіць пакуль што да вас на работу, калі прымеце,— сказаў бацька.— Тут недалёка, вярсты тры. А кузню перадам ужо свайму калгасу, бо і ў нас жа, відаць, скора будзе...

Старшыня шкадаваў, што не можа цяпер памагчы пераехаць і пабудавацца, хоць бы, гаварыў, ніўнянскім уловам агарадзь якія хаціны, але прасіў прыходзіць і кавальнічаць.

Я, калі бываў у Ніўным, то спярша заварочваў на кашошню, да дзядзькі Антуся. Памагаў яму карміць коней — разносіў па загарадках сена, вотруб'е, найболей стараўся даць чаго-небудзь смачненькага жарабяткам, але дзядзька не дапускаў да іх: баяўся, каб мяне не ўбрыкнулі кабылы. Даваў мне лёгкую работу: прайсці па калідоры і пазакладаць жэрдкі ў стойлах, а ў загарадках самых памаўзлівых коней забіць над жэрдкамі ў дзюркі калочкі.

Вечарамі, калі быў у канюшні, дзядзька садзіў мяне на рахманага Ангора, і мы ганялі на раку паіць коней. Пакуль коні вярталіся — ішлі яны панурыя, цяжкія ад вады, апусціўшы галовы, не брыкаліся і не гулялі, як хвілін колькі таму,— валасы ля пыс абмярзалі, звісалі тоненькімі лядзяшкамі, якія дакраналіся адна да адной і ціхенька пазвоньвалі...

...Я пабег за возам, стаў крычаць і махаць рукою. Каб летам, то мог бы яго і не дагнаць, але цяпер, бездарожжам, цяжка нагружаны конь цягнуўся паволі, і я хутка дагнаў яго.

Дзядзька прыпыніўся і злез з калёс, прывітаўся са мною за руку, спытаў:

— Што скажаш добрага?

— Сёння нам бусел дзяўчынку прынёс,— сказаў я.

— А! — дзядзька ўсміхнуўся, ускалашмаціў свае валасы.— Ёсць адзін такі бацян, ён ніколі не адлятае на зіму, а разносіць па хатах дзяцей. Правароніў юшку зачыніць?

Я апусціў галаву: сапраўды ўчора не зачыняў, бо дагледжваў грубку бацька — тоўк галавешкі, разгортваў жар. І бацька, і дзядзька вінавацяць толькі мяне...

Дзядзька Янусь падхапіў мяне на рукі, пасадзіў на дровы, і мы паехалі да нас. Калі зайшлі ў хату, я ўбачыў, што бацька дастаў за гэты час з вышак калыску, абцёр яе ад пылу. Знайшоў недзе маленькі сеннічок і паспеў ужо напхнуць яго сенам.

— Я не бачыў, што ты, малец, выскачыў на двор,— усміхнуўся ён.

— Цяпер цябе, пляменнік, будуць часта не бачыць,— прамовіў дзядзька.— Цяпер будуць калаціцца па ёй. Што смачнейшае, лепшае — усё будзе ёй, а не табе...— ён нагнуўся, глянуў на дзяўчынку, здзівіўся: — О, якая брыдкая! Ну што, малец, язык высалапіў? Не ўгледзеў?.. Калышы цяпер.

## 2

Зусім мяне растрывожыў дзядзька. Я стаў прыглядацца, чым жа смачнейшым будуць карміць малую? Што мне застанецца? Дасюль, калі траплялiся якія цукеркі-падушачкі, то былі мае. А цяпер, выходзіць, дастануцца ёй.

Праз колькі дзён я ўбачыў, што маці яе нічым яшчэ не корміць, дае толькі грудзі. Я не вытрываў і спытаў аднойчы, калі будуць даваць малой есці і што-небудзь іншае.

— Падрасце — будзем падкормліваць,— адказала маці.— Пакалышы, а я схаджу ў хлеў.

«Глядзі во яе!.. Няма як пабегчы да Антоніка, нагуляць»,— думаў я, гойдаючы гэтую капрызу: калі тармасіў калыску — спала, толькі адыходзіўся, хацеў выйсці да свайго сябрука — кугакала на ўсю хату. Я ўсё болей разумеў, што цяпер давядзецца мне меней гуляць — трэба глядзець малую.

— Мама,— спытаў я аднаго дня,— а ці забірае бусел маленькіх дзяцей назад?

— Чаму ты хочаш гэта ведаць? — усміхнулася яна.

— Хай забірае, не трэба яна нам...— сказаў я, успомніўшы, як на днях бабуля прынесла салодкі пернік, то маці адламала мне толькі маленькую скібачку, а астатняе схавала «даваць Ганьцы».

— Чаму ты хочаш аддаць сястрычку? — дапытвалася яна.

Я прамаўчаў, але хацеў сказаць, што яна, мама, была дасюль да мяне добрая, ласкавая, а цяпер на мяне мала глядзіць, палюбіла гэтую маленькую дзяўчынку, болей думае пра яе, як пра нас з бацькам. Але нічога не сказаў, толькі насупіўся.

— Буслік мой! — прытуліла маці мяне да сябе.— Бадян дзяцей назад не забірае. Ен яшчэ нам брацiка прынясе. Хочаш?

— Не,— крыкнуў я.

— Чаму, сынок? — здзівілася мадi.

— Не хачу.— Я не сказаў, чаму не жадаю яшчэ і хлопчыка, хацеў толькі запытаць, ці любіць яна мяне яшчэ, але стрымаўся.

— Ох, мае вы дзеці! Некалі будзеце радавацца адно аднаму,— прамовіла маці, але я не зразумеў, што яна хацела сказаць, не пераставаў думаць пра брацiка і баяцца яго.

Рашыў, што трэба ўсяляк не дапусціць да коміна бусла: зноў укіне дзіця. Я штохвіліны прасіўся на двор і, колькі дазвалялі мне, быў там, паходжваў і выглядваў, ці не ляціць бацян.

Пакажацца — праганю, няхай вяслуе да суседзяў, у іх даўно няма маленькіх дзяцей... Але бусла не было, і я зразумеў, што не дапільную

яго. Укіне яшчэ адно малое, калі адвярнуся куды, і давядзецца гэтаксама калыхаць яго. І не толькі гушкаць...

Вечарам маці расказала бацьку, як хацеў я пазбавіцца ад сястрычкі. Ён слухаў яе, пасміхаўся, а пасля пачаў дакараць мяне:

— Пара ўжо табе, Стаська, сталейшым быць. Скора ў школу ісці, а ты ўсё дзяцінішся. І чаму ты не хочаш яшчэ і браціка? Весялей жа будзе.

— Нам і так мала есці,— сказаў я.— Лусту хлеба мама цяпер дзеліць на чатыры кавалкі, а тады будзе рэзаць на пяць...

— Ты і праўда ўжо сталы.— Бацька перастаў усміхацца, сеў за стол.— Колькі яшчэ, маці, у нас засталося жыта?

— Сам жа ведаеш, чаго пытаешся? — адказала яна.— На раз змалоць. А ўперадзе — лета... Пакуль тое новае...

— Да новага далека...— уздыхнуў бацька, пацёр далоняю лоб, пасля глянуў на мяне, ды так пільна, як на дарослага.— Дык не хочаш гуляць з маленькаю? Не? Тады будзеш штодзень хадзіць са мною ў кузню памагаць зарабляць хлеб...

## 3

Цемната дагнала нас за лесам; у бары быў цёплы пясок, душнаватае паветра, а тут, у полі, бралася раса, студзіла ногі. Я ішоў побач з бацькам, маўчаў, адчуваў на плячах астуджаны пот, стомленасць, ведаў, што хутка мы прыйдзем дадому і я буду паліваць ваду бацьку на яго чорныя, вымазаныя вуглём і жалезам рукі, а пасля буду мыцца сам, смачна есці і моцна спаць, нават не прасіць расказваць мне казкі.

Я не доўга гуляў з сястрычкаю, да якой пачаў прывыкаць, бо да нас пераехала бабуля, цяпер жыве з намі і гуляе з унучкаю, а я стаў працаваць.

Бацькава кузня стаіць непадалёку, тут, на хутары, дзе да вайны жыў ён і сам. Калі ў блакаду хату спалілі, бацька з маці перабраліся сюды, да дзеда, а кузня засталася на ранейшым месцы. Вось нам і даводзіцца хадзіць на працу за добрую вярсту.

Работа мая ў кузні не такая ўжо і цяжкая. У бацькі ёсць памочнік, хударлявы, стары, з задышкай, дзед Васіль, які памахае крыху молатам, сядзе і не можа адсапціся, нават не курыць, сядзіць і глядзіць у зямлю, пакуль не нагрэецца жалеза. Я падмяняю старога — паддзімаю агонь. Даюць мне і другую работу — зубіць сярпы. Дзед Васіль слепаваты, добра не бачыць, часта б'е малаточкам бацьку па пальцах, таму тата налаўчыў зубіць мяне.

Рабіць гэта нялёгка, хоць і цікава: бацька кладзе на дзве калоды стальны роўны вал, ложыць на яго гладка вытачаны серп і настаўляе зубільца, а я часта-часта, з аднолькавай сілай, б'ю па ім малатком. Спачатку ў мяне не выходзіла: біў я моцна і рассякаў вастрыё сярпа, а то стукаў слаба, і зубы былі нявострыя. Часта ўгоджваў бацьку па пальцах, набіваў сінякі, бацька аж войкаў ад болю, лізаў пальцы і крычаў на мяне, але скора я прызвычаіўся — зубікі атрымоўваліся роўненькія і востранькія. Бабы, як жалі, не маглі нахваліцца гэтымі сярпамі і болей хвалілі мяне, чым бацьку...

— Стаміўся, малады каваль? — спытаў бацька, паклаў мне на плечы цяжкую руку. Ён сярдзіты, калі працуе, а калі падыходзім да хаты, ажыўляецца, жартуе.

— Не,— адказваю я.

— Прагаладаўся?

— Не,— зноў гавару я, хоць ужо даўно смокча ў жываце, цякуць слінкі, аж баліць у роце, але я мужчына, я не сусед — аднагодак Антонік, які гуляе цэлымі днямі ў «коні», лепіць гліняныя домікі ці пячэ пясочныя аладкі, плача, калі застрэміць нагу ці ўджыгне яго пчала. Мне няма часу гуляць, мне трэба памагаць бацьку ў кузні, памагаць зарабляць хлеб... Я не плачу, калі мая рука трапіць пад малаток, замлее ад болю, пасінее; не бядую, што ў мяне звініць у вушах ад стуку.

Антонік не ведае, як удараюць малаткі, а я знаю: пудовы малацішча б'е глуха, як у барабан, а маленькі малаток, які часцей гуляе па кавадле, ляскае дробна, бацька выладжвае ім усялякую тонкую работу — клепле сярпы, нажы, шылы.

Я іду і гадаю, чым будзе карміць нас сёння маці. Відаць, наварыла бульбы — яна яшчэ маладая, цвёрдая, мылкая, але есці ўжо можна. Яе добра пасыпаць соллю і есці сухама ці нашчыпаць звялага пер'я цыбулі і кусаць з ёю. А можа, маці сабрала малака, паставіць на стол кіслага?

Я сам здзіўляюся, чаму гэтае лета думаю многа пра ежу, ці таму, што ў нас даўно выйшла сала і мы не ядзім скваранага, ці таму, што працую, трачу многа сілы, ці таму, што ўсё лепшае — смятану, тварог — берагуць для сястрычкі. Забыўся я ўжо, калі ўволю з'еў і чорнага хлеба — адрэжа маці лусту, дасць, а бохан загорне ў белы ручнік і пакладзе на паліцу, напамяне, каб без яе не чапалі...

На ганку нас сустрэла маці, усміхнулася: «Ах, мае вы работнікі!»— - але чамусьці абняла ды пацалавала толькі мяне, хоць я цяпер вельмі хацеў, каб мама прылашчыла і бацьку: ён многа працуе — цэлы дзянёчак махае молатам, адпускае мяне паляжаць на траве, пакупацца ў

рэчцы, а сам не выходзіць з кузні, стукае, пацее ля агню, а ноччу глуха і цяжка кашляе...

— Ну, што вы сёння зрабілі? — пытаецца маці і палівае нам на рукі халодную ваду.

Мы з бацькам намыльваем рукі, крэкчам і не спяшаемся адказваць. Другім часам я не вытрымаў бы, адразу пахваліўся б, але сёння маўчу, чакаю, што скажа бацька.

— Мы заробім скора Стасю на боты,— кажа ён.

— Малайцы! — радуецца маці.— І я вас сёння нечым пачастую...

Мы заходзім у хату, садзімся за стол. Маці высыпае ў глыбокую місу гарачую бульбу, пара з якой валіць пад столь, і ставіць маласольныя гуркі. Як убачыў я картоплю, у мяне так пацяклі з рота слінкі, што я перастаў стрымлівацца, быць «сталым», напоўніцу набіў рот бульбаю, толькі зяхаў: была яна надта гарачая, апякала рот. Дасюль я, здаецца, не ведаў, што бульба такая смачная.

— Гэта вам, мужчынам,— усміхнулася маці, узяла з паліцы невялікі кавалак сала, адрэзала два роўныя кусочкі, падала мне і бацьку.

Я добра ведаю, што ў нас ужо няма свайго сала, кончылі яшчэ вясною, хрэсьбінамі. Сама мама і бабуля сала не ўзялі, хрумстаюць гуркі і запіваюць бульбу расолам, і хоць часта гавораць, што посная гэта яда, некалі будзе лепшая, але сёння маўчаць, і, здаецца, усе задаволеныя. Толькі наша Ганька не радуецца, не засмучаецца, спіць сабе — сапе ў носік і цмокае губкамі...

— Мама, дзе вы ўзялі сала? — спытаў я, калі крыху збіў голад.

— Вы зарабілі,— кажа яна.— Занесла сёння Пётрыкавым серп, што вы змайстравалі, вось і далі. Так што і ты ўжо наш карміцель...

Я ўсміхаюся, нават бянтэжуся: так мне добра. І тут жа думаю, што, відаць, і бабуля, і маці гэтаксама хацелі б пакаштаваць сала, і я ўзяў нож, адрэзаў ад свайго кусочка і ім па скрылiку.

— Еш сам, сынок,— адмаўляецца бабуля.— Мы тут пры доме... А вы ж у кузні...

І бацька, як толькі цяпер я заўважыў, не еў сала, глядзеў на мяне і пасміхаўся, адрэзаў два кусочкі, падаў іх кабетам, хоць тыя нізавошта не хацелі браць. Узялі толькі тады свае долі, калі сказаў, што і ён не будзе есці.

**4**

...У кузні горача, млосна: спякотна на дварэ і паддае цяпла агонь. Я сяджу на калодзе, паддзімаю і здзіўляюся: як трывае ля горна бацька? Твар яго чырвоны і чорны ад гарачыні і вугалю; на поце, што

выступіў буйнымі кроплямі на лбе, блішчыць полымя; бацька аблізвае сухія губы ды выцірае рукавом з ілба пот, пакручвае доўгімі абцугамі жалеза, горне на яго вугаль, пасля бярэ чырвоны вугалёк і прыкурвае. Я ўжо ведаю: ён будзе паварочваць у агні жалеза, пасыпаць яго жоўценькім пясочкам да тае пары, пакуль яно не стане белым, не заструменіць уверх іскрамі,— тады бацька выхапіць белы кавалак, кіне яго на кавадла,— і яны хопяцца з дзедам Васілём біць малатамі. Б'юць яны моцна, з усяе сілы, ляцяць па баках толькі гарачыя пырскі. Я закрываю рукавом твар — каб не апаліла.

Калі жалеза пачырванела, а мясцінамі на ім паказаліся і чорныя плямы, бацька зноў совае яго ў агонь, закурвае ад вугля, дзед Васіль садзіцца і адпачывае, а я кручу кола паддзімала і думаю, што скора мне ісці ў школу, што мяне будуць вучыць чытаць і пісаць, і я, калі папросіць бабуля, буду складаць лісты яе сыну, дзядзьку Янусю, які летам перабраўся ў горад. Я не заўважаю, як бацька выхоплівае з агню белы кавалак, кідае яго на кавадла,— і зноў пяраць па жалезе з дзедам малатамі.

...З полудня дзед Васіль не вярнуўся. Зайшоў яго сын і сказаў, што стары захварэў, злёг у пасцель. Яны з бацькам паспелі выкаваць сякеру, засталося яе толькі натачыць і загартаваць.

— Павострым? — спытаў у мяне бацька.

Я колькі разоў круціў тачыла, калі вастрылі нажы, сярпы, і было няцяжка, але цяпер трэ было драць новую шурпатую сякеру, таму яе будуць прыціскаць — круціць тачыла тады пад сілу сталаму мужчыне, а не мне. Але я не мог адмовіцца, нічога не сказаў бацьку, моўчкі наліў у карыта вады і падышоў да каменя, узяўся за ручку.

Бацька спачатку не прыціскаў, і я круціў легка, паглядаў нават і любаваўся, як мокне камень, цячэ па ім вада, здзіраюцца жвірынкі, але так трэба доўга тачыць, і таму бацька прыціскае мацней сякеру,— у мяне адразу млее рука. Я часта мяняюся, кручу то левай, то правай і хутка выбіваюся з сіл. Бацька стараецца памагаць мне адною рукою, але ўсё роўна я знясільваюся, і мне становіцца нямілая гэтая работа, не хочацца новых ботаў, думаецца толькі пакінуць круціць гэтае праклятае тачыла, выбегчы з кузні туды, дзе гуляюць мае аднагодкі...

— Ну, мацуйся!— падбадзёрвае мяне бацька,— Зробім гэтую сякеру, заплацяць, і тады купім табе яшчэ і новую шапку. У школу пойдзеш — адзін я тут не ўпраўлюся, пайду ў Ніўнае... Хочаш мець харошую шапку?

Я, канечне, хацеў, бо ў мяне няма людскай аблавушкі: са сваіх старых я павырастаў, а бацькавы мне вялікія, налазяць на вочы, яны

зношаныя, павыціраныя: яшчэ тыя, што падарылі вайскоўцы колькі год таму, калі ішлі на захад.

— Ну, сядзь, адпачні,— кажа мне бацька, і я саджуся, адсопваюся, а ён круціць тачыла сам.

Я разумею, што хапае работы і яму: кожнага дня людзі прыносяць і прывозяць правіць плугі, зубіць сярпы, рабіць сякеры, нажы, каваць вазы. Да яго нават заязджаюць ніўнянскія шафёры і трактарысты: бацька мой майстар на ўсе рукі. І стараецца ўсё зрабіць — і людзям памагчы, і зарабіць.

— Хочацца ўцячы ад гэтага тачыла? — усміхаецца бацька.— Ну, бяжы да свайго Антоніка, пагуляй.

— А хто будзе круціць тачыла?

— Ды я сам,— кажа бацька.— Ты не стаміўся зусім?

— Не.

— Калі не стаміўся, то памажы яшчэ. Паможаш?

— Ага,— ціха адказаў я.

Хоць яшчэ не адышлі рукі, калоцяцца, цягне сапраўды марсянуць адсюль, пабегчы на рэчку, пакупацца ды спакойна паляжаць, але я падняўся і стаў зноў круціць тачыла, нагінацца і заплюшчваць ад стомы вочы, бачыць жоўта-зялёныя іскры, ад якіх кружыцца галава. І ўсяляк стараўся не паказаць бацьку, што мне цяжка, а то ён не дапусціў бы мяне болей да тачыла, круціў бы і тачыў сам...

...Ніхто не ведае маёй радасці, калі я бачу, што сякеру мы ададралі, яна стала белая, вострая. Але я ведаю, што работа з ёю яшчэ не скончана, зараз мы зноў пойдзем у кузню, я буду паддзімаць агонь, круціць кола і не чуць сваіх памлелых рук, а бацька ўсадзіць сякеру ў жар, будзе грэць, пасля выхапіць з агню і стане шоргаць у пясок, апускаць пакрысе ў ваду — гартаваць.

Пасля яшчэ трэ будзе вастрыць яе...

## 5

...Снежань выдаўся люты: яшчэ ў лістападзе скавала зямлю, ажно яна трэскалася, насыпала снегу вышэй платоў, а пасля сцішэла. Пацiснулі маразы — трашчалі вуглы хат і хлявоў, густа лажыўся за ноч іней, выбельваў стрэхі, дрэвы, нават, здаецца, і неба. Раніцай, калі ўзыходзіла вялікае чырвонае сонца, нельга было выйсці з хаты. Ад холаду, здаецца, гарэлі шчокі. Сталі мерзнуць куры, нават у байцаватага нашага пеўня, які не дасць спакойна прайсці па двары, счарнеў, зваліўся набок грэбень.

Пакуль я заходзіў у школу, намярзаўся так, што не мог на першым уроку пісаць: пальцы былі як калочкі, зусім не трымалі ручку.

Удзень мароз крыху адпадаў: прыгравала сонца, нізка вісела і цёпла свяціла; неба было густое, блакітнае, па ім плылі белыя воблакі, а снег зіхацеў, аж калола ў вочы. У зацішку было зусім цёпла, нават капала са стрэх вада.

Калі наставала пара вяртацца са школы дадому, сонца зніжалася, чулася слаба, зноў браўся мароз. Шарэла неба, падхопліваўся ветрык — і пачынала круціць, гнаць па полі снег. І сонца яшчэ свяціла, але было ўжо так холадна, што нельга трываць. Са стрэх переставала капаць вада, замярзала і звісала тонкімі празрыстымі ледзяшамі.

У адзін такі дзень я змарозіў рукі. Маці папрасіла купіць у вясковым магазіне газы, дала бляшанку. Пакуль магазіншчык адпусціў людзей, пайшоў у склад і наліў мне «карасіны», сябрукі мяне не пачакалі і пайшлі дамоў. Я нёс гэтую халодную бляшанку і змёрз. І рукі мяняў: адной нясу, другую грэю ў кішэні, і дзьмуў на пальцы — нічога не памагло. Калі зайшоў у хату, пальцы зусім зайшліся. Я не вытрываў і заплакаў, ды так моцна, што ажно напалохаў маму.

Акалееш ты, дзіця,— пашкадавала мяне маці,— Ні валёнак, ні рукавак добрых... Хоць не пускай цябе ў гэтую школу. Ды во і кажушок моль паела, свіціцца, як рэшата. Каўнер аблез... Купі за што... Ці бацькаў шынель распароць ды падшыць?..

Калі рукі адышлі, пачырванелі і сталі гарачыя, маці дала мне есці. Папалуднаваўшы, я злазіў на гарышча і, як прасіла маці, прынёс стары бацькаў шынель. Маці атрасла яго ад пылу, агледзела і пачала распорваць.

Як распусціла шынель на кускі, зняла з мяне мерку (на ўсё набаўляла — каб яшчэ і другую зіму панасіў), адразу пачала шыць паліто. Праз колькі дзён яно было гатовае, неставала на ім толькі каўняра. Маці перабрала ў шафе «ўсё рыззё», але так і не знайшла, што ж пусціць на каўнер. Тады сказала, што выкраіць і пашые суконны, які будзе мулкі, але які «трэба для красы».

— Хлопец добра рабіў у кузні, то яму трэба людскі каўнер,— паслухаўшы яе, сказаў бацька і ўзяўся лавіць зайца.

Ён штодня ставіў петлі ў гумне ля сена і лубіну, але зайцы ў іх не лезлі, абміналі.

Маці перастала спадзявацца на «ўдачу» і пашыла суконны каўнер, але бацька не дазволіў прышыць яго: перад самым новым годам нечакана паў наш сыты, аж бліскучы ад тлушчу, з густой белавата-чорнай поўсцю кот.

— Добрая скура...— агледзеўшы ката, сказаў бацька.— Някепскі можа быць з яе каўнер. Мяккі ды і пекны... Не горшы за зайчыны.

— Гаворыш ты, аж слухаць не хочацца,— запярэчыла маці.— Ды і людзі смяяцца будуць.

— Не бяда,— стаяў на сваім бацька — Калі ўжо вельмі прыставаць будуць, скажам, што каўнер з заморскага звера...

— Не такія ўжо дурныя людзі, каб не пазнаць... Не саром хлопца,— папраўдзе злавалася маці, не дала прышыць гэты «заморскі» каўнер, а прыладзіла той, з цвёрдага, мулкага шыняля.

— І файна, і цёпла было б, маці,— сказаў бацька.— Што пасмяяліся б — то і не страшна... Са смехам лягчэй жыць. Некалі, як пабагацелі б, лепшы купілі б. Студзень жа на двары.

...Ішла трэцяя пасляваенная снежная і марозная зіма...

## КРЫЧАТЫ

### 1

Чуў я раней у сваім налібоцкім краі, як знаёмяцца чужыя людзі:

— Адкуль самі будзеце?

— З Налібак.

— А я з Хлябовіч, з Янковіч...

Толькі не помню, каб пахваліўся хто, што ён з Крычатоў — за вярсту якую схаваўся за нашым мястэчкам, за Шабуневым лесам, такі невялікі хутарок, хат дзесяць, не болей. Спытаюць незнаёмыя крычатоўца, дзе жыве,— ніколі не прызнаецца, скажа: стаіць яго хата «непадалёку Рудні, Янковіч ці Пільніцы»...

Месца, на якім аселі Крычаты, і добрае, і нядобрае: жывуць людзі на беразе шырокай ракі. У ёй многа шчупакоў, ментузоў, плотак — хапае круглы год і свежай рыбы, і сушанай, самі ўволю ядуць і прадаюць, добрую капейку бяруць. Не ведаюць людзі гора і на сена: месца ля іх нізкае, мокрае, не скора высушваецца — расце трава ў пояс, пахкая, ядкая. І коні ахвотна ядуць і каровы.

Але ў крычатоўцаў мала ворыўнай зямлі: вясною выходзіць з берагоў рака, залівае поле; вада стаіць да чэрвеня, не дае ні араць, ні што лапатаю пасадзіць. А то ворыва забірае лес — ля самага хутарка накідваецца, прыжываецца самасейка, а воддаль уросся, укамліўся бор Налібоцкай пушчы. Дровы, ягады, грыбы блізенька, хоць лапатаю грабі, а зямлі, каб зрабіць добрыя грады ці пасадзіць бульбу, няма.

З-за гэтай зямлі яшчэ раней, за панамі, не хацелі нашы местачкоўцы браць крычатовак, а дзяўчат з вёскі нельга было зацягнуць да іх на хутар. Удавалася ў мястэчку якая бедная ці брыдкая дзяўчына, пасміхаліся: «Табе толькі за крычатоўца ісці...»

Вось так гадамі чужыя людзі абнеслаўлялі гэты лапік зямлі, пасміхаліся, забываліся пра яго, успаміналі, калі выходзіла сваё сена і трэ было дакупіць, ці ўзяць у іх рыбы, мёду або піва, якое ўмелі рабіць толькі на гэтым хутарку. Бралі і стараліся, каб ніхто пра гэта не ведаў... І благая слава трымалася, ліпла да крычатоўцаў, як смала...

Як і я помню ўжо, у Крычатах да самага калгаса не было ні школы, ні магазіна, з іх хутара ніхто не вывучыўся за настаўніка, урача, самае вялікае— налоўчваліся хлопцы рабіць бочкі, шыць касцюмы ды кажухі, век цягаліся па свеце па заработках, прыставалі ў прымы, каб пакінуць меншым кусок зямлі, а самім сесці на жончын.

Праўда, казінцы (так яшчэ завуць крычатоўцаў) амаль усе ўмелі добра спяваць і іграць на цымбалах, гармоніках. Калі паблізу бывала якое вяселле ці вечарынка, казінцы тады хадзілі кара ля мі: ігралі іхнія баяністы і цымбалісты, і тады іх паважалі, нават зайздросцілі, бо і танцоры былі яны спраўныя, люба глянуць было, як яны танцуюць. Вальсамі ды полькамі іхнія хлопцы знясільвалі дзяўчат, танцавалі падоўгу, прыпеўвалі, скакалі, траслі валасамі, грукалі ботамі, і ніхто з імі не мог параўнацца.

Праходзілі танцы, і забывалася гэтая павага, і нават адчувалі гэта і нашы дзеці-янкоўцы і не толькі помнілі, але і часта крычатоўцам-аднакласнікам стараліся не даць пра гэта забыцца.

Яны хадзілі ў нашу пачатковую школу, то мусілі часцей, чым нашы, падмятаць у класе, не старацца на ўроках добра адказваць і не атрымліваць пяцёрак; калі гулялі ў хованкі, ім даводзілася часцей шукаць, а не хавацца.

У нашай школе самым старэйшым і дужым быў Мішка — стараста другой змены. З раніцы вучыўся першы і трэці клас, пасля полудня — мы, другакласнікі, і большыя.

Мішка быў высокі, плячысты, пад носам у яго ўжо чарнеліся вусы — ён яшчэ да вайны адзін ці два гады вучыўся ў польскай школе, «нямала пастаяў на коленках у кутку». Дома ён араў, касіў, піў з мужчынамі гарэлку, на вечарынках агрызаўся са сталымі хлопцамі, не «папускаўся», каб над ім так жартавалі, як над намі, на гадоў восем меншымі за яго.Ён і ў школе не надта слухаўся маладой настаўніцы, часта даводзіў яе да плачу, і тая пасылала каторага з нас, каб мы паклікалі Мішкавага бацьку. Але мы, гэўрыкі, як ён дражніў нас, не хадзілі і не клікалі: баяліся Мішкі. З ім дружылі толькі перарosткі Пятро і Віця, але гэтаксама надта не пярэчылі яму.

## 2

...У той лютаўскі дзень яны завяліся з-за сцежкі. Праўда, яе спачатку не было: пакуль мы вучыліся, вецер круціў і перасыпаў снег, гнаў па полі, залізаў ім санную дарогу, і нам трэ было ісці па цальнягу.

Мішка, Віця і я жылі на другім ад школы канцы вёскі, і нам ладны кавалак дарогі выпадала ісці разам з крычатоўцамі, бо мы хадзілі не вуліцаю (так было далей), а па полі, напрасткі. Вось, калі выйшлі на голае поле, Мішка і пагнаў крычатоўцаў таптаць сцежку, а сам цягнуўся па іх слядах і падганяў: «Ну, ну, гэўрыкі!»

Крычатоўцы, усе дробныя, нядужыя, спачатку паслухаліся, як і заўжды, мяняліся па чарзе, ішлі след у след, але хутка стаміліся, набралі ў боты снегу, памарозілі ногі і сталі прасіцца падмяніць іх, але Мішка нават і слухаць не хацеў пра гэта, піхаў іх у плечы і гнаў наперад. Тады яны адмовіліся ісці першымі, збіліся ў кучку і плакалі, пагражалі, што раскажуць настаўніцы.

Мішка пасміхаўся, абы-што гаварыў, з месца не кратаўся, стаяў, сціскаўся ад холаду, калючага ветру, цёр халодныя шчокі і загадваў крычатоўцам падавацца. Я не вытрымаў холаду ды гэтай гыркатні і, абышоўшы ўсіх, памкнуўся таптаць сцежку, але Мішка хапіў мяне за плячо, прыцягнуў да сябе, прасіпеў: «Што — шкода іх стала? Эх ты, гэўрык!..»

Цямнела, хацелася есці, было холадна, але Мішка і не думаў здавацца, усё сыкаў: «А ну пайшлі, казіне». Калі яны так і не падаліся, ён узвярэў, накінуўся на іх і стаў матлашыць сумкаю. Хлопцаў паваліў, панатыкаў кожнага тварам у снег. Пасля кінуўся да маленькай Камці — адзінай дзяўчынкі-крычатоўкі,— піхнуў яе, хапіў жменю снегу, хацеў нацерці ёй твар, але яна павалілася, засланіла нос і шчокі рукою, папрасіла: «Не біся» — і так жаласна глянула на яго, што я сумеўся, у мяне сцялося ад страху сэрца, і я ледзь не заплакаў. Але Мішка сціснуў снег на лядзяшку і пляснуў ёю у твар Камці. Яна заплакала, з носа паказалася кроў.

— Бандзюга! — крыкнуў я.

— Ну, ты! — Мішка вызверыўся на мяне, вылупіўшы вялікія, па яблыку, вочы.— Калі так, то смалі першы. Я цябе...

Я не чакаў, пакуль крычатоўцы падбяруць вытрасеныя з кішэняў ручкі ды гумкі, пайшоў пракладаць сцежку, глыбока правальваючыся і набіраючы ў боты снегу.

— Які жаласлівы! Смаркаты гэўрык! — гудзеў ззаду Мішка, ужо на мне спаганяючы сваю злосць.— Будзеш такі добранькі, дык яны цябе заганяюць... Але каб дома маўчаў, як нічога і не было. Папробуй толькі пахваліцца!..

Дома я звычайна расказваў маці пра ўсё, што было за дзень у школе, паказваў, якую атрымаў ацэнку, за што мяне пахваліла настаўніца. Але на гэты раз прамаўчаў, нічога не прамовіў, бо добра ведаў: маці не пахваліла б за тое, як мы абышліся сёння з Камцяю. А яе плач не выходзіў з маіх вушэй, у вачах стаяла, як толькі заплюшчуся: Мішка б'е лядзяшкай Камці ў твар...

Ноччу мне снілася, як мы ішлі па цальнягу, гналі перад сабой казінцаў, піхалі іх у снег. І мне здалося, што я ўдарыў Камцю ў твар лядзяшкаю, разбіў ёй губу... Я крычаў спрасоння і ўскакваў, так мне было страшна — маці колькі разоў уставала і супакойвала мяне.

Назаўтра, калі я падняўся раненька, сон не выходзіў з галавы; я не чакаў, калі да мяне зойдуць Мішка і Віця, пайшоў у школу адзін. Плёўся і бачыў, што крычатоўцы ўчора ці першая змена сёння панапісвалі на снезе абышто пра нас, янкоўцаў,— выводзілі пальцамі ля сцежкі. Я добра ведаў, што Мішка не даруе ім гэтага, будзе помсціць, і, каб ён не прачытаў іхніх абраз, не прыдзіраўся, каб зноў не папала Камці, стаптаў нагамі надпісы.

Калі сустрэўся з крычатоўцамі ў школе, яны злаваліся, не гаварылі, не прынеслі сушаных яблыкаў і плотак; Камця, як толькі пайшла дамоў першая змена, не глянула на мяне, спырскала і пачала падмятаць падлогу — была сёння дзяжурная.

Хлопцы, баючыся пылу, выйшлі на двор. Я застаўся ў класе, глядзеў на Камцю, невысокую, чорнавалосую, адзетую ў сінюю сукеначку і белы фартушок, і яна ўсё болей мне падабалася. Я жахаўся: як Мішка мог учора падняць на яе руку? Пасля падышоў да яе і сказаў:

— Давай памагу.

— Я сама,— сказала Камця і не дала мне веніка, хоць я прасіў і яшчэ раз.

А мне так хацелася дагадзіць ёй; каб яна згадзілася, дала венік, а сама пастаяла, паглядзела, мне, здаецца, намнога было б лягчэй. Камця старалася не глядзець на мяне, і гэта зусім засмучала.

— Я папрашу Мішку, дам яму што-небудзь, і ён больш не будзе цябе прымушаць ісці першай па цальнягу,— сказаў я.— Ты маленькая...

— Я не меншая за цябе,— запярэчыла, з крыўдаю глянула на мяне Камця.— У адзін клас ходзім. Я дома бульбу абіраю, падлогу мыю.

— А я дровы рэжу і калю,— тут жа, не падумаўшы, зманіў я: пілаваць бярвенні бацьку памагаў, але калоць іх мне не дазвалялі — баяліся, каб не пасек нагу.

— Мне летам ровар купяць, у трэці клас буду ездзіць, а не хадзіць.

Я змоўк: колькі разоў прасіў узяць у магазіне веласіпед, але бацька не хацеў купляць, казаў, што грошы на вартнейшае патрэбны, а ў школу недалёка, можна пешшу хадзіць.

У клас зайшоў Мішка, у бацькавых высокіх валёнках і доўгім, да зямлі, кажусе, уваліўся, як стаяк усунуўся. Як я і чакаў, спытаўся:

— Чаму не пачакаў сёння?

— Бацька раней паслаў,— сказаў я і стараўся не глядзець на яго.

— Што — не хоча казінка падмятаць? — спытаў ён, пагардліва глянуўшы на Камцю, і хацеў, відаць, пацягнуць яе за касу ці піхнуць, бо шэрыя вочы яго нядобра бліскалі.

— Падмятае,— апраўдаў яе я.— Не называй казінка, яна — Камця...

— Камця-мамця! — перакрывіў Мішка.— Казінка... Бэ-э-э...

Я сярдзіта паглядзеў на яго, і мне не спадабаўся яго кірпаты нос, непрыгожымі здаліся адтапыраныя аблавухія вушы, ягоныя рукі, якія мыліся, мусіць, раз у тыдзень. Нядаўна Мішка так накурыўся, што ля яго нельгаі было стаяць.

— Як вынесці смецце? — спытала ў мяне Камця, і я зарадаваўся, што яна нарэшце загаварыла са мною.

Я хуценька адчыніў сваю сумку, дастаў сшытак, вырваў з яго ліст і падаў Камці. Яна змяла на гэтую паперу пясок і панесла на двор. Здаецца, перад гэтым глянула на мяне і прыемна ўсміхнулася, выходзіла, азірнулася і зноў засмяялася.

— Я ім і сёння дам чосу, папру першымі па цальнягу, хоць і сцежка будзе,— сказаў Мішка, скідаючы з плячэй кажух.— Будуць ісці збоку і новую таптаць.

— Не трэба,— папрасіў я,— яны і так...

— Што — яны?.. Не бойся, жывыя будуць,— сказаў ён.— Вось не пайду налета ў школу, паеду вучыцца на трактарыста, дык вам, жабянятам, на галаву сядуць. А так будуць помніць...

— Будзем таптаць сцежку па калейцы,— сказаў я.

— Што яны табе далі? — скрывіўся Мішка, ён вось-вось ад злосці мог ударыць мяне.

— Нічога яны мне не давалі,— прамовіў я.

— Падсунулі, мусіць, нешта, калі заступаешся,— загневаўся ён, што я сапраўды мог што-небудзь атрымаць смачнае, а з ім не падзяліцца.

— Няўжо табе была вялікая радасць, калі ўчора набіў Камцю? — спытаў я.

— Жывая будзе,— махнуў ён рукою.— Яны прывыклі, каб іх матлашылі. Гэта вы, гэўрыкі, сапляк, а я помню, што я янковец, а

яны — казіне... Рашыў задачку? То давай, перапішу. Малы, але што ў цябе за галава гэтыя задачкі рашаць!.. Я б гэтую арыхмеціку зусім выкінуў бы...

...Дамоў мы ішлі моўчкі. Папярэдзе, па сцежцы, спяшаючыся, падганяючы адзін аднаго, крочылі крычатоўцы, махалі рукамі, толькі сумкі боўталіся па баках. За імі пляліся мы, Мішка, Віця і я.

Сёння наша настаўніца зноў плакала ад Мішкі, абазвала яго ў злосці дурнем і сказала, што яму, такому «быку», ужо сорамна хадзіць з дзецьмі ў школу і што ён «забраў у яе ўсё здароўе»; яна сёння пойдзе ў сельсавет і будзе скардзіцца старшыні. Мішка нават не спалохаўся настаўніцы, перад намі сказаў, што наб'е Васіля, які ходзіць да яе. Яна выганяла яго з класа, цягнула рукамі, але Мішка ўпёрся і не пайшоў.

Цяпер Мішка быў злосны, і я бачыў, што ён хоча задрацца з крычатоўцамі: то скажа якое брыдкае слова на іх, то пхне ў спіну апошняга, то чарпане наском у снег так, каб ён ляцеў пярэднім на галовы.

Крычатоўцы нават не азіраліся, як не бачылі і не чулі гэтага, подбегам трусілі да лесу, дзе дарогі нашы разыходзіліся. Першая ішла Камця, адною рукою яна трымала сумку, прыціскала да боку, другою махала і калі прыспешвала, то шырэй ступалі і мы, калі замаруджвала, то ўсе збіваліся, наступалі адзін аднаму на ногі. Тады Мішка піхаў у плечы крычатоўцаў, усяк зневажаў іх, лаяўся.

— Не трэба,— прасіў я,— не чапай іх.

Камця, пачуўшы гэта, падбягала ўперад, за ёю прыспешвалі хлопцы, і бойка зрывалася.

Ля хвайняку мы разышліся. Крычатоўцы падаліся лесам, а мы павярнулі ўправа, ля краёў маладняку патрусілі ў свой край вёскі.

— Казіне, казіне! — крычаў Мішка,— Бэ-э-э!

— Смагаль, смагаль! — нарэшце асмеліліся, азваліся і тыя.

— Бэ-э-э! — дражніў іх Мішка і падскакваў на месцы — страшыў, што пабяжыць за імі.

Тыя аж выцягваліся, так уцякалі.

— Дурань ты! — упікнуў я Мішку.— Вялікі, але дурань.

— Ты на каго гэта, гэўрык, пляцеш? — Ён падышоў да мяне і звузіў вочы.— Ды я цябе адным пальцам... Як камара... Я, калі захачу, вашу школу перакулю — і не будзеце сваім розумам хваліцца...

Я не спалохаўся, не адступіў, глядзеў яму ў твар і бачыў, як дрыжыць яго губа, як ён, дужы, разгубіўся, пачуўшы, што я сказаў.

— Дык хто я? — прасіпеў ён.

— Ты — дурань, ты сам ніводнай задачкі не рошыш...

Гэта ўжо яго раззлавала, ён размахнуўся рукою — і я са сполахам убачыў, як з яго рукава вылецела прывязаная на гумцы гірка і стала набліжацца да майго твару. Я не паспеў ухіліцца — гірка пляснула мне па пераносіцы.

Я нема завыў ад болю, закрыў твар рукою.

— Будзеш ведаць, як агрызацца...— сказаў Мішка, як апраўдваў сябе.

Я са злосці, крыўды нагнуўся, схапіў жменю снегу, не баяўся, што зноў пападзе (колькі ўжо баяцца), кінуў яго ў твар Мішку.

— Ну ты, гэўрык! — Ён адступіў, закрыў твар рукавом.— Не лезь, а то растапчу...— гразіўся, але біцца не збіраўся, адыходзіў.— У мяне не паскачаш... Вы павінны мяне баяцца... Як агню... А будзеш абзываць — будзеш палучаць. Вытры нос... Калі дома пажалішся, то яшчэ... Заступнік зялёны!..

— Я... Я...— мне хацелася сказаць тое, што думаў, але слёзы душылі, нос балеў, і я не мог стрымаць плачу.

Так, плачучы, з крыўдаю і злосцю, мучачыся, што нічога не магу зрабіць Мішку, прыйшоў дахаты.

### 3

Ужо летам, калі мы не хадзілі ў школу, калі ў садах акругляліся, трацілі горасць і пачыналі цукравець яблыкі, бацька паслаў мяне ў Крычаты. Там я быў часта, хадзіў па розных патрэбах, але адзін ішоў туды першы раз. Як нашы матлашылі казінцаў у сваёй вёсцы, так і яны, залавіўшы нас на сваім хутарку, стараліся адпомсціць, не выпусціць цэлымі; калі не наштурхаюць ці не дадуць кухталёў, то хоць прабягуць, пастрашаць ды каменняў услед нашпурляюць...

Бацька ўкаваў калёсы аднаму крычатоўцу, і вось цяпер я ішоў да яго па плату. Тупаў і асцерагаўся, каб не злавілі мяне там аднаго і не адлупцавалі, бо не забыліся, як на днях Мішка ля нашай вёскі пераняў Тосіка, паваліў яго, адабраў торбачку, у якой той нёс з нашага магазіна цукар, і насыпаў у яе пяску...

Калі я мінуў Шабунеў лес, выйшаў на луг і ўбачыў, што ля крычатоўскага моста купаецца многа хлопцаў, я ўзяў ля абочыны і засунуў у кішэні пару камянёў. Мяне згледзелі, павылазілі на бераг. Я падрыхтаваўся да бойкі.

— Хадзі, Стасік, пакупаемся,— паклікаў мяне Тосік, але я мала верыў яго дабраце, думаў, што заманьвае.

Я адмовіўся купацца, стараўся хутчэй падысці да моста і перабегчы яго. Азіраючыся, перайшоў і бачыў, што гнацца за мною не

збіраюцца. Тады я, адышоўшыся, прысеў, каб мяне ніхто не бачыў, і выкінуў з кішэні камяні.

Калі я забраў плату і вяртаўся дамоў, мяне сустрэла Камця. Здаецца, яна падрасла за лета, стала высокая, загарэлая, леташняя яе сукенка была маленькаю.

— Дзе ты быў? — спытала яна.

Я прызнаўся.

— А мне ровар купілі,— пахвалілася яна.

У мяне такіх радасцей не было, таму я прамаўчаў.

— У Прудах школу адкрылі,— сказала яна.— І мы будзем хадзіць не да вас, а да іх, бо туды бліжэй.

Я пачуў гэта і засумаваў, што мы не будзем больш бачыцца, што цяпер ужо могуць крыўдзіць яе прудзяне, і ніхто, можа, за яе не заступіцца.

— Пачакай мяне,— прамовіла яна і пабегла ў сваю хату, хутка вярнулася і несла ў руках лусту батона, намазанага мёдам.

Белы хлеб мы елі толькі па святах, а так мама пячэ на нядзелях сухарыкі.

— На,— сказала Камця і падала лусту.— Бяры, у нас многа булак.

Я ўзяў і са смакам пачаў уплятаць, хоць шкадаваў: ніяк не мог выхітраваць, каб мёд быў на лусце і яго з'ядаць, бо ён цёк па пальцах і капаў на зямлю.

— Хочаш пакатацца на ровары? — спытала Камця.

— Хачу,— сказаў я.

— Прыходзь заўтра, таты і мамы не будзе дома, то мы і пакатаемся. Прыйдзеш?

— Прыйду,— з радасцю прамовіў я.

— Прыходзь, толькі Мішкі не бяры з сабою. Я не дам яму катацца...

— Я яму нічога не скажу,— паабяцаў я.

Толькі што перастаў ліць, як з дзіравага мяха, дождж. Рассунуліся, пасвятлелі на небе шэрыя хмары — павіднела, стала высокае, блакітнае неба. Прыпякло і прыпарыла.

Камця і я сядзелі ля рэчкі, глядзелі, як блішчыць на сцяблах асакі вада, збіраецца ў кроплі і падае долу. Яшчэ нядаўна мы былі ў хаце, сцішана сядзелі і са сполахам слухалі, як лютаваў, ляскаў гром, жудасна паліла неба маланка, як ліло,— здавалася, затопіць усё на свеце. Калі пацішэла, пакацілася навальніца кудысьці за Налібакі, мы выбеглі з хаты і гойсалі па цёплых лужынах, пырскаліся, абліліся з ног да галавы вадою, а пасля прыбеглі сюды, на пясчаны бераг

крычатоўскай ракі. Тут мы часта ўжо гулялі, ляпілі з мокрага пяску домікі — «школу, магазін, хаты».

Я глядзеў на Камцю і бачыў: за лета яна добра папраўілася. Як хадзіла ў школу, была бледная, тоненькая, як сцяблінка, цяпер пачырванела, налілася сілаю, здароўем. Вельмі пекная стала, глядзіш і нельга наглядзецца. Ды яшчэ гэтыя вочы — сінія-сінія, глянеш — і сэрца замірае. І голас яе мне падабаецца — мяккі такі, тоненькі, гаворыць — ручаёк па каменьчыках бурлікае...

— Стаська, ты такі няўмека,— кажа Камця.— Растаптаў хатку цёці Зосі і страху са школы сарваў. Ці ты вучыцца не хочаш?

— Хачу,— збянтэжана кажу я.

— А чаму тройкі маеш?

— Таму,— насупіўся я, нічога не сказаў болей, апусціў галаву долу, пасля разбурыў нагамі «школу».

— А я буду вучыцца на настаўніцу,— усміхнулася Камця.

Я маўчаў.

Яна падсела да мяне:

— Стаська, як вырасцем, мы з табою будзем жаніцца?

— Не ведаю,— прамовіў я.— У вас сваіх хлопцаў многа, яны цябе возьмуць.

— Я за іх не хачу ісці замуж,— сказала Камця.

— Чаму? — абрадавана спытаў я.

— Яны б'юцца, за валасы цягаюць,— прызналася яна,— я не хачу з імі дружыць. А ты не б'ешся, за нас, крычатоўцаў, заступаешся. Ці і ты будзеш насміхацца?

— Не,— запэўніў я.

— Але ты мяне ўсё роўна не возьмеш,— сказала з жалем Камця.

— Чаму? — я ледзь не пакрыўдзіўся.

— З вашай вёскі нашых не бяруць,— прамовіла яна.— Вы — местачкоўцы... А мы... Мы — казіне...

— Я вазьму цябе.

— Праўда? — узрадавалася і яна.— І бацькі баяцца не будзеш?

— Не,— зноў запэўніў я і захваляваўся: бацькі я пабойваўся.Ён не крычаў так многа, не бедаваў, як маці («О божа! Нашто мне гэта гора на галаву!»), калі я рабіў блага, а гаварыў разок і, калі было не па яго, браўся за папружку... Вось і думаў я, ці дазволіць ён мне ажаніцца з крычатоўкаю Камцяю, бо сапраўды дасюль з нашай вёскі ніхто з імі не парадніўся...— Калі тата не дазволіць, то я маму папрашу. Яна добрая...

— Мы будзем жыць у нас,— сказала Камця.— Я прывыкла тут.

— І я прывык да сваіх Янковіч,— прамовіў я, і мне стала шкода роднай вёскі.

— А як пажэнімся, будзем разам гуляць? Ці ты захочаш камандаваць мною?

— Не,— сказаў я і адчуў на сваім твары цень.

Падняў галаву: перад намі стаяў Гаптар — Камцін бацька — малы, нягалены, злосны. Ступіў і патаптаў сваімі ботамі нашыя «хаткі».

— Дык вось чаго сюды ходзіць пан местачковец...— сказаў ён, і я ўбачыў, што ён п'яны, стаіць і хістаецца, не можа ўтрымацца на нагах. Рэдкія валасы яго апалі на лоб, рукі ён трымаў у кішэнях штаноў і растапырваў іх у бакі. Час ад часу ён ікаў, плюскаў вачамі.

Я ўскочыў.

— Вы... Каб нагі тваёй тут не было,— ён зноў ікнуў, аж трасянуўся.— Мне вы... Пасміхаецеся век... Вон,— ступіў, пагразіў рукою,— вон, не магу бачыць.

Я сарваўся з месца і куляю памчаўся дадому.

— Дзе ты гэта бываеш? — накінулася на мяне маці, калі ўбачыла задыханага ў двары.

Я не сказаў, дзе быў.

— Гойсае недзе, а тут хоць разарвіся: дзіця плача, з рук не злазіць, нешта трэба зрабіць па гаспадарцы, свінні развярнулі загародку і вылезлі... Ды ў школе людзей збіраюць, відаць, будуць у калгас запісвацца, то трэба схадзіць.

— Мама,— калі яна крыху паспакайнела, спытаў я,— чаму крычатоўцы горшыя за нас?

— Чаго гэта яны горшыя? — здзівілася яна.— Людзі як людзі.

— А чаму з іх смяюцца? — спытаў я.

— Смяецца той, хто розуму не мае,— сказала маці.— Гэта ўсё з некаляшняга... Тады, за панамі, яны бяднейшыя былі, меней зямлі мелі. Цяпер усе роўныя... І яны, і мы скора будзем калгаснікамі.

— А ты не будзеш смяяцца з іх? — хвалюючыся, запытаў я.

— Я ніколі, сынок, не смяялася, бо і сама такая была, ні капелькі не багацейшая,— сказала маці, і я зарадаваўся: значыць, і з Камці не будзе пакепліваць, дазволіць, каб мы пажаніліся.

Мне вельмі хацелася схадзіць у Крычаты, сустрэцца з Камцяю і расказаць ёй пра гэта. Але я баяўся яе бацькі, які нечага неўзлюбіў мяне, і не пайшоў. Сумаваў, кожнага дня хацеў убачыць Камцю.

**4**

Хутка, калі трэ было на днях ісці ў школу, я пачуў ад людзей, што Гаптар прадаў хату, скаціну, сабраўся з'язджаць з Крычатоў.

— Можа, і добра робіць чалавек,— гаварыла маці бацьку,— паедзе ў горад і жыць, як усе, будзе... А тут нялёгка яму: Мішуковы яшчэ за палякамі не аддалі замуж Манькі — пасумаваў нямала... Хоць яна плача цяпер, што не пайшла за Гаптара, можа, шчаслівейшая была б, а то яе Стэфусь — багацей — у паліцыі быў, светёй і дзецям завязаў. Ды і надакучыла, відаць: крычатовец ды крычатовец... Маладыя не такія ўжо, не разбіраюцца, хто адкуль. А старыя... Такі ўжо гонар!.. Хоць цяпер каторыя крычатоўцы, каго не спалілі ў вайну, лепей за нашых жывуць.

Мне вельмі хацелася ўбачыць Камцю, я перасіліў свой страх і пабег у Крычаты.

Гаптар, паголены, у вычышчаных старых хромавых ботах, у белай кашулі, зашпіленай на верхні гузік, выносіў з хаты клункі і ләжыў на воз. Там ужо ляжалі мяхі з мукою, цабэркі, стаяў куфар, абвязаны вяроўкаю. На мяне Гаптар нават не глянуў.

Заплаканая, папраўляючы на галаве хустку, выйшла з хаты невысокая, гарбаценькая гаспадыня, абаперлася на частакол і загаласіла.

— Сціхні! Горш не будзе. Такое ўжо дабро пакідаем і славу...— абураўся Гаптар.

— Што не было, а свой куточак,— плакала жанчына.

— А ты дзе там? — крыкнуў гаспадар.— Ідзі, са сваім кавалерам развітайся, бо паедзем ужо. Не развітацца няможна: местачковы кавалер!

— Зусім здурэў,— папракнула яго жонка.

— Хіба няпраўду гавару? — незалюбіў Гаптар, са злосцю глянуў на жонку.— Даўся мне іхні гонар!

— Калі што было...

З сенцаў выйшла Камця. Падышла да мяне і нічога не магла сказаць. Сёння яна зноў была бледная, худзенькая, зусім нямоглая. Стаяла і плакала.

З-за сенцаў выбег рудаваты сабачка, жаласна скуголіў і цёрся гаспадыні аб ногі. Тая дастала з кішэні акраец хлеба і падала яму. Шчанюк нават не нагнуўся да куска, глядзеў на кабету і скуголіў.

— І шчаня ростань чуе...— зноў заплакала жанчына.

— Ну, скарэй...— ужо не са злосцю, а спакойна сказаў Гаптар, адвярнуўся, нацягнуў брылёўку на вочы.

— На, на памяць,— прамовіла Камця і падала мне невялікі, загорнуты ў паперу ад шпалераў, пакуначак.

Я ўзяў падарунак і не мог сказаць ні слова. Маўчала і Камця, толькі з яе вока выкацілася і паплыла па шчацэ празрыстая, як

расінка, слязіна. Нешта ў душы маёй перавярнулася, заныла, і я не вытрымаў, заплакаў. Яшчэ мацней загаласіла і Камця.

— Ну, пайшлі, дачка, на воз,— падышоў і ціха сказаў Гаптар.— Усё роўна ехаць трэба...

— Камця і вы, цёця, я ніколі нічога благога не скажу на Крычаты,— прамовіў я.

— Дзякуй, сынок,— пацалавала мяне ў лоб гаспадыня.— Будзь шчаслівы і не забывай нас. І будзь заўсёды такі разумны... Дасць бог, яшчэ ўбачымся...— яна ўзяла Камцю за руку і павяла да воза.

Нечакана падышоў да мяне Гаптар, падаў моўчкі руку, моцна пацiснуў маю, не прамовіў і слова,зноў хутка-хутка пайшоў да калёс. Я зусім разгубіўся, стаяў і глядзеў, як яны паселі — гаспадар уперадзе, спіною да мяне, а жанчыны прымасціліся ззаду, тварам сюды.

Гаспадар цмокнуў, махнуў лейцамі, і конь крануўся. Заляскалі на возе цабэркі, зацерлася аб атосу пярэдняе кола, правае задняе кола было зусім крывое,ківалася ў бакі і шмаравала па лястцы.

Жанчыны сталі махаць рукамі — сваёй хаце і, відаць, мне. Следам за імі бег і шчанюк.

Я, разгублены і заплаканы, стаяў на чужым пустым двары і адчуваў, як штосьці вялікае, дарагое, моцнае выплывае з маёй душы, імкнецца туды, за лес, у якім схаваўся нагружаны клункамі воз...

## КАСЦЮМ

— Ідзі, мурза, вымыйся,— зласнавата сказала мне маці,— такога бруднага з сабою не вазьму, не хачу, каб чужыя людзі смяяліся ды пальцамі паказвалі.

Я даўно ведаў, куды збіраецца ісці сёння мама, вельмі хацеў пайсці з ёю і цяпер моўчкі выслухаў, як яна папракала мяне. Я знаў, што другім разам дасталося б ад маці матуза па спіне ці яна прыстрашыла б: калі я такі непаслухмяны, неахайны, то пакараюць — абстрыгуць маю чупрыну, будзе галава голая, як бубен, і ніколі мне новага, людскага чаго не купяць. Словам, з гэтай часіны возьмуцца за мяне, бо далі неразумную патолю, і я стаў вялікім раздуронцам...

Але маці цяпер не напомніла гэтага, не пастрашыла, і я ўзрадаваўся, пабег да студні, выцягнуў вядро вады. Выліў яе ў доўгае і глыбокае карыта, адарваў галінку палыну і адагнаў пчол, якія пачулі вільгаць і прагнулі асвяжыцца, лезлі да вады, тады намыліў «запушчаныя» рукі, «чорныя, з куранятамі» ногі і пачаў церці іх пяском і сухадзяроўкаю, заплюшчваючы ад болю вочы.

Калі рукі мае і ногі не так пачысцелі, як пачырванелі, зайшліся ад сцюдзёнай вады, я пакінуў драць іх і, ступаючы на пятках, вярнуўся ў хату.

— Людское дзіця адзенуць, і яно дзень чысценькае ходзіць, а ты ды Ганя... Не цэніце вы маёй працы, не шкадуеце рук маіх,— гневалася маці і здзірала праз галаву маю брудную кашулю,— толькі ведаю — дзянёчак цэлы ля вас таптацца: карміць, абмываць ды пераадзяваць.

Я стаяў, моўчкі нацягваў свежыя штонікі, апусціўшы галаву, слухаў маці: праўда была яе. Перад полуднем я ўжо мяняў майку, скідаў брудную і надзяваў чысценькую, але нядаўна, як прагнаў карову на пашу, сустрэўся са сваім лепшым сябруком, суседам Антонікам, капаў з ім «акопы», добра прапацеў, пасля мы не паладзілі і абсыпалі адзін аднаго пяском...

Нехаця я надзеў штонікі: не любіў іх. Былі яны выцвелый, кароценькія, на шлейках, зусім «дзяцінныя», а я даўно ўжо хацеў доўгія, па костачкі, з кішэнямі, «мужчынскія», каб у іх зацягваўся рэмень. Антонік, як і я, скончыў гэтым летам чатыры класы, але мае цёмна-сінія «дарослыя» порткі, хваліцца, пасміхаецца, што ў мяне такіх няма.

Я многа прасіў маці купіць і мне такія штонікі, бо ўжо, гаварыў ёй, не малы, саромлюся насіць «майткі» на шлейках ці шаравары на гумцы. Маці абяцала «расстарацца», але пасля забывалася, распорвала бацькавы зношаныя фрэнчы і штаны, выразала з іх цэлыя, не працёртыя кускі і сшывала з іх мне «портачкі», якія былі зноў без кішэняў. І я не быў рады ім, чакаў той любай часіны, калі буду мець «мужчынскае» новае адзенне...

І вось сёння гэты дзень настаў: маці збіраецца ісці ў суседняе мястэчка купляць мне касцюм. Гэта будзе мой першы «куплены» касцюм: сёлета я скончыў «школку» ў сваёй вёсцы і пайду «ў людзі» — у пяты клас суседняй дзесяцігодкі, і бацька з маці рашылі, што не выправяць мяне ў чужую вёску неахайным, горшым за людскіх дзяцей, «выкамбінуюць» мне яшчэ новыя чаравікі і паліто.

Дзед Караль часта гаворыць, што і цяпер я «разумны»: умею чытаць, пісаць, складаць вяскоўцам заявы, лісты, чытаю пра навіны ў газетах, і ён кажа, што мне ўжо і гэтай навукі хопіць, да нядаўняга ў вёсцы ніхто далей чацвёртага класа не вучыўся. Як бацька і маці, я дзеда не слухаю, хачу яшчэ вучыцца, мару стаць лётчыкам — высока і са свістам лётаць, збіваць варожыя самалёты, пускаць белы дым па небе і калі-небудзь пакатаць маму і сястрычку, яны ніколі не ляталі на самалёце, толькі што бачылі яго ў небе...

Я вельмі хацеў схадзіць у магазін і сам выбраць касцюм, які, як думаў, будзе харошы, самы лепшы на свеце, паможа мне стаць дарослым, цікавым, у ім я буду лепш вучыцца, даб'юся, чаго захачу, ды і людзям можна паказаць: ужо і мы можам купляць новае і пекнае адзенне, быць не горшымі за іншых... І я не мог дачакацца, калі настане такі дзень.

Маці пабурчала на мяне ды сціхла, падышла да люстэрка, надзела светленькую блузку, завязала ружовую хустку, паглядзелася і перамяніла адзенне — дастала з шуфляды другую, сіненькую, блузачку, з маленькімі, як мак, кропелькамі. Пасля ўзяла з-пад шафы туфлі, якія носіць толькі па нядзелях ці вялікіх святах, абмахнула іх ад пылу і абулася. Як ні гавары, трэба прыхарашыцца: ідзём мы ў Налібакі — там сельсавет, пошта, магазіны, жыве многа настаўнікаў...

Гляджу я на маму і любуюся: пекная яна. Невысокая, чорненькая валасамі і бровамі, кругленькая ў твары, вясёлая, пагпядаю я на яе і радуюся, што ні ў кога няма такой красуні мамы, ёсць адна такая на свеце, і тая толькі ў мяне... Падумаў я так і адчуў, што няма ў мяне ні злосці, ні крыўды, што ні ў чым яна не вінаватая, не прыдзіраецца да мяне, нядобрым стаў я сам і часамі гэтага не бачу.

— Ці не на дождж збіраецца? — калі мы выйшлі на двор, занепакоілася мама, зажмурылася і паглядзела на вадкае, нельга было глянуць, расплаўленае сонца, якое абложвалі маленькія чорненькія хмаркі.

— Не будзе дажджу,— заспакойваю я, стараюся вывесці маці з двара.— Пайшлі хутчэй!

— Можа, і раскалышацца, не будзе марасі,— сказала яна і падалася на брукаванку, азірнулася, глянула на новую нашу хату, якую паставілі тут, у вёсцы, толькі пазалетась — дасюль жылі на хутары ў цеснай дзедавай перасыпанцы. Сёлета перавезлі ў вёску і бацькаву кузню, калгас аплаціў нам за інструменты, і кузня стала калгаснай. Але бацька застаўся ў ёй кавалём, толькі цяпер ужо амаль не робіць нажоў ды сякер, а куе калёсы, правіць жняяркі і машыны...

Я пачыльгікаў за маці і весела засвістаў: хацеў, каб цяпер мяне ўбачыў Антонік — не часта і ён бывае ў мястэчку, хоць трапіць туды хоча, бо ўсе малыя дзеці стараюцца пабываць у чужой вёсцы.

Антонік, белавалосы, высокі і тонкі, як дубец, гэтаксама ўжо вымыты і пераадзеты, стаяў у сваім гародзе, нагінаў вялікую жоўтую галаву сланечніка і выбіраў з яе зярняты. Згледзеў нас, памкнуўся спытаць, куды іду, але ўспомніў, што мы цяпер «злуём», і не затрымаў мяне, адвязаў хустку з шапкі другога сланечніка (абвязвалі, каб не вылушчвалі зярнят вераб'і), адвярнуўся, як не ўбачыў, пачаў

скручваць недаспелую шапку. І я не зачапіў яго, адвярнуўся, узняў галаву і моўчкі прайшоў ля іхняга частаколу. Калі, выходзячы з вёскі, я не сцярпеў і азірнуўся, то ўбачыў: Антонік выйшаў са свайго двара на дарогу і глядзеў нам услед. Згледзеў я яго — і пашкадаваў, што не загаварыў з ім: мы ідзём «далека», а ён будзе дома, не ўбачыць таго, што я ўбачу хутка. Памахаў яму рукою, і Антонік заківаў, аж падскакаў, каб я яго лепей бачыў.

Маці ішла, маўчала, і я не ведаў, пра што яна думала. Я ўглядаўся на дарогу, сабе пад ногі. Бачыў шматкі пабялелага сена, бітае шкло, згубленую некім сасновую галіну, цяпер ужо абабітую, высахлую, раздушаны яблык. Але гэта мяне не цікавіла, як не цікавіць і адзінокі падголены, цудам не зрэзаны жнеяркамі высокі асот на аўсянішчы. Я нічога не заўважаю ў гэтым новага, бачу такое штодня, я глядзеў, ці не трапіцца на дарозе якая жалезіна, бо Антонік знайшоў тут учора гаечны ключ, а днямі раней — вялікую адвёртку з касцяною ручкаю: сюдою праходзіць за дзень многа машын, і , бывае, што-небудзь вытрасецца з іх. Вось і цяпер паблізу камбайн жне авёс, разварочваецца ля дарогі. Каб я пахадзіў там, то нешта знайшоў бы.

Я даваў Антоніку шапку салодкіх яблыкаў, але ён не прадаў мне адвёрткі, хваліўся, што аддасць суседу-шаферу, і той пакатае за гэта, нават дазволіць «пакіраваць».

Антонік любіць хваліцца, я... Я гэтаксама хачу, каб у мяне ўсё добра выходзіла, але мне неяк меней шанцуе, хоць сёння і я дачакаўся радасці, магу пахваліцца, як надзену неўзабаве новы касцюм.

Нечакана ў мяне ёкнула сэрца: убачыў у пыле абцугі. Я з радасцю падхапіў іх і — тут жа затрывожыўся: былі яны ў салідоле, і я адчуў, што вымазаў рукі.

Згледзела гэта маці, загневалася і не магла нічога сказаць ад нечаканасці, хацела раззлавацца, але не знаходзіла сярдзітых слоў.

— Выкінь! — спрабавала крычаць, але злосці ў яе так і не было.— Ну, чаму ты такі?.. Чысценькі, у людзі ідзём, а ты ўсялякае жалеззе бруднае паднімаеш. Будзь ты ўжо разумнейшы крыху.

Мне не хочацца выпускаць з рук такую знаходку, але я не мог выцерпець такіх слоў маці, шкадаваў і любіў яе — шпурнуў абцугі далей ад дарогі, у куст алешніку.

— Не відаць, што і мыўся,— сказала маці, гледзячы, як я пакручваў брудныя рукі, стараўся іх недзе схаваць, пасля падабраў шматок саломы, спрабаваў выцерці ёю мазуту, але рукі мае не пачысцелі: салідол расціраўся і ўядаўся ў цела.

Добры настрой мой пагоршыўся. Я захваляваўся, растрывожыўся, і мне стала крыўдна на самога сябе. Чаму я такі бесталковы? Калі ўжо сапраўды прыйдзе да мяне гэты «розум»?

Злаваўся я на сябе і адчуваў, як моцна паліць сонца, прыпарвае. Лес нагрэўся, прымлеў — цягне душным, густым пахам ад шыгалля, пяску і мурашніку. Смалою пахнуць зялёныя ігліцы, карэнні і залысіны на камлях сосен. Хтосьці зачасаў сякераю хвою — кропелькамі-слёзамі выступіла жоўтая сырыца-смала, прыцвярдзела, пабялела і пахне.

Даўнавата не быў я ў лесе, але адчуваю, што пачынае ўжо красавацъ верас: прыемна пахне салодкім цёпленькім мядком. Здаецца, прыгледзься добра і ўбачыш, як садзіцца на верасоўку пчолка, гойдаецца, нахінаецца ледзь не да самай зямлі і суне галоўку ў кветачку — п'е соладзь...

Ад гарачыні мітусяцца, медна звіняць разамлелыя авадні; даўно стаіць суш, пыліцца зямля — не зялёнымі, а шэрымі сталі кусты, вецер не можа стрэсці з іх пыл, як не здолее іх абмыць раса, вызеленіць і прасвяжыць. Чакае ўсё дажджу.

І тут я ўспомніў, што мы ідзём купляць касцюм, які будзе прыгожы, з доўгімі штонікамі, у якія можна будзе зацягваць пояс, у кішэні якіх пакладу палавіну свайго дабра — гаечкі, шпунцікі, складанчык. Да ножыка я зашмаргну матузок, які прывяжу і да штаноў — каб не згубіць.

Падумаў так — і адразу павесялеў, шпарчэй затупаў, паразважаў, што рукі памыю ў рачулцы, якая цячэ перад самым мястэчкам, і будуць яны чыстыя. Чаго так па іх бедаваць? Самае важнае, што мы ідзём у магазін, будзем купляць «мужчынскі» касцюм, якога я ніколі не меў, але які хутка ў мяне будзе...

Пясок цёплы, пульхны, і я мякка тупаю, маці стараецца ісці сцежкаю, дзе цвярдзей: там не паднімаецца пыл, і ёй лягчэй шанаваць, каб туфлі блішчалі, а не былі запыленыя.

— Не забалелі ногі? — усміхаецца маці.

— Не,— адказваю я, хоць і паколвае ад быстрае хады ў лытках.

— Напомні, каб кніжак паглядзелі, а то магу забыцца,— просіць маці.— Хоць усё роўна, купляй ці не купляй, толк з цябе малы, вучыцца не хочаш. Троек вунь колькі.

— Не,— адмаўляюся я.

— А кім жа ты хочаш стаць?

— Лётчыкам.

— Ого! Хоць бы за якога шафера вывучыўся б! А Антонік твой кім думае быць?

— Камандзірам-пагранічнікам.
— Ого, начальнікамі хочаце стаць,— кажа маці,— хоць цяпер мала думаеце, што трэба меней мячык ганяць, а болей кніжак чытаць.
— А настаўніца нам гаварыла: каб быць дужым, трэба болей бегаць, хадзіць,— апраўдваўся я.
— Трэба,— згадзілася маці,— але розуму вялікага ад бегатні не набярэшся. Трэба чытаць, калі хочаш лётчыкам стаць. Я хацела настаўніцаю быць, дужа многа чытала, што толькі пападала ў рукі, але бацькі далей чацвёртага не пусцілі вучыцца: сям'я, сказалі, вялікая, няма ад каго вучыць цябе, налаўчыся во на швачку, дык скарэй толк убачым... Паплакала я ад крыўды і пачала хадзіць да адной тутэйшай швачкі, глядзець, як яна шые. За месяцы два вывучылася і з таго часу абшываю вёску... У навуку вы ўжо ідзіце, мы з бацькам дарогі вам заступаць не будзем і знойдзем, з чаго вучыць.
Маці азіраецца, і мы, прыслухаўшыся, чуем, як непадалёку грукоча па карэннях, ляскае бартамі, падтрасаючыся на выбоінах, машына. Прыпыняемся і чакаем яе, бо вельмі хочацца пад'ехаць, хутчэй трапіць у магазін.
Веска наша маленькая, у адну вулачку, у баку ад вялікіх дарог, і аўтобус да нас не заглядвае. Вось і мусім хадзіць у школу ці ў магазін за колькі вёрст у суседняе мястэчка.
Шафёр трапіўся добры, прыпыніў машыну і дазволіў нам пад'ехаць. Мы залезлі ў кузаў, пасталі. Калі паехалі, нас трэсла, кідала, біла бочкаю, якая шалёна качалася, але мы не падпускалі яе да сябе нагамі, радаваліся, што едзем.
Мігам праскочылі лес, рачулку, у якой я збіраўся памыць рукі, і ўехалі ў Налібакі. Мястэчка гэтае вялікае — шырокі пасярэдзіне пляц, тут стаіць высокі помнік, адсюль разыходзіцца многа вуліц, па якіх багата дамоў, садоў, магазінаў. Кожная вуліца мае сваю назву, а дамы пазначаны нумарамі.
Я люблю бываць у гэтым мястэчку, але заўсёды, як і цяпер, калі мы злезлі з машыны і пайшлі, губляюся: здаецца мне яно чужое. Я здзіўляюся, як тут дзеці могуць добра гуляць, у нашай вёсачцы болей волі...
Мы абышлі помнік і пайшлі ўніз, на Пяскі, да сельмага. Маці вітаецца з каторымі жанчынамі, загаворвае, і я вітаюся, усміхаюся, хоць нікога тут не ведаю.
У сельмагу мала людзей, цяпер жнівень — хто сянуе, збірае ягады ці першыя грыбы — часу гуляць няма. Я гляджу на полкі, набітыя адзеннем, і ў мяне разбягаюцца вочы: колькі сукенак, плашчоў,

касцюмаў! Тут цяжка і выбраць, і я баюся, што мне трапіць не самае лепшае...

Я пачаў сам углядацца, каб знайсці прыгожы пінжачок. Прайшоўся колькі разоў ля прылаўка і прыпыніўся, дзе вісеў чорненькі касцюм, паказаў яго маці.

— Сама бачыла,— ціха сказала яна,— дарагі вельмі...— прамовіла і паглядзела на шэры, у жоўтыя палосачкі.

Той мне зусім не спадабаўся, здаўся выгаралым, выцвілым, самым горшым на свеце.

Калі маці больш не стала глядзець на яго, я зарадаваўся, што і ёй не спадабаўся гэты касцюм. Яна абышла колькі разоў і нічога не выбрала. Я насцярожыўся: яшчэ скажа, што нічога добрага няма, касцюмы благія, а грошы вялікія, не будзем купляць, перашыем з бацькавага рудога, яшчэ паносіш сёлета. А мне так ужо надакучыла насіць гэтыя цесныя, паношаныя, перашытыя касцюмы...

— Што вы хацелі? — спытала ў мамы магазіншчыца.

— Ды касцюмчык майму кавалеру трэба,— збянтэжылася мама.

— За колькі рублёў?

— Таннейшы які...

— Таннейшы ды пякнейшы,— кажа і ўсміхаецца магазіншчыца, перакладае на прылаўку кіпы адзення і дастае спадыспаду густа-сіні пінжачок.

Маці ўзяла яго, але сказаць што не спяшаецца, аглядае рукавы, падкладку, гузікі.

— Памерай,— кажа потым і надзяе на мяне пінжак, круціць мяне ва ўсе бакі і аглядае.— Здаецца, добра, сіненькі, надта мазацца не будзе, не тое што светлы які. Плечыкі во не паднятыя.

Магазіншчыца ўсміхаецца і падае «мужчынскія» штонікі, я хачу сам узяць іх, але мяне перапыняе маці:

— Не бяры сваімі рукамі.

— Як на яго,— кажа магазіншчыца,— лепшага не падбераце.

— Вымажа за дзень, падзярэ за тыдзень,— цяпер усміхаецца і маці.

— Ды яны, дзеці, такія. У мяне чацвёра, дык не набрацца ні касцюмаў, ні абутку,— згаджаецца магазіншчыца.

Я слухаю іх і не веру, што магу не толькі падраць, але нават выпацкаць такі чысценькі, з прыемным пахам касцюм. Я не прылягу ў ім, прыйду са школы, зніму яго, вычышчу і павешу ў шафу, дома буду бегаць у старым. Я сёлета пастараюся добра вучыцца, лепш, як летась, каб стаць лётчыкам...

Маці дае магазіншчыцы грошы, знімае з мяне пінжак і азіраецца: у магазін заходзіць высокі вусаты мужчына.

— Ой, якія краслатыя штаны табе, хлопец, купілі,— сур'ёзна кажа ён.— Я такіх краслатых не насіў бы.

Я гляджу на яго, разгубліваюся, адчуваю, што вочы мае туманеюць, бо ў іх збіраюцца слёзы.

— Не слухай яго, хлопчык, дзядзька смяецца,— суцяшае мяне магазіншчыца, бярэ пінжак, штаны, абгортвае іх паперай, звязвае вяровачкаю — Харошанькі касцюмчык... Насі на здароўе і вучыся добра.

Я забываюся ад шчасця сказаць якое добрае слова, толькі калі маці штурхнула ў бок, апомніўся, прамовіў: «Дзінькую». . -

Маці папрасіла магазіншчыцу паказаць блакітную хустку, узяла яе, разгледзела, відаць, хацела купіць, бо доўга не аддавала, але нехаця палажыла на прылавак, апраўдалася:

— Тоненькая вельмі...

Мы развіталіся з магазіншчыцай і вусатым дзядзькам-жартуном і выйшлі на двор. Парыла, было душна і ціха; ніводзін лісточак на бярозах не кратаўся, маўчалі, млосна блішчалі драты, вакол стаяла прыглушаная разамлелая ціш. Я прыклаў руку да грудзей і чуў, як радасна тохкае сэрца.

— Не паспеем мы, Стась, да навальніцы зайсці дадому,— занепакоілася маці,— а пра кніжкі і забыўся, лётчык... Пабеглі хутчэй.

Мы подбегам падаліся ў кнігарню, з яе — у прадуктовую лаўку: трэба купіць булак, цукру, запалак, цукерак маёй сястрычцы — лічы, не быў у мястэчку, калі вярнуўся без гасцінцаў...

Дождж, уліўны, цёплы, грыбасей, дагнаў нас у лесе, абрынуўся як з вядра. Пасвяжэла, пацягнула ветрыкам, пасля бліснула, асляпіла маланка, а за ёю звонка ляснуў гром. Маці зняла з ног туфлі, і мы сышлі з дарогі, сталі пад густой маладою елкай. Увачавідкі змыўся з лесу шэры пыл, вакол усё азелянілася, сабраліся ў спадзінках мутныя ручайкі, падхапілі і панеслі ігліцы, растрэсенае сена.

— Бацька на рабоце, мы гуляем, а сена мокне,— бядуе маці.— Не зусім добра ўсё выйшла... Пападзе нам сёння. Хіба як папяросамі бацьку ўлагодзім, каб не крычаў. Ну, пакажы...

Я падаю ёй пакунак. Яна развязвае матузок, разгортвае паперу і разглядвае.

— Добры касцюмчык! — радуецца маці.— І колер харошы, і падкладачка мякенькая, і моцненькі. Я таго не мела ў твае гады... Шануй толькі.

— Ага,— згаджаюся я.

— Мы адзяём, кормім, а ты вучыся... Цяпер вучыцца можна: хочаш на настаўніка падавайся, хочаш на лётчыка старайся. Ты шчаслівы, што нарадзіцца ведаў калі...— кажа маці, задумваецца і як бы сумуе аб нечым.— Ну, стала далека грымець, то падаліся, сынок. Не з цукру, не растанем.

Мы выйшлі з-пад елкі, пабеглі па сцежцы, цёплых мутных лужынах, і я чуў, як дробна, гулка шалясцяць па маім пакунку празрыстыя чыстыя кроплі дажджу.

1973

## ЖНІВЕНЬСКІЯ ЛІЎНІ

Алена Пятроўна, пажылая, маці трох дачок і бабуля міленькага «жэўжыка» Толі, яшчэ сама з маладою красою, «вялікая начальніца», занепакоілася. Не пра сям'ю, не за сябе,— для гэтага ў яе заўсёды не хапала часу. Яна затрывожылася — у каторы раз! — па рабоце: у пачатку жніўня нечакана палілі дажджы. Зацабанілі не ў пору: толькі ўзяліся жаць, выпусцілі на поле ўсе камбайны, жняяркі, абяцалі хутка зжаць жыта, не даць абсыпацца ніводнаму каласку, як серадою, на другі дзень жніўня, прыпарыла, стала так душна, што не было чым дыхаць. Незаўважна з-за небакраю вынырнулі маленькія, цёмныя, зусім не дажджавыя хмаркі, не паказвалі нават на морась, як пасля полудня яны расплыліся, пашарэлі і зацягнулі неба. Тады стала відаць, што будзе лівень.

Але спачатку пасыпаў густы і буйны град. У адно імгненне зламаў, зляжыў жыта. Тады ўжо забухаў гром і разгулялася маланка, абрынуўся дождж. З неба, якое стала шэрым, амаль сівым, лілося праз колькі дзён — на дарогах і лагчынах сабраліся лужыны, паднялася вада ў рэчцы, выплыла з берагоў, затапіла сенажаці. Плавалі па вадзе пракосы, гарэла і прэла ў копах сена.

Алена Пятроўна Тышкевіч — колішні аграном — добра ведала, што значыць — дождж у жнівень. Яна выехала з горада, гойсала на «казле» па раёнах і бачыла, як перажываюць людзі, клянуць надвор'е, бяруцца рукамі за галовы, гледзячы на палеглае жыта. Нічога благога на людзей нельга было сказаць, думала яна, калі гаварыла з імі: усе стараліся. Але ж пагоды не закажаш... Хоць нешта будзе: дзе цішэй, дзе вышэй, машынамі, рукамі, але сажнецца. Абы не аблажыла непагадзь надоўга, не сапрэла і не прарасло зерне.

Алена Пятроўна вярталася дамоў неспакойная: хацелася, каб усё было добра, як думалася. Ехалі ў «козліку» ўдваіх: шафёр, малады хлопец, толькі сёлета з войска, і яна. Выбіралі палявыя ўбітыя сцежкі,

любаваліся на загоны зялёнай бульбы. Засмучала толькі тое, што нават з кабіны відаць былі жукі на ёй. Падумала: «Прыбілася во халера...»

З жалем глядзела на высокую, буйнакалосістую, але зложаную збажыну, глядзела і не заўважыла, як ускочылі ў вёску. Дамы былі адзін пад адзін — новыя, у нямецкі вугал, з вялікімі выцацкаванымі верандамі, абгароджаныя жоўтым смалістым частаколам. Гарадзілі нядаўна: збоку платоў на высокай траве яшчэ ляжала рудая скручаная кара, валяліся абрэзаныя нажоўкаю верхавінкі-калочкі.

Вуліца была пясчаная, ішла спадзінай — на ёй збіралася вада, сплывала з двароў і агародаў, нават платы стаялі на вадзе, таму і падгнівалі знізу. «Газік» буксаваў — залятаў у яміны, выбітыя машынамі.

«Не могуць пяску насыпаць, падняць дарогу вышэй»,— падумала Алена Пятроўна і старалася прыпомніць, які тут саўгас — за многія гады работы на сваёй пасадзе ведала амаль усе сёлы вобласці.

«Газік» ускочыў у глыбокую каляіну і стаў, не мог выбрацца з гразі. Шафёр і назад яго падаваў і рваў уперад — выехаць не мог.

— Не выберамся, Пятроўна,— сказаў ён вінавата.— Трэба шукаць, каб хто выцягнуў.

— Што ж ты так? — незадаволена прамовіла яна.

— Што я! — апраўдваўся ён.— Дарогі... Трэба ісці па трактар...

— Не я ж пайду,— буркнула Алена Пятроўна, хоць падумала: хлопец не вінаваты, чаго на яго злавацца?

Шафёр адчыніў дзверцы, хацеў пераскочыць лужыну, трапіць з машыны на сухі грудок, але не дастаў да яго, плюхнуўся ў ваду.

— Эх, ты, мужчына! — усміхнулася Алена Пятроўна.— Падкаці камень, я ж не буду скакаць.

Хлопец паслухаў, скаціў з грудка ў ваду валун, укінуў яшчэ колькі дробных каменняў, але яны патанулі, нават не паказаліся з вады.

«Трэба пашарсціць іх крыху, не могуць сабе дарогу замасціць»,— рашыла Алена Пятроўна, адзела балоневы плашчык, які дасюль ляжаў у машыне на парэнчы, вылезла з кабіны і скочыла на камень. Трымаючыся за плот, стаўляючы ногі між частаколін, перайшла па жэрдцы лужыну; гаспадар, што ставіў тут плот, быў прадбачлівы: у гэтым месцы радзей прыбіваў калочкі.

Алена Пятроўна падумала, што не мокнуць жа ёй на двары, трэба зайсці ў бліжэйшую хату, паглядзець, як жывуць людзі, пагаварыць з імі, папрасіць, каб паклікалі тутэйшага старшыню сельсавета. Не паспела адчыніць варотцаў, якія вялі да новага вышаляванага дома,

як да яе кінуўся сабака, зароў, заліўся моцным, хоць затыкай вушы, брэхам.

З хаты ніхто не выйшаў. Алеца Пятроўна пастаяла, збаяўшыся сабакі, і павярнула да суседняга, больш старога дома. Пад страхою сенцаў гэтай хаты стаялі, звесіўшы галовы, куры, на двары ляжала доўгае карыта, і ў яго налілося поўна вады.

Алена Пятроўна зайшла ў сенцы, пастукала і ступіла ў хату, спыталася:

— Можна?

— Проша,— пачуўся з другой палавіны мужчынскі голас.

Яна стрэсла з балоневай хусткі ваду, павесіла яе на цвічок, села на лаве, агледзела хату. Спадабалася: сцены былі чысценькія, нядаўна пафарбаваныя бялюткім мелам, мясцінамі нават былі знаць палосы ад густых шчацін, беленькая была столь, чырвоная, зіхаткая падлога, зялёная, без ніводнай плямінкі ад дыму, стаяла печ. Вілкі стаялі на чыстым лісце паперы.

Тут жа на кухню зайшоў невысокі, са светлымі бровамі, рыжымі вусамі, статны для сваіх гадоў мужчына. Здаецца, яна недзе яго бачыла. Гаспадар гэтаксама пільна паглядзеў на яе, прывітаўся.

«Можа, прыходзіў калі з якою просьбаю? Ці мала бывае за дзень людзей, усіх не запомніш».

— Во зазлавалася неба,— сказала яна.

— Зазлавалася дык зазлавалася,— прамовіў мужчына, а яна падумала: не ведае яе, каб знаў, то так смела не трымаўся б...

— Зусім злажыла жыта,— сказала яна.

— Злажыла,— пашкадаваў гаспадар.— Гэтакі град смаляў... І дождж во колькі ўжо лье, аж зямля перастала прымаць ваду.

— Хай бы на колькі дзён пазней ліло.

— Неба сляпое, у яго свая работа,— усміхнуўся мужчына.— Прыйшла яму пара, вось і разгулялася...

— Ну, як вы жывяце? — спыталася Алена Пятроўна.

— Ды памаленьку,— сказаў ён і сеў на другім канцы лавы.— Маракаваць няма на што. Здаровыя, сілу яшчэ маем — стараемся працаваць. На плату не крыўдзімся...

— Калі што — гаварыце,— прамовіла яна.— Я з вобласці...

— Ды ведаю, Алена Пятроўна...— сказаў мужчына і не ўсміхнуўся, нават не варухнуліся яго́ныя вусны, не міргнуў вокам. Сядзеў ціхі і спакойны.

Яна ўстрывожылася, адчула, як мацней забілася сэрца, не змагла вытрымаць гэтага спакойнага погляду, разгадала ў ім глыбокую журботнасць.

— Ты? — выдыхнула яна.

— Можа і не я, Алена Пятроўна,— гледзячы на яе, прамовіў ён, і яна не зразумела: злуе, дакарае, пасміхаецца?

— Чаго ты тут, за пяцьдзесят вёрст? — здзівілася яна.

— Хату купіў, жыву…

— Сяргей... Як жа цябе?.. Ты прабач...

— Ды нічога,— сказаў ён.— Па бацьку і лішне называць, мы не прывыклі... А так Карачун я, бацька мой Адамам зваўся.

— Ага, дзякую,— яна збянтэжылася, успыхнула чырванню.— Цяпер і сама ўспомніла: Сяргей Карачун. Ды ты ж знатны чалавек...

— Які там знатны! — махнуў ён рукою, як засаромеўся.

— Ды ты ж добры садавод, я да ўзнагароды цябе летась прадстаўляла. Каб ведала... ну, каб помніла, што Карачун— гэта ты, то большай дабівалася б...

— Хопіць мне і гэтай.

— І ў дакладах сваіх я часта цябе хвалю.

— Хваліце...

— І ведаў, а маўчаў...— прамовіла яна.

— А што я магу сказаць, Алена Пятроўна,— пацісnуў ён плячыма,— я працую, як заўсёды, стараюся.

— Называй мяне Алёнаю,— папрасіла яна.

— Вы адно, а я — другое...

— Ладна табе,— махнула яна рукою,— некалі, калі маладая была і ты таксама, то называў.— Сказала і ўсміхнулася: помніла, што ніколі ён не клікаў яе так.

— Годзе вам смяяцца,— як папрасіў ён.

— Ды не смяюся, Сяргей,— яна перастала жартаваць.— Я тады дурная была, смяялася... А ты ўсё такі...

— Ды не мяняюся,— гаварыў ён і глядзеў у стол.— Жыву, як бог вучыць.

— Добры твой бог,— сказала яна.— А душа твая яшчэ лепшая... Залатая ў цябе душа, Сяргей, толькі з гадамі адчуваеш гэта...

— Гаворыце вы,— збянтэжыўся ён,— вы самі дужа добрая...

— Толькі не для цябе я добрая,— сказала яна,— табе дабра таго я найменей прынесла.

— Мала што было,— прамовіў ён,— але рукі ў вас залатыя, галава разумная, язык ведае, што гаворыць... Вось за гэта і любяць вас людзі.

— Калі так, то дзякую за цёплыя словы,— сказала яна і ўспомніла, як яе, маладую, прыгожую, толькі што пасля інстытута, прыслалі

працаваць у калгас, дзе жыў Сяргей. Ён і тады, гадоў дваццаць таму, быў садаводам, гэтаксама быў малады, статны і вельмі сарамлівы.

Ёй сказалі, што гэты хлопец закахаўся ў яе, на сходах не зводзіць з яе вачэй, хоць і стараўся не сутыкацца. Яна пасмяялася з гэтага, паслухала сваіх сяброўак і сама стала прыходзіць у сад, жартаваць: «Ну выберы мне, жаніх, лепшае яблычка»,— ён бянтэжыўся, але даваў ёй папяроўкі. Яна папракала, што пашкадаваў, пачаставаў самым горшым, пагражала, што не пойдзе за яго замуж. Ён хмурнеў, гаварыў толькі: «Годзе вам смяяцца...»

Галаву тады ёй затлуміў дырэктар суседняга саўгаса. Малады, прыгожы, што лялька, ветлівы. Ён ласкава называў яе «Пятроўна, пятровачка мая», стараўся вазіць яе ўсюды на сваім «казле» адзін, без шафера. Часта заварочваў у лес, паказваў, дзе растуць чарніцы, вучыў, як шукаць баравікі, заводзіў яе ў такі гушчар, з якога і выбрацца цяжка было. Верасовых баравікоў яна так і не навучылася знаходзіць, а галава закружылася ад «чыстагаляснога водару», і неўзабаве Тышкевіч стала цяжарная...

Вось тады яна і перастала жартаваць. Дырэктар выкручваўся, не хацеў браць яе замуж, стараўся даказаць, што дзіця не ад яго, а ад Сяргея, гаварыў, што ўсе ведаюць, як яна сама хадзіла да таго ў сад. Яна плакала, пагражала, што не будзе жыць без яго... Тады ён узяў яе, хоць пажылі яны нядоўга: яна не магла выцерпець, што ён вытвараў, і сама пазней прагнала яго. Цяпер у яе быў другі муж, добры чалавек і бацька...

— Ну, як жывеш, Сяргей? — апамяталася яна.

— Я ж гаварыў — добра...— прамовіў ён.

— Ах, так! — спахапілася яна.— Ажаніўся?

— Ажаніўся.

— Хто твая жонка?

— Даяркаю тут працуе,— асмеліўся, глянуў на яе.— А вы як жывяце?

— Працую...

— Што працуеце, ведаю,— усхвалявана сказаў ён.— А як так жывяце?

— Усяляк, Сяргей,— уздыхнула яна.— Ем хлеб траякі: чорны, белы і ніякі. Ох, Сяргей, Сяргей! Што робіць маладосць ды дурная галава! Ужо і забылася...

— Так, памяць кароткая,— згадзіўся ён,— але я ўсё помню. Як вы паехалі... І я тады выбраўся адтуль, прыблукаў сюды.

— Ты тады адзін, мусіць, і шкадаваў мяне,— прамовіла яна, пацерла вочы, глянула на яго.— Дзеці маеш?

— Двое хлопцаў,— сказаў ён.— Пецця і Міша.

— Малайчына. У мяне толькі дочкі.

— Які ж я маладзец? — усміхнуўся і ён.— Каб быў удалец, то і дочак бы меў, а то сыны...

— Ты ж чуў, я развялася з тым...

— Чуў,— ён апусціў галаву, пачаў качаць па стале маленькую крошку хлеба.— У яго трэцяя ці чацвёртая ўжо... Сустрэліся летась, насміхаецца з мяне і вас. Блага, кажа, ты яблычкамі частаваў, не тыя трэба былі яблычкі... Я ледзь стрымаўся.

— Ох, Сяргей, Сяргей! Што жыццё робіць...

— Робім мы,— сказаў ён.

— Можа, і так,— згадзілася яна, падумала, што ляпнула абы-што, зусім не апраўдалася за сваё ранейшае, і ён, відаць, гэта зразумеў, але яна зноў недарэчы спыталася: — Дык добра жывеш?

— Жыць ёсць дзе, есці хапае,— сказаў ён.

Алена Пятроўна глянула ў акно і ўбачыла, як пад'ехаў самазвал, яе шафёр прычапіў трос да яго, і грузавік легка, як каляску, выцягнуў «казла». Шафёр адчыніў дзверцы і засігналіў — трэ было выходзіць.

— Ты ўжо прабач, калі можаш.

— Ды ладна. Што ўспамінаць?..— спакойна адказаў ён.— Не пара я вам быў... Каюся толькі, што зусім сляпы быў, жартам вашым верыў...

— Не гавары так,— папрасіла яна.— Ты... Але добра, што ты шчаслівы, дзяцей маеш, з жонкаю ў ладзе жывеш. Ну, бывай! — яна падала яму руку, паціснула.

— Мо пачастую я вас чым? — спытаўся ён.

— Не, дзякую, Сярожа,— прамовіла яна, пажадала яму і сям'і здароўя, шчасця і выйшла на двор, дзе несціхана ліў дождж.

Сцепанулася ад холаду, угнула галаву і, стомленая, пастарэлая, паплялася да машыны. Па-ранейшаму стаялі пад страхою мокрыя куры, карыта было поўненькае, вада з яго цякла цераз краі, збіралася ў лужыну.

— Ну, як твой? — пачула, як гаварылі шафёры.

— У мяне яна...— адказаў яе вадзіцель.— Пайду лепш у таксісты ці на аўтобус...

«І ён...— падумала Алена Пятроўна.— І дождж гэты...» — і ўбачыла, як вуліцаю бег чарнявы хлапчук, трымаў у руцэ тонкі калок і ляскатаў ім па частаколінах, пакуль не завярнуў у Сяргееў двор. «Пецька, ці як яго...» — падумала і сказала шаферу:

— Паехалі, Віктар Андрэевіч, паехалі, браток.

Шафёр уздрыгнуў, здзіўлена глянуў на яе, нават разгубіўся: яна ніколі так, па імю і бацьку, не называла яго.

1971

## АСЕННЯЕ ЛЕТА

Бывае такая нядоўгая, але вельмі прыкметная пара на дварэ— асенняе лета. Стаіць яно на пачатку верасня, калі яшчэ не паслабела святло, не паспела астудзіцца паветра і трымае летняе цяпло зямля. Тады некалькі дзён гэтак жа горача, як і ў чэрвені ці ў ліпені, бо няма яшчэ халодных скразнякоў і нудных дажджоў-аблажнікаў. Морась — цёплы пырскуль ці ўліўны грыбасей — часта нарываецца, але яна хутка праходзіць, мякка парыць, прымушае красаваць у лесе зямлю.

Цёпла, утульна ў асенняе лета, але ўжо вока журботна заўважае жоўта-рудаватае лісце, чырвані ў якім большае з кожным днём, бачыць апусцелыя сухабелыя палі, пацукравелыя яблыкі ў садах і самотную пажаўцеласць на дварэ, якая надта відаць, наганяе незразумелы сум, калі сонца прыхаваецца за хмару і свеціць адтуль, свеціць, здаецца, ярка, але неяк па-жоўтаму самотна. Журбота і смутак прыходзяць, мусіць, ад трывогі за цяпло, зеляніну і кветкі, ад трывогі перад блізкімі халадамі і нізкімі сібернымі дажджамі.

Гэту пару — асенняе лета — Вольга Пятроўна вельмі адчула сёлета, адчула на саракавым годзе свайго жыцця. Дасюль, здаецца, і не заўважалася надта, што там на дварэ — канчаецца лета ці ідзе восень, пацяплела ці крыху пахаладала. Важней за ўсё была праца, сям'я — муж ды дзеці — і свая маладосць. А вось сёлета, бадай упершыню, прыйшла трывога, што ўсё на свеце мяняецца, прыходзіць і адыходзіць, але толькі не маладосць. Нечакана яна прыйдзе, закрасуе, успеніць кроў, ад якой закружыцца галава, затуманіцца розум — тады, можа, і прыйдуць цудоўныя хвіліны кахання ды шчасця,— але нечакана — што і не заўважыш — пасля атухне, хвалюе, як даўні ўспамін, ад якога часамі і зноў палягчэе, абудзяцца радасць, нейкія няспраўджаныя жаданні ды мары пра недасяжна прыгожае і несправабаванае, а пазней усё нечакана і гэта адыдзе, знікне — і добра чуецца, што табе ўжо сорак, што няма маладой ношкі на плячах, якая зусім не чулася дасюль, бо была вельмі лёгкая, нячуйная, як крыллі, можа, затое другая — пажылая — пачала адчувацца адразу...

Вольга Пятроўна ляжала на канапе і адпачывала. Толькі што яна вярнулася дахаты са школы, праўдзівей сказаць, прыйшла не са

школы, а з поля, бо дзеці ўжо другі дзень не вучыліся, а капалі ў саўгасе бульбу. Вярнулася, памылася, пад'ела і прылегла адпачыць, адчуваючы, што доўга не прыйдзецца паляжаць, бо трэба ісці і выбіраць сваю бульбу. Здзіўлялася, што цяпер так хутка пачала стамляцца, чаго раней з ёю не было.

Цішыня стаяла ў іх вялікай хаце. Надта ціха зрабілася нядаўна, калі паехала вучыцца ў горад дачка — закончыла дзесяцігодку і паступіла ў інстытут. Сын ужо з год служыў у войску. Дома была толькі яна, Вольга Пятроўна, ды муж-настаўнік, які гэтаю хвілінаю хадзіў недзе па двары.

Яна падумала, што незаўважна надта, хутка выраслі і разышліся дзеці, што іх ужо не збярэш, не ўтрымаеш тут, дома, а сама яна, маці, не такая старая, магла б яшчэ радзіць дачку ці сына, мець, словам, дзіця, з якім было б і цяпер і некалі весялей. Магла б, каб не было сорамна не так перад людзьмі, як перад сваімі дарослымі дзецьмі, якія ўжо, як яна адчувала сваім матчыным і жаночым сэрцам, маюць маладыя трывогі, жаданні, перажываюць пару першага кахання, і яе, пажылой маткі, калі яна родзіць, не зразумеюць, пачнуць калі не папракаць, то саромецца. Ды і муж, саракасямігадовы мужчына, як яна адчувае, не хоча гэтага, думае, мусіць, што яны ўжо старыя...

Вольга Пятроўна выцягнула даўгаватыя ногі, выпрамілася, убачыўшы, што яна яшчэ надта не пастарэла, не страціла стройнасці — высокія во, але не апалыя, тугаватыя грудзі, зусім не поўны жывот, ладныя загарэлыя ногі, на якіх толькі дзе-нідзе сінеліся падпухлыя жылкі. Не пастарэў і твар — высокі, мала маршчыністы лоб, жывы агеньчык у вачах, чырванаватыя шчокі. Толькі ў куточку вачэй ды вуснаў збегліся густаватыя зморшчакі, але яны яшчэ надта не старацъ яе, бо відаць на яе твары былая яе краса. Так, яна некалі была вялікая красуня, мела многа хлопцаў, выбірала, мяняла іх, а вось выйшла замуж чамусьці за невысокага, не вельмі і сімпатычнага Анатоля, які, як пасля агледзелася, і старэйшы быў за яе, і не такі разумны, як здавалася, але быў, праўда, добры настаўнік і гэтакі ж добры муж. Ціхманы і паслухмяны. Што яна хацела, думала, ён тое век і рабіў, слухаўся яе. Здаецца, толькі вельмі раўнаваў, мучыўся, як яна ў школе пасміхалася з калегамі-настаўнікамі ці вытанцоўвала ў клубе з прыезджымі шафёрамі, але мучыўся моўчкі. Можа, нават і таму, што яна жартавала з чужымі мужчынамі, любіла закружыць ім крышку галаву, прымусіць іх і ўкахацца, у яе, паспрабаваць залецацца, але ніколі большага чаго яна не дазваляла.

Анатоль, які гэтаксама быў з ёю сёння на полі, вярнуўшыся дахаты, пераапрануўшыся і перакусіўшы, не прылёг, а хадзіў недзе па

двары. Ці не падбіраў у садзе ападкі — сёлета чамусьці яблыкі вельмі чарвівелі і абвальваліся. Іх не паспявалі есці — і крышаноў з іх насушылі, варэння наварылі, а цяпер дык не ведалі, дзе іх дзяваць.

Пачуліся крокі ў сенцах — ішоў у хату Анатоль. Ён прыпыніўся на кухні, паставіў, мусіць, ля парога кош з ападкамі і ішоў сюды, у лепшую палавіну, дзе стаяла канапа, шафа з кнігамі, тэлевізар і стол.

— Мала што сыплюцца яблыкі, дык яшчэ адна напасць на іх...— сказаў ён, трымаючы ў рудэ вялікі жоўта-зялёны яблык з глыбокімі норкамі, у якіх была відаць чарнаватая труха.

Вольга Пятроўна, лежачы, зірнула не на яблык, а на мужа — невысокага, лысаватага і з густымі маршчынамі на вузкім, здаецца, зусім нясвежым, нават старым, твары, убачыла, што ён стаміўся. Яна пашкадавала яго, паклікала да сябе.

Ён паасцерагаўся, што ідзе па ходніку ў туфлях, можа натрэсці пяску, але бачачы, што яна кліча, зморшчыўся, падышоў і прысеў, стараючыся на яе не пазіраць.

— Сарокі клююць здаровыя жоўтыя антоны,— яшчэ раз заклапочана сказаў ён.— Гэта ж ніколі такога не было, каб птушкі яблыкі на дрэвах дзяўблі...

— Прыляж,— ціха прамовіла яна, пасунулася да сцяны, даючы яму болей месца ля сябе.

— Можа, пойдзем ужо на агарод,— сказаў ён,— буду падкопваць, а ты будзеш выбіраць.

— Выберам тую бульбу, нідзе яна не дзенецца,— адказала яна,— яшчэ вунь толькі пачатак верасня на дварэ. Чаму ты еў часнок?

— Вецер прахапіў,— прамовіў ён,— дык вось заклаў у нос, каб прагнаць прастуду. І з'еў пару драбкоў.

— Які ты нехарошы! Толькі сябе аднаго глядзіш...— яна прыгарнулася да яго.— Але прылашчы...

Ён як засаромеўся, што яна так гаворыць, паводзіць сябе як зусім маладая, азірнуўся, бы хто быў у хаце, а тады злёгку, каб паслухацца, не зусім ахвотна правёў далонню па яе русявых валасах.

— Як яна там, наша Ірынка? — нечакана спытала яна.

— Будзе вучыцца, як і мы некалі вучыліся, як і цяпер вучацца яе аднагодкі.

Пакуль ён гэта гаварыў, яна паспела ўжо ціха заплакаць — зажурбоціцца па дачцэ. Бязгучна плакала і адчувала, што муж гэта чуе, але не спяшаецца супакоіць, пацалаваць яе, як некалі, у маладыя гады, адразу ж супакойваў і цалаваў, а ляжыць побач моўчкі, добра ведаючы, што яна крыху пахліпае, выплача свае хуткія жаночыя

слёзы і сама супакоіцца. Ёй стала балюча, што ён такі — спакойны і па-мужчынску чарстваваты.

— Не можа ж яна век быць з намі,— сказаў яшчэ ён, прамовіў зноў надта цвяроза і сухавата.— Пайшлі, бо нам з табой удваіх шмат работы.

І яна, слухаючы яго, паплакала, напраўду супакоілася, што дачцэ трэба было выязджаць адсюль, бо трэба вучыцца, думаць пра будучае, а ім во трэба застацца ўдваіх, працаваць і думаць пра іх, пра сваіх дарослых дзяцей. Яна, адчуваючы, што раптоўны жаль не зусім прайшоў, пацалавала мужа ў аброслую за дзень, калючую шчаку. Ён жа нават не варухнуўся, здаецца, нішто не захвалявала яго — што яна блізка, што ў яе крышку расшпілена блузка і з-пад яе відаць лагчынка ад яе высокіх грудзей, што вышэй каленяў агаліліся яе белаватыя роўненькія ногі.

— Дык пойдзем? — спытаў ён.

— Пойдзем,— уздыхнула яна, яшчэ толькі нядаўна хацела прашаптаць мужу: «А можа, нам і праўда асмеліцца?..» — нават прыдумала ўжо, як апраўдацца, але як толькі пачула сухаватае і настойлівае: «Дык пойдзем?» — стрымалася і не пачала гаварыць мужу пра свае патаемныя думкі, бо яшчэ збаялася, ці добра не толькі дзеці, але і ён, Анатоль, яе зразумее...

Муж падняўся і сказаў, што пойдзе падкопваць на аторку — лапінцы пры хляве — бульбу, а яна няхай зараз падыдзе з кашамі. Сказаў і, не азіраючыся, выйшаў.

Вольга Пятроўна паднялася, паправіла засцілку на канапе. Па целе прабегла нейкая прыемная стома, здаецца, прыліло цяпло да шчок. Яна падышла да люстэрка, паглядзелася і ўбачыла, што напраўду на шчоках гарыць чырванец, і адчула, што гэта не звычайны чырванец, а палымяны, малады.

Можа, муж убачыў яго і крышку раней, заўважыў і сышоў.

Яна ж, пазіраючы на сябе, думала, што зусім яшчэ не старая, даволі маладая на твары і постаццю. І тут жа ўспомніла, што ёй пра гэта — што яна маладая і прыгожая — гаварыў нядаўна адзін мужчына. Ды не пажылы чалавек, а малады хлопец, новы настаўнік.

Ён, гэты новы настаўнік, прыехаў у іх школу ў сярэдзіне жніўня. Быў здалёку, але тутэйшыя настаўніцы ўжо аднекуль ведалі, што яму трыццаць гадоў, што ён быў жанаты, развёўся, будзе плаціць аліменты за дзіця.

Гэты Станіслаў Браніслававіч здаўся спачатку зусім не настаўнікам. Здаўся па сваім адзенні. Усе мужчыны-педагогі хадзілі на працу ў строгіх — аднаго колеру штанах і пінжаку — касцюмах, у

белых кашулях і пры гальштуках, а ён, новенькі, прыйшоў першага верасня ў школу ў шэрых джынсах, на якіх былі жоўтыя замкі, прышыты скураныя жоўтыя латкі з малюнкамі, шырокі з вялікаю бронзаваю папругаю пояс, быў у рыжай скураной куртцы, у расшпіленай на верхні гузік кашулі.

З усімі ён, ні кропелькі не саромеючыся, хутка пазнаёміўся, загаворваў, гэтак жа хутка пазнаёміўся і з ёю, усміхнуўся, што яна вельмі прыгожая, гаварыў і пільна, нясціпла пазіраў у вочы. І пазней стараўся ў настаўніцкай на перапынках жартаваць толькі з ёю, зусім не гледзячы, што бянтэжыцца яна і бялее на твары яе муж ад гэтага. Да яе прыйшоў страх ад яго вось гэтай смеласці ды хітрасці застацца з ёю адзін на адзін і гаварыць ёй пяшчотным голасам толькі прыемнае.

А на днях, атрымаўшы першую плату, яны, настаўнікі, наладзілі невялікую гулянку. Патанцавалі. Анатоль не танцаваў, сядзеў у кутку з мужчынамі, то яна вальсіравала з жанчынамі і з ім, Станіславам Браніслававічам.

Танцор ён быў вельмі спраўны, умеў лёгка круціцца, вадзіць яе вакол сябе, прыбліжаючы часамі так блізка, што яна ажно хвалявалася ад гэтага.

Станцаваўшы польку, яна выбегла на двор астудзіцца. Следам за ёю выбег і ён, наблізіўся і шапнуў: «Якая вы мілая! Я ўкаханы ў вас. Чуеце?..»

— Што вы гаворыце? — усміхнулася яна, махаючы перад тварам хустачкаю.— Я ваша маці.

— Я люблю вас, чуеце? — шаптаў ён і прыбліжаўся да яе.— Ні адна дзяўчына вам тут не раўня... Прыйдзіце заўтра ў восем да Каменнай гары... Я буду вас там штодзень чакаць.

— Гаворыце вы!..— прамовіла яна, усміхнулася.— Не хапала мне толькі ў сорак гадоў на спатканні бегаць... Апомніцеся, што вы гаворыце, малады хлопец?

Але бачачы, што ён набліжаецца і ці не думае прыхіліць яе да сябе, крутнулася ля яго і хутка падалася ў хату, села ля мужа і болей не танцавала, а пасля ўгаварыла яго ісці дахаты. Нічога яму пра нядаўняе не сказала, а ўжо лежачы ў пасцелі і ўспомніўшы гэта, усміхнулася сама сабе, гадаючы, што было б, каб яна ў свае гады пачала яшчэ хадзіць на спатканні. Думала так і аж ківала галавою...

«А я яшчэ і не старая,— зноў падумала яна цяпер, стоячы ля люстэрка,— і кахаць яшчэ ўмею, магу...»

А Станіслаў Браніслававіч сёння, як яна ішла з поля дахаты, як наўмысна чакаў яе ля магазіна, прывітаўся і выхітрававаў,

размаўляючы з Анатолем, шапнуць ёй, што ён учора чакаў яе ля Каменнай гары і сёння будзе чакаць, і так зірнуў, што ў яе перахапіла дыханне.

...Ля васьмі гадзін вечара, калі ўжо прыцямнелася, яны пазносілі і высыпалі ў склеп выбраную бульбу, вярнуліся ў хату і хуценька ўхадзіліся па гаспадарцы. Яна сказала мужу абіраць і варыць бульбу, а сама падаіла карову, пасля сасмажыла яешню.

Калі ўдваіх моўчкі і нехаця павячэралі, прыбралі са стала, яна сказала мужу, што ў клубе будуць паказваць сёння цікавае кіно, можна схадзіць і паглядзець.

— Ай! — стомлена ўсміхнуўся Анатоль.— Давай лепш тэлевізар паглядзім ці спаць ляжам,— і, калі гаварыў, шырока пазяхаў і меў такі лянівы выраз твару, што добра відаць было: ніякімі сіламі яго з хаты цяпер не вывалачаш.

— Ну, што ты такі? — Калі ён уключыў тэлевізар, сеў на канапе, яна падышла, апусцілася яму на калені, абняла за шыю.

— Фіранка не зацягнута — людзі ўбачаць.

— Ну і што? — спытала яна.— Хай бачаць. А ты вось вазьмі і панасі мяне на руках...

— Яшчэ што выдумай! — сказаў ён і ссадзіў яе з каленяў побач на канапу.— Хочацца табе яшчэ дзяцініцца!..

— Дзяцініцца, дзяцініцца! — перадражніла яна зласнавата, і ён, здаецца, зразумеў яе, адчуў нават тое, што яна хацела сказаць, але не сказала.

Адчуў, але зусім не змяніўся. Сядзеў і ўзіраўся ў тэлевізар, у якім пачалі паказваць футбол.

«А можа, той на ніякія спатканні не прыходзіць? — нечакана падумала яна пра Станіслава Браніслававіча.— Можа, ён толькі насміхаецца з мяне?» — падумала яна так, і стала крыўдна, што малады хлопец надумаўся пацяшацца з яе.

Як падумала так, адчула горыч, чамусьці ёй захацелася напраўду схадзіць да Каменнай гары і неяк асцярожна, незаўважна паглядзець: прыйшоў той туды ці і не думаў ісці.

— Нешта галава баліць, так хочацца пабыць на дварэ,— сказала яна, ведаючы, што Анатоль нізашто зараз не выйдзе з хаты.

— Ну, пахадзі па свежым ветры,— сказаў незадаволена ён.

— Пайду,— прамовіла з крыўдаю яна,— пайду і не вярнуся да цябе такога...

— А дзе ж ты дзенешся? — усміхнуўся ён.

— Пайду шукаць кавалераў...

— Ідзі, ідзі...— пакепліваў Анатоль.— Толькі ты ім і трэба...

— Што я — такая ўжо старая ці зусім збрыдчэла? — пакрыўджана спытала яна.

— А што — маладзенькая? — усміхнуўся муж і аж падскочыў да тэлевізара: на стадыёне футбалісты ў белай форме забілі гол у вароты футбалістаў у чорным.

Вольга Пятроўна нічога болей не сказала мужу, падалася з хаты.

На двары цяпер, пазнаватым вечарам, добра чулася ўжо, што стаіць восень. Было свежа, астыла дзённае цяпло, ад рэчкі папоўз холад, ды і раса пачынала гусцець надта холадна.

Вольга Пятроўна, скалануўшыся плячыма ад дрыжыкаў, выйшла на агарод і разораю падалася на сценку, а з яе — полем да Каменнай гары. Ішла і не хацела ісці, думала, на што ўсё гэта яна робіць, чаго ідзе, чаго хоча, што трэба вярнуцца назад, але і вельмі хацелася пайсці і паглядзець, ці прыйшоў той, ці сур’езна ён нешта задумаў...

Вольга Пятроўна многа абгінала, ішла да рэчкі, каб падысці туды не з поля і быць заўважанай, а непрыкметна прыблізіцца з другога боку, з кустоў.

Як пачала прыбліжацца да высокай гары, якую цяпер пачалі раскопваць на жвір, пайшла цішэй, затупала мякка, узіраючыся наперад і ўслухоўваючыся. Часта прыпынялася і падоўгу стаяла, уважліва слухала і стрымлівала дыханне. Але нічога ўбачыць і пачуць не магла, хоць ужо зусім блізка была ля гары.

Можа, вось так уся, як ёсць, і выскачыла б з кустоў на дарогу, каб не пачула цыгарэтны дым. Тады раптоўна прыпынілася, прыклала руку да сэрца: так яно нечакана затрапяталася. Затрапяталася, як толькі ў роскапні ўбачыла ў джынсах і скураной куртцы, маладога, з цыгарэтаю ў зубах, Станіслава Браніслававіча, які сядзеў на вялікім камені і курыў, пазіраючы амаль на яе.

«Што ён сабе думае, тэты хлопец, за каго мяне лічыць? — падумала яна і разам з тым неяк узрадавалася, што ён не насміхаўся, а напраўду прыйшоў сюды, лічыць яе яшчэ за зусім маладую.— Але што гэта я?..»

Яна, спалохаўшыся сама сябе, адступіла крок назад і зачапіла галавою галінку сасняку, і тая загайдалася. Заміраючы, яна пазірала на галінку, прасіла бога, каб хлопец не заўважыў гэтага. Пастаяўшы яшчэ крышачку, яна ціхенька адышлася і хутка падалася адсюль, адчуваючы, што нешта зрушылася ў яе душы, як абуджаецца, здаецца, забытае маладое хваляванне, як штосьці нядобрае цягне яе вярнуцца назад, а не ўцякаць адсюль, бо яна, можа, ўцякае ад сваёй маладосці, ад свайго цяперашняга шчасця і пасля будзе папракаць сябе за гэта...

...Калі падыходзіла да свайго дома, што амаль ужо зліўся ў цемені з садам, з паветрам і небам, убачыла ў акне лепшай палавіны сіняе святло ад тэлевізара. Падышоўшы бліжэй, да самых шыбін, зірнула і з самотаю, з нейкім пачуццём вялікай страты згледзела: муж, прылёгшы на правы бок, падкурчыўшыся, ужо спаў нераспрануты на канапе.

1974

© OCR: Камунікат.org, 2012
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2012
© PDF: Камунікат.org, 2012

# ЗМЕСТ

Аповесці

Усё яшчэ наперадзе
Юля

Апавяданні

Цяпло на першацвет
Жнівеньскія ліўні
Асенняе лета .

На белорусском языке
Генрих Вацлавович Далидович
ТЕПЛО НА ПЕРВОЦВЕТ
Рэдактар А. А. Жук.
Мастак В. П. Масцераў.
Мастацкі рэдактар А. І. Труханава.
Тэхнічны рэдактар Т. М. Сокал.
Карэктар А. Т. Глушчанка.
АТ 09317. Здадзена ў набор 5/VI 1975 г. Падп. да друку 17/XII 1975 г.
Тыраж 10 000 экз. Фармат 70X108'/зг. Папера друк. № 3. Ум. друк. арк. 11,9. Ул.-выд. арк. 12,28. Зак. 2395. Цана 48 кап.
Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўйага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, Савецкая, 19.
Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, Чырвоная, 23.